# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

**Вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання**

**(базавы і павышаны ўзроўні)**

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

2-е выданне

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2005

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

УДК 811.161.3(075.3=161.3=161.1)
ББК 81.2Беи-922
Б43

А ў т а р ы:

**Л. А. Антанюк** (§ 1—31 тэарэтычная частка); **М. В. Кныш** (§ 1—31 практычная частка); **З. І. Бадзевіч** (§ 32—37 тэарэтычная частка); **М. В. Кныш** (§ 32—37 практычная частка); **І. М. Саматыя** (§ 38—39); **З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя** (§ 40—59, Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага ў IX класе); **З. І. Бадзевіч** (Дадатак, Тлумачальны слоўнік, Арфаэпічны слоўнік); **З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя** (Адказы на тэставыя заданні).

Р э ц э н з е н т ы:

канд. філал. навук, дац. кафедры беларускага мовазнаўства БДПУ імя Максіма Танка *С. С. Мароз;* метадыст аддзела грамадска-гуманітарнай адукацыі Мінскага гарадскога дзяржаўнага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў адукацыі *С. І. Цыбульская.*

**Умоўныя абазначэнні:**

◆ — правіла; ⌇ — для назірання;

● — дадатковыя заданні;

↑ — заданні павышанага ўзроўню;

* — лексічнае значэнне слова тлумачыцца ў слоўніку;

| | | | |
|---|---|---|---|
| ——— | — дзейнік; | ⌒ | — корань; |
| ═══ | — выказнік; | ⌐ | — прыстаўка; |
| ～～～ | — азначэнне; | ∧ | — суфікс; |
| – – – | — дапаўненне; | □ | — канчатак; |
| –·–·– | — акалічнасць; | └┘ | — аснова; |
| | | ┌── | — постфікс. |

**Беларуская** мова: вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў,
Б43 якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з бел. і рус. мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання (базавы і павышаны ўзроўні) / Л. А. Антанюк [і інш.]. — 2-е выд. — Мн.: НІА, 2005. — 328 с.
ISBN 985-465-185-1.

**УДК 811.161.3(075.3=161.3=161.1)**
**ББК 81.2Беи-922**

© Антанюк Л. А., Бадзевіч З. І., Кныш М. В., Саматыя І. М., 2005
© Афармленне. Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2005

**ISBN 985-465-185-1**

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

*Бедны той, хто, апрача грошай, апрача багацця, каторае пры першым няшчасці счэзне дазвання, не мае скарбаў вечных — скарбаў душы. Такі скарб, каторы ніхто і ніколі адабраць ад нас не здолее, гэта любоў да бацькаўшчыны, да свайго народа, да роднай мовы...*

Цётка

## § 1. Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры

Пад нацыянальнай культурай разумеюць усё багацце дасягненняў нацыі, народа ў вытворчым, грамадскім і духоўным жыцці.

Гэта багацце цесна звязана з мовай народа ўжо таму, што пазнанне і творчае адлюстраванне навакольнага свету адбываецца пры непасрэдным удзеле той мовы, на якой размаўляе чалавек. Тым больш, што і сам працэс мыслення непарыўна звязаны з роднай мовай, бо чалавек думае на сваёй мове.

Пазнаючы свет, людзі выказваюць разуменне і мастацкае бачанне яго ў сваёй мове. З дапамогай мовы адбываецца і далейшае пазнанне. Так складвалася спецыфічнае бачанне свету кожнага, у тым ліку і беларускага, народа на працягу стагоддзяў. Зараз яно выразна праяўляецца ў беларускай лексіцы, фразеалогіі, граматычных асаблівасцях беларускай мовы. Напрыклад, словы, якія маюць дакладныя, здавалася б, адпаведнікі ў іншых мовах, часта заключаюць у сабе сваё, спецыфічнае, бачанне адных і тых жа прадметаў, з’яў: беларускае *запалка* звязана з працэсам запальвання, з полымем; рускае *спичка* — са словам *спица,* што абазначае драўляны ці металічны стрыжань, г. зн. не з запальваннем, полымем, а з тым, што запальваецца, гарыць.

Акрамя таго, у беларускай, як і ў любой мове, ёсць словы, што не маюць аднаслоўнага перакладу: бел. *абапал* — рус. *по обеим сторонам* (чего-либо), бел. *алей* — рус. *растительное масло,* бел. *агораць* — рус. *справиться с большим трудом,* бел. *зважаць* — рус. *обращать внима-*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

*ние,* бел. *імшара* — рус. *моховое болото,* бел. *нядбалец* — рус. *нерадивый человек,* бел. *адвеку* — рус. *испокон веку,* бел. *зашмарга* — рус. *затяжная петля.* Гэтыя адрозненні звязаны з адрозненнямі ў культуры, умовах жыцця.

**1.** Прачытайце тэкст. Выпішыце 10 слоў, якія адрозніваюцца ад слоў рускай мовы. Знайдзіце сярод іх гутарковыя і дыялектныя. Падбярыце да іх літаратурныя адпаведнікі.

Ад самага красавіка надвор'е спрыяла людзям. Было багата цяпла, і ў час паілі зямлю спорныя дажджы. І азіміна, і яравое раслі на вачах, і разам з азімінай, з яравым раслі ў асцярожных, звыклых да ўсяго сэрцах куранёўцаў надзеі на лета: малілі Бога, каб толькі і далей памог пагодаю. Ужо блізка сенакосу нахапілася раптам некалькі навальніц. Зранку неба было і чыстае, і яснае, і яснасць стаяла доўга ўдзень, але за полуднем проста ўвачавідкі пачыналі пухнуць белыя, потым сіняватыя хмары. Парыла так, што ў Куранях і навокал усё млела ў духаце; пад вечар хмары зацягвалі ўжо ўсё неба. У вячэрняй цемры безупынку кідаліся чырвоныя зарніцы. Яшчэ да таго, як сяло апаноўваў шумны лівень, неба над прыціхлымі хатамі і агародамі нізалі стрэлы маланак і расколвалі разложыстыя ўдары грому. У навальнічнай цемрадзі бляск маланак быў бела-сіні, прагавіты, грымоты падалі і каціліся так магутна і грозна, што, здавалася, на мокрым лапіку зямлі са стрэхамі і ў балотным абшары вакол усё замірала ад страху. *(І. Мележ)*

● Растлумачце значэнне слоў *увачавідкі, безупынку.*

↑ Растлумачце значэнне слоў *надвор'е, пагода.* Якія гэта словы? Запішыце са словам *пагода* тры ўстойлівыя спалучэнні (прыказкі, прымаўкі).

**2.** Прачытайце. Вызначце тэму і стыль тэксту. Выпішыце словы, характэрныя для гэтага стылю.

Працэс фарміравання беларускай народнасці з уласцівай ёй асобнай мовай быў працяглым. Выдатны знаўца беларускай мовы акадэмік Я. Ф. Карскі адзначаў, што ўсе галоўныя асаблівасці сучасных беларускіх гаворак у большай ці меншай ступені склаліся не пазней за XIII стагоддзе. Аб


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

існаванні беларусаў са спецыфічнай для іх мовай ужо ў канцы XIV стагоддзя гавораць і іншыя даследчыкі.

У пісьмовых помніках, якія ствараліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў XIII стагоддзі, усё часцей і часцей з'яўляюцца беларускія моўныя асаблівасці. Найбольш прыкметна яны выяўляюцца ў дзелавых помніках і перш за ўсё — у фанетыцы і лексіцы, якія вельмі адчувальныя да змен у жыцці народа.

Новыя моўныя з'явы ў помніках беларускага пісьменства XIV стагоддзя, асабліва юрыдычных, найцясней звязаны з жывой гаворкай народа і сустракаюцца вельмі часта. Сярод іх многа спецыфічна беларускіх слоў, пераважна такіх, якія з'яўляюцца і зараз агульнаўжывальнымі ў беларускай мове: *адзенне, дабрадзей, жыта, дзяржава, звычай, дарослы, дасканалы, пільнаваць, моўца, рэчы, добры, скарб, час.*

XV—XVI стагоддзі асабліва багатыя на помнікі беларускага пісьменства. Як лічаць многія даследчыкі, к канцу гэтага адрэзка часу склалася жывая, вусна-гутарковая мова беларускай народнасці. У дачыненні да гэтай пары можна гаварыць і аб існаванні ўжо асобнай усходнеславянскай літаратурнай мовы — беларускай. *(Паводле Л. Шакуна)*

↑ Паразважайце, чаму менавіта фанетыка і лексіка вельмі адчувальныя да змен у жыцці народа.

↑ Пастаўце да тэксту пытанні і, адказваючы на іх, раскажыце аб гістарычным фарміраванні беларускай народнасці і мовы.

↑ З першага абзаца выпішыце словы неславянскага паходжання. Назавіце фармальныя прыметы гэтых слоў.

На пэўным этапе развіцця народа само маўленне пачало ўспрымацца з эстэтычнага боку, захапляць сваёй трапнасцю, дакладнасцю, глыбокай асэнсаванасцю. Напрыклад, людзей захаплялі высокамастацкія казанні Кірылы Тураўскага, слава аб якіх распаўсюдзілася па ўсёй Кіеўскай Русі і за яе межамі. Яны, як і творы іншых знакамітых пісьменнікаў беларускіх зямель, абуджалі і саграваλі душы людзей, выклікалі творчыя, культурныя працэсы ў жыцці грамадства. Менавіта ў гэтай сувязі неацэнным скарбам беларускага народа, яго нацыянальнай святыняй стала слова Ф. Скарыны.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Інакш кажучы, у сваім развіцці нацыянальная мова і нацыянальная культура былі цесна ўзаемазвязаны на працягу многіх стагоддзяў. Акрамя таго, сама па сабе нацыянальная мова — элемент нацыянальнай культуры, сацыяльна-культурны скарб кожнай нацыі.

У вусна-паэтычнай творчасці, у мастацкай літаратуры беларускі народ выказаў на роднай мове і пакінуў у спадчыну нашчадкам сваё разуменне разумнага і прыгожага. Эстэтычную каштоўнасць уяўляе сабой і сама мова вусна-паэтычнай творчасці, мастацкай літаратуры.

У станаўленні і развіцці розных галін духоўнай культуры беларускага народа: асветы, літаратуры, мастацтва, радыё, тэлебачання, перыядычнага друку — нацыянальнай мове належыць асабліва значная роля.

Беларуская мова мае даўнюю традыцыю выкарыстання яе ў якасці дзяржаўнай. На ёй, пачынаючы з XIV стагоддзя, складаліся дзяржаўныя дакументы, Статуты Вялікага княства Літоўскага і інш.

У наш час на беларускай мове выдаюцца разнастайныя слоўнікі і даведнікі: «Беларуская энцыклапедыя», энцыклапедыя «Беларуская мова», энцыклапедыя «Беларусь», «Этнаграфія Беларусі», «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» і інш.

Веданне беларускай мовы дае чалавеку магчымасць авалодаць здабыткамі багатай беларускай гісторыі і культуры, бо мова — гэта сродак зносін, захавання і перадачы ведаў, абмену вопытам паміж людзьмі.

Роднае слова ўваходзіць у жыццё чалавека з нараджэння, фарміруе яго розум, акрыляе думкі. Яна — багацце народнай душы, яе паэтычны дар, невычэрпны жывы талент.

**3.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стылёвую прыналежнасць. Выпішыце адметныя словы і звароты, уласцівыя пісьмовай форме маўлення, у адрозненне ад вуснай, гутарковай. Раскажыце аб умовах і спрыяльных фактарах развіцця беларускай мовы ў названы перыяд.

Развіццю і ўдасканаленню старабеларускай літаратурнай мовы ў значнай меры спрыяла тое, што яна выконвала дзяржаўныя функцыі ў Вялікім княстве Літоўскім.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Дзякуючы гэтаму на беларускай мове была створана надзвычай вялікая колькасць розных юрыдычных і дзелавых запісаў. Дзелавое пісьменства з'яўлялася важным узорам літаратурнай апрацоўкі жывой народнай гаворкі і ўплывала на развіццё іншых жанраў беларускай літаратуры. Старабеларуская літаратурная мова пранікала ў розныя сферы жыцця, да навукі і культуры ўключна, абслугоўванне якіх да гэтага было непадзельнай манаполіяй кніжна-славянскай мовы.

Аб надзвычай высокім грамадскім значэнні беларускай мовы ў Вялікім княстве Літоўскім, пашырэнні яе на пісьме і ў вусным выкарыстанні сярод адукаваных колаў тагачаснага грамадства ідзе гаворка нават у старажытным вершы, змешчаным у рукапісным экземпляры «Літоўскага статута» 1529 года.

Выдатныя дзеячы культуры на Беларусі імкнуліся наблізіць мову пісьменства да жывой гаворкі народа. У гэтай справе выключная роля належыць выдатнаму беларускаму асветніку пачатку XVI стагоддзя Ф. Скарыну, які ўводзіў беларускую мову ў найбольш кансерватыўную сферу — у тэксты свяшчэннага пісання, асабліва папулярныя сярод народа. Значная заслуга ў выпрацоўцы моўных сродкаў, у пашырэнні культуры і асветы належыць многім іншым прадстаўнікам беларускай культуры. Важную ролю ў гэтай справе адыграла адкрытае Ф. Скарынам для ўсходнеславянскага свету кнігадрукаванне, якое садзейнічала выпрацоўцы норм літаратурнай мовы, пашырэнню яе ў народзе. *(Паводле Л. Шакуна)*

● Запішыце словамі лічэбнік 1529 і праскланяйце яго.

**4.** Прачытайце тэкст. Як вы разумееце паняцце «тэрміналогія»?

Найбольш развітыя ў XIV—XVII стагоддзях групы лексікі адлюстравалі высокі ўзровень культуры таго перыяду на беларускіх землях: дасягненні ў грамадска-культурным, навуковым, вытворчым развіцці. Гэта грамадска-палітычная, юрыдычная, гандлёвая, сельскагаспадарчая, прамысловая, ваенная тэрміналогія, а таксама тэрміналогія мовазнаўства, астраноміі, матэматыкі і інш.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Узнікненне і развіццё грамадска-палітычнай і юрыдычнай тэрміналогіі было найбольш раннім і інтэнсіўным дзякуючы выкарыстанню мовы ў якасці дзяржаўнай. Захавалася мноства помнікаў дзелавога пісьменства старабеларускай мовы гэтага часу.

Актыўны працэс фарміравання гандлёвай старабеларускай тэрміналогіі пачаўся ў XV стагоддзі разам з бурным развіццём гарадоў, з іх рамеснай і гандлёвай дзейнасцю. На тэрыторыі Беларусі ў гэты час узнікалі буйныя рынкі, цэнтрамі якіх былі Мінск, Брэст, Віцебск.

Сельскагаспадарчая тэрміналогія ўключала мноства агульных для ўсходніх славян слоў, вылучалася шматлікасцю сінонімаў для абазначэння месца размяшчэння сялянскай хаты з гаспадарчымі прыбудовамі: *дворышча, падвор’е, селішча, сяліба, сядзіба.*

Прамысловая тэрміналогія ўключала назвы прадметаў, працэсаў, якасцей рыбалоўства, пчалярства (бортніцтва), палявання, солеварэння, вытворчасці будаўнічых, бытавых і транспартных матэрыялаў (*гонта, клёпкі для бочак, палазы, дугі, дзёгаць, смала* і інш.).

Знаходзячыся ў геаграфічным цэнтры Еўропы, насельніцтва Беларусі прымала ўдзел у найважнейшых ваенных падзеях XIV—XVIII стагоддзяў. Таму ў старабеларускай мове сфарміравалася шырокая група лексікі, якая адлюстравала высокі ўзровень развіцця ваеннай справы таго часу: назвы зброі, войска, удзельнікаў узброенай барацьбы.

Развіццё мовазнаўчай тэрміналогіі і выхад першых граматык былі звязаны не толькі з патрэбамі вывучэння царкоўнаславянскай і старабеларускай моў, а і з грамадска-палітычнымі працэсамі таго часу. На тэрыторыі Беларусі, як цэнтра ўсходнеславянскай культуры ў XVI—XVII стагоддзях, шырока распаўсюдзіліся праваслаўныя, так званыя брацкія, вучылішчы і школы, якія ствараліся ў процідзеянне езуіцкім калегіям, што культывавалі лацінскую і польскую мовы. Для гэтых вучылішчаў і школ з мэтай вывучэння беларускай мовы ствараліся першыя граматыкі і іншая літаратура. *(Л. Антанюк)*

● Раскажыце, як адбываўся працэс фарміравання гандлёвай, сельскагаспадарчай, прамысловай, ваеннай, мовазнаўчай тэрміналогіі.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА Ў V—VIII КЛАСАХ

**5.** Прачытайце. Раскажыце аб прыметах тэксту. У чым выражаецца яго сэнсавае і граматычнае адзінства. Назавіце сродкі сувязі сказаў у тэкстах і тыпы тэкстаў.

Тэкст (ад лац. *textum* — тканіна, сувязь, злучэнне) — напісанае ці выказанае вусна паведамленне, якое характарызуецца структурнай і сэнсавай завершанасцю.

Тэкст існуе ў форме дыялога ці маналога.

Дыялог — форма маўлення, у якой абмен выказваннямі адбываецца паміж удзельнікамі размовы. Маналог — форма маўлення, звернутая да слухачоў, чытачоў, самога сябе (унутраны маналог), у якой разгорнутае выказванне складаецца з рада сказаў, звязаных сэнсава і граматычна.

Мінімальнай адзінкай тэксту з'яўляецца сказ. Тэкст мае або можа мець загаловак. Сказы аб'ядноўваюцца ў абзацы, параграфы, раздзелы і г. д. Колькасць сказаў у тэксце неабмежаваная, яна вызначаецца задачамі паведамлення.

Найважнейшымі прыметамі тэксту з'яўляюцца:

1) сэнсавая цэласнасць (асноўная думка тэксту, яго закончанасць, наяўнасць пачатку і канца);

2) падзельнасць (здольнасць падзяляцца на сказы);

3) звязнасць (паслядоўнасць і лагічнасць выказвання, камунікатыўная пераемнасць, калі кожны наступны сказ будуецца з улікам папярэдняга ці ўсе сказы аб'ядноўваюцца агульнай тэмай і паралельнай сувяззю);

4) стылёвае адзінства.

Асноўнымі сродкамі фармальнай і граматычнай звязнасці частак тэксту з'яўляюцца:

а) паралелізм (аднолькавы парадак слоў) у будове самастойных сказаў;

б) ужыванне асабовых (у 3-й асобе) і ўказальных займеннікаў замест назоўнікаў ці прыметнікаў з папярэдніх сказаў;

в) адзінства ў трыванні і часе дзеясловаў-выказнікаў;

г) ужыванне няпоўных сказаў;

д) выкарыстанне падпарадкавальных і злучальных злучнікаў у пачатку сказаў;

е) ужыванне разнастайных акалічнасцей, якія аднолькава адносяцца да некалькіх самастойных сказаў;


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

ж) паўторы слоў і словазлучэнняў;

з) сінанімічныя замены тоесных слоў;

і) выкарыстанне антонімаў, зваротkaў, рытарычных пытанняў і інш.

Вылучаецца два тыпы сувязі частак тэксту: ланцужковая (паслядоўная) і паралельная. *Ланцужковая* сувязь адлюстроўвае паслядоўнае развіццё думкі, дзеяння, падзеі. У такіх тэкстах кожны новы сказ суадносіцца са словамі ці словазлучэннямі папярэдняга сказа, часта ўжываюцца займеннікі, няпоўныя сказы. *Паралельная* сувязь грунтуецца на паралелізме, суадносінах аднолькавых ці падобных па будове сказаў, у якіх звычайна ўжываюцца аднолькавыя па часе і трыванні дзеясловы-выказнікі, адсутнічаюць абагульняльныя словы і займеннікі.

Моўныя тэксты ў залежнасці ад іх функцыянальна-сэнсавага характару дзеляцца на тры тыпы: апісанне, апавяданне, разважанне.

*Апісанне* выкарыстоўваецца для дэталёвай характарыстыкі прадметаў, прымет, паняццяў, з’яў рэчаіснасці і інш. У *апавяданні* ўвага акцэнтуецца на характары развіцця дзеянняў, падзей, учынкаў, іх паслядоўнасці. *Разважанне* пашырана ў публіцыстычных і навуковых тэкстах, якія будуюцца ў адпаведнасці са строгай і лагічнай паслядоўнасцю сказаў і прычынна-выніковымі сувязямі паміж імі.

**6.** Прачытайце. Дакажыце, што перад вамі тэкст. Вызначце яго тэму і адрасата. Прыдумайце загаловак.

Хто з нас не імкнуўся пабываць у гэтым старажытным горадзе, не любаваўся яго храмамі, выдатнымі творамі рук і сэрца нашых продкаў?

Вось над зліццём дзвюх рэк, на замчышчы, вымалёўваецца белы, з дзвюма званіцамі Сафійскі сабор. Полацкая Сафія. Каменны цуд XI стагоддзя.

Сафійскі сабор у Полацку — першы прыклад помніка, у якім адлюстраваліся рысы, уласцівыя мастацтву Полацкай зямлі. Сафійскі сабор — сама гісторыя горада. Ён многа разоў перабудоўваўся. На працягу стагоддзяў сабор быў храмам-крэпасцю, аб яго муры не раз разбівалі галовы ворагі зямлі Полацкай.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

А вось сабор Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. Ён пабудаваны дойлідам Іаанам, і ў гэтым храме адлюстраваны асаблівасці дойлідства XII стагоддзя: невялікія памеры, прастата плана, манументальнасць.

Славіцца Спаса-Еўфрасіннеўскі сабор сваімі фрэскамі. Прыгледзься да адной. Магчыма, гэта сама Еўфрасіння Полацкая.

Гэта яна пісала летапісы і арыгінальныя творы, стварала асяродкі асветы ў Полацкім княстве. *(«Літаратура і мастацтва»)*

● Праскланяйце лічэбнікі *два, дзве.* Звярніце ўвагу на правапіс канчаткаў гэтых лічэбнікаў у творным склоне.

↑ Ці можна ў слове *гісторыя* лічыць гук [г] прыстаўным? Чаму?

● Што вы ведаеце пра Еўфрасінню Полацкую?

**7.** Напішыце тэкст на тэму «Мы збіраемся ў паход». Жанр тэксту выберыце самастойна.

## § 2. Стылі мовы і маўлення

Стыль мовы — гэта яе разнавіднасць, якая выкарыстоўваецца ў пэўнай сферы грамадскага жыцця (штодзённых побытавых зносінах людзей і афіцыйна-дзелавых адносінах, грамадска-палітычнай дзейнасці, навуцы, сферы мастацкай літаратуры, рэлігійнай сферы) і адрозніваецца спецыфічнымі моўнымі сродкамі. Вылучаюцца адпаведна гутарковы, афіцыйна-дзелавы, публіцыстычны, навуковы, мастацкі стылі.

Пад стылем маўлення разумеюць выкарыстанне сродкаў стылю мовы ў канкрэтнай маўленчай сітуацыі.

Слова «стыль» выкарыстоўваецца і ў больш вузкіх значэннях. Напрыклад, калі мы гаворым: *стыль аповесці, стыль Янкі Купалы, стыль рамана І. Мележа «Людзі на балоце»,* то разумеем пад стылем уласцівую пэўнаму літаратурнаму жанру або асобнаму твору сукупнасць моўных сродкаў ці прыёмаў выкарыстання гэтых сродкаў.

Кожны з названых вышэй стыляў мае сваё прызначэнне, сферу ўжывання, свае жанры, моўныя сродкі і стылёвыя рысы. Акрамя таго, кожны стыль выкарыстоўваецца ў вуснай і пісьмовай форме.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Словы, фразеалагічныя спалучэнні падзяляюцца на нейтральныя, узнёслыя (урачыстыя) і зніжаныя, на агульнаўжывальныя і ўласцівыя толькі пэўнаму стылю. Такім чынам, кожны стыль складаецца з нейтральных, агульнаўжывальных і спецыфічных сродкаў, характэрных пераважна для дадзенага стылю.

У адпаведнасці з мэтамі і зместам паведамлення ў кожным стылі выпрацаваўся пэўны набор моўных сродкаў, замацаваны практыкай выкарыстання мовы ў розных сферах і пэўнымі стылістычнымі нормамі.

| Стыль | Пісьмовая форма | Вусная форма |
|---|---|---|
| навуковы | навуковая праца, анатацыя, рэцэнзія, даведка і інш. | выступленне, даклад, паведамленне на канферэнцыі, на ўроку і інш. |
| публіцыстычны | артыкул часопіса, газеты, памфлет, фельетон, рэпартаж, рэцэнзія і інш. | выступленне на сходзе, па радыё, тэлебачанні і інш. |
| мастацкі | паэтычны, празаічны твор (раман, апавяданне, байка) і інш. | вусны фальклор (казка, легенда, паданне) і інш. |
| афіцыйна-дзелавы | нота, пастанова, рэзалюцыя, зварот, заява, дакладная запіска, пратакол, аўтабіяграфія і інш. | пераказ дакументаў на сходзе, па радыё, тэлебачанні і інш. |
| гутарковы | пісьмо, запіска, сяброўскае вітанне і інш. | дыялог з сябрамі і інш. |

## § 3. Навуковы стыль

Навуковы стыль характэрны для такіх жанраў, як манаграфія, навуковы артыкул, дысертацыя, водзыў, анатацыя, падручнік, лекцыя, даклад.

Адметныя сродкі навуковага стылю — навуковыя тэрміны, спецыяльная фразеалогія, складаныя сінтаксічныя канструкцыі, пабочныя словы, сказы з абагульняльнымі


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

словамі і родавымі назвамі. Шырока выкарыстоўваюцца спасылкі на навуковыя крыніцы, цытаты.

Асаблівасцю навуковага стылю з'яўляецца вельмі рэдкае ўжыванне эмацыянальна-экспрэсіўных слоў і слоў з пераносным значэннем.

Мэта навуковага стылю — паведамленне і тлумачэнне навуковай інфармацыі. Гэта мэта звычайна рэалізуецца ў форме маналога.

**8.** Прачытайце тэкст. Выпішыце навуковыя тэрміны. Якую ролю яны выконваюць у тэксце?

Гук — гэта ваганне паветра пад уздзеяннем пругкага цела. Такім целам для гукаў мовы з'яўляюцца органы маўлення.

Кожны гук мае вышыню, сілу і тэмбр. Вышыня гука залежыць ад частаты вагання. Чалавечы слых успрымае гукі з частатой ад 20 да 20 тысяч герц (герц — адно ваганне ў секунду).

Сіла гука абумоўліваецца амплітудай вагання паветра, і яна будзе тым большая, чым большая яго амплітуда. Тэмбр гука ствараецца спалучэннем ваганняў рознай частаты. З дапамогай сучаснай тэхнікі можна зрабіць графічны запіс гука на папяровую стужку або фатаграфічную плёнку. Для гэтай мэты прымяняюцца спецыяльныя прыборы — асцылографы і спектрографы. *(Л. Выгонная)*

● Выкарыстоўваючы лінгвістычныя тэрміны, стварыце тэкст навуковага стылю на тэму: «Самастойныя часціны мовы», «Службовыя часціны мовы», «Асобыя формы дзеяслова» (на выбар) і інш.

## § 4. Публіцыстычны стыль

Публіцыстычны стыль выкарыстоўваецца ў грамадска-палітычнай дзейнасці і рэалізуецца ў жанрах публіцыстычнага артыкула, нарыса, выступлення, памфлета, фельетона, нататкі і інш.

У публіцыстычным стылі шырока ўжываецца грамадска-палітычная лексіка, словы і словазлучэнні з урачыстай, узнёслай афарбоўкай, часціцы, выклічнікі, простыя


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

сінтаксічныя канструкцыі, рытарычныя пытанні, заклікі, паўторы, трапныя метафары, параўнанні, фразеалагізмы.

Усе гэтыя сродкі абумоўлены мэтай публіцыстычнага стылю — уздзеяннем на чытачоў і слухачоў для ўзбуджэння іх актыўнасці (матэрыяламі газет, часопісаў, радыё, тэлебачання, сходаў, мітынгаў) пры вырашэнні пэўных грамадска-палітычных задач.

**9.** Прачытайце тэкст. Выпішыце словы і сказы, характэрныя для публіцыстычнага стылю.

У нашых сэрцах радасць. Беларусь сардэчна вітае дарагіх гасцей — пасланцоў усіх народаў славянскай сябрыны. Па гарадах і вёсках рэспублікі з 24 па 27 мая пройдзе свята славянскага пісьменства і славянскіх культур.

Кожны народ мае свае духоўныя арыенціры, каб не збіцца з правільнага шляху на крутых паваротах гісторыі. Для нас, беларусаў, імі сталі Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына, Францішак Багушэвіч, Янка Купала — і рад гэты можна доўжыць. Але, вяртаючыся да вытокаў, мы бачым велічныя постаці роўнаапосталаў, першанастаўнікаў, выдатных славянскіх асветнікаў Кірылы і Мяфодзія. Услед за імі пачуццё духоўнай еднасці, ідэю славянскага братэрства і ўзаемапавагі неслі заўсёды ў сваіх сэрцах лепшыя сыны і дочкі ўсіх нашых народаў.

Гэта свята нараджае спадзяванне, што агульны клопат і намаганні ў справе адраджэння і ўмацавання славянскіх культур дапамогуць акрыяць і нашай беларускай мове і культуры.

Караніся ж, вечнае дрэва славянства, пі шчодрыя сокі роднай зямлі, цягніся ў высокія нябёсы! Хай радаснымі птушкамі перагукваюцца ў тваёй разгалай шумлівай кроне ўсе братнія мовы! Хай кожны славянін, ягоныя сыны і дочкі, унукі і праўнукі любяць і помняць, адчуваюць сябе на гэтым магутным дрэве жывой, зялёнай лісцінкай — лісцінкай надзеі і веры! *(С. Законнікаў)*

- Растлумачце напісанне слоў *сэрца, роўнаапостал, Мяфодзій.*
- Стварыце тэкст публіцыстычнага стылю, прысвечаны Дню настаўніка.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## § 5. Мастацкі стыль

Гэты стыль выкарыстоўваецца ў мастацкай літаратуры і займае асаблівае месца сярод іншых стыляў, паколькі ў ім для стварэння вобразаў ужываюцца ўсе моўныя сродкі: агульнаўжывальная лексіка, дыялектызмы, прафесійная лексіка і тэрміналогія, устарэлыя словы, гутарковая лексіка. Шырока выкарыстоўваюцца вобразныя сродкі мовы: метафары, эпітэты, параўнанні.

Мэта мастацкага стылю — уздзеянне на пачуцці і думкі чытачоў і слухачоў з дапамогай мастацкіх вобразаў.

Мастацкі стыль рэалізуецца ў жанрах прозы, паэзіі, драматургіі (рамане, аповесці, апавяданні; вершы, байцы, паэме, рамансе; трагедыі, камедыі, драме і інш.).

**10.** У мастацкім творы адрозніваюць мову персанажаў і мову аўтара. Маўленне дзейных асоб раскрывае род заняткаў герояў, іх культуру, стан душы. Маўленне аўтара перадае яго асабістыя разважанні і пачуцці. Выпішыце ў два слупкі найбольш яскравыя, на ваш погляд, словы і выразы з маўлення аўтара тэксту і яго герояў. Як яны характарызуюць аўтара, герояў?

Ліпцы сапраўды не пашчаслівіла. Калі яна была яшчэ зусім маленькая, бура паблізу вывернула тоўстую елку. Ліпка расла і хутка ўпёрлася вершалінкай у вываранець. Яна схіліла свой стан, хацела глянуць, ці тоўстая елка, ды так і не ўбачыла. А як дацягнулася да верху, то выпрастацца ўжо не змагла.

Потым прыйшлі маладыя хлопцы, каб спілаваць вываранець, і адзін з іх нават пашкадаваў дрэўца:

— Глядзі, як пакалечыла елка бедную ліпку, — сказаў ён свайму сябру.

— Нічога, сонца выпрастае, — адказаў той. — Трэба толькі асцярожна спілаваць вываранець, каб не зламаць яе, кволенькую і пакрыўджаную.

І людзі з добрым сэрцам не загубілі маладзенькае дрэўца. Цяпер ліпцы было прасторна, і яна расла, дужэла. Потым зноў прыйшлі людзі. На гэты раз з песнямі, гоманам. Гэта былі школьнікі. Яны прыехалі выкопваць дрэўцы, каб абсадзіць школу, вуліцу, упрыгожыць двор. Адзін са школьнікаў сказаў:


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

— Выкапаем і гэтую. Няхай едзе ў горад!

— Крываватая трошкі, — пакруціў галавою другі. — Хіба такою ўпрыгожыш вуліцу?

— А чым яна вінавата? Хіба людзі не ведаюць, што не ўвесь лес роўны? Выкапаем, — і першы хлопчык усадзіў рыдлёўку ў зямлю.

Ліпка злёгку зашапацела апошнімі пажоўклымі лісточкамі. Гэта яна шапнула школьніку: «Дзякуй за спагаду, добры чалавек!» Але той, заняты працай, не пачуў шэпту. І вось ліпка ў горадзе. Яе суседак хутка разабралі і, дзе трэба, пасадзілі, а яна — адна-адзінюткая — ляжыць на зямлі. Туга апанавала дрэўца: «Няўжо людзям цяжка выкапаць ямку і пасадзіць мяне ў зямлю? Абы-дзе, калі лепшыя месцы аддалі лепшым. Мне б толькі ўчапіцца за зямлю — і я вырасту».

Вярнуўся Віця са школы, убачыў пакінутую ліпку, падняў, пакруціў у руках і, уздыхнуўшы, сказаў:

— Далі ганьбу табе. Не хочуць у рад з роўнымі дрэўцамі садзіць. Я знайду табе месца. І ён выкапаў ямку далей ад дома, дзе ўвесь дзень не бывае ценю, свеціць сонца. Віця пасадзіў дрэўца ўвагнутым бокам да сонца, каб лепей выпраўлялася крывізна, і пажадаў:

— Расці купчастая ды вялікая!

І ўвесну ліпка першая зазелянела і першая напомніла людзям аб прыгожай пары года — вясне. А летам зацвіла, і пчолы ўпадабалі яе, яе буйныя мядовыя кветкі. *(Паводле А. Пальчэўскага)*

● Стварыце тэкст мастацкага стылю на тэму: «Восень у лесе», «Восень у горадзе», «Ранняя восень», «Позняя восень» (на выбар) і інш.

↑ Назавіце з тэксту словы з эмацыянальна-ацэначным значэннем. Якая іх роля ў тэксце?

## § 6. Афіцыйна-дзелавы стыль

Афіцыйна-дзелавы стыль выкарыстоўваецца ў грамадскай дзейнасці: у афіцыйных зносінах паміж людзьмі, у перапісцы з дзяржаўнымі ўстановамі (заява, пратакол, справаздача і інш.). У яго межах вылучаюцца заканадаўчы, дыпламатычны, адміністрацыйна-канцылярскі падстылі.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

У адрозненне ад гутарковага і мастацкага стыляў, у якіх інфармацыя падаецца ў выглядзе разважання, апісання, у афіцыйным стылі тэкст прадстаўлены ў форме прадпісання, канстатацыі, сцвярджэння. Гэта выяўляецца ў сістэме моўных сродкаў.

Тут шырока выкарыстоўваюцца дзеясловы ў неазначальнай форме, аддзеяслоўныя назоўнікі, назвы асоб па іх афіцыйнай прыналежнасці (жыхар,ісцец, сведка), па прафесіі, сферы дзейнасці (настаўнік, вучань, рабочы), назвы дакументаў (інструкцыя, указ, пратакол) і інш.

Істотная прымета афіцыйна-дзелавога стылю — аб'ектыўнасць і адсутнасць эмацыянальнасці, наяўнасць стандартных выразаў, застылых штампаў. Асноўныя мэты гэтага стылю — інфармацыйная (паведамляльная) і пабуджальная.

**11.** Прачытайце тэкст-аўтабіяграфію Якуба Коласа ў падручніку-хрэстаматыі па літаратуры. Вызначце стандартызаваныя элементы жанру: 1) абазначэнне аўтара дакумента (асабовы займеннік, уласны назоўнік); 2) найбольш важныя падзеі ў жыцці аўтара і яго блізкіх з указаннем іх дакладнага часу і месца; 3) дата, год напісання аўтабіяграфіі і подпіс аўтара; 4) ужыванне стылістычна нейтральнай лексікі.

**12.** Прачытайце тэксты. Вызначце іх стыль. Параўнайце тэксты паводле: а) сферы выкарыстання; б) асноўных функцый; в) стылёвых адзнак; г) моўных сродкаў. Вызначце адрозненні стылёвай прыналежнасці першага і другога тэкстаў.

I. І слухалі мы цара... Усе нас крыўдзілі ды ўсё абдзіралі, і біў нас сільнейшы, крыўдзіў багаты, а на тое нідзе не было справядлівасці. Мы ўсё маўчалі ды слухалі, усім кланяліся, за ўсё плацілі, усё цярпелі, ждучы канца, бо спадзяваліся справядлівай вольнасці, спадзяваліся, што дадуць вольнай зямелькі. Замест таго, каб аддаць нашу зямельку, ды якую ж зямельку? Гэту, што з дзядоў, прадзедаў кроўнаю працай дзесяць раз ужо на яе зарабілі ды заплацілі, за гэту зямлю цар наказуе нам чыншы плаціць у казначэйства. Ды якія ж чыншы? Якія ўздумаецца пастанавіць чыноўнікам ды судовым крывапійцам, ды яшчэ з кожным годам усё большыя ды большыя. Так волі нам ужо і не будзе: век цэлы плаці ды неяк нясі астаткі, каб адплаціцца палатам ды праўленням... *(К. Каліноўскі)*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

II. У 1959 годзе ў раёне станцыі Зялёнае пад Мінскам адбыўся першы рэспубліканскі злёт турыстаў. Але нараджэнне турысцкага руху ў Беларусі адбылося значна раней, напрыканцы 40-х гадоў. Менавіта тады пры некаторых калектывах фізкультуры пачалі ўзнікаць разрозненыя турысцкія секцыі. Спачатку іх дзейнасць грунтавалася на арганізацыі паходаў выхаднога дня, турысцкіх злётаў. Пасля пачалі пракладвацца першыя далёкія маршруты. Першы клуб турыстаў узнік на базе ДСТ «Чырвонае знамя» ў 1959 годзе, рух пачаў набіраць сілу, аўтарытэт і папулярнасць і паступова станавіўся ўпарадкаваным і сістэмным. Найбольш актыўна далучаліся да яго студэнты: клубы і секцыі політэхнічнага інстытута, Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Мінскага медыцынскага інстытута штогод арганізоўвалі цікавыя і складаныя маршруты — пешаходныя, горныя, водныя, паспяхова развіваўся альпінізм.

Тады, напачатку, была здзейснена вялікая арганізацыйная работа: падрыхтаваны інструктарскія кадры, распрацаваны метадычны матэрыял для гэтых мэт, самадзейны турызм стаў адным з накірункаў работы Беларускага турысцка-экскурсійнага ўпраўлення. Так адбылося яго афіцыйнае прызнанне, далей пачаўся росквіт... *(«Настаўніцкая газета»)*

- Растлумачце напісанне слоў з вялікай літары ў другім тэксце.
- Стварыце тэкст афіцыйна-дзелавога стылю на тэму: «Справаздача аб класным мерапрыемстве», «Пратакол пасяджэння штаба па добраўпарадкаванні школьнай тэрыторыі» (на выбар) і інш.

## § 7. Гутарковы стыль

Гутарковы стыль выкарыстоўваецца ў штодзённых зносінах паміж людзьмі. Мэта гутарковага стылю — абмен думкамі, уражаннямі. Асноўная форма рэалізацыі гутарковага стылю — дыялог.

У гутарковым стылі пераважае лексіка штодзённага побытавага ўжывання, простыя сказы. Побач з нейтральнымі моўнымі сродкамі выкарыстоўваюцца зніжаныя, прастамоўныя, эмацыянальна афарбаваныя словы, словы з пераносным значэннем, паўторы, часціцы, выклічнікі. У гутарковым стылі вялікую ролю адыгрываюць міміка і жэсты.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**13.** Прачытайце тэкст. Дакажыце, што ён адносіцца да гутарковага стылю.

Сярод жанок, што тоўпіліся на двары, аб уступленні ў калгас найбольш хваляваліся Чарнушкава Куліна і Сарока.

— Як хто, а я — штоб такое зрабіла калі! — Куліна круціла галавой, з чырвоным, злым тварам, клялася перад усімі: ніколі, нават пад прымусам!

— Жызня будзе: прыйдзеш з работы — ніякай турботы! — растарэквала адважна Сарока. — Ні каровы, ні свіняці — адны сцены ў хаце!.. Любата!

— Як ето яно будзе? — трывожылася Васілёва Маня. — Добра, у каго няма нічога!

— Аге! — запярэчыла нявестцы Васілёва матка. — Не шкода хіба! Багатаму шкода карабля, а беднаму кашаля!

— Карова — ето не кашэль! — сказала Ігнаціха.

— То-та і яно!.. Што ето, праўда, будзе — са ўсёй етай выдумкі? *(Паводле І. Мележа)*

● Выпішыце з тэксту прыналежныя прыметнікі і растлумачце іх напісанне. Запішыце свае прыклады на адпаведнае правіла.

↑ У тлумачальных слоўніках вы можаце знайсці словы са стылістычнымі паметамі, якія ўказваюць на адпаведны стылістычны пласт лексікі. Выпішыце са слоўніка па два словы з адпаведнымі паметамі і вызначце, у якім стылі мовы яны найчасцей ужываюцца і што абазначаюць: *кніжн.; высок.; паэт.; нар.-паэт.; разм.; праст.; уст.; гіст.; спец.; абл.; ласк.; жарт.; неадабр.; іран.; асудж.; пагард.; груб.; лаянк.*

**14.** Прачытайце. Вызначце стыль і тып тэксту. Знайдзіце самастойныя і службовыя часціны мовы.

### НЕПАЎТОРНЫ КРАЙ

У кожнага чалавека, які меў шчасце некалі нарадзіцца на нашай зялёнай — такой маленькай і такой неабдымнай — зямлі, абавязкова ёсць свой гожы, ласкавы і шчымліванепаўторны край, які ў вялікім і шырокім паняцці Радзімы звычайна займае невялікае, звыклае месца. Такі край — заўсёды твой цэлы свет.

Ёсць такі край і ў мяне. Там намнога пазней, чым у цяплейшых раёнах Беларусі, зацвітае агурочнік. Там намнога даўжэй спеюць прывязаныя да пруткоў, цяжка абвіслыя на



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

рагулькі зеленаватыя памідоры, а круглабокія гарбузы, перавернутыя белымі, незагарэлымі бакамі да сцішанага, пахаладалага ўжо восеньскага сонца, ляжаць у гародах як не да самых замаразкаў.

Там аж згінаюць да зямлі зялёнае пер'е атавы буйныя і чыстыя жнівеньскія росы, якія выпадаюць раней і не скочваюцца долу ледзь не ўвесь дзень. Затое намнога раней убельваюцца знаёмыя мне зялёныя палі і пожні раннімі зазімкамі — сівымі да нечаканасці. Штосьці ад сапраўднай Поўначы мае мой край. Дзіва што — ён жа на самых паўночных схілах Беларусі. Таму тут і восеньскае неба часам здаецца завельмі нізкім, і завея — круцейшая, і нават вецер крыху бялейшы — і не ад холаду, а проста ад адной, відаць, думкі пра Поўнач. *(Паводле Я. Сіпакова)*

- Растлумачце напісанне слоў *восеньскі, штосьці.*
- Адзначце, якія службовыя часціны мовы ў тэксце сустракаюцца рэдка ці наогул адсутнічаюць.
- Вызначце сэнсава-стылістычную ролю самастойных і службовых часцін мовы.
- Вызначце спосаб утварэння слоў *прывязаныя, павернутыя, незагарэлыя.*

**15.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак. Сфармулюйце правілы правапісу слоў з ***не(ня), ні*** ў тэксце.

Не мяцелі снегавыя, не маразы лютыя гоняць ад нас птушак на зіму. Адлятаюць яны ад недахопу ежы, ратуюцца ад галоднай смерці.

Пазнікаюць увосень насякомыя, пакрыецца снегам насенне, расліны — няма чым карміцца птушкам. Яшчэ не паспее асыпацца на дрэвах ліст, а ўжо нідзе не чуваць птушыных галасоў. І саміх птушак мала відаць.

Ужо з верасня пачынаюць птушкі адлятаць у вырай. Нельга не заўважыць, як першымі падымаюць трывогу буслы. Незадоўга да адлёту збіраюцца яны чародамі, а потым, глядзіш, і зусім прапалі.

Вясёлыя, спрытныя ластаўкі нізка лятаюць над зямлёй, ловяць мошак. А вось на двары неяк халаднее, мошкі знікаюць, няма чаго есці ластаўкам, і яны, не чакаючы, збіраюцца ў дарогу.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Поле ўжо апусцела. Пачынаюць капаць бульбу. У небе плаўна нясецца крык журавоў. Высока ляцяць жураўлі і кідаюць на зямлю свой развітальны крык.

Патроху ўсе птушкі, якія прыляцелі да нас вясною, зноў пакінулі нас на ўсю зіму. Шмат бяды прыходзіцца выцерпець ім, пакуль заляцяць яны на зімовыя кватэры. Нямала птушак гіне ад навальніц, ад драпежнікаў.

У выраі нашы птушкі гнёздаў не ўюць і песень не спяваюць. Віць гнёзды і выводзіць птушанят яны прылятаюць назад, на сваю радзіму. *(Паводле Я. Коласа)*

- Вызначце сродкі сувязі сказаў у тэксце.
- Вызначце тэму і стылістычную прыналежнасць тэксту.

↑ На якія правілы правапісу ***не(ня), ні*** ў дадзеным тэксце вы не знайшлі прыкладаў?

**16.** Выразна прачытайце тэкст. Назавіце яго асноўныя стылёвыя рысы. Ахарактарызуйце моўныя сродкі тэксту. Ці адпавядаюць яны той задачы, якая стаяла перад аўтарам? Перакажыце тэкст.

Эх, і пагодка ж стаіць на Палессі!

Толькі старыя людзі памятаюць такія прыгожыя дні. Цеплыня, цішыня, яснасць. У сіняй смузе песцяцца далі. Залатая чырвань лістоў нерухліва звісае на купчастых галінках высокіх вязаў. Цёмныя ночы тояць нейкі ўрачысты спакой, і неба ніжэй нахіляецца да зямлі, каб падслухаць яе спрадвечную скаргу. А кяцістыя зоры, бы дыяменты, усыпаюць усё неба, дрыжаць, пераліваюцца колерамі вясёлкі, аб чымся бязмежна вялікім гавораць тваёй душы. *(Я. Колас)*

- Як вы разумееце паняцце «тэкст»? Назавіце яго асноўныя прыметы.
- Пісьмова дайце сваё апісанне цёплага восеньскага надвор'я.

**17.** Спішыце, раскрываючы дужкі.

*(Не)* дзялімая на тры лічба; *(не)* дзялімая лічба; *(не)* пераможаная каманда; *(не)* згасальная любоў да радзімы; *(не)* змаўкальны днём і ноччу шум мора; *(не)* пранікальная для вады тканіна; *(не)* пранікальная тканіна; *(не)* заменныя ў дарозе рэчы; нічым *(не)* ўзнаўляльная страта; *(не)* дасягальныя вынікі; *(не)* дасягальныя без трэніроўкі вынікі; *(не)* прымальнае рашэнне; *(не)* прымальная для нас умова.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**18.** Прачытайце тэксты. Дакажыце іх прыналежнасць да пэўных стыляў. Вызначце іх тэму, адрасата і мэтанакіраванасць. Растлумачце ўжыванне і правапіс ***не, ні*** са словамі. Вызначце тып кожнага тэксту.

I. Расцярушыла ночка свой цёмны пыл, распляла над зямлёю свае чорныя косы, а сама, як маці, прытаілася ў лесе, каб вартаваць і ахоўваць сон людзей і сон прыроды. Гэта была добрая ночка. А каб на зямлі не было так маркотна ў час яе прыходу, яна пазмятала з неба ўсе хмаркі, і яно заззяла тысячамі рознакаляровых агеньчыкаў-зорак. Слаўна blішчалі гэтыя адвечныя нябесныя вочы. Яны дрыгацелі ў пералівах жывых агнёў, нібы брыльянцістыя матылькі, што, сеўшы на краску, трапечуць крыльцамі, сатканымі з праменняў.

Аднак было добра адно тое, што бляск зорак асвятляў і ночку і тым самым рабіў менш адчувальным змрок. Тыя ж, каму прыходзілася ў гэты час быць у далёкай дарозе, калі ў сэрца закрадвалася трывожная думка: а ці той гэта шлях? — пазіралі на зоры і па іх знаходзілі дарогу. А калі хто прачынаўся ўночы і таксама заўважаў зоркі на небе, дык і яму было весялей, і ён выказваў уголас сваё задавальненне. *(Паводле Я. Коласа)*

II. Не могуць дрэвы жыць без карэння. Не могуць і людзі. Можа, таму і памірае ад настальгіі — самай чорнай і самай светлай хваробы — чалавек, які пры жывой радзіме топча чужыя травы, лашчыць чужыя кветкі, чуе чужую мову сваіх дзяцей. Таму кожнаму народу, мусіць, будзе зразумелая тая вялікая і шчырая радасць, прыемная разгубленасць бурата, які, пасучы авечак, зрабіў раптам нечаканае для сябе, такое шчымлівае і такое простае адкрыццё: сонца, маўляў, заўсёды, пастаянна жыве ў яго краіне, а да іншых яно толькі ў госці ходзіць...

А вось і яна — наша сяліба. Сюды, засмучаныя і ўзрадаваныя, пакрыўджаныя і суцешаныя, заўсёды вярталіся мае продкі. Ішлі пехатою — і паслухмяна, даючы ім дарогу, рыпелі весніцы, ехалі на кані — і шырока расчыняліся вароты, запрашаючы ў круглы двор ці сані, ці плуг, ці воз дроў.

*(Паводле Я. Сіпакова)*

- Зрабіце фанетычны разбор слоў *расцярушыла, расчыняліся.*
- Растлумачце значэнне слова *настальгія.*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

III. Гэтак і стаялі — адзін перад адным. Чалавек і воўк. Абодва здранцвелыя ад нечаканасці, ад сустрэчы, але страху адзін перад адным не адчувалі. Чалавек шмат пабачыў іх, шэрых, добра ведаў іх і сілу, і слабасць, і нораў. Тым больш не баяўся тут, на асфальце, ды яшчэ напачатку лета, калі ваўкі асцярожныя, бо не галодныя. А воўк, вядома, таксама не спалохаўся чалавека, бо ў чалавека не было стрэльбы, а без стрэльбы ды без сабакі чалавек слабы — гэта воўк ведаў. Ды і абрыдла ўвесь век баяцца. Воўк быў стары, сівы, колькі разоў за сваё жыццё ён ішоў праз агонь, праз сцяжкі, з-пад стрэлаў, абыходзіў смерць.

— Ну, што скажаш, стары? Цяжка аднаму?

Воўк унурыў галаву ў плечы, яшчэ больш згорбіўся, прыўзняў азадак, падняў хвост, як згатовіўся накінуцца. Але чалавек быў спакойны. У гэтай грознай пастаՙве ваўка ён убачыў не толькі гатоўнасць кінуцца на чалавека, але і такую ж гатоўнасць бегчы ад яго. *(Паводле В. Карамазава)*

● Як вы разумееце значэнне выразу *ішоў праз сцяжкі,* слова *ўнурыў?*

**19.** Прачытайце тэксты. Вызначце сэнсава-стылістычную ролю адмоўных займеннікаў і часціц. Растлумачце правапіс ***не, ні*** з рознымі часцінамі мовы.

I. Колькі гадоў таму дубу, ніхто з вяскоўцаў не ведае. Не адно пакаленне людзей бачыла і бачыць яго такім, які ён сёння. Стаіць дуб на правым беразе Нёмана і сваімі лісцямі глядзіцца ў празрыстую ваду. Увосень лісце падае на халодныя хвалі і, гайдаючыся на іх, плыве далёка-далёка.

А па суседству з дубам між кустоў чаромхі прымасцілася сасонка. Старыя людзі памятаюць яе маленькай, на іхніх вачах яна вырасла ў гонкае дрэва, вышэйшае за дуб.

Не раз сасна ганарылася перад старым суседам сваім ростам. Дуб не зайздросціў ёй. За свой век ён бачыў, як такія сосны, даўнейшыя яго суседкі, выраслі ў гонкіх прыгажунь, а потым або самі падалі на зямлю ад старасці, або людзі высякалі іх. А дуб жыве сабе ды жыве, згубіўшы лік гадам. *(А. Пальчэўскі)*

● Растлумачце значэнне выразу *не адно* і падбярыце да яго сінонім.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

II. Як многа гэта значыць — мець не толькі вёску ці горад, дзе ты нарадзіўся, дзе табе знаёма кожная вуліца, кожны дом, дзе ты ўсё ведаеш і цябе таксама ўсе ведаюць, але мець яшчэ і сваіх людзей, быць сярод іх сваім чалавекам, адчуць, што, адкуль бы ты і які ні вярнуўся, яны цябе прымуць, памогуць. Ніякая дружба, ніякае сяброўства не заменяць гэтага. Бо свае людзі помняць цябе змалку, помняць тое, чаго пра цябе ніхто не помніць. І не толькі пра цябе, але і пра ўсю радню тваю — маці, бацьку, дзядоў і прадзедаў. І калі нейкія іхнія высновы не пацвердзяцца — а гэта здараецца вельмі рэдка, — не бяда... Яны адкапаюць нешта ў тваім родзе такое, што супакоіць і іх, і цябе: яны не памыліліся. Як правіла, свае людзі рэдка ў кім памыляюцца. *(Б. Сачанка)*

● Дакажыце, што ў дадзеных тэкстах ёсць сэнсавая цэласнасць, тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, завершанасць.

**20.** Спішыце, раскрываючы дужкі. Растлумачце напісанне ***не (ня), ні*** ў словах.

*(Ні)* кчэмны, *(ні)* рыба *(ні)* мяса, *(ні)* хто, *(не)* хта, *(ні)* часу *(не)* шкада *(ні)* сіл, *(ні)* колі, *(ні)* быта, *(не)* йкі, *(ні)* які, *(ні)* кудышны, *(не)* куды, *(не)* адкуль, *(ні)* кроку назад, *(ні)* бы, *(ні)* даць *(ні)* ўзяць, *(ні)* шчымны, *(ні)* што, *(не)* шта, *(не)* дзе, *(ні)* дзе, на вуліцы *(ні)* душы, *(ні)* з месца, *(ні)* тое *(ні)* сёе, *(ні)* як, *(не)* як, *(не, ня)* многа, *(не, ня)* трэба, *(не)* пакоіць, *(не)* здаровіцца, *(не)* дамагаць, *(не, ня)* воліць.

**21.** Прачытайце тэксты. Вызначце іх стыль, тып маўлення, тэму і адрасата. Абгрунтуйце свой выбар. Дайце тэкстам загалоўкі.

I. Сведчаннем высокай прававой культуры грамадства на Беларусі, Літве і Украіне ў XVI стагоддзі з’явілася стварэнне Статута Вялікага княства Літоўскага 1529 года. Гэта быў першы добра распрацаваны кодэкс феадальнага права ва Усходняй Еўропе. Створаны на беларускай мове і зацверджаны сеймам у Вільні, Статут ахапіў нормы права дзяржаўнага, зямельнага, крымінальнага, працэсуальнага і спадчыннага.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Тэкст яго, які складаўся з 13 раздзелаў і 282 артыкулаў, абапіраўся на шматлікія крыніцы. Гэта былі нормы Рускай Праўды, судовыя рашэнні, некаторыя нормы рымскага, польскага і нямецкага права. Шырока было выкарыстана і звычаёвае права, распаўсюджанае на Беларусі.

Статут — важны гістарычны дакумент, які сведчыў аб усё большых сувязях Беларусі са здабыткамі тагачаснай еўрапейскай культуры. *(А. Грыцкевіч)*

- Запішыце лічбы словамі ў патрэбнай граматычнай форме.
- Запішыце ў транскрыпцыі словы *сведчанне, грамадства.*

II. Як толькі я сябе помню, бацькі мае і старэйшыя людзі прывучалі нас, малых, шанаваць усё жывое, што было навокал нас.

З таго часу расло ў мяне вялікае замілаванне да прыроды. Нават крапіву, якой частавалі мяне за некаторыя грахі дзяцінства, забаранялася збіваць без прычыны пугаю.

Любіў я, заўважыўшы ў лесе прыгожую кветку-зёлку, выкапаць яе з зямлі і прынесці ў агарод.

І вось быў у мяне каля склепа мой запаветны гадавальнік. Раслі ў мяне там духмяныя фіялкі, якія я прынёс з князеўскай аселіцы, раслі рамонкі, васількі, мядункі...

Цяпер, калі мне давялося праз паўсотню гадоў зірнуць на тое самае месца, дзе калісьці быў наш маленькі агарод, я пабачыў нібы казку: увесь ён заняты школьным кветнікам. Гэта вучні школы, якая збудавана на месцы колішняй нашай сядзібы, самі не ведаючы таго, ажыццявілі маё летуценне, мае запаветныя жаданні... *(Паводле У. Дубоўкі)*

- Вызначце сэнсава-стылістычную і тэкстаўтваральную ролю займеннікаў.
- Зрабіце марфалагічны разбор двух займеннікаў (на выбар).

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

*...Не адметнасць лексікі перш за ўсё робіць пагоду: у лексіцы славянскіх народаў агульных слоў тысячы. Пагоду робіць сінтаксіс. Музыка фразы. Тое, у чым дух мовы. Яе глыбінная сутнасць. Яе мысліцельная прырода. Тое, што ў генах, і перадаецца з генамі.*

Н. Гілевіч

# СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ

Граматыка складаецца з дзвюх цесна звязаных паміж сабой частак — марфалогіі і сінтаксісу.

С і н т а к с і с — гэта раздзел граматыкі, што вывучае будову, значэнне словазлучэнняў і сказаў, з якіх складаецца звязнае маўленне (у вуснай форме ці ў форме пісьмовага тэксту).

Цесная сувязь марфалогіі і сінтаксісу заключаецца ў тым, што словазлучэнні і сказы ўтвараюцца ў выніку аб'яднання слоў у пэўных граматычных формах, якія вывучаюцца ў марфалогіі.

Для перадачы сэнсавай, сінтаксічнай і інтанацыйнай будовы сказаў у пісьмовым маўленні выкарыстоўваюцца знакі прыпынку. Сістэма правіл пастаноўкі знакаў прыпынку і сама сукупнасць знакаў прыпынку называюцца п у н к т у а ц ы я й (ад лац. *punctum* — кропка).

**22.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму, спосабы і сродкі сувязі сказаў у ім. Дайце тэксту загаловак.

Доўгая хада па лесе прытаміла дзеда Талаша. Зняў ён з-за пляча стрэльбу, паляўнічую торбу ды сеў на пні падсілкавацца. Але глухі шорах прымусіў дзеда прыслухацца і разгледзецца. І бачыць ён, як вялізны дзікі кабан павольна выходзіць з ляснога гушчару, не зважаючы на дзеда. Кабан падыходзіць да прыгожага, як бы вытачанага рукою здольнага майстра, стажка-мурашніка, акуратна і роўна прысыпанага снегам, і запыняецца. А потым пачынае рыць, ускідваючы высока ўгору разам са смеццем, нанесеным мурашкамі за гады ўпартай працы, камякі снегу. Кабан рые павольна,



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

усё больш і больш углыбляючыся ў зямлю і не заўважаючы, што з гушчару падкрадваецца да яго воўк. *(Паводле Я. Коласа)*

- Знайдзіце ў тэксце зменныя і нязменныя часціны мовы.
- Дакажыце, што словазлучэнне ўтвараецца ў выніку аб'яднання слоў у пэўных граматычных формах.

**23.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Што вы даведаліся пра гісторыю пунктуацыі? Вызначце тэму, спосабы і сродкі сувязі сказаў у тэксце. У чым выяўляецца сувязь пунктуацыі з сінтаксісам?

Знакі прыпынку паявіліся ў старажытных грэкаў і рымлян яшчэ да IV—V стст. У пісьмовых помніках усходніх славян аж да XIV ст. ужывалася кропка і розныя спалучэнні кропак. Шэсць знакаў прыпынку было ўжо ў граматыцы Л. Зізанія (1596 г.). Вынаходства кнігадрукавання, развіццё навукі і асветы садзейнічалі ўстанаўленню адзіных пунктуацыйных правіл. Пунктуацыя як сістэма графічных абазначэнняў была канчаткова прынята большасцю народаў Еўропы толькі ў сярэдзіне XV ст. У XV—XVII стст. у рускай пісьменнасці ўводзяцца коска, кропка з коскай, двукроп'е, пытальны і клічны знакі, дужкі, працяжнік, а ў XVIII ст. складваецца ў асноўным сучасная пунктуацыя рускай мовы. Першыя спробы даць тлумачэнне знакаў прыпынку зрабіў М. В. Ламаносаў у «Российской грамматике» (1755 г.).

Беларускія назвы знакаў прыпынку ўпершыню знаходзім у кнігах «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання» (1906 г.) А. Пашкевіч (Цёткі), «Беларуская граматыка для школ» (1918 г.) Б. Тарашкевіча, а з 30-х гг. канчаткова замацоўваюцца сучасныя назвы знакаў прыпынку. Сучасная беларуская пунктуацыя мае стройную і дасканалую сістэму правіл, у аснове якіх ляжаць сэнсавы, граматычны (сінтаксічны) і інтанацыйны прынцыпы.

Усе знакі прыпынку паводле сваёй функцыі ў сказе падзяляюцца на раздзяляльныя і выдзяляльныя.

*Раздзяляльныя (няпарныя)* знакі прыпынку служаць для раздзялення асобных членаў простага сказа, састаўных частак складаных сказаў або цэлых сказаў. Раздзяляльнымі знакамі бываюць кропка, пытальнік, клічнік, шматкроп'е ў канцы сказа, коска, кропка з коскай, двукроп'е, працяжнік, коска з працяжнікам у сярэдзіне сказа.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

*Выдзяляльныя (парныя)* знакі прыпынку служаць для выдзялення са структуры сказа пэўных сінтаксічных канструкцый: адасобленых членаў сказа, зваротказ, пабочных і ўстаўных слоў і словазлучэнняў, цытат і інш. *(А. Адамовіч)*

**24.** Падзяліце пісьмова дадзеныя словазлучэнні на тры групы: а) словазлучэнні якія называюць прадмет (з'яву) і яго прымету (якасць); б) дзеянне і прадмет; в) дзеянне і яго прымету.

Дасягнуць поспеху, усюды жаўцеюць, бегчы навыперадкі, баяцца цяжкасцей, асабістая думка, зайсці нечакана, цяжкія пачуцці.

## § 8. Публічнае выступленне

П у б л і ч н а е в ы с т у п л е н н е — гэта вуснае выступленне, зварот з мэтай эмацыянальнага ўздзеяння на канкрэтных слухачоў. Асноўнымі відамі публічных выступленняў з'яўляюцца: лекцыя, даклад, паведамленне, дыспут, спрэчка, гутарка, прамова.

Пры падрыхтоўцы да публічнага выступлення неабходна выбраць тэму і ўдакладніць мэту сваёй прамовы. Найбольш агульныя мэты выступлення — праінфармаваць пра падзеі, дапамагчы разабрацца ў навуковай праблеме, не толькі пераканаць слухачоў у чым-небудзь, але і пабудзіць іх да дзеяння.

Публічнае выступленне павінна складацца з трох частак: уступу, асноўнай часткі і заключэння. **Уступ** псіхалагічна ўводзіць слухачоў у працэс успрымання. Ён прызначаны засяродзіць увагу слухачоў, забяспечыць кантакт выступаючага з аўдыторыяй. Уступ павінен быць кароткі і залежаць ад жанру маўлення, сітуацыі. У **асноўнай частцы** галоўнае месца адводзіцца пераказу матэрыялу, яго аналізу, абагульненню. **Заключэнне** дапамагае асэнсаваць усё выступленне. У заключэнні могуць быць зроблены тэарэтычныя і фактычныя вывады.

Завяршае падрыхтоўку да публічнага выступлення праца над мовай і стылем будучай прамовы.

**25.** Назавіце асаблівасці вуснага публічнага выступлення. Ці выступалі вы публічна? Раскажыце пра гэта.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**26.** Прааналізуйце мову ўрыўка. Знайдзіце сродкі выражэння ацэначных адносін аўтара да выказвання, а таксама сродкі экспрэсіі і эмацыянальнасці. Назавіце характэрныя рысы публіцыстычнага стылю.

Дзецюкі!

Мінула ўжо тое, калі здавалася ўсім, што мужыцкая рука здольна толькі да сахі, — цяпер настаў такі час, што самі можам пісаць, і пісаць такую праўду справядлівую, як бог на небе. О, загрыміць наша праўда і, як маланка, пераляціць па свеце! Няхай пазнае, што мы можам не толькі карміць сваім хлебам, але яшчэ і вучыць сваёй мужыцкай праўдзе.

Пыталі і пытаюць усе на свеце, хто нам, бедным мужыкам, дасць вольнасць. Але, па праўдзе кажучы, мала хто хоча сказаць так, як сумленне кажа, — па справядлівасці. Мы, мужыкі, браты вашыя, мы вам будзем гаварыць усю праўду, толькі слухайце нас!

Маскалі, чыноўнікі і многія паны будуць затрымліваць пісьмо наша да вас; але знойдуцца людзі і з мужыкоў больш разумныя, і з панскага роду, і з мястэчкоўцаў, якія хочуць вашай свабоды, вашага шчасця, — яны то вам самі гэтае пісьмо даваць будуць, каб вы ведалі, хто ваш сябар, а хто вораг. *(З «Мужыцкай праўды» К. Каліноўскага)*

- Вызначце адрасата дадзенага тэксту. Якімі пунктуацыйнымі знакамі ён аформлены на пісьме?

**27.** Прачытайце тэкст. Назавіце прыметы публічнага выступлення.

Усяго 25 свечак адпалала на зямным бяседным стале Максіма Багдановіча. Калі ў маі 1917 года пагасла апошняя, тоненькая і пахілая, побач не было ні сваякоў, ні сяброў, і выпадковыя людзі, якія паклалі ў камяністую крымскую зямлю высушанае туберкулёзам маладое цела, не здагадваліся нават, што хавалі аднаго з найвыдатнейшых беларускіх паэтаў, аднаго з самых любімых сыноў нацыі.

За 25 гадоў жыцця большасць з людзей паспяваюць толькі закончыць адукацыю ды яшчэ ажаніцца або сустрэць сваю нарачоную. А Максім Багдановіч за гэтыя кароткія імгненні вечнасці паспеў стаць адным з самых дасведчаных мужоў свайго часу, класікам роднай літаратуры. Народжаны



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

ў Мінску, асірацелы ў Гродне, вывезены пяцігадовым з Беларусі, ён на доўгія гады быў адарваны ад роднай зямлі, ад матчынай мовы і бабуліных казак, ад пошуму наднёманскіх бароў і вясёлага булькатання крынічак. Вучыўся ён у Ніжнім Ноўгарадзе і Яраслаўлі, каханне сваё напаткаў над матухнай-Волгай, а ўсе сілы і магутны талент аддаў да астатку, да апошняй кроплі «краіне-бранячцы» — Беларусі.

Самым гарачым, самым трапяткім, самым святым пачуццём Максіма была любоў да Радзімы, да маці-Беларусі. Яна зрабіла яго паэтам, яна дала сэнс ягонаму самаахвярнаму жыццю, яна пакінула яго ў памяці нашчадкаў. *(Г. Бураўкін)*

- Падрыхтуйце вусны пераказ тэксту.

**28.** Падрыхтуйце невялікае вуснае выступленне на тэму «Як патрэбна сябе паводзіць» для розных слухачоў (малодшыя школьнікі, вашы аднакласнікі, дарослая аўдыторыя).

**29.** Падрыхтуйце выступленне на грамадска-палітычную або навуковую тэму.

## § 9. Словазлучэнне

С л о в а з л у ч э н н е — гэта спалучэнне двух ці больш самастойных слоў, звязаных па сэнсе і граматычна.

Адно з такіх слоў з'яўляецца галоўным, другое (ці другія) — залежным (залежнымі). Від сувязі, пры якім адно слова залежыць ад другога па сэнсе і граматычна, называецца п а д п а р а д к а в а л ь н а й.

Словазлучэнне, як і слова, называе з'яву, прадмет, толькі больш канкрэтна, дакладна. Параўн.: *кніга — цікавая кніга, пісаць — пісаць ліст, апрануцца — апрануцца па-святочнаму.*

Слова — адзінка лексічная, словазлучэнне — сінтаксічная. Слова называе прадметы, дзеянні, прыметы; словазлучэнне называе прадметы, дзеянні, прыметы ў іх адносінах. Параўн.: *паранены* (прымета або асоба), *шчаслівы* (прымета), *выпадак* (прадмет), *птушка* (прадмет), *ісці* (дзеянне); *параненая птушка* (прадмет і яго прымета), *выратаваць параненага* (дзеянне і асоба, на якую яно накіравана), *шчаслівы выпадак* (прадмет і яго прымета).



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Словазлучэнні бываюць рознымі па будове ў залежнасці ад граматычных асаблівасцей слоў, з якіх яны складаюцца.

Так, словазлучэнне *цікавая кніга* складаецца з назоўніка і залежнага ад яго прыметніка (прыметнік + назоўнік), словазлучэнне *пісаць ліст* — з дзеяслова і залежнага ад яго назоўніка (дзеяслоў + назоўнік), словазлучэнне *апранецца па-святочнаму* — з дзеяслова і залежнага ад яго прыслоўя (дзеяслоў + прыслоўе).

**30.** Вызначце, якія спалучэнні слоў з'яўляюцца словазлучэннямі. Выпішыце іх. Абгрунтуйце свой выбар.

Вельмі ціхі, на бяду, сястра спіць, маці і бацька, пах бэзу, дапамог бы, ісці з братам, самы важны, далёка ад лесу, няхай чытае, з сябрам, каля лесу, больш высокі, часопіс «Бярозка», спаленая немцамі хата, маці хворая, з-за лесу, дзяўчынка і хлопчык, выйшаў усміхаючыся, сорак пяць.

↑ Растлумачце, чым адрозніваюцца паняцці *спалучэнне слоў* і *словазлучэнне*.

**31.** Прачытайце. Вызначце стыль тэксту. Дайце яму загаловак. Выпішыце з двух сказаў першага абзаца словазлучэнні. Назавіце ў іх галоўныя і залежныя словы. Якімі часцінамі мовы яны выражаны?

Веснавая цёплая ноч толькі што апранула зямлю і раскідала свае таемныя чары, поўныя крыху смутнага харастваю. Першыя зоры ўжо замігацелі то там, то сям у бяздонным небе, а з-за лесу залатым пажарам узнімаўся кругам бліішчасты месяц. Дробныя белыя хмаркі высцілалі яму дарожку сваімі лёгкімі, празрыстымі тканінамі і расступаліся перад ім, скупануўшы ў яго бляску свае танкарунныя кудры.

Пахла зямля, багата акропленая расою. У сяле чуліся гаворка і песні. Вясёлыя маладыя гукі смела ўразаліся ў цішыню ночы і бойка плылі за рэчку, тут яны ўпыняліся ў высокі бераг, адскоквалі назад і беглі ўздоўж яго па дузе лукі і заміралі ўжо за лугам. *(Паводле Я. Коласа)*

● Сфармулюйце правілы напісання слоў *з-за, месяц, расступіліся, адскоквалі.*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**32.** Выпішыце спачатку словазлучэнні, потым — сказы. Якім з гэтых канструкцый уласцівая сэнсавая і інтанацыйная закончанасць?

Пісаць ліст. Я іду ў вялікі свет. Рамантаваць дах. Мы любім горад свой родны. Ці любіце вы чытаць перад сном? Прачытайце свой любімы верш. Любімая радыёперадача. Твор цікавы. Вясёлы чалавек. У мяне многа кніг. У цябе ёсць запаветная мара?

## § 10. Граматычнае значэнне словазлучэнняў

У залежнасці ад таго, да якіх часцін мовы належаць словы, што ўваходзяць у склад словазлучэння, гэтыя словазлучэнні маюць пэўныя значэнні. Гэтыя значэнні часцей за ўсё бываюць агульнымі для словазлучэнняў аднолькавай будовы. Напрыклад, словазлучэнні, якія складаюцца з назоўніка і залежнага прыметніка, тыпу *цікавая кніга,* маюць значэнне прадмета і яго прыметы; словазлучэнні, якія складаюцца з дзеяслова і залежнага назоўніка ў форме вінавальнага склону, тыпу *пісаць ліст,* маюць значэнне дзеяння і прадмета, на які пераходзіць гэта дзеянне; словазлучэнні, якія складаюцца з дзеяслова і залежнага прыслоўя, тыпу *апрануцца па-святочнаму,* маюць значэнне дзеяння і прыметы гэтага дзеяння. Такое агульнае значэнне словазлучэнняў аднолькавай будовы называецца **граматычным значэннем словазлучэнняў.**

Граматычнае значэнне словазлучэння вынікае з граматычных значэнняў тых часцін мовы, да якіх належаць словы, што ўваходзяць у склад адпаведнага словазлучэння. Гэта і абумоўлівае агульнасць граматычнага значэння словазлучэнняў, створаных са слоў аднолькавых часцін мовы. Напрыклад, адно і тое ж значэнне прадмета і яго прыметы маюць словазлучэнні *сонечны дзень, вясновая раніца, глыбокая рака* і падобныя.

Агульнае значэнне дзеяння і прадмета, на які пераходзіць гэта дзеянне, маюць словазлучэнні *выканаць заданне, прачытаць верш, выказаць меркаванне, прачытаць у кнізе, клопат пра бацькоў* і падобныя.

У адпаведнасці з марфалагічным выражэннем галоўнага слова словазлучэнні падзяляюцца на:



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

1) д з е я с л о ў н ы я — з галоўным словам дзеясловам: **чытаць** кнігу, **сустракаць** ад душы, **гаварыць** ціха;

2) і м е н н ы я — з галоўным словам назоўнікам: задушэўная **мелодыя, песні** птушак; з галоўным словам прыметнікам: **чырвоны** ад сораму, **шчаслівы** без меры; з галоўным словам займеннікам: **хтосьці** з нас, **кожны** з вучняў; з галоўным словам лічэбнікам: **адна** з дзяўчынак, **трыццаць** чалавек;

3) п р ы с л о ў н ы я — з галоўным словам прыслоўем: **нечакана** для ўсіх, **высока** ў небе.

Будову, граматычнае значэнне словазлучэнняў можна паказаць у наступнай табліцы:

| Словазлучэнне | Будова | Граматычнае значэнне |
|---|---|---|
| *цікавая кніга* | прым. + наз. | прадмет і яго прымета |
| *пісаць пісьмо* | дзеясл. + наз. у В. скл. | дзеянне і прадмет, на які яно пераходзіць |
| *апрануцца па-святочнаму* | дзеясл. + прысл. | дзеянне і яго прымета |

**33.** Прачытайце. Вызначце тэму і стыль тэксту. Выпішыце са сказаў першага абзаца словазлучэнні. Вызначце іх будову і граматычнае значэнне (як паказана ў табліцы вышэй).

Зіма падыходзіла к канцу. Трымаліся яшчэ маразы і падаў снег, але ўдзень так прыгравала сонца, што ў зацішках раставала. Першыя кволыя сасулькі павіслі пад стрэхамі. Былі яны вельмі тонкія, кароценькія, але падрасталі з кожным сонечным днём. Паглыбела неба, вечарамі гэта асабліва было прыкметна. Цёмна-сіняе, яно пачало адліваць нейкім зялёным адценнем. Папрыгажэлі ранішнія зоры, нібы памаладзелі, і пачалі ярчэй ззяць. Вецер патыхнуў вясенняй вільгаццю.

Ніхто так не адчувае набліжэння вясны, як дзеці. Іх ужо ад раніцы нешта кліча на двор. І хоць гульні яшчэ старыя, зімнія, але праходзяць яны жвавей і весялей.

Цікавы і вясёлы час, калі няма яшчэ ні цеплыні, ні вясны, але прырода ўжо адчувае іх подых і цягнецца ім насустрач. *(А. Чарнышэвіч)*

● Сфармулюйце правілы вымаўлення слоў *снег, з кожным, адценнем, адчувае.*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**34.** Спішыце словазлучэнні. Абазначце галоўнае слова. Вызначце тып словазлучэнняў паводле прыналежнасці галоўнага слова да пэўнай часціны мовы.

Адданы сябар, адданы сябру, дзесяць кніг, кніга пра жывёл, шосты ад дарогі, нехта з дзяцей, шкадаваць сябе, далёка ад радзімы, горача ад сонца, шкада хворых.

- Да якіх часцін мовы адносяцца залежныя словы?
- Вусна перакладзіце дадзеныя словазлучэні на рускую мову, супастаўце пераклад з арыгіналам. Чым адрозніваюцца беларускія і суадносныя з імі рускія словазлучэнні?

**35.** Спішыце словазлучэнні, размеркаваўшы іх па групах паводле прыналежнасці галоўнага слова да пэўнай часціны мовы. Пастаўце пытанне ад галоўнага слова да залежнага.

У з о р. Дзеяслоўныя словазлучэнні: *глядзець* (на што?) *на неба.*

Блізкі чалавеку, паехаць вучыцца, учора вечарам, кляновыя лісты, ехаць праз поле, цікавы ў мінулым, прыйшоў раніцай, мякка пад нагамі, высока ў гарах, рушылі наперад, вельмі высокі, не горшы за іншых, жаданне вучыцца, уручэнне ўзнагарод, штосьці з былога.

**36.** Спішыце словазлучэнні. Абазначце галоўнае і залежнае словы. Адкажыце, да якіх часцін мовы яны адносяцца.

Густы бярэзнік, свежы хлеб, водар лесу, прыезд брата, чытаць кнігу, дарога лесам, бярэзнік ля дарогі, поўны хараства, пяць кніжак, хтосьці з дзяцей, верыць у перамогу, весткі ад бацькоў, пажоўклая трава, прыехалі ўчора, добрыя весткі, верныя сябры, рыбакова хата, прыгожыя краявіды, прыехаць да таварыша, прыехаць ненадоўга.

## § 11. Сінтаксічныя адносіны паміж словамі ў словазлучэнні

На аснове граматычных значэнняў слоў розных часцін мовы, якія ўваходзяць у словазлучэнне, складваюцца сінтаксічныя адносіны паміж імі. Так, словазлучэнні з назоўнікаў і залежных ад іх прыметнікаў, тыпу *цікавая кніга,* з граматычным значэннем прадмета і яго прыметы


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

маюць **азначальныя** сінтаксічныя адносіны паміж словамі, што і пацвярджаецца пытаннем (якая?) ад галоўнага да залежнага слова.

Словазлучэнні, якія складаюцца з дзеясловаў і залежных ад іх назоўнікаў, тыпу *пісаць пісьмо,* з граматычным значэннем дзеяння і прадмета, на які пераходзіць гэта дзеянне, маюць **аб'ектныя** сінтаксічныя адносіны паміж галоўным і залежным словамі, што пацвярджаецца пытаннем (што?) ад галоўнага да залежнага слова.

Словазлучэнні, якія складаюцца з дзеясловаў і залежных ад іх прыслоўяў, тыпу *апрануцца па-святочнаму,* з граматычным значэннем дзеяння і яго прыметы маюць **акалічнасныя** сінтаксічныя адносіны паміж галоўным і залежным словамі, што пацвярджаецца пытаннямі (як? якім чынам?).

**37.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце і выпішыце словы, на якія прыпадае найбольшая сэнсавая нагрузка. Вусна выдзеліце са сказаў словазлучэнні. Вызначце сінтаксічныя адносіны ў гэтых словазлучэннях.

Немалаважны ўклад у скарбніцу агульнабеларускага фальклору ўнесла беларускае Палессе. Гэты край мае сваю многавяковую гераічную гісторыю і багатую народную культуру, якая адыходзіць у глыбіню стагоддзяў, добра захоўвае традыцыйныя элементы ўсёй славянскай духоўнай культуры.

Палессе знаходзіцца паміж тэрыторыямі, на якіх сфарміраваліся тры роднасныя народы ўсходнеславянскага паходжання — рускі, украінскі, беларускі. На захадзе яно прымыкае да іншых славянскіх тэрыторый. Тут здаўна адбывалася ўзаемадзеянне розных этнічных культурных традыцый, якія мелі глыбокія карані. *(В. Захарава)*

- Зрабіце словаўтваральны разбор слоў *немалаважны, узаемадзеянне.*
- У першым і другім сказах назавіце складаныя словы і сфармулюйце правілы іх напісання.

**38.** Вызначце тып кожнага словазлучэння па характары сінтаксічных адносін паміж кампанентамі. Спішыце. Абазначце галоўныя словы.

Цікавы чалавек, дапамагчы па-сяброўску, паважаць чалавека, пачуццё любові, здольнасць марыць, выхаванне ча-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

лавека, любіць музыку, боты са скуры, зялёны луг, хата бацькі, падарыць сябру, сядзець дома, хутка бегаць, прыехаць у чацвер, працаваць па вечарах, гуляць у садзе, наша моладзь, першы вучань.

**39.** У дадзеных словазлучэннях замяніце дзеясловы аднакарэннымі назоўнікамі. Вызначце тып утвораных словазлучэнняў па характары адносін паміж кампанентамі. Запішыце.

У з о р. *Вывучаць праблему — вывучэнне праблемы (аб'ектныя адносіны).*

Чытаць часопіс, апісаць эксперымент, скласці план, абагульніць факты, асвойваць космас, рэцэнзаваць артыкул, паскараць працэс, любіць Бацькаўшчыну, паважаць герояў, спачуваць хвораму.

## § 12. Спосабы сувязі слоў у словазлучэнні

У складзе словазлучэння словы звязваюцца трыма асноўнымі спосабамі падпарадкавальнай сувязі: дапасаваннем, кіраваннем і прымыканнем.

Д а п а с а в а н н е — гэта спосаб падпарадкавальнай сувязі, пры якім залежнае слова набывае тыя ж граматычныя формы, што і галоўнае: *цікавая кніга, цікавай кнігі, цікавую кнігу, аб цікавай кнізе.*

К і р а в а н н е — гэта спосаб падпарадкавальнай сувязі, пры якім залежнае слова (назоўнік ці іншая часціна мовы, ужытая ў значэнні назоўніка) ставіцца ў той склонавай форме (з прыназоўнікам ці без прыназоўніка), якой патрабуе галоўнае слова: *пісаць ліст, паведамляць пра навіны, цікавіцца падзеямі, выпрабоўваць машыну.*

П р ы м ы к а н н е — гэта спосаб падпарадкавальнай сувязі, пры якім нязменнае слова далучаецца да галоўнага толькі па сэнсе. Прымыкаюць прыслоўі, неазначальная форма дзеяслова, дзеепрыслоўі: *працаваць размаўляючы, жаданне падарожнічаць, запрасіць зайсці, сустракаць вечарам, дом насупраць.*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**40.** Праверце сябе: ці засвоілі вы тэмы «Граматычнае значэнне словазлучэнняў» і «Спосабы сувязі слоў у словазлучэнні»? Дапоўніце табліцу сваімі прыкладамі.

### Значэнне словазлучэнняў і сувязь слоў

| Граматычнае значэнне | Падпарадкавальная сувязь | | |
|---|---|---|---|
| | дапасаванне | кіраванне | прымыканне |
| Прадмет і яго прымета | прым. + наз. | | |
| Дзеянне і прадмет | | дзясл. + наз. | |
| Дзеянне і яго прымета | | | дзеясл. + прысл. |

**41.** Вусна вызначце спосаб сувязі слоў у словазлучэннях, а таксама тып словазлучэнняў паводле галоўнага слова і характару сінтаксічных адносін паміж кампанентамі.

Стомлены ад барацьбы, майстэрства маляваць, любіць жыццё, пятыя суткі, заснуць апоўначы, перавыкананне задання, вельмі цяжкі, даступны шырокаму колу гледачоў, некаторыя з сяброў, пятнаццаць вучняў, ніхто з нас, позна ноччу, два дамы, далёка ад сяброў, вяртанне ноччу, намнога бліжэй, (гаварыў) незразумела для слухачоў, адпачынак пасля абеду, жанчына з характарам, стукнуў па стале, задаволены сабой.

**42.** Вызначце тып паводле будовы сказаў, якія складаюцца з аднаго слова, двух слоў. Утварыце развітыя сказы і запішыце іх. Зрабіце пісьмовы разбор словазлучэнняў, якія ёсць у вашых сказах, паказваючы: а) прыналежнасць кампанентаў словазлучэнняў да пэўных часцін мовы; б) сінтаксічныя адносіны; в) спосаб падпарадкавальнай сувязі (гл. дадатак «Узоры разбору»).

Вучоба цікавая. Жыццё — барацьба. Жыць — значыць змагацца. Светла. Змяркаецца.

**43.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Запішыце. Падкрэсліце словазлучэнні, звязаныя спосабам прымыкання. Вызначце іх тып паводле характару сінтаксічных адносін паміж словамі.

Днем на лугу ко мне пристала ласточка. Она быстро кружилась около меня, крича жалобно и настойчиво. Я старательно следил за полётом, но не мог ничего понять, а



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

дед Митрий с удовольствием рассказал мне, в чём здесь дело. Я шёл по лугу, пугал кузнечиков, а ласточка летала кругом и ловила их на лету без всякой заботы. *(К. Паустовский)*

**44.** Разгледзьце табліцу. Раскажыце пра сувязь граматычнага значэння і будовы словазлучэнняў. Дапоўніце звесткі з табліцы прыкладамі словазлучэнняў.

| Граматычнае значэнне | Прадмет і яго прымета | Дзеянне і прадмет | Дзеянне і яго прымета |
|---|---|---|---|
| Будова | назоўнік ці іншае слова ў значэнні назоўніка + прыметнік; займеннік + прыметнік; лічэбнік + назоўнік | дзеяслоў + назоўнік; дзеяслоў + займеннік, які падобны па форме да назоўніка | дзеяслоў + прыслоўе; дзеяслоў + дзеепрыслоўе; дзеяслоў + неазначальная форма дзеяслова |

**45.** Размяркуйце словазлучэнні ў групы паводле спосабу падпарадкавальнай сувязі (дапасаванне, прымыканне і кіраванне) і запішыце.

Памяркоўны чалавек, пісаць алоўкам, пакрыўдзіць нечакана, дзесьці расце, напісаная кніга, жаданне пабачыць мора, паспець да вечара, запаліць агонь.

● Гэтыя ж словазлучэнні размяркуйце ў дзве групы: а) са значэннем прыметы прадмета; б) са значэннем прыметы дзеяння.

**46.** Прачытайце верш. Выпішыце па два словазлучэнні з рознымі відамі сінтаксічных адносін паміж словамі.

ЛІСЦЕ

Восень прайшла пералескамі,
Па няголеным іржышчы ніў,
Чырвонымі арабескамі*
Лісце лесураніў.
Глянь на зямлю залатую,
Пяшчотную, сумную, чыстую,
Нехта па ёй вандруе,
Ў паветра ўзнімаючы лісце.
Медзь на азёрах ўсплывае,


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Сум у небе імглістым...
Як песня, з галін злятае
Лісце, лісце,
Залацістае лісце,
Сто лісцяў,
Дзесяць лісцяў,
Ліст.

*У. Караткевіч*

↑ Знайдзіце ў вершы вобразныя сродкі мовы.

↑ Назавіце словы з прыстаўнымі гукамі. Сфармулюйце правілы іх напісання.

**47.** Прачытайце тэкст. Вусна выдзеліце словазлучэнні. Назавіце галоўнае і залежнае словы. Вызначце сінтаксічныя адносіны паміж імі.

Добра было ясным днём на высокім беразе. Унізе цвырчэла вада ў рачулцы, на дрэвах ужо шмат дзе пракідалася жоўтае лісце. Яшчэ цвілі асеннія кветкі. На дубах спелі жалуды. Слаўна пахла грыбамі. Баравікі, сыраежкі і рыжыкі вылазілі з травы і з-пад лісця.

Пасля трэцяга ўрока ўся школа пайшла на высокі бераг пацешыцца з прыгажосці яснага неба, пазбіраць грыбоў, раскласці агонь на беразе рэчкі і, самае важнае, паглядзець буслоў. Гэта была найцікавейшая з’ява. *(К. Чорны)*

↑ Назавіце словы, у якіх адбылося чаргаванне зычных гукаў.

**48.** Выразна прачытайце верш. Выпішыце словазлучэнні з галоўным словам: а) назоўнікам; б) дзеясловам.

### БАБІНА ЛЕТА

Над густа-сінім возерам чарот
З прыходам восені шуміць тужліва.
Здаволена гумно на поўны рот
Глытае дар багатай, спелай нівы.
Як шэрань* на траве, палотнаў рад,
Ля хат вясёлыя гамоняць людзі,
Кабеты* ў садзе кормяць немаўлят,
Сад засаромеўся і стаў аж рудым.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Чароды на зялёных берагах
Апошняю гадуюцца травою,
І слівы сыта луснулі ў баках,
Аб'еўшыся і сонцам, і зямлёю.

*У. Караткевіч*

● Зрабіце марфемны разбор слоў *глытае, тужліва, засаромеўся, гадуюцца.*

**49.** Прачытайце словазлучэнні, вусна вызначце спосабы падпарадкавальнай сувязі слоў. Да якіх часцін мовы адносяцца ў пераважнай большасці галоўныя словы словазлучэнняў з рознымі спосабамі падпарадкавальнай сувязі?

Летняя раніца, нізка над зямлёю, заўтра ўвечары, радасны дзень, матчына песня, дзесятая зіма, напісаць брату, халодная ад расы, маляваць карціну, вельмі шанаваў, просьба застацца, моцны духам, чырвоныя кветкі, усе вучні, будынак школы, дом насупраць, будаваць метро, сёмы дом, уменне пераконваць, сівыя хмары.

**50.** Прачытайце верш. Вусна вызначце, якім спосабам сувязі звязаны словы ў словазлучэннях: дапасаваннем, кіраваннем ці прымыканнем. Вызначце сінтаксічныя адносіны паміж словамі ў гэтых словазлучэннях.

Не абміні чужой бяды,
Сабой не надта ганарыся,
Няхай спяшаюцца гады,
А ты вазьмі і прыпыніся.
Слабому працягні руку,
Сляпому пакажы дарогу,
Падай акраец жабраку,
Суцеш малога і старога.
Тады і познюю зіму
Усмешкай стрэнеш маладою
І не прыйдзецца аднаму
Застацца са сваёй бядою.

*С. Грахоўскі*

**51.** Падбярыце і запішыце словазлучэнні, у якіх залежныя словы абазначаюць прыметы прадметаў. Вызначце сінтаксічныя адносіны паміж словамі ў гэтых словазлучэннях.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

У з о р. *Падманлівая ўсмешка* — прымета па якасці; *другі матч* — прымета па парадку, паслядоўнасці; *аўтамабіль з прычэпам* — прымета па адносінах да іншага прадмета.

**52.** Складзіце словазлучэнні з галоўным словам *гаварыць,* каб выражаліся значэнні: валодаць мовай, размаўляць, выражаць думкі, пачуцці, якасную характарыстыку. Звярніце ўвагу на тое, што ўсе словазлучэнні аб'ядноўваюцца па змесце значэннем дзеяння (працэсу гаварэння).

**53.** Прыдумайце і запішыце словазлучэнні з дзеясловамі, якія выражаюць думку, маўленне, успрыманне.

У з о р. *Ведаць — ведаць праўду, слухаць — слухаць музыку.*

Помніць, бачыць, глядзець, успамінаць, папярэджваць, усведамляць, думаць, пытацца.

Словазлучэнні, розныя па сваёй будове, але блізкія па граматычных значэннях і сінтаксічных адносінах паміж словамі, называюцца сінанімічнымі: *кніга брата — братава кніга.*

**54.** Прачытайце тэкст. Якія словазлучэнні называюцца сінанімічнымі? Якія сінтаксічныя адносіны могуць устанаўлівацца паміж словамі ў свабодных словазлучэннях?

У сучаснай беларускай мове сінанімічныя адносіны часта адзначаюцца ў свабодных словазлучэннях, кампаненты якіх звязваюцца кіраваннем або прымыканнем. Паколькі словазлучэнне — гэта аб'яднанне двух ці больш самастойных слоў, звязаных падпарадкавальнай сувяззю, заканамерна, што сінаніміка словазлучэнняў заснавана на лексіка-граматычных значэннях залежнага слова (з прыназоўнікам ці без яго): *ветлівы з гасцямі — ветлівы да гасцей, чулы з дзецьмі — чулы да дзяцей, дачакацца раніцы — дачакацца да раніцы* і інш. Сінанімічныя адносіны ўстанаўліваюцца паміж свабоднымі словазлучэннямі з рознымі відамі сінтаксічных адносін, напрыклад: з аб'ектнымі *(перабегчы дарогу — перабегчы праз дарогу),* з часавымі *(прыехаць летам — прыехаць улетку),* з прычыннымі *(смяяцца з радасці — смяяцца ад радасці),* з адносінамі мэты *(пайсці ў грыбы — пайсці*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

*па грыбы*), з прасторавымі (*стаяць паміж дрэвамі — стаяць між дрэў*) і інш.

Багацце і разнастайнасць сінанімічных сродкаў — паказчык высокай ступені развітасці беларускай літаратурнай мовы, выкарыстанне іх робіць мову багатай, выразнай, шматфарбнай. (*М. Кныш*)

**55.** Спішыце. У сінанімічных словазлучэннях падкрэсліце галоўныя словы, вызначце спосаб сувязі і характар сінтаксічных адносін паміж кампанентамі.

1. Дзіцячыя гульні — гульні дзяцей.
2. Адпачынак на месяц — месячны адпачынак.
3. Школа ў вёсцы — вясковая школа.
4. Прыехаць адпачываць — прыехаць на адпачынак.
5. Рабочае месца — месца для работы.

**56.** Падбярыце да словазлучэнняў сінанімічныя, у якіх словы звязаны спосабам кіравання. Запішыце.

Узор. *Асінавае лісце — лісце асіны.*

Матчыны клопаты, сонечная ўсмешка, драматычны тэатр, сардэчныя сасуды, залаты гадзіннік, чалавечае жыццё, скураная куртка, салаўіныя песні, вячэрні змрок, мінскія трактары, пасажырскі цягнік, вясковая дарога, святочны падарунак.

**57.** Да словазлучэнняў падбярыце сінанімічныя. Вызначце спосаб сінтаксічнай сувязі ў дадзеных словазлучэннях і тых, што атрымаліся. Запішыце.

Узор. *Кніга з ілюстрацыямі (кіраванне) — ілюстраваная кніга (дапасаванне).*

Хлопчык з вёскі, машына для ўборкі бульбы, дзяўчына з чорнымі вачыма, любоў маці, шафа для кніг, варэнне з вішні, размова па-англійску, кніжка для запісаў, кашуля з ільну.

- Вызначце разрад прыметнікаў у запісаных вамі словазлучэннях.
- Растлумачце правапіс суфіксаў і канчаткаў прыналежных прыметнікаў.

**58.** Спішыце, раскрываючы дужкі. Вызначце: а) спосаб сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэннях; б) якімі часцінамі мовы выража-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

ны залежныя словы; в) сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі словазлучэнняў.

Вывучыў *(на)* памяць, віднеецца *(у)* гары, падалі *(з)* верху, з’яднаць *(на)* заўсёды, павярнуў *(у)* лева, *(аб)* садзіць дрэвамі, жыць *(па)* новаму, пісаць *(па)* англійску, прыходзіць *(што)* дзень, прыйсці *(па)* ціху, цёплая *(па)* летняму, прыйшоўшы *(у)* вечары, жылі *(па)* суседску.

**59.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стылёвую прыналежнасць.

Беларускай мове ўласцівы спецыфічныя асаблівасці ў будове словазлучэнняў. Так, азначэнні, уключаныя ў спалучэнне колькасных лічэбнікаў **два (абодва), дзве (абедзве), тры, чатыры** ў назоўным склоне і назоўніка, заўсёды ставяцца ў форме назоўнага склону множнага ліку: *два вучнёўскія сшыткі, тры прыгожыя малюнкі, абодва замежныя студэнты, чатыры драўляныя сталы.* Калі гэтыя лічэбнікі ўваходзяць у склад састаўных, то назоўнік пры іх таксама ставіцца ў форме назоўнага склону множнага ліку: *сто трыццаць два рублі, дваццаць тры аркушы.* У рускай мове ў такіх спалучэннях назоўнікі ўжываюцца ў форме роднага склону адзіночнага ліку: *два студента, три товарища, оба брата.*

Дзеясловы руху **(ісці, ляцець, бегчы, паслаць, ехаць, плысці)** з мэтавым значэннем спалучаюцца з назоўнікамі (займеннікамі) у форме вінавальнага склону з прыназоўнікамі **у** ці **па**: *пайсці ў грыбы, пайсці па ваду, паехаць па сена, паслаць па хлеб.* У рускай мове такім словазлучэнням адпавядаюць канструкцыі з формай творнага склону з прыназоўнікам **за:** *пойти за грибами, поехать за сеном.*

Дзеясловы **жартаваць, смяяцца, насміхацца, кпіць, здзекавацца, дзівіцца, цешыцца, глуміцца, пасмейвацца** ўжываюцца з назоўнікамі (займеннікамі) у форме роднага склону з прыназоўнікам **з**: *смяяцца з няўмекі, цешыцца з дзяўчынкі, здзекавацца з дармаеда, кпіць з гультая.* У рускай мове ў такіх словазлучэннях выкарыстоўваецца творны склон назоўніка (займенніка) з прыназоўнікам **над:** *смеяться над лентяем, издеваться над незнайкой.*

Дзеясловы **ажаніць, ажаніцца** ў беларускай мове ўжываюцца з прыназоўнікам **з** і назоўнікам (займеннікам) у форме творнага склону: *ажаніцца з Вераю* (рус.: *жениться на Вере*).



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Пры словах **хворы, хварэць** назоўнік (назва захворвання) ужываецца з прыназоўнікам **на:** *хворы на грып, хварэць на адзёр.*

Дзеясловы **дзякаваць, дараваць, выбачаць** утвараюць словазлучэнні з назоўнікам (займеннікам) у форме давальнага склону: *дзякаваць маме, дараваць брату, даруйце мне.*

*(Т. Тамашэвіч)*

● Раскажыце пра асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове. Адказ праілюструйце прыкладамі.

**60.** Знайдзіце і выпраўце моўныя памылкі ў кіраванні і дапасаванні. Запішыце выпраўленыя сказы.

1. Кожнаму хацелася пацiснуць руку высокага госця. 2. Тры высокіх спартсмена выйшлі з залы. 3. Выбачайце мяне, што так атрымалася. 4. Дзякуем вас за вялікую дапамогу. 5. У трох кіламетрах ад вёскі віднеўся лес. 6. Саша вышэйшы ўсіх у класе. 7. Настаўніца захварэла грыпам. 8. Вучня паслалі за журналам. 9. Гэтаму дубу не менш ста год. 10. Яго жанілі на суседцы. 11. Два летніх дні аднакласнікі правялі ў паходзе. 12. Хлопцы любілі гуляць па вечарам.

**61.** Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову. Абазначце ў іх галоўныя словы. Якімі часцінамі мовы яны выражаны?

Пойти за водой, поехать за врачом, сорок четыре рубля, смеяться над чудаком, извини меня, благодарить судьбу, пойти за грибами, поехать на мельницу, болеть корью, в двух шагах от школы, пять свежих яблок, сын похож на дедушку, два новых стола.

Сярод словазлучэнняў выдзяляюцца непадзельныя, якія выступаюць у ролі аднаго члена сказа: *некалькі кніг, шмат недахопаў, фігурнае катанне, некалькі вучняў, пятнаццаць хвілін, адзін з іх, малоць языком* і інш.: *На крутым беразе Дняпра стаяць тры дубы. Андрэй прачнуўся ў шэсць гадзін.*

**62.** Прыдумайце сказы з дадзенымі словазлучэннямі. Запішыце іх. Падкрэсліце непадзельныя словазлучэнні як члены сказа.

Старыя Дарогі, Далёкі Усход, ісці шпаркім крокам, спаць трывожным сном, змагацца да апошняй кроплі крыві, заданне асаблівай важнасці, сталь высокай цвёрдасці.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**63.** Прачытайце тэкст. Выпішыце выдзеленыя словазлучэнні і ахарактарызуйце: а) тып словазлучэння паводле марфалагічнага выражэння галоўнага слова; б) сінтаксічныя адносіны паміж словамі; в) спосаб падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэннях.

Позна **цямнее ўлетку.** Сонца ўжо схавалася, непрыкметна знікла зара, а ўсё яшчэ даволі светла. Толькі **колеры лесу,** палеткаў, бліжэйшага выгану нібы згусціліся, а далеч зацягнулася **лёгкай шызаватай смугою** і ад гэтага зрабілася сіняя. З Нёмана пацягнула прахалодай. Ціха вакол і прыгожа. Нават размаўляць уголас не хочацца, каб не парушыць **незвычайнай заспакоенасці** ў прыродзе. У народзе такі **перадвячэрні час** называюць шарай гадзінай. *(В. Вольскі)*

**64.** Прачытайце. Вызначце стыль тэкстаў. У кожным з іх выдзеліце апорныя словазлучэнні, карыстаючыся якімі перакажыце першы тэкст.

I. У беларускай літаратурнай мове ў адных выпадках напісанне адлюстроўвае вымаўленне *(галава, зямля, глыток, брызент),* а ў другіх вымаўленне не супадае з напісаннем. Напрыклад, вымаўляем [горат], [с’м’эх], [гарацк’і], [л’охка], [н’а бачыў], а пішам: *горад, смех, гарадскі, лёгка, не бачыў.* Пры напісанні і вымаўленні некаторых слоў дапускаецца варыянтнасць у межах нормы: *канешне* і *канечне, жаваранак* і *жаўранак, кафтан* і *каптан.*

Правільнае вымаўленне — істотны кампанент паняцця «культура мовы». Існуюць адзіныя, абавязковыя для ўсіх носьбітаў мовы нормы літаратурнага вымаўлення, якія, аднак, нярэдка парушаюцца па трох прычынах. Першая з іх — захаванне ў вымаўленні дыялектных рыс роднай гаворкі. *(І. Лепешаў)*

II. Усім, хто ўдзельнічае ў падрыхтоўцы вечара, неабходна сабрацца а 15 гадзіне ў актавай зале школы. Абавязкова пры сабе мець аловак і блакнот. Хто не зможа прыйсці ў вызначаны час, папярэдзьце аб гэтым арганізатара школы і класнага кіраўніка. Вечар плануецца правесці а 18 гадзіне 10 лістапада.

*Арганізацыйны камітэт.*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**65.** Прачытайце тэкст.

Прамінула некалькі стагоддзяў, на месцы Полацкага і Тураўскага княстваў утварылася Вялікае княства Літоўскае. Яно аб'яднала шматлікія дробныя княствы ў магутную Беларуска-Літоўскую дзяржаву. На захадзе яно разлягалася да Балтыйскага, а на поўдні да Чорнага мораў. У ім у розныя часы valадарылі вялікія князі — Міндоўг, Гедымін, Альгерд, Ягайла, Вітаўт. Сталіцаю Вялікага княства быў спачатку Наваградак (Навагрудак), а пасля — Вільня. Панавала ў княстве беларуская мова. На ёй выступалі з прамовамі, вялі перапіску, выдавалі законы, пісалі загады. Усе, ад князёў да простых сялян, размаўлялі на роднай мове.

Існавала Вялікае княства Літоўскае 400 год, з XIII па XVI стагоддзе.

У Вялікім княстве Літоўскім народ глыбока шанаваў праваслаўную веру. Будавалася шмат цэркваў. У адным невялікім Тураве іх налічвалася каля васьмідзесяці. Сярод вернікаў вылучаліся людзі з асаблівай набожнасцю, чысцінёй і беззаганнасцю. Яны станавіліся манахамі, жылі ў манастырах. Манастыры існавалі ў кожным княжацкім горадзе і ў аддаленых бязлюдных мясцінах. Сюды за настаўленнямі і духоўным суцяшэннем ішлі беларусы. У цэрквах і манастырах народ беларускі вучыўся дабру і святасці.

Заняпала і страціла сваю незалежнасць Вялікае княства Літоўскае, калі было аб'яднана з Польшчай. Праваслаўныя храмы і манастыры закрываліся іншаверцамі. Дзяржаваю пачаў кіраваць кароль. *(Паводле Л. Качанкі)*

- Адкажыце на наступныя пытанні:

1. Замест якіх княстваў утварылася Вялікае княства Літоўскае? Якую тэрыторыю яно займала? 2. Хто з князёў валадарыў у Вялікім княстве Літоўскім? 3. На якой мове размаўлялі ў княстве? 4. Колькі гадоў яно існавала? 5. Раскажыце, як народ шанаваў праваслаўную веру. 6. Калі адбыўся заняпад Вялікага княства Літоўскага?

- Вызначце стыль і тып тэксту.
- Запішыце прыкладны план тэксту.
- Знайдзіце ў тэксце апорныя словазлучэнні і па іх перакажыце тэкст, захоўваючы адпаведны стыль.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**66.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму і асноўную думку. Знайдзіце словазлучэнні, на якія прыпадае найбольшая сэнсавая нагрузка ў тэксце. Вусна зрабіце сінтаксічны разбор гэтых словазлучэнняў (з узорам разбору пазнаёмцеся ў дадатку да падручніка).

22 чэрвеня 1941 года... Досвітак... На Брэсцкую крэпасць і на горад Брэст абрушыўся агонь варожай артылерыі. З неба пасыпаліся бомбы. Але авалодаць крэпасцю з ходу ворагу не ўдалося. На кожным кроку гітлераўцам аказвалі жорсткае супраціўленне.

Мужна абаранялася Брэсцкая крэпасць. Яе нешматлікі гарнізон змагаўся да апошняга патрона. Нават ворагі не маглі не дзівіцца з мужнасці і гераізму абаронцаў крэпасці. Не хапала боепрыпасаў, не было чаго есці, не было вады.

Знясіленыя ранамі, голадам і смагай, героі Брэсцкай крэпасці змагаліся да апошняга дыхання. *(Паводле В. Вольскага)*

## *Кантрольныя пытанні і заданні*

1. Які раздзел граматыкі называецца сінтаксісам?
2. Што называецца пунктуацыяй?
3. Чым адрозніваецца словазлучэнне ад сказа? ад іншых спалучэнняў слоў у сказе?
4. Раскажыце пра будову словазлучэнняў. Прывядзіце прыклады.
5. Што вы ведаеце пра граматычнае значэнне словазлучэнняў і сінтаксічныя адносіны паміж словамі ў іх?
6. Які спосаб падпарадкавальнай сувязі называецца дапасаваннем? кіраваннем? прымыканнем?
7. Чым адрозніваюцца свабодныя і несвабодныя словазлучэнні?
8. Прывядзіце прыклады непадзельных словазлучэнняў.
9. Раскажыце пра асаблівасці кіравання і дапасавання ў беларускай мове.
10. У мове шмат мнагазначных слоў. У словазлучэнні, у сказе слова ўжываецца ў адным са значэнняў: *трымацца за дрэва* (ухапіцца за дрэва), *трымацца так і далей* (весці сябе пэўным чынам), *трымацца правага боку* (рухацца ў вызначаным напрамку). Складзіце словазлучэнні са словамі *перавесці, падняць, праца,* ужываючы іх у розных значэннях. Зрабіце сінтаксічны разбор словазлучэнняў.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

# СКАЗ

## § 13. Агульнае паняцце аб простым сказе

**67.** Прачытайце тэкст. Звярніце ўвагу на сказы з аднаго слова, з двух слоў. Якая іх функцыя ў тэксце?

Навокал лес. Гушчарнік. Калматыя елкі. Выносістыя, жаўтлявыя пад вяршыняю, нібы свечкі, прамыя сосны... Ціха. Белая завея ўгаманілася. У такі час хочацца думаць. Пра што? Ці не ўсё адно для гэтых прыгажунь-сосен і гардынь-елак? Ім, такім зацятым у сваёй веліччы і ўладарнасці, мабыць, няма клопату, што побач чалавек... *(С. Кухараў)*

● Знайдзіце ў тэксце сказы, у якіх паведамляецца аб думках і пачуццях, выражаецца пытанне або пабуджэнне. Ці аднолькавая інтанацыя ў сказах?

С к а з — асноўная сінтаксічная адзінка, якая служыць сродкам фарміравання, выражэння і паведамлення думкі.

С к а з, у адрозненне ад словазлучэння, з'яўляецца камунікатыўнай адзінкай, у якой заключаецца паведамленне пра факты рэчаіснасці і якая служыць асноўнай адзінкай абмену думкамі паміж людзьмі. Напрыклад: *у небе звінелі* і *У небе звінелі жаваранкі.* (Я. Колас) У словазлучэнні *ў небе звінелі* названы дзеянне і яго месца, але паведамлення ў ім няма. *У небе звінелі жаваранкі* — сказ, які дае поўную інфармацыю, паведамленне пра факт рэчаіснасці, у ім выражаецца закончаная думка.

Паведамленне можа выражацца як рэальны факт, што адбываецца, адбываўся ці будзе адбывацца: *Збываюцца ў жыцці запаветныя мары. Збываліся ў жыцці запаветныя мары. Збудуцца ў жыцці запаветныя мары.*

Паведамленне можа быць і нерэальным, г. зн. выражаць магчымае, немагчымае, пажаданае, неабходнае: *Прыйсці б у час.* (У. Караткевіч) *Нельга адмахнуцца ад людской бяды.* (П. Галавач) *Нам неабходны мір ва ўсім свеце.* («Звязда»)



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

С к а з характарызуецца і інтанацыйнай афармленасцю. Інтанацыя паведамлення, пытання, пабуджэння надае выказванню сэнсавую закончанасць: *Прачытаў кнігу. Прачытаў кнігу? Прачытаў кнігу!*

**68.** Прачытайце тэкст. Вызначце граматычную аснову сказаў 1-га, 2-га і 3-га абзацаў. Карыстаючыся прыкладамі з гэтага тэксту, раскажыце, што вы ведаеце аб простым сказе.

Аднойчы ўлетку з'явіўся ў Пінск атрад нейкіх дзіўных воінаў. Выгляд у іх быў незвычайны. Апрануты і ўзброены былі зусім не так, як мясцовыя жыхары.

Невядомыя людзі называліся пасланцамі вялікага хана. Вялікую бяду прынеслі ханскія воіны. Пачалі паліць гарады і вёскі, людзей забіваць без літасці, шмат жанчын і дзяцей прадалі ў няволю.

«Ці не лепш, сапраўды, здаць чужынцам горад без бою? — думаў князь. — Інакш знішчаць яны ўсіх людзей, усё вакол спаляць, нікога не пашкадуюць».

Была ў князя маладая дачка — прыгожая, смелая і да людзей справядлівая. Любілі яе за гэта простыя людзі. Даведалася князёўна, што задумаў князь падпарадкавацца ворагам.

І яна сама паслала ганцоў, каб узняць народ супраць ханскіх заваёўнікаў.

І пайшлі да Пінска людзі з усіх бакоў. Прыйшлі з Турава, з Давыд-Гарадка, з усіх ваколіц. Хто мячом узброіўся, а хто касу ці сякеру ўзяў.

На світанні сышліся на раўніне пінчане з мангола-татарскай ардой. Храпуць коні, скрыгочуць мячы, свішчуць стрэлы. І не вытрымала войска пінскага князя, пахіснулася пад націскам ханскіх заваёўнікаў.

Тады наперад выбегла князёўна. Убачылі пінскія людзі адну бяззбройную дзяўчыну, апамяталіся і смела кінуліся за ёю на ворагаў. Сякуць, колюць лютых чужынцаў. Павярнулі мангола-татары коней і наўцёкі. Толькі нямногім удалося выратавацца. Сам хан, які стаяў на чале гэтага войска, быў забіты.

Пазней на тым месцы, дзе адбылася бітва, вырас гарадок. Яму далі назву Целяханы ад слоў *цела хана*, бо якраз


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

тут, як гаворыцца ў паданні, быў пахаваны хан. *(Паводле В. Вольскага)*

Раскажыце, якія паданні аб паходжанні назваў населеных пунктаў вы ведаеце.

Падрыхтуйце вусны пераказ тэксту.

**69.** Прачытайце. Вызначце стыль і тып тэксту. Раскажыце, пра што вы даведаліся з прачытанага. Складзіце план паведамлення.

Сказ мае граматычную аснову, якая складаецца з двух галоўных членаў — дзейніка і выказніка або аднаго галоўнага члена сказа — дзейніка ці выказніка. Напрыклад: *Ён падрыхтаваў* пераказ. *Падрыхтавалі* пераказ. Кожны з галоўных членаў сказа можа мець залежныя словы, якія называюцца даданымі членамі сказа.

Сказы могуць быць простыя і складаныя. Простыя складаюцца з адной граматычнай асновы (дзейніка і выказніка або дзейніка ці выказніка). Напрыклад: Мая *маці працуе* ў школе. Складаныя сказы маюць у сваім складзе дзве ці некалькі граматычных асноў. Напрыклад: Мая *маці працуе* ў школе, і *яна любіць* сваю працу.

**70.** Параўнайце азначэнні дзейніка і выказніка. Знайдзіце ў іх агульнае і тое, чым яны адрозніваюцца.

Дзейнік — галоўны член сказа, які абазначае прадмет думкі, аб якім нешта сцвярджаецца ці адмаўляецца ў выказніку.

Выказнік — носьбіт прыметы (дзеяння, стану, якасці, уласцівасці), якая абазначаецца дзейнікам.

## § 14. Тыпы сказаў па мэце выказвання

Па мэце выказвання сказы падзяляюцца на апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя: *Тонкія галінкі дробным прадаўгаватым лісцем слаліся па купіне.* (Л. Дайнека) *Ну, як ты?* (В. Быкаў) *Няхай жыве, як сонца, вечная паэзія!* (Я. Брыль)

Паводле інтанацыйнага афармлення выдзяляюцца сказы клічныя і няклічныя: *Беларусь, Беларусь — гэта ты паліш думку маю, як агнём!* (У. Жылка)


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Выказанае ў сказе паведамленне можа адлюстроўваць рэальную рэчаіснасць або нешта пажаданае ці магчымае пры пэўных умовах. Калі ў сказе паведамляецца пра нешта рэальнае, г. зн. такое, якое сапраўды было, ёсць ці будзе, то выказнік выражаецца дзеясловам абвеснага ладу прошлага, цяперашняга ці будучага часу: *Ён падрыхтаваў (рыхтуе, падрыхтуе) пераказ.*

Калі ў сказе паведамляецца пра нешта пажаданае ці магчымае пры пэўных умовах, то выказнік выражаецца дзеясловам загаднага ці ўмоўнага ладу. *Хай бы ён падрыхтаваў пераказ. Ён падрыхтаваў бы пераказ, каб папрацаваў над тэкстам як належыць.*

**71.** Прачытайце. Вызначце стыль і галоўную думку тэксту. Пастаўце да яго пытанні і пісьмова адкажыце на іх.

Сказы па характары выражаных у іх адносін да рэчаіснасці падзяляюцца на сцвярджальныя і адмоўныя. У сцвярджальных сказах сцвярджаецца тое, што выказваецца адносна прадмета маўлення: *Нацыянальная мова — гэта мова, якая з'яўляецца сродкам пісьмовых і вусных зносін нацыі.* («Беларуская мова. Энцыклапедыя») У адмоўных сказах адмаўляецца тое, што выражана выказнікам або якім-небудзь іншым членам сказа: *Васіль не стрымаў усмешкі.* (І. Шамякін) *Прыпяці, схаванай гурбамі, адсюль яшчэ не было відаць.* (І. Мележ) *Кветцы завяўшай зноў не цвісці.* (Я. Купала)

Асаблівасцю адмоўных сказаў з'яўляецца ўжыванне розных адмоўных слоў, якія з'яўляюцца фармальнымі паказчыкамі гэтых сказаў: *Вучні не размаўляюць на ўроку. На ўроку няма размоў.*

Сцвярджальныя сказы не маюць якіх-небудзь спецыяльных сродкаў выражэння сцвярджальнасці, таму ўсе сказы, якія не маюць адмоўных слоў, успрымаюцца як сцвярджальныя.

**72.** Прачытайце тэксты ўголас. У канцы кожнага сказа паніжайце голас і рабіце прыпынак — паўзу.

I. Ноччу на зямлю вярнуўся прымаразак. Ён прыпудрыў леташнюю траву, зашкліў лужынкі, падмаладзіў сонца. Усё зрабілася святочным і наўздзіў радасным. *(Я. Пархута)*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

II. На сонечным узлеску
Апошні снег растаў.
Вясёлыя пралескі
Зірнулі з-пад куста.
Празрыста ззяюць вочы,
Нібы блакіт нябёс.
Халоднай весняй ноччу
Іх не кране мароз.

*М. Хведаровіч*

● Колькі сказаў у кожным тэксце? Чым сказы адрозніваюцца адзін ад аднаго? Ахарактарызуйце сказы па мэце выказвання.
● Як вы разумееце значэнне выразу *наўздзіў радасны?*

**73**. Прачытайце сказы з павышэннем голасу на выдзеленых словах. Якую ролю адыгрывае інтанацыя ў выказваннях?

1. **Маленькі** хлопчык заблудзіўся ў лесе. Маленькі **хлопчык** заблудзіўся ў лесе? Маленькі хлопчык **заблудзіўся** ў лесе! Маленькі хлопчык заблудзіўся **ў лесе?**
2. **Кот** выскачыў праз акно ў двор? Кот **выскачыў** праз акно ў двор? Кот выскачыў **праз акно** ў двор? Кот выскачыў праз акно **ў двор?**
3. **Алесь** пераехаў у горад на вучобу? Алесь **пераехаў** у горад на вучобу? Алесь пераехаў **у горад** на вучобу? Алесь пераехаў у горад **на вучобу?**

**74.** Выразна прачытайце вершы. Назавіце словы, якія вымаўляюцца з павышэннем тону. Якія тыпы сказаў па мэце выказвання ўжытыя ў вершах? Абгрунтуйце сваю думку.

I. Добры дзень, суседзі!
Будзем век сябрамі.
Добры дзень, суседкі!
Светлая зіма...

*П. Панчанка*

II. Не гасіце агнёў! Хай гараць
весялей,
Хай палаюць іскрыста ў цьме
ночы.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Не гасіце агнёў! Хай праменні
ясней
Асвятляюць праспаныя
вочы!..

*А. Гурло*

III. Колькі шуму, колькі смеху,
Дзеда вылепілі з снегу!

*Н. Гілевіч*

● Назавіце словы ветлівасці. Прыдумайце з імі клічныя сказы.

**75.** Прачытайце тэкст, захоўваючы патрэбную інтанацыю. Вызначце тыпы сказаў па мэце выказвання, па адносінах да зместу выказвання і па інтанацыі.

Я ішоў да возера, але разгубіўся: якою сцяжынкаю пададцца?

— А тут усе вядуць на Свіцязь! — пачулася нечакана глухавата, як з-пад зямлі. — Ступай, як хочаш!

Праз хвіліну Лесавік-праваднік зноў загаварыў пра сваё:

— Наша Свіцязь — усім азёрам возера. Уяві сабе ланцуг узвышшаў. А на адным з хрыбтоў таго ланцуга — круглае люстра вады. Ва ўпадзіне. Наўкола — лес. І дрэвы навіссю над тым люстрам. Вада чысцюткая. А дно — белае. Толькі сям-там плёсы рэдкім чаротам засеяны. Уявіў? Ну вось гэта будзе Свіцязь.

...Раптам бор расступіўся, і ля нашых ног нечакана ўзнікла вада.

— Свіцязь! — нібы робячы самае важнае ў жыцці адкрыццё, радасна ўскрыкнуў Лесавік.

Свіцязь ляжала перад намі адкрыта, даверліва і спакойна. У надвячоркавай цішыні ледзь-ледзь чутна шамацелі блізкія чараты. Паволі гайдалася і закалыхвала сябе возера. Надыходзіў вечар. І ўсё рыхтавалася да спачыну — і вада, і зямля; не трэсне сучок у бары, не ўсплёсне рыбіна ў возеры.

*(Паводле Я. Пархуты)*

● Вызначце і назавіце сказы паводле інтанацыі (клічныя і няклічныя).

**76.** Складзіце тэкст пра любімае возера (рэчку) вашай мясцовасці, ужываючы розныя па мэце выказвання тыпы сказаў.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**77.** Спішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў канцы сказаў. Растлумачце іх пастаноўку.

1. Што ж мне можа быць больш за Радзіму любімую міла *(П. Панчанка)* 2. Пакіньце на беразе смутак і жаль, песню бярыце з сабою *(Н. Гілевіч)* 3. Матчыны рукі ніколі не чуюць цяжару свайго дзіцяці *(Р. Сабаленка)* 4. — А хто там ідзе, а хто там ідзе ў агромністай такой грамадзе — Беларусы *(Я. Купала)* 5. Хай свята дружбы будзе вечным святам *(Г. Бураўкін)* 6. І дзе на свеце ёсць такая, як Нёман, рэчанька другая *(Я. Колас)* 7. Хай мір жыве, хай для дзяцей век сонца над зямлёю свеціць *(М. Танк)*

**78.** Прачытайце клічныя сказы, захоўваючы правільную інтанацыю.

1. Навечна будзь благаславёны, запрацаваны ў поце хлеб, не квашаны і не салёны, для важных спечаны патрэб! *(П. Глебка)* 2. Слава бацькаўшчыне нашай і яе народам! *(Я. Купала)* 3. Якія знаёмыя назвы і словы, якая цудоўная родная мова! *(П. Панчанка)* 4. Якія тут цудоўныя краявіды! *(А. Вольскі)* 5. Эх, як прывольны прасторы наднямонскіх лугоў! *(Я. Колас)* 6. О, дзядзька спосабаў меў многа даняць працаўніка малога! *(Я. Колас)*

**79.** Складзіце тэкст выкарыстоўваючы прапанаваныя сказы, спалучэнні слоў. Дайце яму загаловак. Вызначце тыпы складзеных вамі сказаў паводле мэты і адносін да зместу выказвання.

Грэе сонца, не змаўкае спеў птушак, бачылі яшчэ не ўсе, вельмі цікава, не мог не любавацца, нельга не ўлічыць, як не расказаць, ці не пайсці, як не думаць.

## § 15. Лагічны націск. Парадак слоў у сказе

У вусным маўленні найбольш важнае па сэнсе слова гучыць больш моцна, выдзяляецца голасам — ***лагічным націскам.***

Лагічным націскам можна выдзяляць у сказе любое самастойнае слова. Напрыклад, у сказе *Ён падрыхтаваў перараказ* лагічны націск можна паставіць на любым слове ў залежнасці ад таго, што патрэбна падкрэсліць, на чым


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

трэба зрабіць акцэнт. Калі неабходна паведаміць, **хто** выканаў дзеянне, то лагічны націск патрэбна паставіць на слове *ён: Ён* (а не нехта іншы) *падрыхтаваў пераказ.*

Калі неабходна паведаміць, **што** ён падрыхтаваў, то патрэбна выдзеліць слова *пераказ,* каб паказаць, што падрыхтаваны менавіта пераказ (а не сачыненне ці нешта іншае).

Словы ў сказах могуць займаць рознае месца ў залежнасці ад сэнсу. Парадак слоў у сказе можа супадаць з парадкам слоў у словазлучэннях, а можа і не супадаць, г. зн. быць прамым або адваротным. Сказы, у якіх дзейнік папярэднічае выказніку, маюць прамы парадак слоў: *Чайкі гуляюць над люстранай вадою, пікіруючы на спажыву, або садзяцца на вільготны, вылізаны прылівам пясок.* (Я. Брыль) Пры адваротным парадку слоў выказнік стаіць перад дзейнікам: *Прыгожым стаіць лес за вёскай.*

Пры прамым парадку дапаўненне і недапасаванае азначэнне стаяць пасля слова, да якога адносяцца, дапасаванае азначэнне — перад азначаемым словам, акалічнасці — як перад выказнікам, так і пасля яго (акрамя акалічнасцей, выражаных якасным прыслоўем на **-а, -о,** якія заўсёды стаяць перад выказнікам): *Снегавыя хмары нізка звісалі над зямлёю.*

Пры адваротным парадку сэнсава важнае слова вымаўляецца больш выразна, з большай сілай голасу. Адваротны парадак слоў называецца ***інверсіяй.***

Парадак слоў у сказе можа мець як сінтаксічнае, так і стылістычнае значэнне. Параўн.: *Мінск — сталіца Беларусі* і *Сталіца Беларусі — Мінск.* У выніку змянення парадку слоў змянілася і іх сінтаксічная функцыя. У наступных прыкладах адбываецца ўзмацненне сэнсавай нагрузкі слоў пры захаванні іх сінтаксічнай ролі: *Школьнікі любяць вандраваць* і *Любяць школьнікі вандраваць. Гэта была вясёлая і шчаслівая ўсмешка* і *Гэта была ўсмешка вясёлая і шчаслівая.* У першай пары сказаў павялічылася сэнсавая нагрузка выказніка *(любяць),* а ў другой — азначэнняў *(вясёлая і шчаслівая).*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**80.** Прачытайце сказы, выдзяляючы па чарзе лагічным націскам кожнае слова. Паразважайце, як змяняецца сэнсавае адценне сказаў.

1. У лесе пяюць птушкі. 2. Гэта мой падручнік. 3. Дзе ты ўчора быў? 4. Я прачытаў гэтую кнігу. 5. Сёння пойдзе дождж. 6. Заўтра будзе сонечнае надвор'е.

**81.** Прачытайце тэкст. Прааналізуйце парадак слоў у сказах. Зрабіце вывад, які парадак — прамы ці адваротны — пераважае ў тэксце. Якія асаблівасці маюць сказы з адваротным парадкам слоў?

Чорная хмара сунецца памаленьку, ахінае ўвесь небакрай на захадзе. Лес, што сіняй палоскай віднееецца на даляглядзе, растае ў гэтым заўчасным змроку. Нібы насоўваецца ноч. Набліжаецца штосьці грознае, перасталі шапацець бярозы, пацямнела вада ў рэчцы, духата ў паветры зрабілася густая, застылая. І вось гэту анямелую цішыню раз-пораз пачалі калаціць грымоты. Далёкія, цяжкія, яны чуваць мацней і мацней. Часцей бліскае маланка. У яе палахлівым бляску відны контуры хмар, закругленыя і вострыя, як вяршыні гор. Успыхне бліскавіца, асвеціць залацістыя краі воблакаў — і зноў змрок... Праз нейкі час паветра і зямлю ўскалыхне выбух. *(І. Грамовіч)*

● Вызначце сказы, якія выражаюць галоўны сэнс тэксту, і тыя, якія іх паясняюць.

**82.** Прачытайце. Замяніце сказы з прамым парадкам слоў на сказы з адваротным парадкам. Ці змяніўся сэнс выказвання? Запішыце тэкст, раскрыйце дужкі, устаўце прапушчаныя літары.

Беглі дні, і *(па)* малу канчалася восень. Пачарнеў лес, скінуўшы на дол апошняе сваё залатое ўбранне, асірацелі голыя палеткі. З дня *(у)* дзень губляла блакітную празрыстасць неба і, усё часцей хмурнеючы, як бы ніжэй апускалася да зямлі. Ц*(?)*мянасцю пакрыліся ўсе яркія *(шмат)* каляровыя фарбы асенняй прыроды...

Але ўсё яшчэ сярод хмарных здараліся і пагодлівыя дзянькі, калі зямля, здавалася, на поўныя грудзі дыхала ц..плынёй, а навокал стаяла такая яснасць, што курлыканне адлётных журавоў чутно было ў небе на многія вёрсты.

*(У. Краўчанка)*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

- Вызначце і ахарактарызуйце стыль і тып тэксту.
- Зрабіце словаўтваральны аналіз слоў *хмурнеючы, празрыстасць, пагодлівыя, курлыканне.*

**83.** Перабудуйце сказы так, каб прыслоўі выражалі найбольш важнае паведамленне.

1. Прыемна глядзець на ўзыход сонца. 2. Мы ўважліва слухаем паведамленні пра сваіх землякоў. 3. Ветліва сустракалі гледачы любімых артыстаў. 4. Факты красамоўна сведчаць пра мінулае нашых продкаў.

**84.** Выразна прачытайце верш, захоўваючы правільную інтанацыю. Выберыце патрэбны тон, вызначце месцы кароткіх і доўгіх паўз. Назавіце словы, якія патрэбна выдзеліць лагічным націскам.

Той дзень прапаў і страчаны навекі,
Калі ты не зрабіў таго, што мог,
Калі не паспрыяў ты чалавеку,
Няшчыры быў, зманіў, не дапамог.
Той дзень збяднеў, зліняў на сотню радуг
І, попелам рассыпаны, сканаў,
Калі не падзяліў з суседам радасць
І больш за дзень узяў ты, чым аддаў.
Той дзень, лічы, завянуў пустацветам,
Калі ты пяць хвілін пашкадаваў,
Каб дзецям паказаць куточак свету
І хараство людзей, і дрэў, і траў.
Той дзень зусім закрэслены табою,
Калі ты раўнадушна абмінуў
Бяду чужую, пабаяўся болю,
Абразу хама моўчкі праглынуў...

*П. Панчанка*

- Адкажыце, як інтанацыя звязана з пунктуацыяй.
- Як у залежнасці ад інтанацыі змяняецца сэнс сказа?

**85.** Прачытайце тэкст, захоўваючы патрэбную інтанацыю. Вызначце стыль і тып тэксту. Прыдумайце загаловак.

Ляцела варона над рэчкай. Глядзіць — паўзе рак. Варона — хап яго і ўселася на галіне закусіць.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Бачыць рак, што прыйдзецца прапасці, і гаворыць:

— Эх, варона, варона, ведаў я твайго бацьку і тваю маці. Слаўныя былі птушкі.

— Угу! — адказала варона, не раскрываючы рот.

— І братоў, і сясцёр тваіх ведаў. Што за цудоўныя птушкі!

— Угу! — адказала зноў варона.

— Ды хоць цудоўныя яны былі птушкі, але ж далёка ім да цябе. Разумнейшага за цябе я нікога не бачыў.

Спадабалася вароне, як яе хваляць.

— Ага! — крыкнула яна на ўвесь рот, і ўпаў рак у ваду.

*(Казка)*

**86.** Прачытайце. Вызначце стыль і тып тэксту. Назавіце асаблівасці дадзенага стылю. З якога твора Кузьмы Чорнага ўзяты гэты ўрывак?

— Ты, Насця, вучышся? — запытаўся я, увайшоўшы за ёю ў дом.

— Я ўжо ў трэцім класе, — сказала яна.

— А я ўвосень буду ў першым, — не сцярпеў, каб не абазвацца, Толя. — А восень ужо скора.

— А я дык буду лётчыцай, — праспявала Надзька.

— А я такі, як наш тата, буду, — сказаў Толя. — Я калгаснікам буду.

— А ты, Насцечка, кім хочаш быць? Насцечка падумала і задуменна адказала:

— А я яшчэ не думала пра гэта.

Тут у гаворку ўмяшаўся Толя:

— А Насця раз казала, што яна хоча стаць доктарам.

**87**. Успомніце, як вы правялі летнія канікулы. На падставе сваіх успамінаў прыдумайце і запішыце дыялог з сябрам або сяброўкай аб гэтым часе.

**88.** Прачытайце тэкст. Пастарайцеся ўзнавіць па памяці яго змест.

На змярканні з-за лесу папаўзлі шызыя змрочныя хмары. Сваім шчыльным цяжарам яны зусім загрувасцілі неба, затулілі блішчастую шчыліну над касагорамі; стала пагрозліва, трывожна і сцюдзёна. Вецер з шалёнай восеньскай лютасцю абтрасаў бярозы над шляхам, церабіў, вымятаў



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

лісцвяны маладняк прысадаў, гнаў цераз чыгунку ў шэрую далеч шапатлівыя статкі лісця. Каламутная вада ў лужыне ад напору ветру аж выплёсквалася з дарогі і пырскала на ўзмежак сцюдзёнымі бруднымі кроплямі. *(В. Быкаў)*

- Вызначце тыпы сказаў па мэце выказвання.
- Назавіце стыль тэксту і яго асноўныя рысы.
- Ахарактарызуйце моўныя сродкі тэксту. Ці адпавядаюць яны той задачы, якая стаяла перад аўтарам?

**89.** Падзяліце дэфармаваны тэкст на сказы і абазначце іх межы. Спішыце. Пастаўце знакі прыпынку ў канцы сказаў. Прачытайце, захоўваючы правільную інтанацыю.

— Ты куды ляціш, такі напалоханы

— Ай, браток, не пытайся нейкага гада на карчы бачыў

— Калі дзе

— Паслухай дай, думаю, схаджу ў рыбу сам ведаеш, хочацца адпачыць, пасядзець спакойна закінуў я вуду, сяджу, значыцца, чакаю хоць бы клюнула аж ужо на сон пацягнула неяк выпадкова кінуў вока на корч а божачка ж з вады высоўваецца спачатку нос, а потым круглая мокрая галава, пакрытая зялёнай тванню карабкаецца на корч а хвост доўгі, прыплюснуты з бакоў гад і ўсё да сябе дайсці не магу да гэтага часу

— Дзівак, ты, Мікола гэта ж андатра была

— Андатра каб яе ваўкі, гэта ж трэба так напалохаць я ж раней яе ніколі не бачыў

- Адкажыце, дзе часцей за ўсё можна пачуць такую размову?
- Вызначце стыль тэксту. Назавіце яго асноўныя стылёвыя прыметы.
- Раскажыце пра цікавае здарэнне са свайго жыцця.

**90.** Напішыце пісьмо свайму сябру (сяброўцы) з просьбай выканаць якое-небудзь заданне.

**91.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Запішыце. Што новага вы даведаліся з прачытанага?

Великое княжество Литовское образовалось на территории Белоруссии в 1240 году со столицей в городе Новогрудке в результате мирного слияния древнебелорусских и литов-



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

ских княжеств. Государственным языком в Великом княжестве Литовском был старобелорусский язык вплоть до XVII века. Великое княжество Литовское считалось славянским не только по языку и культуре, но и по преобладанию славянского населения. Белорусский народ создал одно из самых демократических государственных образований в Европе. Он вместе с литовцами и украинцами в 1363 году под Синими Водами нанёс поражение татаро-монгольским ордам и на протяжении столетий успешно защищал свою свободу и независимость от завоевателей. *(Е. Ширяев)*

## Кантрольныя пытанні і заданні

**Варыянт 1**

1. Што называецца сказам?
2. Чым адрозніваецца словазлучэнне ад сказа?
3. Раскажыце пра будову сказа.
4. Назавіце тыпы сказаў па мэце выказвання, адносінах да зместу выказвання і інтанацыі.
5. Раскажыце пра парадак слоў у сказе.
6. Прывядзіце прыклады сказаў, у якіх парадак слоў выконвае функцыю: а) перадачы, праяснення сэнсу; б) стылістычную, надаючы сказу эмацыянальную афарбоўку; в) сінтаксічную (адрознівае члены сказа).

**Варыянт 2**

1. Назавіце асноўныя прыметы сказа.
2. Як класіфікуюцца сказы паводле мэты выказвання?
3. Якія бываюць тыпы сказаў па характары выказаных адносін да рэчаіснасці?
4. Чым адрозніваецца просты сказ ад складанага?
5. Якая роля лагічнага націску ў сказе?
6. Выдзеліце сэнсавы цэнтр сказа (самае важнае ў паведамленні слова), паставіўшы да яго пытанне: *Бабры будуюць хаткі.* Ці магчымыя варыянты ў вызначэнні сэнсавага цэнтра сказа?


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

# ПРОСТЫ СКАЗ. ДВУХСАСТАЎНЫЯ НЕРАЗВІТЫЯ СКАЗЫ

## § 16. Будова і ўжыванне двухсастаўных неразвітых сказаў

Галоўныя члены сказа могуць мець пры сабе паясняльныя словы або ўжывацца без такіх слоў. У залежнасці ад гэтага сказы падзяляюцца на развітыя і неразвітыя.

Сказ, які складаецца з галоўных (ці аднаго галоўнага члена) і даданых членаў, называецца **р а з в і т ы м**: *Весела свеціць вясновае сонца.*

Сказ, які складаецца толькі з галоўных членаў (ці аднаго галоўнага члена), называецца **н е р а з в і т ы м**: *Свеціць сонца. Раніца.*

**92.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. У кожным сказе знайдзіце і выпішыце граматычную аснову.

Я ўвесь быў захоплены хараством лесу. Быццам маленства маё вярнулася, і я зноў перажываю ўсё тое, што калісьці перажываў тут. Ад усяго жудаснага і цяжкага, што было ў маленстве, сціскалася маё сэрца. Ад усяго слаўнага, чым цешылася душа, павявала на мяне спакоем. Навокал мяне спявалі лясныя птушкі. Недалёка той час, калі яны будуць збірацца ў зімовы адлёт. Ціха было і спакойна пад стагоднімі хвоямі. Дзе-нідзе ў хвойніку пракідалася бяроза, часамі траплялася асіна. Дарога вывела мяне на прылесны поплаў, а вось там, за ім, знаёмыя клёны, і, нарэшце, павінен быў быць уезд у знаёмую вуліцу. *(Паводле К. Чорнага)*

**93.** З неразвітых сказаў утварыце развітыя. Скампануйце сказы ў тэкст. Запішыце. Прыдумайце загаловак.

Прыйшла вясна. Свеціць сонейка. Наступіла раніца. Сабраліся дзеці. Пайшлі ў паход. Віднеецца лес. Птушкі спяваюць. Дрэвы шумяць. Гарыць вогнішча. Дзеці адпачылі.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## § 17. Галоўныя і даданыя члены сказа

Члены сказа — гэта словы або спалучэнні слоў, якія ўваходзяць у склад сказа і выконваюць у ім пэўную сінтаксічную і сэнсавую ролю.

У сказе ўсе паўназначныя (знамянальныя) словы з'яўляюцца галоўнымі або даданымі членамі сказа.

Галоўныя члены (дзейнік і выказнік) выражаюць асноўны сэнс сказа і аб'ядноўваюць вакол сябе ўсе даданыя члены сказа на аснове розных спосабаў сувязі.

Даданыя члены сказа ўдакладняюць і тлумачаць тое, што выражана галоўнымі членамі. Даданымі членамі сказа з'яўляюцца *дапаўненне, азначэнне, акалічнасць.*

**94.** Прачытайце тэкст. Запішыце два сказы з другога абзаца, падкрэсліце галоўныя і даданыя члены і ўкажыце, якімі часцінамі мовы яны выражаны. Назавіце спецыфічныя рысы стылю, да якога адносіцца тэкст.

Пяць цывілізацый існуе сёння на Зямлі: заходняя, праваслаўная, ісламская, індуская і далёкаўсходняя. Беларускі народ належыць пераважна да праваслаўнай цывілізацыі, але ажно па гэты час зберагліся ў нашай культуры многія асаблівасці старажытнага міфалагічнага светапогляду. Нашы продкі ўмелі на здзіўленне паэтычна і вельмі дакладна, гарманічна зводзіць у адно свае назіранні над прыродай. Міф — гэта максімальна абагульнены вопыт, праяўлены праз сістэму вобразаў. Тут сплаўлена ў адно пазнанне і творчасць.

Міф — гэта з'ява сінтэтычная. У ім своеасабліва злучыліся элементы сапраўдных ведаў аб прыродзе, мастацкія вобразы, маральныя нормы і рэлігійныя ўяўленні. *(Т. Шамякіна)*

● Зрабіце марфалагічны разбор слоў *міф, належыць, народ, дакладна.*

## § 18. Дзейнік. Спосабы яго выражэння

Д з е й н і к — гэта галоўны член сказа, які абазначае прадмет думкі, з'яўляецца носьбітам прыметы, абазначанай выказнікам, і адказвае на пытанні **хто? што?**


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Звычайна дзейнік выражаецца назоўнікам або займеннікам з прадметным значэннем у форме назоўнага склону, паколькі абазначэнне прадмета ці ўказанне на прадмет з'яўляецца асноўным прызначэннем гэтых часцін мовы: *Бацька ў вольныя часіны расказваў дома ўсе навіны.* (Я. Колас) *Не, народа майго аніхто не сагне!* (П. Панчанка)

Дзейнік можа выражацца прыметнікам, дзеепрыметнікам, лічэбнікам і займеннікам, калі яны ўжываюцца ў ролі назоўніка і маюць прадметнае значэнне: *Вузкай сцяжынкай цераз поле ішоў незнаёмы.* (К. Чорны) *Перажытае ў тыя гады і цяпер жыве са мною.* (П. Панчанка) *Сямёра аднаго не чакаюць.* (Прыказка) *Кожны займаўся сваёй справай.* (П. Галавач)

Функцыю дзейніка можа выконваць неазначальная форма дзеяслова: *Жыць — Радзіме служыць.* (Прыказка)

Часам дзейнік выражаецца прыслоўем, выклічнікам і іншымі службовымі словамі, якія маюць прадметнае значэнне: *Настане лепшае заўтра. Разнеслася гучнае «ўра». Ці выконвае ролю часціцы і злучніка.*

Дзейнік можа быць выражаны ўстойлівым або сінтаксічна непадзельным словазлучэннем: *За акном віднеліся тры разгалістыя хвоі.* (М. Лынькоў)

**95.** Прачытайце верш. Вызначце яго асноўную думку. Знайдзіце ў тэксце дзейнікі. Чым яны выражаны?

Ходзяць у пары сонца і цень,
Радасць і смутак, любоў і нянавісць,
Сонца схаваецца — цень западзе,
Радасць знікае — сум крылы распravіць.
Толькі любоў і нянавісць чамусь
У сэрцы маім не ўміраюць ніколі...
Чым болей люблю я цябе, Беларусь,
Цемру і сум ненавіджу болей...

*А. Лойка*

● Назавіце назоўнікі, у якіх назіраецца несупадзенне ў родзе ў беларускай і рускай мовах. Дапоўніце пералік сваімі прыкладамі.
↑ Запішыце верш па памяці.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**96**. Спішыце. Знайдзіце ў сказах дзейнікі. Чым яны выражаны? Падкрэсліце дзейнікі, якія выражаны сінтаксічна непадзельнымі словазлучэннямі.

1. Дзяўчынка прытулілася да мацеры. *(К. Чорны)* 2. Кожны з нас прыпасае Радзімы куток... *(П. Панчанка)* 3. Усе любяць свой край. *(Я. Колас)* 4. Дзве бярозы шумяць пад акном. *(А. Астрэйка)* 5. Ласкава шапталіся верхавіны дрэў. *(Я. Маўр)* 6. Некалькі эшалонаў стаяла на рэйках. *(К. Чорны)*

**97**. Выпішыце сказы, у якіх дзейнік выражаны: а) словазлучэннем; б) словам, якое ўжыта ў ролі назоўніка.

1. Два матчы чэмпіянату краіны па футболе сярод каманд вышэйшай лігі адбыліся 5 красавіка. 2. Працяглае «А-а-а-й!» вырвалася з грудзей жанчыны... 3. Сорак тысяч берлінцаў з хваляваннем прымалі пасланцоў беларускага мастацтва. 4. Новае ў жыцці патрабуе і новых назваў. 5. Гэтае здарэнне яшчэ больш парадніла сем'і суседзяў. 6. Ішлі два сябры вечаровай парою і дзелавую размову вялі паміж сабою. 7. Усе тры мужчыны ехалі моўчкі.

**98**. З інфінітыва, ужытага ў ролі дзейніка, утварыце аддзеяслоўны назоўнік. Запішыце пары сказаў. Вызначце стылістычныя адрозненні гэтых варыянтаў.

Узор. *Курыць у вагоне забаронена. — Курэнне ў вагоне забаронена.*

1. Размаўляць з сябрамі вельмі цікава. 2. Гуляць у лесе надзвычай прыемна. 3. Чытаць лежачы шкодна. 4. Спрачацца з ім цяжка. 5. Пераказваць прачытанае пры вывучэнні замежнай мовы карысна.

**99**. Складзіце і запішыце сказы, каб дадзеныя словы і спалучэнні слоў былі дзейнікам. Вызначце спосабы выражэння дзейнікаў.

Белавежская пушча, мы, незнаёмы, многія вучні, некаторыя з нас, людзі, трэці з іх, пяты, усе яны, шмат рабочых.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## § 19. Тыпы выказнікаў і спосабы іх выражэння

В ы к а з н і к — гэта галоўны член сказа, які абазначае тое, што гаворыцца пра дзейнік.

Пры выражэнні дзеяння выказнік адказвае на пытанні **што робіць прадмет? што з ім робіцца?**: *Вішня расцвітае. Дом будуецца.*

Пры выражэнні якасці, стану прадмета выказнік адказвае на пытанні: **хто (што) ён такі (такое)? які ён?**: *Дзейнік — галоўны член сказа. Ноч зорная.*

***Простым дзеяслоўным выказнікам*** называецца выказнік, выражаны дзеясловам у форме абвеснага, умоўнага або загаднага ладу: *Сонца ўзыходзіць. Сад квітнеў бы. Разгорнем шырока магутныя плечы!* (Я. Колас) Просты выказнік можа ўскладняцца шляхам паўтарэння двух аднолькавых або блізкіх па значэнні слоў (ускладнены выказнік): *Пацяклі-паплылі за гадамі гады.* (Я. Купала)

***Састаўны дзеяслоўны выказнік*** складаецца з двух дзеясловаў: дапаможнага дзеяслова, які выражае граматычнае значэнне выказніка, і неазначальнай формы дзеяслова, якая выражае асноўнае лексічнае значэнне выказніка: *Ён пачаў працаваць. Ён хацеў працаваць.*

***Састаўны іменны выказнік*** складаецца з дзеяслова-звязкі, які выражае граматычнае значэнне выказніка, і іменнай часткі (назоўніка, прыметніка, лічэбніка, прыслоўя, займенніка, дзеепрыметніка), якая выражае яго асноўны сэнс: *Вецер быў цёплы. У нас кожны быў чацвёрты.* (М. Танк)

***Складаныя выказнікі*** ўключаюць тры ці больш кампаненты. Імі могуць быць асабовыя формы дзеясловаў, якія выступаюць звязкай, і некалькі інфінітываў: *Яны сабраліся з Сашай пайсці пагуляць за вёску, далей ад людскога вока.* (І. Шамякін)



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**100.** Разгледзьце табліцу. Дайце азначэнне выказніку кожнага тыпу, улічваючы яго будову.

| Выказнік | | | | |
|---|---|---|---|---|
| просты дзеяслоўны | састаўны дзеяслоўны | | састаўны іменны | |
| | дзеяслоў-звязка | дзеяслоўная частка | дзеяслоў-звязка | іменная частка |
| Абвесны лад: *прачытаў*<br>умоўны лад: *прачытаў бы*<br>загадны лад: *прачытай* | *пачаць*<br>*стаць*<br>*заканчваць*<br>*хацець*<br>*жадаць*<br>*магчы* | неазначальная форма дзеяслова | *быць*<br>*рабіцца*<br>*стаць*<br>*станавіцца*<br>*з'яўляцца*<br>*лічыцца*<br>*называцца* | прыметнік<br>назоўнік<br>займеннік<br>дзеепрыметнік<br>лічэбнік<br>прыслоўе<br>словазлучэнне |

**101.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце загаловак. Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце свае вывады. Выпішыце простыя дзеяслоўныя выказнікі. Вызначце, якімі формамі дзеяслова яны выражаны.

Ціхая ноч ляжала над Палессем.

Аднатонную песню вялі колы вагонаў. Бясконцы рой залатых іскраў выпускаў паравоз, агністаю палоскаю вызначаючы сабе дарогу. Ціха гулі і судрыгаліся балоты побач чыгункі, дзе бегла машына. Раскацiста і гучна грымелі салаўі: звону іх песень не маглі заглушыць грук і шум вагонных колаў. Месцамі ўзнімаўся белаваты туман і нерухома звісаў над маладымі асокамі, цёмнымі абрысамі разложыстых купчастых лазнякоў. І калі спынялася машына на станцыях і паўстанках і заціхаў шум поезда, з балот даносіліся хвалі незвычайна мяккіх зыкаў крахтання жаб. Нейкі невыразна маркотны і разам з тым прыемны гоман стаяў над балотамі, як бы яны апавядалі гэтай ціхай ночцы і гэтым людзям, што не спалі, адвечную скаргу сваю і смутак свой.

*(Я. Колас)*

- Зрабіце марфалагічны разбор дзеясловаў *грымелі, заціхаў*.
- Вызначце ўтваральныя асновы да слоў *белаваты, вызначаючы, невыразна*.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**102**. Спішыце. Падкрэсліце простыя дзеяслоўныя ўскладненыя і няўскладненыя выказнікі.

1. Людзі працаваць, а мы рукамі махаць. 2. Тут коннік скок у сядло. 3. Ён страляць не страляе, а стрэльбу трымае. 4. Я сядзеў-сядзеў, слухаў-слухаў. 5. Цяпер жанчына не магла стрымацца і дала поўную волю слязам.

**103.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў сказах выказнікі і вызначце іх тып.

У лесе было ціха і маркотна, толькі ўгары стаяў глухі шум старых хвой і ялін. Высокія асіны і бярозы далучалі зрэдку і свой голас да гэтага шуму, калі часам дужэй патыхаў сыры, халодны вецер і варушыў іх голае вецце. На гэтым месцы, дзе рос дуб, мала вызначылася прастору, і маладыя высокія елкі ўжо разгарнулі свае кашлатыя зялёныя лапы і занялі месца дуба. Так і за сталом жыцця, дзе сядзіць цесная людская сям'я, не пустуе месца выхвачанага смерцю сем'яніна. *(Я. Колас)*

- Вызначце межы частак у складаных сказах.
- Назавіце прыналежнасць слоў у першым сказе да пэўных часцін мовы.

↑ Як вымаўляецца злучнік ***і*** ў першым і другім сказах?

**104**. Перакладзіце тэкст з дапамогай «Русско-белорусского словаря». Падкрэсліце выказнікі, вызначце іх тып. Вусна замяніце ў трох-чатырох сказах простыя выказнікі на састаўныя.

За четверть часа до захождения солнца, весной, вы входите в рощу, с ружьём, без собаки. Вы отыскиваете себе место где-нибудь подле опушки, оглядываетесь, осматриваете пистон, перемигиваетесь с товарищем. Четверть часа прошло. Солнце село, но в лесу ещё светло; воздух чист и прозрачен, птицы болтливо лепечут; молодая трава блестит весёлым блеском изумруда... Вы ждёте. Внутренность леса постепенно темнеет; алый цвет вечерней зари медленно скользит по корням и стволам деревьев, поднимается выше и выше, переходит от нижних, почти ещё голых, веток к неподвижным, засыхающим верхушкам... Вот и самые верхушки потускнели, румяное небо синеет. В лесу всё темней да темней.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Деревья сливаются в большие чернеющие массы; на синем небе робко выступают первые звёздочки. *(И. Тургенев)*

- Вызначце тып тэксту.

## § 20. Некаторыя выпадкі дапасавання простага дзеяслоўнага выказніка да дзейніка

1. Калі дзейнік выражаны спалучэннем назоўнікаў (займеннікаў) у назоўным склоне, звязаных злучнікам ***і***, або спалучэннем назоўніка (займенніка) у назоўным склоне і назоўніка (займенніка) у творным склоне з прыназоўнікам ***з (са)*** і выражае значэнне сумеснасці, то выказнік ужываецца ў форме множнага ліку: *Алег і Саша пайшлі ў тэатр. Алег з Сашам пайшлі ў тэатр.*

У тых выпадках, калі дзейнікам з'яўляецца толькі назоўнік (займеннік) назоўнага склону, а назоўнік (займеннік) творнага склону абазначае суправаджальную асобу ці асоб, выказнік мае форму адзіночнага ліку. Такія сказы звычайна адрозніваюцца ад папярэдніх парадкам слоў і інтанацыяй: *Алег пайшоў у тэатр з Сашам. Алег з Сашам* (а не з сястрой) *пайшоў у тэатр.*

2. Пры дзейніку, выражаным спалучэннем колькаснага лічэбніка з назоўнікам, выказнік ставіцца ў форме множнага ліку: *Раней вызначанага тэрміну з заданнем справіліся тры вучні.* Калі падкрэсліваецца пасіўнасць дзеяння, то выказнік можа ўжывацца ў адзіночным ліку: *На стале ляжала два кускі хлеба.* (Ц. Гартны)

3. Калі дзейнік выражаны спалучэннем слоў ***большасць, мала, меншасць, многа, некалькі, нямала, нямнога, шмат*** з назоўнікам у родным склоне, то выказнік звычайна ўжываецца ў форме адзіночнага ліку: *Большасць вучняў справілася з заданнем.* Са словам ***некалькі*** дапускаецца ўжыванне выказніка ў форме множнага ліку, асабліва калі дзейнік абазначае асоб: *Некалькі вучняў выканалі заданне раней вызначанага тэрміну.*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

4. Калі дзейнік выражаны спалучэннем зборнага лічэбніка з назоўнікам, то выказнік ужываецца ў форме адзіночнага ліку: *На прыпынку стаяла трое чалавек.*

Часцей за ўсё граматычныя значэнні дзейніка і выказніка супадаюць. Выбар формы роду, ліку, асобы залежыць ад канкрэтных значэнняў дзейніка і выказніка, г. зн. існуе сэнсавая сувязь паміж дзейнікам і выказнікам: *Доктар паехала* або *Доктар паехаў* — варыянт напісання выбіраецца з улікам рэальнага мужчынскага або жаночага роду.

**105.** Спішыце сказы, раскрываючы дужкі. Падкрэсліце галоўныя члены сказа. Вызначце, у якіх граматычных формах дапасуецца выказнік да дзейніка.

1. Чалавек *(жыць)* дзеля дабра, для *(служыць)* праўдзе. *(Я. Колас)* 2. Нешта *(трэснуць)* у лесе, і сябры адначасова глянулі *(у)* бок, у гушчыню. *(І. Навуменка)* 3. З дваццаці ў нашу вёску цэлымі *(вярнуцца)* толькі трое. *(Р. Няхай)* 4. Маладзіком пабеленыя і сівізной двое *(ісці)* па беразе сцежкай адной. *(П. Макаль)* 5. Але ніхто з дзяцей *(не любіць)* так бор з яго ваколіцамі, як Алёша. *(А. Якімовіч)* 6. Малец з Ярошкам ад цямна да цямна *(сядзець)* у бібліятэцы. *(У. Дамашэвіч)* 7. Узгорак з рутамі *(быць)* акутаны таямнічасцю не для аднаго Уладзіка. *(Т. Хадкевіч)*

**106.** Прачытайце тэкст. Спішыце. Замест кропак устаўце прапушчаныя простыя дзеяслоўныя выказнікі. Адкажыце, калі просты дзеяслоўны выказнік дапасуецца да дзейніка ў ліку і асобе. Прывядзіце прыклады з тэксту.

Тым часам ... лета. ... ліпеньскія і жнівеньскія навальніцы, гучна адспяваўшы песню лету. Дзень за днём ... палі. Людзі ўжо ... познія пасевы ярыны. Прасторы зямлі нібы ... ў межах і таілі ў сабе нейкую неакрэсленую і нявыказаную сумоту. ... разнастайныя птушыныя песні. Адны толькі дружныя, вясёлыя шпакі ... ў велічэзныя гурты, ... над палямі, то ў густыя, чорныя кучы, то ў паветры празрыстымі сеткамі. Старыя шпакі, відавочна, ... маладых у лятанні, каб ... іх крыллі перад дарогай у вырай. *(Паводле Я. Коласа)*

- Складзіце невялікі тэкст пра адлёт птушак у вырай.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**107.** Перакладзіце сказы на беларускую мову. Спішыце. Растлумачце выбар формы дзеяслова-выказніка. Вызначце, якой часцінай мовы ён выражаны.

1. Эти двое явились с опозданием. 2. Все трое отстали. 3. На земле живёт пять миллиардов людей. 4. Все пять учеников пришли. 5. Ваня и Коля бежали по берегу. 6. Работаем я и он. 7. Ни я, ни ты не едем. 8. Наша новая врач сегодня принимает больных. 9. Надоело мне «если». 10. Прошло около часа. 11. Несколько собак злобно бросились за медведем. 12. Большинство делегатов уже прибыло. 13. Полдома разрушено. 14. У тебя покушать есть?

**108.** Выпішыце сказы, у якіх дапаможны дзеяслоў выражае значэнне: а) пачатку, канца, прадаўжэння дзеяння; б) магчымасці ці пажадання, намеру.

1. Вагоны, якія толькі што падагналі, пачалі разгружаць. 2. Ён стараўся не прапускаць трэніровак. 3. Іван Пятровіч не хацеў перашкаджаць Міхаську. 4. Вядучы закончыў чытаць пастанову. 5. Нашы людзі ўсё могуць пераадолець. 6. Сяргей рашыў пачакаць хвілін пяць. 7. Ігар Міхайлавіч хацеў пабыць дома тры дні. 8. Пятрэнка не мог ступаць на хворую нагу. 9. Андрэй адпачываў і зноў браўся пілаваць дровы.

**109.** Складзіце і запішыце словазлучэнні тыпу «дзеяслоў + неазначальная форма дзеяслова» з дадзенымі словамі.

1. Пачаў, прыступіў, стаў, прадоўжыў, закончыў.

2. Мог, умее, бярэцца, спрабуе, думае, спадзяецца, аказваецца, адказваецца, збіраецца, баяўся.

**110.** Замяніце дзеясловы звязкай *быць*. Запішыце. Параўнайце атрыманыя канструкцыі з дадзенымі.

Узор. *Сын стаў зусім дарослы. — Сын быў зусім дарослы.*

1. Пасля заканчэння інстытута Ірына стала настаўніцай. 2. Бяроза зрабілася пушыстай і белай ад снегу. 3. Сёння ён здаваўся стомленым больш, чым учора. 4. Навіна аказалася такой хвалюючай, што многія пачалі плакаць. 5. На вуліцы


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

гарачыня стаяла невыносная. 6. Дзень выдаўся прыгожы, сонечны і цёплы.

● Вызначце семантычныя адрозненні канструкцый з дзеясловам-звязкай *быць* і іншымі дзеясловамі.

**111.** Пры спісванні выберыце адзін з дадзеных у дужках дапаможных дзеясловаў, ставячы яго ў адпаведнай форме. Падкрэсліце выказнікі. Канчаткі ў іменнай частцы дзеясловаў дапішыце.

1. Наш сад *(быць, здавацца)* стар.. і апусцел.. . 2. Прыезд брата *(з'явіцца, быць)* прыемн.. нечаканасц.. для нас. 3. Мой сябар *(з'яўляцца, стаць, быць)* настаўнік.. у нашай школе.

**112.** Пісьмова размяркуйце сказы паводле выражэння іменнай часткі выказніка той ці іншай часцінай мовы.

1. Мікола — чалавек з загадкай. 2. Я вяртаўся дамоў на Брэсцкую вуліцу, стомлены і шчаслівы. 3. Веды даражэйшыя за багацце. 4. Хлопец з першага погляду здаўся мне вельмі прыгожым. 5. Ярчэйшым было сонца, мацней пахлі кветкі. 6. Дзень стаяў цёплы, сонечны. 7. Маці прыйшла стомленая, задуменная. 8. Настрой чамусьці рабіўся добрым, нават выдатным.

**113.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Запішыце. Падкрэсліце дзеясловы-выказнікі, вызначце іх тып.

Я спустился с обрыва к реке и тут же не сходя с места поймал четыре крупные форели. Поймал подряд всех четырёх и клевать сразу же перестало. Тогда я поднялся наверх и положил форель на траву возле костра. Она блестела влажными боками, вздрагивая на верёвке, продетой сквозь жабры. Спины рыб были синеватыми, а животы золотистыми. На чешуйках горели разноцветные точки — голубые, красные, чёрные... Живые цветы. Рыба-цветок. *(По Ю. Коринцу)*

**114.** Спішыце сказы. Падкрэсліце галоўныя члены і ахарактарызуйце іх паводле будовы і спосабаў выражэння.

1. Хлопцы не стамляліся працаваць у полі. 2. Маці хацела навучыць мяне вышываць крыжыкам. 3. Ён стаў пра-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

сіць бацьку прыехаць у вёску. 4. Хлопчык прасіў прадоўжыць гульню. 5. Дзеці спрабавалі танцаваць, але нічога не атрымлівалася.

**115.** Вызначце, якія дзеясловы ў састаўным дзеяслоўным выказніку выражаюць: а) пачатак; б) прадаўжэнне; в) заканчэнне дзеяння.

1. Я перастаў думаць толькі пра сябе і пачаў уважліва адносіцца да людзей. 2. Прыйшоў Сяргей Пятровіч, і яны сталі есці, піць і размаўляць. 3. Ён пакуль што заставаўся жыць у горадзе. 4. Я ўжо пачынаў вучыцца іграць на цымбалах. 5. Жыццё птушак пачало замiраць у лесе, затое стала ажываць жыццё звяроў. 6. Са старымі знаёмымі ён перастаў сустракацца. 7. Дзевяты клас закончыў вучыцца.

**116.** Вызначце састаўныя іменныя выказнікі. Якой часцінай мовы выражаны іменныя часткі?

1. Дзённік быў напісаны ў студэнцкія гады. 2. Надзя была хворая. 3. Яна была прыгажуня. 4. Сэрца ў Алега Пятровіча было здаровае. 5. Іван Барысавіч, вядома, быў таленавіты чалавек. 6. Я быў бы намнога шчаслівейшы. 7. Ён быў высокага росту. 8. Вучоба будзе карыснай. 9. Хлопец быў у поўнай адзіноце. 10. Твар у яго быў увесь у вяснушках. 11. Мы былі напагатове. 12. Яна замужам. 13. Лета без дажджоў. 14. Яна была не ў настроі. 15. Паранены быў непрытомны.

**117.** У сказах знайдзіце звязку і іменную частку састаўнога іменнага выказніка. Запішыце сказы.

1. Снег стаў зусім мокры. 2. Клоун быў душою цырка, галоўным яго героем. 3. Сцяпан быў у свой час рыбаком. 4. Пазнанне самога сябе з'яўляецца шчасцем. 5. Мікола лічыўся заўсёды адным з лепшых таварышаў. 6. Карабель «Беларусь» Андрэю здаваўся цудам караблебудавання. 7. І снеданне зрабілася яшчэ больш прыемным ад таго, што за спінай гаспадара загарэліся дровы ў каміне. 8. Але і цяпер яны заставаліся сябрамі, разумелі адзін аднаго з паўслова. 9. Дзверы аказаліся адчыненыя. 10. Кніжная шафа служыла ўпрыгожаннем самага вялікага пакоя.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**118.** Складзіце і запішыце сказы з дзеясловамі-выказнікамі *чуць, распытваць, пісаць, адрасаваць* са значэннем маўлення; *абараняцца, ахоўваць, берагчы, збірацца* са значэннем прычыны; *дабегчы, плысці, апускацца* са значэннем руху; *капаць, пісаць, вязаць* са значэннем прылады дзеяння.

**119.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Запішыце. Укажыце, як выражана ў сказах сувязь дзейніка і выказніка.

Проснувшись, я долго не мог сообразить, где я.

Надо мной расстилалось голубое небо, по которому тихо плыло и таяло сверкающее облако... Справа, в нескольких шагах от меня, стоял какой-то незнакомый шалаш...

А у самых моих ног плескалась река.

Этот-то плеск и разбудил меня от сладкого сна. Давно уж он прорывался к моему сознанию беспокоящим шёпотом, точно ласкающий, но вместе с тем беспощадный голос, который подымает на заре для неизбежного трудового дня. А вставать так не хочется... *(В. Короленко)*

## *Кантрольныя пытанні і заданні*

1. Якія сказы называюцца развітымі?
2. Які член сказа называецца дзейнікам? Назавіце спосабы яго выражэння.
3. Прывядзіце прыклады сказаў з дзейнікам, які выражаны іменным ці колькасна-іменным спалучэннем.
4. Прывядзіце прыклады сказаў з дзейнікам, што выражаны прыметнікам або прыслоўем, якія ўжываюцца ў ролі назоўніка.
5. Які член сказа называецца выказнікам? Назавіце тыпы выказнікаў. Прывядзіце прыклады.
6. Якія існуюць спосабы выражэння выказніка?
7. Прывядзіце прыклады сказаў з нулявой звязкай у выказніку.
8. Назавіце спосабы выражэння іменнай часткі ў састаўным іменным выказніку.
9. Раскажыце пра некаторыя выпадкі дапасавання простага дзеяслоўнага выказніка да дзейніка.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## § 21. Будова і сэнсава-стылістычныя магчымасці двухсастаўных развітых сказаў

Двухсастаўныя сказы маюць у сваім складзе састаў дзейніка і састаў выказніка: *Шырокі шлях пралёг паміж палёў.* (К. Буйло) Дзейнік і выказнік у сказе складаюць яго граматычную аснову: *шлях пралёг* — граматычная аснова. Састаў дзейніка — *шлях* (які?) *шырокі;* састаў выказніка — *пралёг* (дзе?) *паміж палёў*. Састаў дзейніка ўтвараецца з дзейніка і даданых членаў сказа, якія адносяцца да яго. Састаў выказніка ўтвараецца з выказніка і залежных ад яго даданых членаў сказа.

Двухсастаўнымі развітымі з'яўляюцца сказы, у якіх галоўныя члены паясняюцца даданымі членамі сказа: *Высока ў бязвоблачным небе плыве яркае сонца.* (І. Навуменка) *Не чуваць ні галасоў птушыных, ні вясёлага плёскату рыбы.* (П. Місько) *Багатыя тут лясы рознай птушкай, зверам, арэхамі, ягадамі і грыбамі.*

У разнастайных маўленчых сітуацыях двухсастаўныя развітыя сказы сустракаюцца часцей, чым неразвітыя. Дзякуючы даданым членам яны больш поўна характарызуюць падзеі, з'явы, даносяць больш дакладную інфармацыю да слухача (чытача).

**120.** Прачытайце. Вызначце стыль і тып маўлення. Дайце тэксту загаловак. Выпішыце галоўныя члены сказа. У кожным сказе назавіце састаў дзейніка і састаў выказніка.

У песні чалавек найбольш поўна і глыбока выяўляе сваю душу. Ён спявае ў мінуты суму, калі на душы ў яго цёмна і неспакойна, у радасці, калі сэрца апавіта святлом і цеплынёй, спявае ў працы і ў вяселлі, складае песні гневу і кахання. Ёсць песні і без слоў. Іх спяваюць налітыя каласы жытоў, калі па жаўцізне неабсяжных палеткаў прабяжыць часамі непаседа-вецер. Іх пяе маці над калыскай сына, паўнаводдзем іх спяваюць рэкі. Я іх чуў, бывала, у адвечным глухім шуме палескіх лясоў, вясеннім шчэбеце птушак, чуў у скрыпе жураўлёў над калодзежам і свісце касы на лузе, калі пад вострым лязом рад за радам нікне пакрытая першай расой трава... *(У. Краўчанка)*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

● Зрабіце фанетычны разбор слоў *спявае, неабсяжных, паўнаводдзем.*

● Растлумачце значэнне слова *лязо.*

↑ Назавіце дзеясловы-метафары. Якая іх роля ў тэксце?

**121.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак. Вызначце граматычную аснову ў сказах. Выпішыце двухсастаўныя развітыя сказы.

Пад гарою расла вярба. Пад вярбою было люстраное акно ў зялёнай траве. Тут пачынаўся і бег да рэчкі малы ручаёк. З узгорка да вярбы вытапталі шырокую сцежку. Усе прыходзілі сюды піць ваду, і цэлае лета сіняе неба ўглядалася ў гэта акно. Увосень берагі яго чарнелі ад дажджу, а на вадзе плавала лісце вярбы. Зімою акно не замярзала. Рэдкая па́ра, як з міскі, клубілася над ім у глыбокім снезе. А дзед казаў, што гэта зямля дыхае тут. Крыніца... *(І. Грамовіч)*

● Выпішыце прыслоўі і зрабіце іх марфалагічны разбор.

● Знайдзіце апісанне, растлумачце, якую ролю яно выконвае ў тэксце.

## § 22. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам

З в я з к а — гэта службовы дзеяслоў або дзеяслоў з аслабленым лексічным значэннем, які ўваходзіць у склад састаўнога выказніка і выражае яго граматычнае значэнне, паказваючы на час, асобу, лік, лад: *Дзень быў хмарны і марозны.* (У. Краўчанка) Нулявая звязка *(ёсць)* не выражаецца графічна ў іменным выказніку, але служыць паказчыкам цяперашняга часу абвеснага ладу: *Беларусь — мая маці і мова, паветра і хлеб!* (А. Вялюгін)

Пры нулявой звязцы паміж дзейнікам і выказнікам ставіцца працяжнік:

1) калі дзейнік і выказнік выражаны назоўнікамі або лічэбнікамі ў назоўным склоне: *Мінск — сталіца Беларусі. Шэсць і восем — чатырнаццаць;*

2) калі дзейнік і выказнік выражаны неазначальнай формай дзеяслова: *Жыць — Радзіме служыць;*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

3) калі адзін галоўны член сказа выражаны неазначальнай формай дзеяслова, а другі — назоўнікам: *Выпрацоўваць характар — неабходная справа. Сцяна — не ўзабраца.* (В. Каваль)

Калі перад выказнікам стаяць словы ***гэта, вось, значыць, гэта значыць,*** то працяжнік ставіцца перад гэтымі словамі: *Шчасце — гэта калі цябе разумеюць. Вучоба — вось што галоўнае для вас.*

Працяжнік звычайна не ставіцца:

1) калі перад выказнікам ёсць параўнальныя злучнікі: *Мурашкі быццам старанныя будаўнікі;*

2) калі дзейнік выражаны асабовым займеннікам: *Яны надзейныя сябры;*

3) калі пры выказніку ёсць адмоўная часціца ***не:*** *Старасць не радасць.*

З а ў в а г а. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам можа ставіцца ў тых выпадках, калі на дзейнік падае лагічны націск: *Яны — надзейныя сябры. Я — сын зямлі, нашчадак хлебаробаў.* (Р. Барадулін) *Мой горад — як казачны палац.*

Працяжнік ставіцца і тады, калі выказнік выдзяляецца лагічна і перад ім ёсць паўза: *Жанчына — маладая, прыгожая.*

**122.** Выразна прачытайце вершаваныя радкі, захоўваючы правільную інтанацыю. Назавіце галоўныя члены сказа і вызначце, чым яны выражаны. Растлумачце пастаноўку працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам.

Беларусь — мая калыска,
Маці белая мая.

*У. Лісіцын*

Радзіма ўся — лятункаў* мова
І скрозь, заўжды пад сінявой,
Як шчасця звонкая падкова,
Яе сярпок над галавой.

*К. Кірэенка*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Расціце, лясы,
Спявайце, лясы...
Лясы —
Маёй роднай зямлі галасы.

*В. Ракаў*

Суметы —
Нашых зім барханы.
Снягі —
Сыпучыя пяскі.
Я ў вас
Да скону закаханы,
Як нашы продкі і бацькі.

*І. Калеснік*

● Знайдзіце словы, ужытыя ў пераносным значэнні.

**123.** Спішыце сказы. Пастаўце, дзе трэба, працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам. Растлумачце яго пастаноўку.

1. Наша праца наш узлёт, наша слава і багацце. *(Я. Колас)*
2. Плошча поля трыста семдзесят пяць гектараў.
3. Прырода любая мая! Я твой заступнік, абаронца. *(А. Русецкі)*
4. Пушчы звонкія, пералогі гэта наша радзіма, наш дом. *(К. Цвірка)*
5. Воўк не пастух, а свіння не агародніца. *(Прыказка)*
6. Старанна працаваць краіну мацаваць. *(Прыказка)*
7. Адвечнае дрэва дуб. *(І. Шамякін)*

**124.** Прачытайце ўрывак з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля». Вызначце, з якой мэтай выкарыстоўваецца паўтор дзейніка. Растлумачце пастаноўку працяжніка ў сказах.

А дзе ж той выхад, дзе збавенне
З няволі цяжкай, з паланення?
Адзін ён ёсць: зямля, зямля,
Свой пэўны кут, свая ралля:
То — наймацнейшая аснова
І жыцця першая ўмова.
Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Зямля дасць волі, дасць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы,
Зямля дзяцей тваіх не кіне,
Зямля — аснова ўсёй айчыне.

**125.** Спішыце. Растлумачце, чаму ў дадзеных сказах адсутнічае працяжнік.

1. Добрае не забываецца. 2. Праца ў полі не заўсёды асалода. 3. Ён сумленны чалавек. 4. Я толькі рабочы, які працуе на заводзе. 5. Ноч цёмная. 6. Яна добрая настаўніца. 7. Рана глыбокая. 8. Наш дом як прахадны двор.

**126.** Адкажыце пісьмова на пытанні. Звярніце ўвагу на пастаноўку працяжніка пры нулявой звязцы ў іменным састаўным выказніку.

1. Што такое метро? 2. Што ўяўляе сабою ваш горад (вёска)? 3. Што такое касмадром? 4. Хто такі Мікола Гусоўскі? 5. Хто такі Заір Азгур? 6. Што такое дэфіс? 7. Што мы называем састаўным іменным выказнікам? 8. Што такое сінтаксіс? 9. Што мы называем словазлучэннем?

## § 23. Даданыя члены сказа

**127.** Спішыце, раскрываючы дужкі. Падкрэсліце ў сказах граматычныя асновы. Растлумачце значэнне даданых членаў сказа для разумення сэнсу тэксту (перадаюць якасную характарыстыку, канкрэтызуюць стан, абазначаюць месца, час і інш.).

*(У)* нізе заломвала калена рэчка, падточваючы пясчаны падмурак адхону, і мела *(не)* малы поспех у гэтым. Гадоў колькі таму падмыла карэнне і заваліла высокую страявую сасну. Тая лягла *(у)* поперак плыні, нібы такім спосабам выказваючы супраціўленне чужой волі. Волю гэтую яна не стрымала, вада перакатвалася цераз ствол, злізваючы мёртвую кару, і несла далей сваю разбуральную сілу. Сасна набрыняла вільгаццю, глеіста пасінела, тармазіла рознае смецце і друз і сур’ёзна пачала заступаць дарогу вадзе. *(А. Кудравец)*

- Апошні сказ разбярыце па членах сказа.
- Падбярыце сінонімы да слова *смецце*.
- Абазначце ў тэксце дзеепрыслоўныя звароты.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**128.** Пададзеныя сказы зрабіце развітымі. Стварыце з іх тэкст. Запішыце.

Аўтобус ехаў; Алесь вяртаўся; ён нарадзіўся, вырас; ён не быў; хлопец хадзіў і не пазнаваў; Алесь пабачыў; Галіна Іванаўна, настаўніца; не падумаў, не ўспомніў; быў лепшым; ён пабываў; даведаўся многа.

## § 24. Дапаўненне

**129.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Знайдзіце граматычную аснову і даданыя члены сказаў. Па якіх прыметах адрозніваюцца даданыя члены? Якімі спосабамі звязаны залежныя словы з галоўнымі?

Нідзе так звонка не чуваць спеў жаваранка, як у чыстым полі. З высокага неба падае, льецца птушыны спеў, нібы мноства срэбных званочкаў узняло сонца аж пад аблокі. Стаіш і чуеш, як пранікае птушыная песня ў сэрца, напаўняе яго радасцю. З птушкамі не было маркотна ў полі. Колькі я знаходзіў іх гнёздаў на межах, у баразнах, пад скібай ад плуга! Я ніколі не кранаў птушыную сям'ю. Я ведаў, калі маленькія птушаняты выводзяцца, калі ў іх адрастаюць крылы. І мне здавалася, што жаваранкі, перапёлкі, курапаткі таксама ўжо ведалі мяне, прывыклі да мяне. Пырхнуўшы з гнязда, шэрая птушына далёка не адлятала, а садзілася на галінку чарнобылю і глядзела ў мой бок па-свойску, смела. *(І. Грамовіч)*

● Зрабіце фанетычны разбор слоў *льецца, радасцю.*

↑ Апішыце цікавае здарэнне пра вашу сустрэчу ў лесе з птушкамі, звярамі.

Д а п а ў н е н н е — гэта даданы член сказа, які паясняе выказнік або іншыя члены сказа, абазначае аб'ект, адносіны да дзеяння ці праяўлення прыметы і адказвае на пытанні ўскосных склонаў: *Ён выканаў* (што?) *практыкаванне.* (Каму?) *Кожнаму хочацца быць шчаслівым.* (С. Грахоўскі)



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

У ролі дапаўнення выступаюць назоўнікі, займеннікі або лічэбнікі ў форме ўскосных склонаў: *Мы чытаем* (што?) *кнігу. Школа ветліва сустракае* (каго?) *нас. Дзевяць дзеліцца* (на што?) *на тры.*

Радзей дапаўненні выражаюцца неазначальнай формай дзеяслова, іншымі часцінамі мовы, якія ўжываюцца ў значэнні назоўніка: *Ён прапанаваў сябру* (што?) *вярнуцца. Хлопчык прывітаўся* (з кім?) *з прахожымі.*

У ролі дапаўнення могуць выступаць непадзельныя словазлучэнні і фразеалагізмы: *Мы выпісалі пяць газет. Яны ведалі яго ахілесаву пяту.* Такія словазлучэнні звычайна маюць у сваім складзе назоўнік ці іншую часціну мовы ў значэнні назоўніка.

Часціны мовы ў форме ўскоснага склону, якія выступаюць у ролі дапаўнення, звязваюцца з галоўным словам спосабам кіравання (акрамя дапаўнення, выражанага неазначальнай формай дзеяслова, якая прымыкае да галоўнага слова): *Сасновыя бары чаргаваліся* (з чым?) *з забалочанымі хмызнякамі.* (Р. Няхай)

**130.** Разгледзьце табліцу. Вызначце адценні значэння дапаўненняў у сказах. Па ўзоры прыдумайце сказы і запішыце іх.

| Адценні значэння | Сказы |
|---|---|
| Прадмета прамога дзеяння | Я чытаў кнігі, часопісы, газеты. |
| Адрасата | Да настаўніцы звярнуўся вучань. |
| Прылады працы | Не пяром пішуць, а розумам. |
| Удзельніка | Настаўнік гаварыў з вучнямі. |

**131.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Назавіце ў сказах граматычную аснову і дапаўненні.

Гравюрамі Скарыны захапляліся яго сучаснікі, захапляюцца знаўцы мастацтва да нашага часу. Іх лічылі лепшымі, чым у іншых славянскіх кнігах, роўнымі толькі гравюрам славутых венецыянскіх выданняў прызнанага майстра, чараўніка кніжнай справы Альда Манучы. Гравюры Скарыны імкнуліся пераймаць нямецкія і чэшскія выдаўцы.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Асаблівай увагі заслугоўвае змешчаны Скарынам у Бібліі ўласны партрэт. Ужо само змяшчэнне партрэта выдаўца было выклікам царкве, бо ў Бібліі павінны былі змяшчацца толькі партрэты святых. У гэтым адбілася ўласцівае Скарыну як дзеячу Рэнесанса пачуццё ўласнай годнасці.

Беларускі першадрукар паказаны ў сваім рабочым кабінеце. Ён сядзіць у крэсле за невысокім столікам, на якім ляжыць рукапіс. У правай руцэ — пяро. Ён працуе і толькі на секунду адарваўся ад рукапісу, каб абдумаць напісанае. Адзеты Скарына ў доктарскую мантыю па тагачаснай модзе. На яго галаве берэт, з-пад якога спадаюць на плечы пышныя валасы... *(Паводле У. Свяжынскага)*

- Назавіце словы, напісанне якіх не супадае з вымаўленнем.
- Зрабіце словаўтваральны разбор слоў *сучаснік, першадрукар, невысокі.*
- Закончыце апісанне партрэта Ф. Скарыны. (Гл. уклейку ў падручніку «Ф. Скарына. Аўтапартрэт»). Што яшчэ вы бачыце на малюнку?

**132.** Супастаўце сказы. Якімі членамі сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы?

1. **Урокі** былі падрыхтаваныя. Мы падрыхтавалі **ўрокі.** 2. **Дзень** мы аддаём рабоце. **Дзень** выдаўся ясны, сонечны. 3. **Вуліцы** горада заасфальтаваныя. Я люблю **вуліцы** Мінска вясной. 4. Мы здалёк убачылі **замак,** які стаяў на гары. **Замак,** які стаяў на гары, быў бачны здалёк. 5. **Печ** была моцна напалена. Я першы раз убачыў такую **печ.** 6. Вакол школы вучні пасадзілі **дрэўцы.** Вакол школы раслі **дрэўцы.** 7. **Канікулы** мы правялі вельмі весела. **Канікулы** прайшлі вельмі весела.

**133.** Знайдзіце ў сказах дзейнік і дапаўненне. Змяніце сказы так, каб дзейнік стаў дапаўненнем або дапаўненне — дзейнікам. Запішыце.

У з о р. *Гэтыя кветкі сабрала дзяўчына на лузе. — Гэтыя кветкі сабраныя дзяўчынай на лузе.*

1. Хмара закрыла паўнеба. 2. Сын любіць маці. 3. Дзень змяняе ноч, а восень змяняе лета. 4. Бацька падарыў мне кнігу. 5. Дрэва было павалена ветрам. 6. Шавец пашыў прыгожы касцюм.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Дапаўненне часцей за ўсё залежыць ад дзеяслова: *Сонца пяшчотна асвятляла* (што?) *палянку.* (Я. Колас)

Дапаўненні падзяляюцца на прамыя і ўскосныя.

П р а м ы я дапаўненні абазначаюць аб'ект, на які непасрэдна накіравана дзеянне, маюць форму вінавальнага склону без прыназоўніка або роднага склону без прыназоўніка, калі пры дзеяслове стаіць адмоўе ***не*** ці дзеянне накіравана не на ўвесь прадмет, а толькі на яго частку, і адносяцца да пераходнага дзеяслова: *Люблю народ наш беларускі і хаты ў зелені садоў.* (К. Буйло) *Не злічыць у небе ясных зорак, не злічыць у сэрцы светлых дум.* (М. Багдановіч)

У с к о с н ы я дапаўненні абазначаюць аб'ект, на які ўскосна накіравана дзеянне, маюць формы ўсіх ускосных склонаў з прыназоўнікамі ці без іх (апрача вінавальнага) і залежаць ад непераходных дзеясловаў: *Кожнаму ўспамінаецца сваё.* (С. Грахоўскі) *З такімі невясёлымі думкамі ён памалу прыціх, быццам задрамаў нават, звыкся са сваёй бядой і сваім болем.* (В. Быкаў)

**134.** Замяніце дзеясловы дзеепрыметнікамі залежнага стану. Запішыце. Падкрэсліце дзейнікі і вызначце склон дапаўненняў.

У з о р. *Мы ўжо выпрацавалі план дзеянняў. — Намі ўжо выпрацаваны план дзеянняў.*

1. Сонца ярка асвяціла бярозавы гай. 2. Моцны мароз скаваў нашу рэчку. 3. Падпіску на газеты і часопісы прымаюць усе паштовыя аддзяленні. 4. Завод выпусціў новую партыю аўтамабіляў. 5. Студэнт датэрмінова здаў экзамен.

**135.** Складзіце сказы, каб пры кожным дзеяслове было прамое і ўскоснае дапаўненне. Запішыце.

У з о р. *Вучыць. — Я вучу ўрокі. Нас вучаць матэматыцы.*

Хваліць, знаёміць, маляваць, сустракаць, чакаць.

**136.** Спішыце. Падкрэсліце словы як члены сказа. Адкажыце, якім членам сказа можа з'яўляцца неазначальная форма дзеяслова.

1. Я пачаў шукаць згублены ключ. 2. Зранку мы вырашылі заняцца справай. 3. Доктар забараніў мне чытаць лежачы.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

4. Маці папрасіла прынесці вады. 5. Яму дазволілі нямнога гуляць. 6. Мы вырашылі схавацца ад дажджу. 7. Ён папрасіў нас прыехаць. 8. Нам параілі пакупацца ў возеры.

**137.** Складзіце і запішыце сказы з наступнымі словазлучэннямі. Падкрэсліце дапаўненні і ахарактарызуйце іх.

Выконваць заданне, старонкі часопіса, крыўдна за сябра, наліў малака, адрэзаў хлеба, загадаў стаяць, не заўважыў чалавека.

**138.** Дапаўненні шырока выкарыстоўваюцца ў дзелавых паперах. Распіска — гэта дакумент, які пацвярджае атрыманне чаго-небудзь. Прачытайце. Вызначце састаўныя часткі дакумента: назву; аўтара дакумента; найменне таго, каму даецца распіска; найменне таго, хто атрымаў распіску; подпіс таго, хто атрымаў распіску; дату. Знайдзіце дапаўненні. Складзіце распіскі на: 1) атрыманне саджанцаў у лесніка; 2) атрыманне спортінвентару ў настаўніка фізкультуры.

Распіска.

Я, Пратасевіч Сцяпан, вучань 9 «А» класа сярэдняй школы № 118 г. Мінска, атрымаў у бібліятэцы школы 10 падручнікаў па беларускай мове.

20 верасня 2006 г. С. Пратасевіч

**139.** Заява — дакумент, які змяшчае прапанову, просьбу. Разгледзьце састаўныя часткі дадзенай заявы: найменне адрасата (каму заява); аўтара заявы; назву дакумента; апісанне просьбы; подпіс; дату. Напішыце заяву на імя дырэктара школы па розных пытаннях школьнага жыцця.

Дырэктару сярэдняй агульнаадукацыйнай
школы № 118 г. Мінска
Кавалю М. В.
Міцкевіча Аляксандра Мікалаевіча,
які жыве па адрасе: г. Мінск,
пр-т Ракасоўскага, д. 12, кв. 128,
тэл.: 218-88-90

заява.

Прашу прыняць мяне ў 10 «А» клас з паглыбленым вывучэннем беларускай мовы.

31 жніўня 2006 г. А. Міцкевіч



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## § 25. Азначэнне

**140.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў сказах азначэнні. Якая іх роля ў тэксце? Чым яны выражаны і на якія пытанні адказваюць? Да якіх членаў сказа адносяцца? Вызначце від падпарадкавальнай сувязі, паміж азначэннямі і паяснёнымі словамі.

Пажаўцела зялёнае мора ў ваколіцах Мінска! Золкія, з лёгкімі замаразкамі ночы прыспешылі развітанне дрэў са сваім летнім уборам. За які тыдзень трапяткія кроны асін зрабіліся ружавата-чырвонымі. Нейк адразу пацямнелі ад даўкага крывянога соку гронкі каліны. У самым гушчары, у засені старой калматай елкі, адчула халодны подых восені і ціхая сямейка брызгліны. Яе лісце зрабілася васкова-празрыстае, і толькі рэдкія пацеркі ягад здзіўлена пазіралі на свет са сваёй мяккай аранжавай аправы чорнымі бліскучымі вочкамі. *(В. Вольскі)*

- Зрабіце словаўтваральны разбор слова *развітанне.*
- Сфармулюйце правілы напісання слоў у тэксце праз злучок.

**141.** У першай частцы практыкавання замяніце словазлучэнні, у якіх словы звязаны спосабам дапасавання, словазлучэннямі, у якіх словы звязаны спосабам кіравання, а ў другой частцы — наадварот. Запішыце.

У з о р. *Чалавечы твар — твар чалавека.*

I. Драўляная пабудова, салаўіны спеў, школьныя сябры, каменныя дамы, лісінае футра.

У з о р. *Гоман птушак — птушыны гоман.*

II. Даследаванні па хіміі, сцены з цэглы, шкло для акон, песня салаўя, чалавек гадоў трыццаці.

Даданы член сказа, які абазначае прымету прадмета, паясняе члены сказа, выражаныя назоўнікамі ці іншымі часцінамі мовы ў значэнні назоўніка, і адказвае на пытанні **які? чый?**, называецца а з н а ч э н н е м: (Якім?) *Белым пухам замятае вецер* (якія?) *чорныя палі.* (Я. Колас) (Чый?) *Чыйсьці голас пачуўся на вуліцы.* (Ц. Гартны)



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**142.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак. Вызначце стыль і тып тэксту. Выпішыце прыметнікі-азначэнні разам з паяснёнымі словамі і прыметнікі-выказнікі разам з дзейнікамі.

Ах, гэтая мележаўская ўсмешка!

Прыязная, іранічная, загадкавая, сарамлівая, кплівая, цёплая, хітраватая, задумлівая і шматзначная, але заўсёды чалавечная, неабразлівая.

Такой усмешкі ні ў кога не было — адразу і так многа тонаў, паўтонаў, адценняў, як у той вясёлцы, што летнім днём перакідваецца цераз ціхую, задуменную Прыпяць.

Усмешка — водбліск душы. Пустая душа — пустая ўсмешка. У Мележа ўсмешка была таленавітая, шчырая. Яна саграvала прыязнасцю і тады, калі азмрачалася самотай, а бывала і так, што абодва пачуцці адразу афарбоўвалі яе — твар іскрыўся шчаснасцю, у вачах таілася туга.

Смех — разрадка. Ён адключае чалавека хоць на імгненне ад напружанай працы мозгу. Ды нават і тады, калі Мележ смяяўся ад усяе душы, з ягонага твару — во дзіва! — не знікала напружанасць думкі. *(А. Асіпенка)*

- Вызначце від і спосабы сінтаксічнай сувязі слоў у сказах трэцяга абзаца.
- Назавіце сродкі, з дапамогай якіх афармляецца сувязь слоў у словазлучэнні.
- Растлумачце пастаноўку працяжніка ў сказах.
- Зрабіце словаўтваральны разбор слоў *шчаснасцю, напружанасць.*

Азначэнні, звязаныя з паяснёнымі словамі сувяззю дапасавання, называюцца д а п а с а в а н ы м і. Яны найбольш пашыраныя ў маўленні і выражаюцца прыметнікамі, дзеепрыметнікамі, а таксама парадкавымі лічэбнікамі і займеннікамі, якія змяняюцца, як прыметнікі. Параўн.: *Ён адчыніў* (якія?) *дубовыя дзверы. Ён адчыніў* (якія?) *паржавелыя дзверы. Ён адчыніў* (якія?) *першыя дзверы. Ён нерашуча адчыніў* (чые?) *ягоныя дзверы.*

Калі дапасаваныя азначэнні, выражаныя прыметнікавымі ці дзеепрыметнікавымі зваротамі, стаяць пасля паяснёнага слова, то на пісьме яны выдзяляюцца коскамі, а ў вусным маўленні — паўзай. Параўн.: *Ён адчыніў паржавелыя ад вільгаці дзверы. Ён адчыніў дзверы, паржавелыя ад вільгаці.*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**143.** Прачытайце. Дайце загаловак тэксту. Вызначце яго стыль. Выпішыце дапасаваныя азначэнні разам з паяснёнымі словамі. Чым яны выражаны і як звязаны паміж сабой?

Іх некалі ў наваколлі Кушлянаў было шмат. Каржакаватыя, яны раслі на паплавах, на ўзлесках, уздоўж дарогі на Наздрачуны і на ўзмежках. Хто і калі іх садзіў, кушлянцы не памятаюць — так даўно гэта было, але дубы тыя надта аздаблялі паэтаву сядзібу. Багушэвіч ганарыўся імі і не раз цешыўся, захапляўся з іх волатаўскай сілы. Яшчэ хлапчуком ён збіраў пад імі срабрыстыя, нібы майскія жукі, жалуды. Жалудамі карміліжывёлу, на дубовым лісце, здаралася, пяклі хлеб.

Былі гэта ўсе векавыя прыгажуны. Кожны з іх меў сваю гісторыю. З іх лёсам моцна часам пераплятаўся і лёс людзей.

Вось каля гэтага, выпаленага ў сярэдзіне, у тры абхваты чалавечых рук таўстуна, расказваюць, Багушэвічаў бацька ў маладыя гады ўпаляваў мядзведзя.

А пад дубам, што калісь рос на поплаве, Францішак Багушэвіч вырасціў не адзін дзесятак дабрэнных баравікоў.

*(У. Содаль)*

- Вызначце асноўную думку сказаў трэцяга і чацвёртага абзацаў.
- Падзяліце тэкст на сэнсавыя часткі. Да кожнай часткі пастаўце пытанне і адкажыце на яго.

Н е д а п а с а в а н ы я азначэнні звязваюцца з паяснёнымі словамі сувяззю кіравання або (радзей) прымыкання. Параўн.: *Ён зрабіў* (які?) *дубовы стол. Ён зрабіў стол* (які?) *з дубу.*

Часцей за ўсё недапасаваныя азначэнні выражаюцца назоўнікамі ва ўскосных склонах (з прыназоўнікамі ці без іх), неазначальнай формай дзеяслова, дзеепрыслоўем, сінтаксічна непадзельным словазлучэннем: *Спевы* (чые?) *птушак напоўнілі гай.* (М. Паслядовіч) *І ўсё ж да Чубара даволі хутка вярнулася здольнасць* (якая?) *разважаць.* (І. Чыгрынаў) *Якая яда* (якая па спосабе?) *стоячы? Да іх падышла дзяўчынка* (якая?) *адзінаццаці гадоў.*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**144.** Прачытайце. Знайдзіце дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні ў сказах. Як яны звязаны з азначаемым словам і чым выражаны?

1. Да твару Даніка дакранаецца цёплая далонь. *(Я. Брыль)* 2. Гэтая бязлітасная думка мільганула ў галаве Грынкевіча толькі на імгненне. *(У. Караткевіч)* 3. Бор, перакулены ўніз галавой, топіць у возеры радасны гул. *(Н. Гілевіч)* 4. Помніш толькі красу, мілы тварык дзявочы, залатую касу, сінявыя вочы. *(М. Багдановіч)* 5. Сны дзявоцтва ў зіхатлівым гуле сцелюцца ўзорным палатном. *(С. Гаўрусёў)* 6. Юркава здрада здавалася абразлівай. *(У. Карпаў)*

**145.** Замяніце недапасаваныя азначэнні дапасаванымі. Прыдумайце з імі сказы. Запішыце.

Узор. *Мундзір афіцэра — афіцэрскі мундзір.*

Творы Купалы, асяроддзе без паветра, сталы для школы, балоты Палесся, часопіс Машы, хлопчык пяці гадоў, крык птушкі, песня салаўя, хата лесніка.

**146.** Прачытайце. Дапоўніце сказы дапасаванымі ці недапасаванымі азначэннямі. Ці змяніўся ад гэтага сэнс выказвання? Чаму? Дапішыце тэкст. Перакажыце яго.

Я даўно марыў пабываць у Белавежскай пушчы. Ведаў пра яе шмат, але не бачыў. І вось едзем. Сэрца замірае ад хвалявання. А калі пабачыў зубра, аленя, казулю, дзікоў, стаў цікавіцца, колькі жыве тут відаў жывёл і птушак, як яны зімуюць, чым кормяцца...

**147.** Прачытайце тэкст. Выпішыце сказы з азначэннямі, выражанымі дзеепрыметнікавымі зваротамі.

Узімку рака мае іншы выгляд. Яе наглуха замятае снегам. Цэлыя гурбы ляжаць на кустах, звешаных з берагавых абрываў. Снег усюды белы, сыпкі, неба такое ж малочнабелае. І калі чалавек трапляе ў рэчышча, яму здаецца, што папаў ён у нейкі іншы свет, на іншую планету, дзе бель снегу ўгары і ўнізе і ўрачыстае маўчанне зімы. Але ў гэтым белым свеце ёсць цікавае, непрыкметнае на першы погляд жыццё. Сюды прыходзіць звер, згаладалы за дзень. Тут



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

шныраюць тхары, гарнастаі, шкандыбаюць зайцы, крадуцца лісіцы. Часам трапляе ў рэчышча разважны воўк, і не адзін, а гурты іх прыходзяць шукаць спажывы. Схаваны ў рэчышчы, кожны звер мае свой прытулак. *(Паводле Э. Самуйлёнка)*

- Растлумачце знакі прыпынку пры дзеепрыметнікавых зваротах.
- Вызначце тэму тэксту і растлумачце, з якой мэтай аўтар часта ўжывае азначэнні.
- Якую прымету абазначаюць азначэнні, выражаныя дзеепрыметнікавым зваротам?
- Знайдзіце ў тэксце сінонімы да слова *ісці,* запішыце сінанімічны рад.

**148.** З кожнай парай слоў утварыце словазлучэнні, ужыўшы другі назоўнік як недапасаванае азначэнне да першага. Са словазлучэннямі, якія атрымаліся, складзіце і запішыце сказы.

У з о р. *Гняздо, птушка — гняздо птушкі. Гняздо птушкі знаходзіцца высока на дрэве.*

Стрэльба, паляўнічы; сукенка, мама; бярлога, мядзведзь; святло, зіма; людзі, вайна; вершы, беларускія паэты.

## § 26. Прыдатак

Азначэнне, выражанае назоўнікам, які звычайна дапасуецца да паяснёнага слова ў склоне і ліку, называецца п р ы д а т к а м: *Над ракой стаяў дуб-волат.*

Прыдаткі могуць абазначаць якасць ці ўласцівасць прадметаў: *дуб* (які?) — *дуб-волат;* указваць на род заняткаў, узрост, прафесію, нацыянальнасць: *чытачы* (якія?) — *чытачы-студэнты, хлопцы* (якія?) — *хлопцы-падлеткі, рабочы* (які?) — *рабочы-маляр, дзяўчынка* (якая?) — *дзяўчынка-ўкраінка;* геаграфічныя назвы: *возера* (якое?) — *возера Свіцязь;* назвы прадпрыемстваў, машын, кніг, часопісаў, мастацкіх твораў: *фабрыка* (якая?) — *фабрыка «Камунарка», машына* (якая?) — *машына «Волга», часопіс* (які?) — *часопіс «Беларусь», раман* (які?) — *раман «Волат».*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

З а ў в а г а. Назоўнікі-сінонімы, якія выступаюць у якасці аднаго члена сказа, прыдаткамі не з'яўляюцца: *Разышліся нашы шляхі-дарогі.*

Прыдаткі, што абазначаюць назвы газет, часопісаў, мастацкіх твораў, устаноў, прадпрыемстваў, пішуцца з вялікай літары і бяруцца ў двукоссе: *У часопісе «Маладосць» надрукаваны мае вершы.*

Адзіночны прыдатак утварае з паяснёным словам сэнсавае цэлае, інтанацыйна не выдзяляецца і пішацца праз злучок:

1) калі прыдатак і паяснёнае слова — агульныя назоўнікі: *Лес-прыгажун радаваў нас грыбамі; Прыгажуні-сосныківалі галовамі;*

2) калі агульны назоўнік стаіць пасля ўласнага і цесна звязаны з ім па сэнсе: *Каля мяне прымасціўся Васіль-аграном.* Параўн.: *Аграном Васіль прымасціўся каля мяне.*

**149.** Спішыце сказы. Падкрэсліце прыдаткі. Скажыце, што яны абазначаюць і як дапасуюцца да азначаемых назоўнікаў.

1. Над ціхай Свіслаччу-ракой зара вясенняя ірдзіцца. *(А. Астрэйка)* 2. Хто не любіць красуні-вясны, калі месяц так хораша свеціць? *(А. Астрэйка)* 3. Чырвоным ліхтаром вісіць на краі неба планета Марс. *(І. Навуменка)* 4. На сінім небе-акіяне павіслі хмары-астраўкі. *(А. Астрэйка)* 5. Мароз-мастак рукой старэчай на шыбах піша свой узор. *(Я. Колас)* 6. Бор шуміць над ракой Арэсай. *(П. Прыходзька)*

● Ад якой часціны мовы залежыць прыдатак? Чым ён выражаны?

**150.** Складзіце і запішыце сказы з прыдаткамі і паяснёнымі словамі. Ахарактарызуйце прыдаткі.

Лес-прыгажун, жанчына-доктар, вецер-забіяка, калгас «Радзіма», трактар «Беларус», горад Мінск, часопіс «Маладосць», возера Нарач.

Прыдаткі бываюць дапасаваныя і недапасаваныя. Дапасаваны прыдатак і паясняемае ім слова пішуцца праз злучок, калі абодва яны з'яўляюцца агульнымі назоўнікамі: *Я люблю чараўніцу-вясну.*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Калі агульны назоўнік стаіць пасля прыдатка, выражанага ўласным назоўнікам, і цесна звязваецца з ім па сэнсе, то перад ім таксама ставіцца злучок: *Сож-рака прытулілася да старадаўняга Гомеля.*

З а ў в а г а. Для размежавання прыдатка і паяснёнага слова трэба кіравацца тым, што пры спалучэнні агульнага і ўласнага назоўніка ролю прыдатка выконвае:

а) агульны назоўнік, калі ўласны абазначае імя ці прозвішча чалавека: *У адзін з халодных дзён позняй восені архітэктар Палянцаў пад'язджаў да свайго невялікага раённага гарадка.* (М. Ракітны) *Дзе дуб малады вершаліну ўзнёс — жыве селянін Асташэня.* (П. Глебка) *Мой бацька, і большы брат Міша, і бабчын сын Васіль недзе на фронце фашыстаў б'юць.* (П. Місько);

б) уласны назоўнік, калі ён выступае назвай вёскі, горада, возера, ракі, машыны і інш.: *Калгас «Прагрэс» рыхтуецца да ўборкі буракоў. Возера Нарач здзіўляе сваёй прыгажосцю.*

Прыдаткі служаць своеасаблівымі характарыстыкамі, выступаючы эпітэтамі: *Ужо над пожнямі ў вырай вандроўнік-жораў вёў свой род.* (К. Кірэенка)

Прыдаткі часта можна замяніць азначэннямі-прыметнікамі: *Цецярук-прыгажун — сіняпёры касач на сцяжыну пяро сваё скінуў.* (К. Буйло) Параўн.: *прыгожы цецярук.*

Выказнікі і азначэнні дапасуюцца не да прыдатка, а да паяснёнага слова: *Газета «Звязда» парадавала цікавай рубрыкай.*

**151.** Спішыце. Знайдзіце назоўнікі з азначэннямі-прыдаткамі. Пастаўце, дзе трэба, злучок ці двукоссе.

1. Хаджу я па вуліцы горада сада, узрушаны, горды гляджу навакол. *(А. Звонак)* 2. Асабліва прыемнаю была наша сустрэча з прыгожым амурскім караблём Мінск. *(С. Грахоўскі)* 3. Атаву восень дакасіла, свае палотны туманы на луг паслала і на воды, і на ракітніках яны. *(А. Бялевіч)* 4. Вальс Амурскія хвалі ўсіх расчуліў да слёз. *(А. Бачыла)* 5. Арлы самалёты свідруюць прастор, не знаючы ў лёце ні меж, ні разор. *(Я. Купала)* 6. Высока ў зорным чыстым небе вісеў месяц сярпок. *(В. Адамчык)*

**152.** Падбярыце да кожнага назоўніка некалькі прыдаткаў.

У з о р. *Жанчына-ўрач, жанчына-шафёр, жанчына-аграном, жанчына-прафесар.*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Юнак, дзяўчына, бяроза, рака, станцыя, часопіс, ноч, раман, дуб, восень, мароз, вочы, вецер, сцежка.

**153.** Да выдзеленых слоў прыдумайце прыдаткі. Сказы запішыце.

1. Знаёмая **дзяўчына** ішла нам насустрач. 2. На ўскрайку лесу раслі **дубы.** 3. **Ларыса** за сталом вучыла ўрокі. 4. Маленькі **Алесь** гуляў у лата. 5. Цёмная **ночка** плыла над зямлёй. 6. Па сінім **небе** плылі белыя **воблакі.**

## § 27. Акалічнасць

А к а л і ч н а с ц ь — гэта даданы член сказа, які паясняе выказнік або іншыя члены сказа і абазначае прымету названага імі дзеяння або прыметы: *Як нейкі востраў на агромністым блюдзе чаротавых балот, маляўніча выступаў старадаўні горад, важнейшы цэнтр неабсяжнага Палесся.* (Я. Колас)

Паводле значэння акалічнасці падзяляюцца на: акалічнасці месца, часу, прычыны, спосабу дзеяння, меры і ступені, умовы, уступкі.

З галоўным словам акалічнасці звязваюцца спосабам прымыкання: *Лётаюць, як лёгкія стрэлы, ластаўкі ў блакітным небе* або кіравання: *Лётаюць ластаўкі ў блакітным небе.*

Акалічнасці звычайна выражаюцца прыслоўямі або назоўнікамі ў формах ускосных склонаў з прыназоўнікамі або без прыназоўнікаў, дзеепрыслоўямі ці дзеепрыслоўнымі зваротамі.

**154.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх акалічнасці. Вызначце, якія члены сказа яны паясняюць і якімі часцінамі мовы выражаны.

1. Вецер патроху цішэў, і завея ў полі спакайнела. *(В. Быкаў)* 2. На месцы цяперашніх балот і лясоў было калісьці вялізнае мора. *(Б. Сачанка)* 3. З пушчы верасень гнаў на дарогу лісты. *(А. Куляшоў)* 4. І вочы ўспыхнулі агнямі бліскавіц. *(П. Глебка)* 5. Хлопцы спыніліся адпачыць. *(М. Лынькоў)* 6. Добры чалавек, параіўшы, не шкадуе.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

*(Прыказка)* 7. Галлё спусціўшы над парканам, расла тут грушка з тонкім станам. *(Я. Колас)* 8. Гэта было ў 1940 годзе. 9. Яшчэ гадзіну якую сядзела Лена як на іголках. *(М. Лобан)*

**155.** Прачытайце тэкст. У сказах знайдзіце акалічнасці. Якая іх роля ў тэксце? Чым яны выражаны? Якім спосабам звязаны акалічнасці з паяснёнымі словамі? Да якіх слоў — членаў сказа — яны адносяцца?

Вось мы і ў вёсцы. Над страхою крайняй хаты, у гняздзе на старой бярозе, уладкоўваецца на ноч сямейства буслоў. Пастух толькі што прыгнаў статак. У дварах бразгаюць цабэркі*. Прыемна запахла сырадоем...

Пачынае цямнець, а вокны ў большасці хат не свецяцца. Толькі ў некаторых паблісквае дрыготкае святло...

Каля адной з хат сядзяць сяляне. Яны толькі што скончылі свой доўгі рабочы дзень і цяпер адпачываюць, ведучы ціхую і няспешную гаворку. Падсядзем да іх, паслухаем, пра што яны гавораць, якія ў іх клопаты, якія думкі... *(В. Вольскі)*

- Дайце тэксту загаловак.
- Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце свой адказ.
- Пастаўце да тэксту пытанні і адкажыце на іх.

## § 28. Акалічнасці месца і часу

**156.** Выразна прачытайце верш. Знайдзіце акалічнасці месца і часу.

Многа слаўненькіх куточкаў
Ёсць у нашым краі,
Дзе пад гоман ручаёчкаў,
Пад шум рэк у гаі
Рой журботных дум пакінеш;
Дзе няма трывогі,
Дзе душою адпачынеш,
Змучаны з дарогі;
Дзе прыемны ветрык млее,
Збажыну
калыша,
Дзе пакоем-згодай вее,
Дзе ўсё шчасцем дыша.

*Я. Колас*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

● Якое значэнне маюць словы, што адказваюць на пытанне *дзе?* Чым яны выражаны, якім спосабам звязаны са словамі, ад якіх залежаць?

Акалічнасць м е с ц а абазначае месца, напрамак дзеяння і адказвае на пытанні **дзе? куды? адкуль?:** *Хмаркі белыя марудна за лясы плывуць.* (Я. Колас)

**157.** Спішыце сказы. Падкрэсліце акалічнасці месца і вызначце, чым яны выражаны.

1. Вакол ляжыць травяністы луг. *(Я. Колас)* 2. Хадзілі дзяўчаты палямі, хадзілі дзяўчаты лугамі, хадзілі ў даль палявую. *(А. Русак)* 3. На вуліцы было многа народу. *(Я. Колас)* 4. Было так хараша вакол, усё цвіло, усё спявала. *(А. Астрэйка)* 5. Адгрымелі ноччу навальніцы, птушак пазванчэлі галасы. *(П. Панчанка)* 6. Перад акном у нас расцвітае чаромха. *(Я. Брыль)* 7. Дзе-нідзе пры дарозе стаялі каранастыя дубы. *(П. Пестрак)* 8. Дзесьці далёка за лесам глуха загрукаталі грымоты. *(З. Бядуля)*

**158.** Прыдумайце словазлучэнні, выкарыстаўшы ў якасці залежных слоў наступныя прыслоўі.

Удаль, углыб, ушыр, увысь, спачатку, зверху.

● Якімі членамі сказа стануць прыслоўі, калі гэтыя словазлучэнні ўвесці ў сказы?

**159.** Прыдумайце сказы, у якіх акалічнасці месца выражаны назоўнікамі ва ўскосных склонах. Запішыце.

У з о р. *Недалёка ад нашай вёскі працякае рачулка. Летам я люблю жыць у вёсцы.*

Пасяджэнне, школа, музей, сцэна, Беларусь, горад, лес.

**160.** Напішыце невялікае сачыненне на тэму «Беражы і ахоўвай родную прыроду». Выкарыстайце ў сказах у ролі акалічнасцей месца дадзеныя словы і словазлучэнні.

Дзесь над ракою, усюды, недзе на лузе, па-над возерам, збоку, навокал, у лесе, аднекуль здалёк, сям-там, воддаль, у небе, ва ўсім свеце.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Акалічнасць часу абазначае час дзеяння, яго працягласць, пачатак ці завяршэнне і адказвае на пытанні **калі? з якога часу? за які час?**: *Бацька ў вольныя часіны расказваў дома ўсе навіны.* (Я. Колас) *Першы гром быў сёння ўночы.* (Н. Гілевіч)

**161.** Выпішыце з кожнага сказа акалічнасць і слова, да якога яна адносіцца. Пастаўце да акалічнасці пытанне, устанавіце спосаб сувязі. Вызначце від акалічнасці паводле значэння.

1. Будзе сёлета багаты ўраджай. *(П. Панчанка)* 2. Часта са старэйшымі вучнямі лекцыі вяліся вечарам пры лямпе. *(Я. Колас)* 3. Буду пець сваю я песню ўзімку, улетку, напрадвесні. *(А. Гурло)* 4. Дождж пайшоў на змярканні. *(К. Чорны)* 5. Я прагавіта ўглядаюся ў прасторы з дзяцінства знаёмай зямлі. *(Я. Колас)* 6. Дзве гадзіны ішла нарада аб становішчы ў Петраградзе. *(І. Шамякін)* 7. Люблю пазіраць я на поле вясной, як ветрык жартліва плыве збажыной. *(Я. Колас)* 8. Ёсць напрадвесні чароўныя раніцы. *(М. Танк)*

**162.** Складзіце і запішыце сказы, каб дадзеныя словы і спалучэнні слоў выступалі ў ролі акалічнасцей часу.

Улетку, заўжды, спрадвеку, сёння, увечары, праз некалькі дзён, учора, навекі, летась, узімку.

**163.** Прачытайце. Вызначце стыль і тып маўлення тэксту. Дайце яму загаловак. Знайдзіце акалічнасці і вызначце, якімі часцінамі мовы яны выражаны.

Абсохла зямля. Дзе-нідзе стала паказвацца зялёная травіца. На пагорку, у лесе, весела гойдае сіняю галоўкай першая вясенняя кветка-сон. У яе аксамітнай галоўцы поўзае пчолка, цалуе яе сінія лісточкі.

Усё варушыцца, прачынаецца ад зімовага сну і холаду. Усё жывое хоча глянуць на высокае сонца. А яно так шчыра саграває яшчэ мокрую зямлю сваім цяплом, добрым святлом.

Сагрэла сонейка і мурашнік. Ён паўгода быў засыпаны снегам. Пачула цяпло і працавітая мурашка. Выпаўзла яна з зямлі. За ёю выпаўзла другая, трэцяя. Вось ужо іх цэлая тысяча таўчэцца, грэецца на сонцы. Яны пагрэліся і зараз


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

жа давай падпраўляць сваю хатку. А яшчэ дзянькі праз два-тры папаўзуць яны ў лес збіраць шыпулькі, смолку.

*(Я. Колас)*

- Зрабіце сінтаксічны разбор апошняга сказа.
- Зрабіце сінтаксічны разбор словазлучэнняў *зялёная травіца, засыпаны снегам, сагравае шчыра.*

**164.** Напішыце аўтабіяграфію, ужываючы акалічнасці месца і часу.

**165.** Адказваючы на пытанні, дапоўніце сказы акалічнасцямі месца і часу. Запішыце. Падкрэсліце словы, да якіх адносяцца акалічнасці.

1. Мы збіралі грыбы (як доўга?) ... . 2. Лугавая сцежка вяла (куды?) ... . 3. Школьнікі працавалі (дзе?) ... . 4. Турысты (калі?) ... адправіліся (куды?) ... . 5. (Як доўга?) ... стаяла цудоўнае надвор'е. 6. Атрад выйшаў (адкуль?) ... (калі?) ... .

Д л я д а в е д к і: *дзве гадзіны, рака, агарод, раніца, гара, на працягу месяца, вёска, світанне.*

## § 29. Акалічнасці прычыны, мэты і спосабу дзеяння

Акалічнасць п р ы ч ы н ы абазначае прычыну дзеяння і адказвае на пытанне **чаму? з якой прычыны?:** *А мяцеліца ад злосці белай грываю трасе.* (З. Бядуля) *Народ загуў ад радасці і здзіўлення.* (Я. Маўр)

**166.** Спішыце сказы, падкрэсліце акалічнасці прычыны. Укажыце, чым яны выражаны.

1. Спрасоння туліцца лісток да аконных рам. *(М. Машара)* 2. Людзі аж прыціхлі ад здзіўлення. *(П. Пестрак)* 3. Рака таўклася ў берагі, хочучы вырвацца з іх. *(У. Караткевіч)* 4. Праз неасцярожнасць з хлопцам здарылася бяда. *(Б. Мікуліч)* 5. Шчокі былі чырвоныя ад марозу. *(І. Шамякін)* 6. У Сцяпана ад сораму ўспыхнулі вушы. *(І. Шамякін)* 7. Нездарма завейнымі начамі снілася мне блізкая вясна. *(В. Вітка)*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**167.** Складзіце і запішыце сказы, каб дадзеныя словы і спалучэнні слоў выступалі ў ролі акалічнасцей прычыны. Вызначце, чым яны выражаны.

Ад спякоты, з гора, ад вялікага хвалявання, праз няўважлівасць, ад хатніх клопатаў, дзякуючы добраму надвор'ю.

Акалічнасць м э т ы абазначае мэту дзеяння і адказвае на пытанні **для чаго? з якой мэтай?:** *Гэта, вядома, было сказана дзеля жарту.* (Б. Сачанка) *Няхай жа для шчасця цвіце ваша доля!* (А. Русак) *Раман Сцяпанавіч ехаў увесну наведаць маці.* (Б. Сачанка)

**168.** Выпішыце са сказаў акалічнасці мэты разам з азначаемымі словамі. Скажыце, чым яны выражаны і як звязаны паміж сабой.

1. Мартын сумыслу едзе павольна і пільна ўзіраецца ў затокі. *(Я. Колас)* 2. Чалавек незнарок зачапіўся за корань і павярэдзіў нагу. *(В. Каваль)* 3. Хлопцы спыніліся непадалёку адпачыць. *(М. Лынькоў)* 4. Ты ідзеш абсохлай абочынай пакланіцца руням маладым. *(Н. Гілевіч)* 5. Для шчасця вашага, сыны, бацькі на ўсё гатовы. *(П. Глебка)* 6. Сыноў бацька сваіх кліча на нараду ў хату. *(Я. Купала)* 7. У той жа дзень наказ быў дадзены ісці Міхалу пад буданы сачыць ваўкоў. *(Я. Колас)* 8. Букрэй аддаў загад расставіць ланцугі дазораў для нагляду за вёскаю. *(Я. Колас)*

**169.** У сказы замест кропак устаўце прапушчаныя акалічнасці мэты.

1. Усе ... насцярожыліся. *(І. Мележ)* 2. Чалавек ... падбадзёрваў сам сябе. *(А. Чарнышэвіч)* 3. Ён прыйшоў ... у школу. *(А. Якімовіч)* 4. Моладзь едзе ў Мінск ... . *(К. Буйло)* 5. Хлопцы спыніліся непадалёку ... . *(М. Лынькоў)* 6. ... стала ціха. *(К. Чорны)* 7. ... я песню складаю. *(К. Кірэнка)* 8. Дзядзька ... загаварыў гучна і рэзка. *(Б. Мікуліч)*

Д л я  д а в е д к і: *адпачыць, зачыніць, сумыслу, мімаволі, вучыцца, знарок, для радасці, наўмысна.*

Акалічнасць спосабу дзеяння абазначае спосаб дзеяння і адказвае на пытанні **як? якім чынам?:** *Натужліва*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

*гулі ў траве чмялі.* (І. Грамовіч) *Ён, не спяшаючыся, ішоў па вуліцы.*

**170.** Выпішыце са сказаў акалічнасці спосабу дзеяння з азначаемымі словамі. Вызначце, якімі часцінамі мовы яны выражаны.

1. Ціха казку веснавую нам шапталі каласы. *(А. Русак)* 2. Лес асенні глуха гудзе. *(П. Панчанка)* 3. Воддаль восень тупае ў маўчанні, воблакаў узняўшы чараду. *(У. Ляпёшкін)* 4. На розныя тоны загулі галасы. *(К. Чорны)* 5. Жуpaвы імкнуць у вырай клінам, крык раняюць за туманнай даллю. *(У. Ляпёшкін)* 6. Час па часе сталі збірацца людзі ў хату. *(М. Машара)* 7. Касцы ідуць то грамадою, то паасобку, то па пары. *(Я. Колас)* 8. Частавалі ад усяго сэрца. *(К. Крапіва)*

**171.** Спішыце, устаўляючы замест кропак акалічнасці прычыны і мэты.

1. Яны не прыйшлі на каток (чаму?) ... . 2. Я зайшоў да хворага таварыша (па якой прычыне?) ... . 3. Мы паехалі на возера (з якой мэтай?) ... . 4. (Па якой прычыне?) ... лыжны прабег прыйшлося адмяніць. 5. Ён выйшаў з пакоя (з якой мэтай?) ... . 6. Кацяня (па якой прычыне?) ... узлезла на дрэва.

**172.** Выпішыце з тэксту акалічнасці спосабу дзеяння з тымі словамі, да якіх яны адносяцца. Вызначце, чым яны выражаны.

Ляснік і двое юных натуралістаў з вялікімі цяжкасцямі прабіраліся праз гушчар. Паціху цямнела. Сонца амаль схавалася за лес. Падарожнікі моцна стаміліся і вырашылі пераначаваць у лесе. Ляснік хутка назбіраў сухіх галінак, і яны ўтраіх перанеслі іх да месца начлегу.

Сонца марудна заходзіла. Паступова перасталі калыхацца галінкі сосен. Зоркі паволі запальваліся на небе. Ціхая, вельмі цёплая ноч спусцілася на лес. Весела трашчала вогнішча. Падарожнікі вячэралі і весела размаўлялі. Адчувалася стомленасць. У хуткім часе размовы сціхлі. Ляснік і хлопчыкі ляглі па-паходнаму на зямлю і адразу заснулі.

*(«Бярозка»)*

**173.** Напішыце сачыненне пра паход у лес, ужываючы акалічнасці месца, часу, прычыны, мэты і спосабу дзеяння.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## § 30. Акалічнасці меры і ступені

Акалічнасці м е р ы і с т у п е н і абазначаюць меру, колькасць чаго-небудзь або ступень праяўлення дзеяння ці прыметы і адказваюць на пытанні **колькі? як многа? у якой ступені? наколькі?**: *Да слёз крануў мяне расказ старога пасечніка.* (Ц. Гартны) *Столькі працы рукам!* (І. Мележ)

**174.** Выпішыце са сказаў акалічнасці меры і ступені і вызначце, чым яны выражаны.

1. Родная ўсмешка кранула маці да слёз. *(І. Шамякін)* 2. Марозік крэпіць, лёд таўшчэе, і рэчка вольная нямее, да дна вадзіца вымярзае. *(Я. Колас)* 3. Прайшло з гадзіну, пакуль гаспадар вярнуўся ў хату. *(К. Чорны)* 4. Пацяплела неба трохі, вырай цягнецца дахаты. *(У. Ляпёшкін)* 5. Дужа багата было непрыемнасцей у Міколкі. *(М. Лынькоў)* 6. Гаворыць дзядзька, бровы хмурыць і бальшуноў ён злёгку журыць. *(Я. Колас)* 7. Надзвычай галасіста спяваюць вясковыя пеўні. *(Б. Мікуліч)* 8. Маляваў Алесь з натуры надта дзіўныя фігуры. *(С. Шушкевіч)*

## § 31. Акалічнасці ўмовы і ўступкі

Акалічнасць у м о в ы абазначае ўмову, пры якой можа адбывацца дзеянне, і адказвае на пытанне **пры якой умове?**: *У выпадку дажджу мы заначуем у вёсцы.* (К. Чорны)

**175.** Спішыце сказы, падкрэсліце акалічнасці ўмовы. Якімі часцінамі мовы яны выражаны?

1. Я ведаў, што, пазнаёміўшыся, мы станем найлепшымі сябрамі. *(Я. Скрыган)* 2. У выпадку добрага надвор'я касьба цягнецца каля двух тыдняў. *(К. Чорны)* 3. Штогод вясну бачым, гуляючы ў полі. *(Я. Купала)* 4. Пры песні і праца спорыцца. *(Я. Колас)* 5. Гуляючы, розуму не прыдбаеш. *(Прыказка)* 6. Пры мілым госцю і гаспадар пажывіцца. *(Прыказка)* 7. Пры гатовай калодзе лягчэй агонь раскладаць. *(Прыказка)*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Акалічнасць **у с т у п к і** абазначае абставіны, насуперак якім адбываецца дзеянне, і адказвае на пытанне **нягледзячы на што?**: *Нягледзячы на дрэннае надвор'е, мы пойдзем у паход.*

**176.** Выпішыце са сказаў акалічнасці ўступкі. Чым яны выражаны?

1. Нягледзячы на туман, выразна відаць абрысы гуцульскіх хат. *(Т. Хадкевіч)* 2. Наперакор звычаю, у гэты раз яму не прысніўся яго заўсёдны пакутны сон. *(В. Быкаў)* 3. На здзіўленне Андрэя, у прыёмнай не было нікога. *(У. Шахавец)* 4. Гэтая ўпэўненасць, насуперак усяму, мацнела. *(У. Карпаў)* 5. Нават калі ён думаў пра Мінск, то трывога, наперакор звычайнаму, не гняла сэрца. *(І. Мележ)* 6. Нягледзячы на позні час, спаць не хацелася. *(М. Лынькоў)*

**177.** Падбярыце да дзеясловаў розныя па сэнсе акалічнасці і запішыце іх.

У з о р. *Ішоў па дарозе (хутка, учора, не спяшаючыся, думаючы, у вёску).*

Чытаць, глядзець, вучыцца, узрыхліць, падарожнічаць.

**178.** Складзіце і запішыце сказы так, каб дадзеныя назоўнікі былі рознымі членамі сказа.

У з о р. *Лес усміхаецца. Я пабачыў лес. Мы пайшлі ў лес. Люблю пах лесу. Тэрыторыя запаведніка — суцэльны лес.*

Вучань, школа, стэп, армія, памяшканне, герой, маці.

**179.** Прачытайце тэкст. Да якога стылю і тыпу ён адносіцца? Вызначце спосабы выражэння дадзеных членаў сказа і іх сэнсава-стылістычную ролю.

Летам мы часта адпачывалі пад вярбою. Дзед шмат апавядаў, а ў крыніцы на дне бесперастанку бурліла вада. Чыстая, халодная, яна біла з-пад зямлі, пампавала ўгору, толькі на паверхні прыкметна спакайнела і павольна цякла ў ручаёк. Ён спачатку бег адным рэчышчам, а далей разліваўся між куп'я, знікаў, хаваўся ў высокай асацэ.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Дзед на сук павесіў карэц*, якім усе пілі ваду з крыніцы. Нап'ешся новым карцом сцюдзёнай вады, і запахне бярозавым сокам. Дзед за вясну рабіў не адзін такі берасцяны карэц, бо не адна крыніца была ў нас на прыкмеце.

Была яшчэ крыніца ў так званых Лісіных гарах. Дзед уставіў туды дубовую бочку без дна. Укапаў глыбока і прасвідраваў клёпку ўверсе. Да дзіркі прыладзіў латок і падставіў выдзеўбанае карыта. Вада падымалася ў бочцы і пачынала пераліваццa па латку ў карыта. Плюскочучы, яна бегла струменьчыкам, а каровы, чуючы гэты звонкі плёскат, самі брылі сюды на вадапой.

Аднойчы ў невыносную летнюю спёку мы набліжаліся да крыніцы пад вярбой. Змораныя, мы ледзь ішлі. Дзед падышоў першы, зняў карэц, напіўся і даў напіцца мне.

Ох, як прыемна стала пасля некалькіх глыткоў вады! Сцюдзёны, асвяжаючы струмень разліваўся па ўсім целе. Свет адразу зрабіўся святлейшы. *(Паводле І. Грамовіча)*

● Складзіце план тэксту і перакажыце яго па плане.

**180.** Прачытайце тэкст. Зрабіце вусны сінтаксічны разбор сказаў. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Ноч была халодная і цёмная. Зрэдку ў паветры з-за хмар выглядвалі адзінокія зоркі. Але Саша не бачыла іх. Яна стаяла на халодным пяску і ўзіралася ў зарэчную цемру. Рака лізала яе босыя ногі. Яна не адчувала холаду. Рака плёскалася, віравала няспынна, шапталася, а за спінай, быццам тысячы жывых істот, варушыўся лазняк. Узляталі і падалі ў атаву начныя птушкі. *(Паводле І. Шамякіна)*

**181.** Прачытайце тэкст, захоўваючы правільную інтанацыю. Вызначце яго асноўную думку, стыль і тып. Абгрунтуйце свой адказ. У сказах знайдзіце акалічнасці і ахарактарызуйце іх.

Табе, шчодры сялянскі стол, хачу сказаць я ласкавае слова. Я памятаю кожную метку на тваіх дошках. Вось гэтыя шрамы ад вострага нажа засталіся з таго часу, калі дзед крышыў на ім табаку, а бабуля — капусту. Гэтыя кругленькія ямачкі — сляды моцных арэшкаў, якія нават малатком разбіць было цяжкавата. А вось гэтыя зарубкі на тваіх ножках расказваюць, як растуць, падымаюцца ўверх дзеці.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Ты прапах аўсяным кісялём, капустаю, блінамі, клёцкамі ды бульбай з грыбамі. Я веру, што ты ўсё яшчэ памятаеш цеплыню і пах загарэлых караваяў, якія толькі што вынялі з печы.

Стол, ты яшчэ не забыўся, як мой бацька пачынаў новы каравай? Ён доўга, старанна абціраў пот, потым браў круглы бохан леваю рукою, прыціскаў яго да грудзей, а праваю абганяў кругом ладны акраец. У сялян была спрадвеку вялікая павага і пашана да хлеба, які ім не так ужо лёгка даваўся.

Стол, ты памятаеш і галодныя дні нашы, калі ў хаце, здавалася, халадала ад бездапаможна парожняй печы. Ты ж ведаеш, як наша мама старалася хоць нечым скрасіць гэты час. Ёй было дастаткова аднаго зубка часнаку і малюсенькага кавалачку здору, каб у нашай хаце запахла, як на каляды. Патоўчанае ўсё гэта разам так здобрывала суп, што мы ніяк не маглі адарвацца ад міскі. І цяпер вось мы можам сабрацца ўсе ў госці, пасядзець за тым жа сталом, успомніць, як дружна мы жылі. Але ранейшае ўжо ніколі не зможа вярнуцца. І нічога не зробіш: птушкі, што вылецелі з аднаго гнязда, вярнуцца ўсе ў яго зноў не могуць. Ім трэба рабіць новыя гнёзды. *(Паводле М. Стральцова)*

- Падбярыце сінонімы да слоў *крышыць, парожні.*
- Выпішыце словы з прадметна-бытавым значэннем. Размяркуйце іх па тэматычных групах.
- Зрабіце марфалагічны разбор слоў *цяжкавата, аўсяным (кісялём), нашы.*

**182.** Прачытайце. Да якога стылю належыць тэкст? Вызначце мэту выказвання, стыль тэксту, сферу яго прымянення, асноўныя стылёвыя рысы.

Даследаванне фанетычнага ладу кожнай мовы патрабуе не толькі апісання спосабаў утварэння і акустычных уласцівасцей асобных гукаў і складоў, але і разгляду таго, як гэтыя гукі і склады выступаюць у моўнай плыні, у рэальным жывым маўленні.

У працэсе камунікацыі велізарная роля адведзена рытміка-меладычнай арганізацыі маўлення, г. зн. інтанацыі. Без адпаведнай рытмічнай арганізацыі набор складоў не можа данесці чалавеку багатую і разнастайную інфарма-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

цыю, змешчаную ў вымаўленых словах, фразах, тэкстах. Калі чалавек чытае марудна, па складах, яму цяжка зразумець сэнс напісанага, слова рассыпаецца, не звязваецца ў адно цэлае.

Агульная накіраванасць рытміка-меладычнай арганізацыі маўлення — стварацць з гукаў, складоў суцэльныя моўныя адзінкі, якія перадаюць пэўныя значэнні. *(Л. Выгонная)*

- Назавіце ў перадапошнім сказе акалічнасці і спосабы іх выражэння.
- Пра што вы даведаліся з тэксту? Пастаўце пытанні да тэксту і адкажыце на іх.

**183.** Напішыце дзелавую паперу: аб'яву, заяву, распіску, даручэнне, даведку (на выбар). Вызначце мэту свайго выказвання і стылістычныя сродкі.

**184.** Прачытайце. Назавіце словы і моўныя сродкі, характэрныя для мастацкага стылю.

Нікла жыццё ў шумным лесе,
Агаляўся твар зямлі,
І ляцелі ў паднябессі
З звонкім крыкам жураўлі.
Восень ткала ўжо красёнцы*
Мяккай чырвані ў лістах,
Восень спеў вяла бясконцы,
З ветрам ходзячы ў кустах:
Восень прала кужаль* тонкі —
Павуціння белы лён;
**Восень шэрая заслонкі**
**Моўчкі клала пад адхон.**
Восень шла ў сырым тумане.
Восень клыгала ўгары.
Восень песні пела зрана,
Восень ныла ўвечары.

*Я. Колас*

- Назавіце словы-сінонімы. Якая іх роля ў вершы?
- Назавіце акалічнасці і вызначце, да якога разраду яны адносяцца, чым выражаны і як звязаны з паяснёнымі словамі.
- Зрабіце сінтаксічны разбор выдзеленага сказа.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**185.** Прачытайце тэкст. Адзначце характэрныя асаблівасці стылю ў лексіцы, марфалогіі і сінтаксісе. Прыдумайце загаловак. Вызначце жанр тэксту.

Князь Барыс мураваў у Полацку царкву і, ну, ведама — гэткая будыніна! — запазычыўся і задаўжаўся кругом. Няма ўжо больш дзе пазычаць! Дык пайшоў урэшце да чорта і папрасіў у яго грошы, кажучы, што на вайну патрэбна. На нішто добрае чорт, вядома, не дасць, але на вайну — пазычыў.

Мінуў год, другі, дзесяты. **Барыс не аддае чорту грошы.** Здакучыла чорту хадзіць; урэшце ідзе ён да свайго старшага, гэтаксама чорта, радзіцца, што рабіць.

— Што ж, — кажа старшы чорт, — дагэтуль ён хітрэйшы за цябе: бо ад чорта грошы ўзяў ды Богу аддаў і ніяк ты з яго не спагоніш! Хіба ён сам згодзіцца на загадкі: ты яму загадай тры загадкі, калі адгадае, дык яго грошы, а не адгадае — бяры яго сюды, мы тут яму пакажам! Прыйшоў чорт да князя пад акно, угаварыўся аб загадках, усё, як яму старшы казаў.

— Добра, — кажа князь, — загадвай!

— Што ўдвух? — загадаў чорт.

— **Дарога карацейшая,** — адказвае князь.

— Што ўтрох?

— Малаціць лягчэй.

— У чатырох? — пытае збянтэжаны чорт.

— Ці чэрці б у цябе грошы прасілі, каб усе чатыркom малацілі!

Тут чорт і ўцёк, бо князь адгадаў усе яго загадкі. *(Паводле В. Ластоўскага)*

- Зрабіце сінтаксічны разбор выдзеленых сказаў (частак сказа).

**186.** Падзяліце тэкст на абзацы і сказы. Пастаўце знакі прыпынку ў канцы сказаў і растлумачце іх. Вызначце сэнсава-граматычную ролю галоўных і даданых членаў сказа.

Васіль трохі **падрамантаваў лыжы**, прыбіў раменьчыкі, нацёр воскам, выразаў палкі на палкі трэба кружочкі, але можна і без іх абысціся пададзеўшы пад пінжачок цяплейшую сарочку, Васіль выязджае на поле калі разгонішся,



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

набегаешся, лішняй вопраткі не трэба цела аж гарыць добра ў полі снежнае покрыва трымае надзейна, лыжы самі бягуць наперадзе — аж да лесу — **сінявата-белая роўнядзь**, на якой **сям-там цямнеюць** кусты Васіль кіруе да лесу хоча наведаць мясціны, дзе летам збіраў грыбы можа, не прыйдзецца болей павандраваць па верасах хвілін дваццаць бегу, і ён у лесе маўклівыя, засяроджаныя стаяць хвоі, бярозы, асіны пануе зацятая цішыня між дрэў ісці цяжэй лыжы правальваюцца, і Васіль выбірае прагаліны вось нарэшце маладыя сасңякі, схаваныя пад снежнай пасцеллю верасы, па якіх ён блукаў летам воблік, настрой мясцін настолькі змяніўся, што Васіль не пазнае іх уражанне такое, што, акрамя маўклівых хваін, бярэзін, якія нібы журацца ў снезе, белай роўнядзі, хмурнага неба, нічога больш на свеце няма *(І. Навуменка)*

- Зрабіце сінтаксічны разбор выдзеленых словазлучэнняў.
- Назавіце словы, вымаўленне якіх не супадае з напісаннем.
- Зрабіце марфалагічны разбор слоў *набегаешся, павандраваць, цяжэй.*

**187**. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Вызначце стыль тэксту. Знайдзіце адрозненні паміж мовай арыгінала і мовай перакладу.

Каштанка вскочила и бросилась на гуся.

— Это что такое? — послышался громкий, сердитый голос, и в комнату вошёл незнакомец в халате и с сигарой в зубах. — Что это значит? На место!

Он подошёл к коту, щёлкнул его по выгнутой спине и сказал:

— Фёдор Тимофеевич, что это значит? Драку подняли? Ах ты, старая каналья! Ложись!

И, обратившись к гусю, он крикнул:

— Иван Иваныч, на место!

Кот покорно лёг на свой матрасик и закрыл глаза. Судя по выражению его морды и усов, он сам был недоволен, что погорячился и вступил в драку. Каштанка обиженно заскулила, а гусь вытянул шею и заговорил о чем-то быстро, горячо и отчётливо, но крайне непонятно.

— Ладно, ладно! — сказал хозяин, зевая. — Надо жить мирно и дружно, он погладил Каштанку и продолжал: — А


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

ты, рыжик, не бойся... Это хорошая публика, не обидит. Постой, как же мы тебя звать будем? Без имени нельзя, брат.

Незнакомец подумал и сказал:

— Вот что... Ты будешь — Тётка... Понимаешь? Тётка!

И, повторив несколько раз слово Тётка, он вышел. Каштанка села и стала наблюдать. *(А. Чехов)*

## Кантрольныя пытанні і заданні

**Варыянт 1**

1. На якія віды падзяляюцца дадзеныя члены сказа паводле агульных граматычных значэнняў?
2. Назавіце адметныя асаблівасці прамых і ўскосных дапаўненняў.
3. Раскажыце пра дапасаваныя прыдаткі, выражаныя ўласнымі назвамі, аб пастаноўцы злучка пры іх.
4. Назавіце і ахарактарызуйце віды акалічнасцей па значэнні.
5. Прачытайце. Падзяліце тэкст на часткі. Якімі спосабамі звязаны ў ім сказы? Вызначце сродкі сувязі. Зрабіце сінтаксічны разбор чатырох двухсастаўных развітых сказаў.

*Я падагнаў лодку да вострава. Востраў зарос алешнікам і ажыннікам. Было ціха, сонца садзілася ў ружовую хмарку, чорнымі слупамі таўкліся камары. Пра такую пару толькі і марацъ рыбакі.*

*Аднак рыба не бралася, і я вырашыў паблукаць па востраве. Раптам у кустах зацокаў салавей. Я асцярожна пайшоў на яго голас. Салавей спяваў голасна, не палохаючыся мяне. І толькі калі я падышоў зусім блізка, на момант заціх. Ён сядзеў на тоненькай галінцы і незадаволена пазіраў на мяне: чаму, маўляў, перашкаджаеш? Мне стала сорамна. Я адышоў.*

*І ён зноў заспяваў — моцна, урачыста. Захоплены яго спевамі, я прысеў на пянёк і раптам заўважыў, што слухаю песню салаўя не адзін. З дупла высокай асіны высунулася пыска ваверкі. Яе чорныя вачаняты былі ўважлівыя і задуменныя.*

*Вось дык слухач! Што ж — удваіх весялей.* (М. Капыловіч)

**Варыянт 2**

1. Ахарактарызуйце кожны дадзены член сказа адносна значэння, спосабу выражэння і сінтаксічнай сувязі з паяснёным словам.
2. Назавіце адметныя асаблівасці дапасаваных і недапасаваных азначэнняў.
3. Раскажыце пра ролю дапаўненняў у мове.
4. Назавіце спосабы выражэння акалічнасцей.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

5. Прачытайце. Падзяліце тэкст на часткі. Вызначце асноўныя сродкі сувязі, якімі звязаны сказы. Зрабіце сінтаксічны разбор чатырох двухсастаўных развітых сказаў.

*Вось ужо чацвёрты месяц, як Коля Дубовік памочнікам машыніста на практыцы. Па сэрцы прыйшоўся яму настаўнік, машыніст Мікалаевіч. Коля яго з паўслова разумее, па вачах яго загады чытае. Сёння Мікалаевіч упершыню дазволіў свайму памочніку сесці за пульт кіравання. Спачатку боязна было Колю. Ён углядаўся ў бліскучыя стужкі рэек, а правую руку на ўсякі выпадак паклаў на тармазны кран.*

*Ужо зусім развіднела. На павароце Коля высунуў галаву з акна, убачыў вялізны састаў з таварнымі вагонамі і цыстэрнамі. Сэрца юнага памочніка напоўнілася гонарам. Нават дух заняло. Няўжо гэта ён з Мікалаевічам удвух гэткую сталёвую махіну вядуць? Семдзесят восем вагонаў! Сёння ён упершыню адчуў адказнасць, якую ўскладае на машыніста дыспетчар.* (А. Кобец-Філімонава)

# АДНАСАСТАЎНЫЯ СКАЗЫ

## § 32. Віды аднасастаўных сказаў

**188.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце граматычную аснову ў сказах. Адзначце, якія са сказаў маюць два галоўныя члены (дзейнік і выказнік), а якія складаюцца толькі з аднаго галоўнага члена (дзейніка або выказніка) ці з аднаго галоўнага і даданых членаў.

Цягнік шыбка ідзе, раве, імчыцца, вырываецца з горада ў шырэйшыя і цішэйшыя прасторы.

Прыемна імчацца. Усякі палёт прыемны. Уздым пачуцця.

Вечарэе. Халадком павявае. Расце лес.

Пад самаю Масквою — і столькі вялікага, прыгожага, праўдзівага лесу. Тут жа ўсё, уздоўж усяе дарогі, дачныя пасёлкі, прыгожыя дачныя будыначкі.

І дачнікі ідуць па адным, па два, па тры, групамі, з кошыкамі, з вудамі, з пакункамі і так, з пустымі рукамі. Некаторыя, абняўшыся, гуляюць, прыбраныя, чыстыя, вясёлыя...

Ціхі вечар. Цёплая і цёмная ноч... Прыемна ехаць.

Кладуся. Буду ляжаць, засну.

Адзін я са сваімі думкамі.

А хочацца спаткацца, пагаманіць... *(Паводле М. Гарэцкага)*

- Растлумачце значэнне словазлучэння *праўдзівы лес*.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**189.** Прачытайце сказы. Вызначце галоўныя члены сказа і іх састаў. Чым выражаны галоўныя члены?

1. Табе складаю шчыры свой санет, прапрадзедаў мая жывая мова... *(Е. Лось)* 2. Новых сяброў набывай, але старых не забывай. *(Прыказка)* 3. Зноў над роднай зямлёй вее водарам хмельным, вясновым. *(Н. Гілевіч)* 4. За песні і весялосць празвалі Васіліну ў вёсцы Вяснянкай. *(Т. Хадкевіч)* 5. Гарачы летні дзень. Жніво. Напружаная праца. *(Я. Сіпакоў)*

● Назавіце сказы: а) у якіх дзеянне, названае выказнікам, суадносіцца з пэўнай асобай; б) у якіх дзеянне, названае выказнікам, суадносіцца з няпэўнай асобай; в) у якіх дзеянне, названае выказнікам, можа быць аднесена да кожнага, да любой асобы; г) у якіх дзеянне, названае выказнікам, не можа быць аднесена да дзейнай асобы; д) у якіх сцвярджаецца існаванне з'явы рэчаіснасці.

Якія гэта сказы паводле наяўнасці саставу галоўных членаў? Абгрунтуйце сваю думку.

Сказы, граматычная аснова якіх складаецца з аднаго галоўнага члена, называюцца а д н а с а с т а ў н ы м і.

У аднасастаўных сказах другі галоўны член або не патрэбны для разумення сэнсу сказа: *Вечар. Чытаю газету,* або яго наогул не можа быць: *На дварэ змяркаецца.*

У залежнасці ад віду галоўнага члена аднасастаўныя сказы падзяляюцца на дзве групы: 1) з галоўным членам дзейнікам: ***Снег. Яліны... Агеньчыкі** ў вокнах.* (У. Караткевіч); 2) з галоўным членам выказнікам: *Жытні колас і васілёк на кашулі бацькавай **помню.*** (Р. Барадулін)

**190.** Разгледзьце табліцу. Падрыхтуйцеся і раскажыце, на якія віды падзяляюцца аднасастаўныя сказы ў залежнасці ад віду галоўнага члена сказа і яго граматычнага выражэння.






Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**191.** Прачытайце верш. Знайдзіце аднасастаўныя сказы. Чым выражаны ў іх галоўныя члены? У якіх сказах можна вызначыць утваральніка дзеяння, а ў якім — не? Па чым можна вызначыць утваральніка дзеяння?

Робім да стомы. Цягнемся. Марым.
Век здаганяем. Героямі ходзім.
Зззяем, як сонца. Чарнеем, як хмары.
Нешта губляем. Амаль не знаходзім.
Моцна кахаем. Ад шчасця
заходзімся.
Рады, як чэрці. Як людзі, сумуем.
Сварымся. Мірымся. І разыходзімся.
Дзён не хапае. Тыдні марнуем.
Любім дзяцей. Патураем ім.
Цешымся.
Радуюць дзеці. Дзеці палохаюць.
Грукне бяда — ад адчаю хоць
вешайся.
Ну і наследнікі! Ахаем, охаем.
Верым з калыскі, што лепшае
спраўдзіцца.
Побыт бацькоўскі не памятаем.
Плачам. Рагочам. Клянёмся
не скардзіцца.
Дзесьці насмецім. Не падмятаем...

*П. Панчанка*

● Якія сказы пераважаюць у вершы? З якой мэтай гэта зроблена?

**192.** Прачытайце тэксты. Знайдзіце і запішыце аднасастаўныя сказы. Дакажыце, што яны аднасастаўныя.

I. Непрыкметна ляцеў час. На двары гудзела завіруха. Кідала ў вокны сухі снег, і ён бясконца шурпаў па шыбах. Вецер біў у бляшаны дах, нібы ў бубен. Гудзела ў коміне. У пакоі было цёпла, утульна. Ярка-ярка гарэла настольная лямпа. Рытмічна і гэтак спакойна цікаў будзільнік. Было ўжо вельмі позна. Але Сяргею не хацелася спаць. Хацелася сядзець і сядзець вось так, глядзець на маці, слухаць яе расказ, які гучаў, як песня. *(І. Шамякін)*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

II. Пасля цэлага месяца ліпеньскай спёкі сабралася над нашай вёскай навальніца. Грымела ўсю ноч, і спорны аж да раніцы дождж шчодра мачыў перасохлую зямлю. Раніцаю як быццам праяснілася: вырвалася з-за хмар пасвяжэлае сонца, усё наўкруга заіскрылася, заспявала, зазвінела. Але ненадоўга. Хутка зноў захмарыла, дождж разахвоціўся і дробна ды густа ліў да самага вечара і ўсю наступную ноч.

Распагодзілася толькі на трэція суткі. І адразу вёску абляцела навіна: у Курганні баравікоў хоць касой касі.

*(К. Кірэенка)*

- Зрабіце словаўтваральны разбор слова *заіскрылася.*
- Растлумачце значэнне фразеалагізма *хоць касой касі.* Успомніце або знайдзіце ў слоўніку антанімічны фразеалагізм.

## § 33. Пэўна-асабовыя сказы

**193.** Параўнайце сказы ў кожнай пары. Чым яны адрозніваюцца?

1. Я прачынаюся звычайна ў сем гадзін раніцы. Прачынаюся звычайна ў сем гадзін раніцы. 2. Ты не забудзеш яе папярэдзіць? Не забудзеш яе папярэдзіць? 3. Мы пойдзем у тэатр. Пойдзем у тэатр. 4. Вы верыце яго словам? Верыце яго словам? 5. Ты прынясі заўтра на занятки слоўнік. Прынясі заўтра на заняткі слоўнік. 6. Вы скажыце яму пра здарэнне. Скажыце яму пра здарэнне.

П э ў н а - а с а б о в ы м і называюцца аднасастаўныя сказы, у якіх выказнік абазначае дзеянне пэўнай, канкрэтнай асобы. Як правіла, ён выражаецца дзеясловамі ў форме 1-й і 2-й асобы адзіночнага або множнага ліку цяперашняга і будучага часу абвеснага і загаднага ладу і абазначае дзеянне пэўнай, канкрэтнай асобы: *Ад роднай мовы, ад роднай нацыі* ***не адцураюся, не адракуся!*** (П. Панчанка)

Асабовыя канчаткі дзеясловаў-выказнікаў выразна паказваюць на дзейную асобу, якая адпавядае займеннікам *я, мы, ты, вы,* таму ў структуры сказа яна неабавязковая. Самае важнае ў такіх сказах — дзеянне, а не дзейная асоба.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Пэўна-асабовыя сказы даволі ўжывальныя ў мове. Яны робяць выказванне дынамічным, лаканічным, даюць магчымасць пазбегнуць паўтору асабовых займеннікаў: *Ну, што ж стаіш, Вераніка? Не бойся! Бліжэй падыдзі.* (Н. Гілевіч)

Пэўна-асабовыя сказы часта ўжываюцца ў гутарковай мове, у дыялогу, у мове мастацкай літаратуры, а таксама ў афіцыйна-дзелавым стылі.

**194.** Спішыце. Пасля кожнага сказа ў дужках адзначце, якая форма выказніка дазволіла выразіць значэнне пэўнай асобы.

1. Працуем, не знаем спакою, не ведаем стомы ў руках... *(П. Броўка)* 2. Углядайся, мой сыне, пільней углядайся ў святыя абрысы бацькоўскай зямлі. *(Н. Гілевіч)* 3. Пачакай! Не гавары так строга. *(З. Бядуля)* 4. Сядайце, госці, за стол наш багаты адзначыць святочны час. *(А. Астрэйка)*

● Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.

**195.** Прачытайце. Што новага вы даведаліся з дадзенага тэксту пра пэўна-асабовыя сказы?

У пэўна-асабовых сказах галоўны член не можа быць выражаны дзеясловамі ў форме прошлага часу абвеснага ладу або дзеясловамі ў форме ўмоўнага ладу, таму што такая форма ў сваім звычайным значэнні не паказвае на адносіны дзеяння да канкрэтнай асобы. Напрыклад, у сказах **Сядзеў за сталом** *(К. Чорны)* ці **Сядзела б сабе дома на печы** *(В. Каваль)* утваральнік дзеяння невядомы і ўзнаўляецца толькі з кантэксту або сітуацыі. Значыць, гэтыя сказы не аднасастаўныя, а двухсастаўныя няпоўныя, паколькі другі галоўны член тут апушчаны. Але калі форма прошлага часу абвеснага ладу або форма ўмоўнага ладу ўжываецца ў значэнні загаднага ладу, як, напрыклад, у сказах **Пайшлі, хлопцы** *(Я. Колас)*; **Схадзіў бы, сынку, па каня** *(П. Галавач)*, то яны таксама могуць паказваць на канкрэтную асобу, якая ў прыведзеных сказах абазначана звароткам. Зразумела, што ў дадзеным выпадку сказы павінны кваліфікавацца як пэўна-асабовыя. *(Паводле Л. Бурака)*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**196.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Выпішыце пэўна-асабовыя сказы. Якімі асабовымі формамі дзеяслова выражаны ў іх выказнік?

Высокі, ладна складзены, ён узышоў на абрыў, спыніўся і, як мне здалося, памкнуўся працягнуць руку, каб пазда-роўкацца з чалавекам з таго берага.

— Даўно не бачыў цябе, — гаварыў той. — Ці, можа, ездзіў куды?

— Не, ездзіць не ездзіў, але, сам ведаеш, прыпар. З таго вунь поля астатнія снапы звозім... А што ў цябе чуваць?

— Як быццам таксама парадак. Малоцім на ўсю сілу. Папар рыхтуем да сяўбы. Ды вось нешта трактар закапрызні-чаў, дык я і заглянуў сюды... *(Паводле Т. Хадкевіча)*

- Назавіце дзеясловы, ужытыя ў пераносным значэнні.
- Растлумачце значэнне слоў *прыпар, папар.*

**197.** Выпішыце з мастацкага твора тэкст гутарковага стылю, у якім ёсць пэўна-асабовыя сказы. Якая іх роля ў тэксце?

**198.** Напішыце віншаванне свайму сябру (сяброўцы). Выкажыце яму (ёй) пажаданне, выкарыстоўваючы пэўна-асабовыя сказы. Якую ролю яны выконваюць у вашым тэксце?

**199.** Складзіце і запішыце невялікае пісьмо родным (сябру, знаёмым), выкарыстоўваючы ў ім пэўна-асабовыя сказы пры апі-санні свайго рэжыму дня.

**200.** Знайдзіце і прачытайце ў падручніку па геаметрыі для IX класа тэкст, у якім ёсць пэўна-асабовыя сказы. Адкажыце, чаму пры апісанні ходу матэматычнага доказу немэтазгодна ўключаць у сказы дзейнік, выражаны займеннікам.

**201.** Прачытайце сказы. Перабудуйце аднасастаўныя пэўна-асабовыя сказы ў двухсастаўныя, увёўшы ў іх дзейнік, выражаны асабовым займеннікам. Запішыце. Вызначце, якія сказы з'яўляюцца больш лаканічнымі. Чаму?

1. З акна імклівай машыны гляджу на ўрадлівае поле. 2. Загружаем лодку. Наверх нацягваем брызент. Увязваем вяроўкамі груз. 3. Стаю ля акна ў цішы калідора. 4. Дзіву


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

даюся нязмернай працавітасці маёй бабулі. 5. Па пышным лузе нацянькі шыбую з вудай да ракі.

- Падбярыце сінонімы да дзеяслова *шыбую*.
- Растлумачце правапіс слова *нацянькі*. Зрабіце яго марфалагічны разбор.

**202.** Прачытайце сказы. Вызначце, чым выражаны ў іх галоўны член сказа і на што ён указвае. Запішыце.

1. Чакай мяне ў госці, мая дарагая рака, рака маіх продкаў. *(Б. Сачанка)* 2. Мацуйся, ідзі, працавітая, да новых здабыткаў, краіна! *(П. Глебка)* 3. У нас адну малую птушку чамусьці кнігаўкай завуць. *(Я. Брыль)* 4. Шлю падзяку вёскам і сябрам, жытнім копам на шырокім полі. *(А. Куляшоў)* 5. У дзверы пакоя нясмела пастукалі. *(І. Шамякін)*

## § 34. Няпэўна-асабовыя сказы

Н я п э ў н а - а с а б о в ы м і называюцца аднасастаўныя сказы, у якіх выказнік абазначае дзеянне няпэўнай або невядомай асобы. У няпэўна-асабовых сказах выказнік выражаецца дзеясловам у форме 3-й асобы множнага ліку прошлага, цяперашняга і будучага часу: *З нашай бульбы тысячу, не меней, **смажаць** і **гатуюць** розных страў*. (П. Панчанка) Дзякуючы форме 3-й асобы множнага ліку ўся ўвага пераносіцца на дзеянне, а не на дзейную асобу, якая мысліцца няпэўна: *Па тэлебачанні **будуць паказваць** мастацкі фільм.* У гэтым сказе важна, што будуць паказваць фільм, але ўтваральнік дзеяння невядомы (яны, нехта).

Няпэўна-асабовыя сказы пашыраны ў гутарковай мове, ужываюцца ў аб'явах: ***Просяць** захоўваць цішыню. Тут **прадаюць** кнігі.* Да няпэўна-асабовых адносяцца сказы тыпу: *Як цябе **завуць**? **Завуць** яе Аленай. Яе **звалі** Нінай.*

**203.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Дайце тэксту загаловак.

Уехалі ў лес і згубіліся ў зялёных вяршынях соснаў. Дрэвы стаялі яшчэ мокрыя. Добра тут хвастаў начны дождж,


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

шмат назбіваў лісця. Нават былі абламаны некаторыя танчэйшыя галіны. У ручаях, што шыліся праз траву і мох, плыло збітае дажджом лісце.

Спусціліся на конях у сырую лагчыну. Лес тут перарваўся вялікім прагалам-палянаю. Леваруч ад сцежкі ўбачылі агромністы таўсманы дуб. Начны ветравал вывернуў яго з зямлі, паклаў на бок. Шырокія лісты падсвечвала сонца. Дужа шмат жалудоў было на дубе, шмат іх было рассыпана ў траве. На бугрыстай, пасечанай сякерамі гадоў, кары пырхалі бліскучыя стракозы. Даўжэзныя карані, што яшчэ зусім нядаўна жылі пад зямлёю, бездапаможна тапырыліся ў неба, высушваліся сонцам і ветрам і ўвачавідкі бялелі.

*(І. Навуменка)*

- Знайдзіце і выпішыце няпэўна-асабовыя сказы.
- Што з'яўляецца больш важным у гэтых сказах: само дзеянне ці ўтваральнік дзеяння?
- Чым адрозніваюцца паміж сабой пэўна-асабовыя і няпэўна-асабовыя сказы?
- Якую сэнсава-стылістычную функцыю выконваюць аднасастаўныя сказы ў тэксце?

**204.** Спішыце. Вызначце, чым выражаны галоўныя члены сказаў. Як дзеянне, названае ў сказах, суадносіцца з дзейнай асобай?

1. Малоцяць зараз у дзве змены. *(С. Грахоўскі)* 2. У штабе затрымалі надоўга, не далі адпачыць. *(І. Мележ)* 3. На плошчы маршыравалі цэлы дзень. *(М. Гарэцкі)* 4. На балоце калісьці капалі торф. *(К. Чорны)* 5. Доўга не лажыліся спаць і ў Майчынай зямлянцы. *(М. Лынькоў)* 6. Над плошчай стаяў вялікі гоман. Гаварылі, віталіся, запрашалі партызан на пачастунак. *(М. Лынькоў)* 7. Сувязіст услухаўся і паведаміў: «Вас выклікаюць у штаб палка на нараду». *(А. Кулакоўскі)*

**205.** Дадзеныя няпэўна-асабовыя сказы замяніце двухсастаўнымі, падкрэсліце дзейнік і выказнік. Чым выражаны выказнік у няпэўна-асабовых і двухсастаўных сказах? Раскажыце пра розніцу ў значэнні зыходнага і новага сказаў.

У з о р. *Запалілі вогнішча, і мы сталі грэцца.* — *Было запалена вогнішча, і мы сталі грэцца.*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

1. Патушылі агні, і ўсе ляглі спаць. 2. Аб гэтым возеры многа пісалі ў газетах, і мы вырашылі схадзіць туды ў паход. 3. Прынеслі свежыя газеты, і мы прыняліся чытаць. 4. Васілю пазванілі, і ён адразу паспяшыў ісці. 5. Вечарам запалілі ў печы, і Алесь яшчэ доўга глядзеў на агонь.

**206.** Прыдумайце па два сказы з кожным з пададзеных ніжэй дзеясловаў — двухсастаўны і аднасастаўны няпэўна-асабовы. Супастаўце пары сказаў па значэнні і структуры. Запішыце.

Узор. *Рабочыя будуюць новы дом. — Новы дом будуюць хутка.*

Прадаюць, купляюць, слухаюць, чытаюць, пішуць, глядзяць, выключаюць, званяць.

**207.** Выпішыце з мастацкіх твораў або складзіце самастойна і запішыце сем няпэўна-асабовых сказаў.

## § 35. Абагульнена-асабовыя сказы

Абагульнена-асабовымі называюцца сказы, у якіх выказнік абазначае дзеянне, што ў аднолькавай ступені адносіцца да кожнага, да любой асобы: *Рэшатам вады* ***не наносіш.*** (Прыказка) *Вясновым паветрам* ***дыхаеш*** *і ніяк* ***не можаш надыхацца.*** (Я. Брыль)

Выказнік абагульнена-асабовых сказаў найчасцей выражаецца дзеясловамі 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку цяперашняга і будучага часу абвеснага, а таксама загаднага ладу, радзей — формамі 1-й або 2-й асобы множнага ліку цяперашняга часу абвеснага ладу: *Адным рукамі нямнога* ***зробіш.*** (Прыказка) ***Не шукай*** *ветру ў полі.* (Прыказка) *Сем разоў* ***адмерай*** *— адзін раз* ***адрэж.*** (Прыказка) *Увосень за стол* ***просім.*** (Прыказка)

Абагульнена-асабовыя сказы шырока ўжываюцца ў мове прыказак.

**208.** Прачытайце сказы. Дакажыце, што яны з'яўляюцца абагульнена-асабовымі. Чым выражаны ў іх выказнік?

1. Па нітачцы і клубочак знойдзеш. *(Прыказка)* 2. Думай звечара, а рабі зранку. *(Прыказка)* 3. Прыслухаешся і пачы-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

наеш адчуваць неабдымнасць нашай зямлі, бязмежжа яе прастораў. *(С. Грахоўскі)* 4. З затоеным дыханнем слухаем музыку, музыку прыходу вясны. *(Р. Няхай)* 5. Сябра за грошы не купіш. *(Прыказка)*

- Растлумачце значэнне прыказак.

**209.** Прыдумайце невялікае сачыненне-апісанне сённяшняга надвор'я, ужываючы абагульнена-асабовыя сказы.

**210.** Выпішыце са зборнікаў беларускіх прыказак пяць абагульнена-асабовых сказаў. Растлумачце іх значэнне. Якая з прыказак вам больш спадабалася? Чаму? У якой сітуацыі вы маглі б выкарыстаць яе?

## § 36. Безасабовыя сказы

Б е з а с а б о в ы м і называюцца сказы, у якіх дзеянне і стан не ўтвараюцца дзейнай асобай: *Зранку* ***парыла, пякло****. Надвячоркам* ***пачало хмарыцца*** *паволі.* (Н. Гілевіч) ***Вечарэла****. На вуліцы* ***ціха****.* (Я. Колас)

**211.** Разгледзьце табліцу. Звярніце ўвагу на спосабы выражэння выказніка ў безасабовых сказах і значэнні гэтых сказаў. Адкажыце, у якіх выпадках безасабовыя сказы можна перабудаваць у двухсастаўныя.

| Просты выказнік | | |
|---|---|---|
| Двухсастаўныя сказы | Безасабовыя сказы | Спосабы выражэння выказніка ў безасабовым сказе |
| Надышоў вечар. | *Вечарэе.* (Стан прыроды) | безасабовы дзеяслоў |
| Веяў халадок. | *Веяла халадком.* (Стан навакольнага асяроддзя) | асабовы дзеяслоў у безасабовым значэнні |
| Я не сплю. | *Мне не спіцца.* (Стан чалавека) | зваротны дзеяслоў у безасабовым значэнні |
| Будзе дождж. | *Быць дажджу.* (Непазбежнасць) | неазначальная форма дзеяслова |
| | *На двары ціха.* (Стан прыроды) | прыслоўе са значэннем стану |


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

| | | |
|---|---|---|
| Я вясёлая.<br><br>Я многа перажыў у апошнія гады. | *Ёй весела.* (Стан чалавека)<br>*Ім многа перажыта ў апошнія гады.* (Вынік дзеяння)<br>*З агнём жартаў няма.* (Адсутнасць чаго-небудзь) | прыслоўе са значэннем стану<br>дзеепрыметнік залежнага стану<br><br>адмоўнае слова ***няма*** |
| Састаўны дзеяслоўны выказнік | | |
| Данілка слухаць не хацеў. | *Данілку слухаць не хацелася.* (Стан чалавека) | безасабовы дапаможны дзеяслоў + неазначальная форма дзеяслова |
| Састаўны іменны выказнік | | |
| Лес быў ціхі і вільготны.<br><br><br>Хата была праветрана, памыта. | *У лесе было ціха і вільготна.* (Стан прыроды)<br><br>*У хаце было праветрана, памыта.* (Вынік дзеяння) | дзеяслоў-звязка ў безасабовай форме + прыслоўе са значэннем стану<br>дзеяслоў-звязка ў безасабовай форме + дзеепрыметнік залежнага стану |

Як паказвае табліца, безасабовыя сказы могуць выражаць стан прыроды і навакольнага асяроддзя, стан чалавека, жывёлы, непазбежнасць або адсутнасць чаго-небудзь (каго-небудзь).

Безасабовыя сказы часцей за ўсё ўжываюцца ў жывой, гутарковай мове і ў мове мастацкай літаратуры.

**212.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Выпішыце безасабовыя сказы. Вызначце, чым у іх выражаны выказнікі. Дайце тэксту загаловак.

Сярод восені выдаюцца часамі ясныя, светлыя дні. Ціха ўсюды. Вецер не скалыхне ні адзін лісцік, ні адну травінку. Ласкавае неба пазірае на зямлю, нідзе ні хмурынкі. Ясна і хораша. Нібыта вярнулася лета, падарыла восень людзям яшчэ некалькі ясных, светлых і цёплых дзён. Усюды ціха, цёпла і ясна. Так ціха, што чутно, як лятуць пчолкі, як


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

звіняць у паветры тоненькім галаском кучкі мошак. Але ўжо не вее тым жыццём, якое відаць вясною.

Куды ні кінь вокам, на ўсім убачыш след восені. Хмурны хваёвы лес чуць заслаўся сінім дымком туману, і стаіць не ўзварухнецца, як у якім задуменні. А бярозы, асіны і дубы чырванеюць здалёк сваім лісцем і напамінаюць сабою пра восень. Над усім ляжыць сіняваты слой смугі. *(Паводле Я. Коласа)*

Безасабовыя сказы часта ўжываюцца ў мастацкай літаратуры пры апісанні пачуццяў, адчуванняў чалавека, малюнкаў прыроды, навакольнага асяроддзя: *У душы — **прасторна, лёгка, весела:** май ідзе праз нівы і бары.* (*Н.* Гілевіч) *І **люба** мне глядзець на поле, дзе колас гнецца да зямлі.* (А. Гурло) ***Вечарэла.** З балот **пацягнула** цёплаю вільгацыю.* (Я. Колас)

Ужываюцца безасабовыя сказы таксама ў афіцыйных паведамленнях, аб'явах, на сходах: ***Забараняецца** выносіць кнігі з чытальнай залы. **Прапануецца** наступны склад прэзідыума. **Рэкамендуецца** рэцэпт стравы.*

**213.** У пададзеных складаных сказах замяніце безасабовыя сказы двухсастаўнымі. Ці мяняецца ад гэтага сэнс сказа? А яго адценні?

1. Яго здароўе было моцна падарвана, і пакуль прыходзілася лячыцца. 2. Сонца ўжо стаяла нізка над гарызонтам, і трэба было спяшацца. 3. Бацька скажа адно слова, і ўсё будзе зроблена. 4. Хутка настане восень, і мне трэба ехаць у горад. 5. Стала цёмна, і вуліца зусім апусцела.

**214.** Просты сказ замяніце складаным са злучнікам *і* так, каб адна з частак стала безасабовым сказам. Ці змяніўся сэнс сказа?

Узор. *Я заплакала і адчула палёгку. — Я заплакала, і мне стала лягчэй.*

1. Я хацеў выканаць практыкаванне і сказаў аб гэтым настаўніку. 2. Дзіцё было хворае і хацела спаць. 3. Праехаць тут ён не змог і павярнуў назад.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**215.** Прадоўжыце сказы так, каб злучнік *і* злучаў: 1) дзве часткі складанага сказа *(Стала холадна, і дзеці разбегліся);* 2) аднародныя члены сказа *(Стала холадна і сумна).* Вызначце від кожнага сказа. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку.

1. Усім было весела і ... . 2. Хлопчык прачнуўся і ... . 3. Будаўніцтва дома было завершана і ... . 4. Хвораму далі лекі і ... . 5. Сёння мяне апранулі па-святочнаму і ... .

**216.** Прыдумайце ўсе магчымыя віды аднасастаўных сказаў на дадзеную тэму.

У з о р. *Хутка прыйдуць летнія канікулы. — Абавязкова пойдзем на летніх канікулах у паход.* (Пэўна-асабовы) *У школе рыхтуюцца да летніх канікул.* (Няпэўна-асабовы) *У час летніх канікул у школе бывае шмат работы.* (Безасабовы)

1. Летам дзеці збіраюць лекавыя расліны.
2. Экскурсія была вельмі цікавая.
3. Неўзабаве пойдуць грыбныя дажджы.

**217.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце аднасастаўныя сказы, а таксама часткі складаных сказаў, якія маюць форму аднасастаўных сказаў. Вызначце іх від, абгрунтуйце сваю думку. Дайце тэксту загаловак.

Возера Бабровіцкае. Невыказная ласкавая шэрасць цёплай, амаль зусім спакойнай вады. Навокал — пена пасля нядаўніх баранчыкаў з бела-стракатымі на цёплай шэрасці палоскамі. Мы вярталіся ў імклівай маторцы, над намі тарахцеў верталёт геолагаў, знаёмых старшыні калгаса, які вадзіў нас па гэтых мясцінах.

Там, дзе раней былі Бабровічы, цяпер растуць маладыя бярозы, буяе трава. З-за купіны выскачыў заяц. Пустэча.

У новых, адбудаваных на другім месцы, Бабровічах мы зноў, як і ў іншых паселішчах, як і ўчора і пазаўчора, запісвалі расказы ацалелых.

Высока зверху — над светлым пакоем калгаснай бібліятэкі, дзе мы слухалі людзей, над новай вялікай вёскай, над усім гэтым азёрна-лясным кутком заходняга Палесся — да самых касмічных арбіт жыве, бушуе ў сонцы наша перамога, у свеце наспяваюць новыя небяспекі, ідзе змаганне за тое, каб яны не прыйшлі.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Унізе, у глыбінях народнага жыцця, у жыццядайнай прастаце яго крынічаць раны памяці, якія нічым не загоіш.

*(Паводле А. Адамовіча)*

- Разбярыце аднасастаўныя сказы па членах сказа. Вызначце сэнсава-граматычную ролю дзеясловаў.
- Падзяліце тэкст на сэнсавыя часткі.

**218.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак. Знайдзіце і выпішыце аднасастаўныя сказы. Вызначце іх сэнсава-стылістычную ролю. Абгрунтуйце мэтазгоднасць ужывання аднасастаўных сказаў у тэксце.

Пахмурным асеннім днём, вяртаючыся з грыбоў, я прысеў на ўзлеску на пянёк, каб адпачыць. І зусім нечакана ўбачыў на траве пачарнелую ад часу гільзу. І ўспомнілася, нахлынула...

...Гэткім жа пахмурным асеннім днём я прыбягаў сюды, на ўзлесак, і тады, перад самым прыходам у нашу вёску немцаў. Тут, на ўзлеску, быў бой. Нашы вайскоўцы, адступаючы, сутыкнуліся з немцамі. Немцы ўцяклі. Адступілі, захапіўшы з сабой параненых. І мы, хлапчукі, счакаўшы які дзень, пабеглі на ўзлесак, на месца бою. Лазілі па кустах, неглыбокіх свежых акопчыках. Збіралі адстраляныя гільзы. Панюхаўшы адну з іх, я крыкнуў:

— Хлопцы, а чым гэтыя гільзы так пахнуць?

Нехта са старэйшых таўхануў мяне ў плячо, сказаў са злосцю:

— Не крычы! Порахам пахнуць...

Я знайшоў некалькі, мусіць, згубленых у спешцы патронаў. Выняў з іх кулі, высыпаў на далонь порах, панюхаў яго. Але пытацца, чым пахне порах, не асмеліўся...

...Прайшлі гады. Я перажыў акупацыю, пабываў за калючым дротам у фашысцкіх лагерах. Бачыў, як гарэлі хаты, гінулі дарослыя і дзеці, чым пахне порах, я ўжо ведаю. Добра ведаю. І, калі мяне хто-небудзь пытае, чым пахне порах, я адказваю:

— Смерцю. Пахне вайной і смерцю... *(Паводле Б. Саchанкі)*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**219.** Прачытайце. Вызначце тэму і галоўную думку тэксту. Перакажыце тэкст са зменай асобы і часу, з ужываннем развітых і неразвітых аднасастаўных сказаў.

Святочныя раніцы ціхія. Ніхто не спяшаецца на работу.

Я іду ў лес. Восень няўстойлівая — і ў канцы верасня выпаў снег, у кастрычніку былі прымаразкі. Дажджы сталі церусіць перад самымі святамі. Жыццё ў лесе ўсё ж не замерла. У сасонніках па жаўтапёсах, імхах там-сям пракідаюцца зялёнкі. Вялікімі сем'ямі растуць кволыя, някідкія на выгляд грыбы — цёмныя каптурыкі на тоненькай ножцы, у нашай мясцовасці іх называюць куркамі. Яшчэ нават познюю кветку можна напаткаць. Свеціцца сіняе ці жоўтае вочка, і цяжка растлумачыць, як гэтая далікатная раслінка вытрымала замаразкі.

Між соснамі і ў лагчынах туман. Ён шчыльны, густы, але на вачах рассейваецца. Можа быць сонечны дзень.

Добра ў лесе — нават у такім вось асеннім. Будзённы клопат, надакучлівыя думкі сплываюць, дыхаецца, думаецца лёгка. Уся істота як бы яднаецца са святочнай урачыстасцю і спакоем, які тут пануе. Прыемна бачыць усё, што трапляе на вока: ядлоўцавыя кусты — яны амаль заўсёды суседнічаюць з мурашкамі, пясчаныя пляшыны прагалін, камяні-валуны, парослыя па баках зялёным мохам.

Вялікага парадку ў лесе няма: сосны растуць як папала, хоць і былі некалі пасаджаны пад шнур, валяецца ламачча, там-сям тырчаць пні, але гэты бачны, адчувальны беспарадак усё адно лашчыць позірк, як бы ў ім стоены нейкая найвышэйшая суладнасць і прыгажосць. *(Паводле І. Навуменкі)*

- Зрабіце фанетычны разбор слова *ламачча.*

## § 37. Назыўныя сказы

**220.** Прачытайце выразна ўрывак з верша П. Глебкі «Пасылка». Знайдзіце двухсастаўныя сказы і аднасастаўныя з галоўным членам дзейнікам. Вызначце, чым выражаны дзейнік у аднасастаўных сказах. Якія з'явы рэчаіснасці яны называюць? Ці зручныя гэтыя сказы для перадачы адпаведнай інтанацыі? Чаму?


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Ноч. Халодная зямлянка.
Перастрэлка. Цішыня.
**Неба чыстае, як шклянка,**
**Тупат быстрага каня.**
Мы пазналі без памылкі,
Што пад сховай цемнаты
Нам даставілі пасылкі,
Тэлеграмы і лісты.

- Адкажыце, якія ўмовы неабходны, каб слова стала сказам.
- Растлумачце знакі прыпынку ў выдзеленым сказе.

Н а з ы ў н ы я — гэта такія аднасастаўныя сказы, у якіх сцвярджаецца наяўнасць прадметаў і з'яў: *Позняя* ***восень****. Дробны* ***дождж****.* (А. Чарнышэвіч)

Галоўны член сказа — дзейнік — звычайна выражаецца назоўнікам у форме назоўнага склону, зрэдку — спалучэннем слоў: ***Самор'е. Год трыццаць дзевяты.*** (А. Звонак)

У саставе назыўных сказаў могуць быць толькі азначэнні (дапасаваныя і недапасаваныя): ***Жнівеньская*** *спёка. Пірог* ***з капустай****.*

Назыўныя сказы вымаўляюцца запаволеным тэмпам, паміж імі робіцца працяглая паўза, лагічны націск падае на дзейнік.

У канцы назыўных сказаў на пісьме ставяцца кропка, клічнік, пытальнік або шматкроп'е.

**221.** Прачытайце верш. Вызначце назыўныя сказы. Як з іх дапамогай аўтар сцвярджае наяўнасць прадметаў і з'яў?

Снежань. Дарога. Вятрыска. Завея.
Хата. Гармонік. Лады. Перабор.
Скокі. Чаканне. Жаданне. Надзея.
Позіркі. Поціскі.
Рэўнасць. Дакор.
Клятвы. Ўгаворы...
Уздых. Дараванне.
Шчасце...
Світанне.

*Г. Юрчанка*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**222.** Вызначце назыўныя сказы.

1. Снежная пустыня. Цішыня. *(І. Шамякін)* 2. Каля акна — пісьмовы стол. На ім — вучнёўскія кнігі і сшыткі. 3. Цішыня. Над туманнай лагчынай, як браты, абняліся дубы. *(А. Звонак)* 4. За сценкай — ціха. 5. Вось і лета. Ліпнёвая раніца. *(П. Трус)* 6. На дварэ дождж.

- Якія дадзеныя члены сказа могуць уваходзіць у назыўныя сказы? Чаму?
- Якую ролю адыгрывае парадак слоў у назыўных сказах?

**223.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль і тып. Правільна праінтануйце назыўныя сказы. Чым выражаны дзейнік у назыўных сказах?

Кастрычнік. Пагодлівая раніца. Пахне марозікам. На ўсходзе — сінь. Хмары фіялетавыя або шэрыя. І агнявая, распаленая чырвань сонца, якое ўзыходзіць.

Туманнае ранне. Узлессе. Лес мяшаны. Я гляджу на жоўты вяршняк бярэзніку, і мне здаецца, што гэта з-за туману ўзыходзіць сонца.

Сыры, лагодны ранак. Рунь — хоць выціскай яе ад вільгаці. На ржышчы прыхоплены марозікам асот, а на дарозе — адна пушыстая, апырсканая расой галоўка дзьмухаўца.

*(Паводле Я. Брыля)*

- У чым своеасаблівасць пейзажнай замалёўкі, перададзенай назыўнымі сказамі?
- Выпішыце назыўныя сказы. Зрабіце разбор па членах сказа. Якія з іх развітыя? Чым яны развітыя?
- З чым звязана назва месяца *кастрычнік?*
- Што за расліна *дзьмухавец?* Чаму яе так назвалі? Як яна называецца ў рускай мове?
- Выпішыце словы, у якіх адбылося падаўжэнне гукаў. Абгрунтуйце свой выбар.

**224.** Выкарыстоўваючы пададзеныя словы і словазлучэнні, стварыце звязны тэкст на тэму «Надыход вечара».

Дзень, верасень, цішыня, асенні парк, ранняя восень, цёплае надвор'е, лёгкі шорах, нізкае неба, хараство, жоўтае лісце, дрэвы, ясені, ліпы, клёны, вячэрняе сонца, паўзмрок.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**225.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Назавіце ў сказах дзейнікі. Чым яны выражаны? Выпішыце назыўныя сказы.

Мокра, сцюдзёна, хмарна, сумна. Горы. Дробная таёжная лісцвянка. Пустата. Толькі казённыя будынкі ды часам рабочыя, што ладзяць чыгунку.

Балотная даліна. Рэчанькі балотныя. Незвычайна буйны жоўты казляк. Сітнікі. І розная балотная трава з краскамі і без красак, толькі я не ведаю, што як завецца. Не люблю гэтага балота.

Вышэй на лузе ўсё тыя самыя буйныя, як мак, чырвона-жоўтыя званочкі. *(Паводле М. Гарэцкага)*

- Выпішыце з тэксту прыслоўі і зрабіце іх словаўтваральны аналіз.
- Зрабіце марфалагічны разбор слоў *сумна, жоўты (казляк).*

Назыўныя сказы вельмі кароткія (лаканічныя) па форме. Яны шырока ўжываюцца ў творах мастацкай літаратуры пры апісанні пейзажу, часу і месца дзеяння, а таксама зручныя пры напісанні дзённікаў, рэпартажаў: ***Май.*** *Вішнёвы* ***пажар****. Сіні* ***ранак****. Па ваду да крыніцы ты ідзеш цераз луг, што ў кветкі прыбраны.* (П. Панчанка)

**226.** Прачытайце. Вызначце стыль і тып, галоўную думку тэксту. У якіх сказах заключана галоўная думка? Прыдумайце загаловак. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары.

Дзеці... З імі вайна аб..шлася асабліва бя..літасна. У яе кр..вавым віры загінула 13 міл..ёнаў малых. А тыя, хто застаўся ж..ць, пра*(?)*шлі праз н..чалавечыя пакуты.

Але дзеці былі не толькі ахв..рамі. Яны ўліваліся ў рады змагароў. Разам з бацькамі ва..валі ў партызанскіх атрадах, у па..поллі, былі сынамі і дочкамі палкоў. З былых юных г..рояў утвораны в..домы ўсім батал..ён беларускіх арл..нят.

Студзень 1989 года... Мінск... На свой першы ..лёт сабраліся дзеці вайны. Успаміны... Словы болю, гневу, удзячнасці...

Каб не паўтар..ліся жахі вайны, сабраліся дэлегаты ..лёту. *(З часопіса «Бярозка»)*

- Зрабіце марфемны разбор слоў *жыць, прайшлі, успаміны.*
- Падкрэсліце сказы, якія маюць адзін галоўны член — дзейнік. Для чаго яны ўжытыя ў тэксце?



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**227.** Уявіце, што вы пайшлі ў паход і пачалі весці дзённік назіранняў. Запішыце свае назіранні за адзін дзень паходу, выкарыстоўваючы назыўныя сказы. Ці прыдатныя яны для перадачы ўласных думак? Чаму?

**228.** Прачытайце верш, захоўваючы патрэбную інтанацыю. Вызначце ролю назыўных сказаў у вершы.

ХЛЕБНЫЯ СЛОВЫ

Адценне слоў — не глупства,
Ты ім не пагарджай.
Скарынка. Скіба. Луста.
Акраец. Каравай.
Акраец — шлях, дарога
І зайцаў хлеб лясны.
Скарынка — сум, трывога
І боль былой вайны.
А скіба — дзень вясновы.
Ралля. Плугі. Сяўба.
Наш хлеб — жыцця аснова,
Працяг і барацьба.

*П. Панчанка*

- Успомніце і запішыце некалькі прыказак пра хлеб.
- Знайдзіце словы-сінонімы ў вершы.

↑ Затранскрыбіруйце словы, у якіх напісанне не супадае з вымаўленнем.

**229.** Прачытайце сказы. Знайдзіце назыўныя і разбярыце іх па членах сказа.

1. Вунь невялікая паляна, каля яе — некалькі хат. *(К. Чорны)* 2. На таку — горы збажыны. Пшаніца. Грэчка. Лён. Лубін. *(І. Шамякін)* 3. У лесе цішыня. *(Я. Колас)* 4. Вёска хавалася ў цемры. Цішыня. *(І. Новікаў)* 5. Круглае поле. Узгоркі. Каменне. Лес па краях як сцяна. *(Я. Колас)*

**230.** Спішыце сказы. Вызначце віды аднасастаўных сказаў. Зрабіце іх сінтаксічны разбор.

1. Добрага чалавека не перахваліш. *(Прыказка)* 2. Навуку за плячыма не носяць. *(Прыказка)* 3. На сухой траве не было ні расінкі. *(І. Шамякін)* 4. Прыемна было адчуваць


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

пяшчоту вясенняга сонца. *(Я. Колас)* 5. Асенняя раніца. У паветры яшчэ вісіць дробны шэры пыл. *(А. Якімовіч)* 6. Люблю мой сад пад белым цветам. *(Цётка)* 7. Праз невялікае акенца бачу зацягнутае хмарамі неба. *(П. Кавалёў)*

**231.** Перабудуйце аднасастаўныя сказы ў двухсастаўныя.

1. Чалавеку вельмі цяжка разлучацца з роднымі мясцінамі. 2. Па сцежцы ідзём да ракі. 3. Люблю лугі квяцістыя, палеткі каласістыя. 4. У небе празрыстая сінява. Яснае сонца. 5. У настаўніку бачылі чалавека вялікага сэрца і адкрытай душы.

● Растлумачце правапіс і вымаўленне слова *(па) сцежцы.*

● Да якога разраду адносяцца прыметнікі ***квяцісты, каласісты.*** Якім спосабам яны ўтвораны?

**232.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Дайце яму загаловак. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце свой выбар.

Поднялась большая тёмная туча, закрыла полнеба. Загромыхал гром.

Понёсся по лесным макушкам сильный вихрь. Зашумели, закачались деревья, закружились над тропинкой сорванные листья.

Упали первые тяжёлые капли. Сверкнула молния, ударил гром. Капля за каплей хлынул проливной дождь.

После проливного дождя пахнет в лесу грибами.

В траве у тропинки прячутся крепкие боровики, розовеют мокрые сыроежки, краснеют нарядные мухоморы. Словно малые ребята, толпятся черноголовые подберёзовики.

Между белыми стволами берёз густо разросся молодой частый ельник. Здесь скрываются душистые грузди и красноголовые подосиновики.

А на лесных полянах показались первые рыжики, желтеют золотые лисички. *(И. Соколов-Микитов)*

● Зрабіце сінтаксічны разбор аднасастаўнага сказа (на выбар).

↑ Успомніце і падбярыце прыклады на правіла напісання назоўнікаў з прыстаўкай ***паў-***.

**233.** Напішыце сачыненне-апісанне малюнкаў прыроды ў мастацкім стылі.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## § 38. Паглыбленне паняцця пра публіцыстычны стыль

**234.** Выпішыце з кніг, газет, часопісаў і іншых крыніц пяць невялікіх тэкстаў featuring рознага стылю, у якіх ёсць аднасастаўныя сказы. Ахарактарызуйце тэксты, карыстаючыся планам адказу і захоўваючы паслядоўнасць у разважанні:

1. У якой маўленчай сітуацыі можа прагучаць дадзены тэкст?
2. У чым заключаецца задача маўлення (абмяняцца ўражаннямі; даць дакладную інфармацыю, растлумачыць якое-небудзь паняцце; стварыць вобраз, карціну; выказаць свае адносіны да прадмета маўлення; заклікаць слухача, чытача да дзеяння)?
3. Якім з'яўляецца выказванне (нязмушаным ці афіцыйным, эмацыянальным ці нейтральным, канкрэтным ці абагульнена-адцягненым)?
4. Якія моўныя сродкі, уласцівыя для гэтага стылю, выкарыстаны ў тэксце?

П у б л і ц ы с т ы ч н ы стыль — гэта стыль перыядычнага друку, прамоўніцкага маўлення і інш. У ім рэалізуюцца інфармацыйная і пабуджальная функцыі мовы. Гэта набліжае публіцыстычны стыль да н а в у к о в а г а і м а с т а ц к а г а. Аднак у публіцыстычным стылі інфармацыйная і пабуджальная функцыі маюць сваю спецыфіку. Інфармацыя, па-першае, прызначаецца не для вузкага кола спецыялістаў, а для ўсёй грамадскасці, па-другое, павінна даводзіцца да адрасата хутка, аператыўна. Уздзеянне скіравана не толькі на розум, але і на пачуцці адрасата. У публіцыстычным стылі могуць выкарыстоўвацца элементы навуковага, афіцыйна-дзелавога, гутарковага стыляў; часта выкарыстоўваюцца мастацкія сродкі (у прыватнасці, вобразнасць). Нягледзячы на наяўнасць стандарту, у публіцыстычным стылі можа праяўляцца аўтарская індывідуальнасць.

**Задачы публіцыстычнага стылю —** паведаміць інфармацыю і ўздзейнічаць на чытача, выклікаючы пэўны водгук.

**Асноўныя рысы публіцыстычнага стылю:**

надзённасць;

лаканічнасць падачы матэрыялу пры інфармацыйнай насычанасці;


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

даходлівасць выкладу матэрыялу (газета — найбольш распаўсюджаны сродак масавай інфармацыі);

яркасць, эмацыянальнасць, абагульненасць, а часта нязмушанасць выказвання.

**Характэрныя асаблівасці публіцыстычнага стылю:** выкарыстанне моўных штампаў, клішэ *(працаўнікі палёў, сяброўская атмасфера);* выкарыстанне перыфразы *(другі хлеб — бульба, блакітныя дарогі — водныя шляхі).*

**Сінтаксіс** тэкстаў публіцыстычнага стылю мае свае асаблівасці:

пераважнае выкарыстанне простых сказаў;

няпоўныя, без дзеясловаў, сказы *(Мы — у рэдакцыю);*

аднасастаўныя сказы розных відаў, асабліва ў якасці загалоўкаў *(«Міражы і рэальнасць», «Не палепшылі, а пагоршылі»);*

градацыя — аднародныя члены сказа, размешчаныя ў парадку ўзрастання ці ўбывання, змяншэння *(Было ў ім нешта* ***сонечнае, яснае, залатое****);*

рытарычныя пытанні *(Ну як не любавацца родным краем?);*

рытарычныя звароткі *(****Радзіма мая****, на долю тваю выпалі неймаверныя выпрабаванні);*

пытальныя, клічныя сказы;

антытэзы *(Вайна — гора і смерць),* інверсіі *(Законы патрэбна паважаць),* анафары *(Кніга — крыніца ведаў. Кніга — скарбонка вопыту),* паралелізм у будове сказаў;

чляненне сказа, пры якім змест рэалізуецца ў некалькіх адрэзках, аддзеленых адзін ад аднаго знакамі прыпынку і паўзамі *(Прыйшло вызваленне. Доўгачаканае. Радаснае).*

На **тэкставым** узроўні таксама праяўляецца неаднароднасць, супярэчлівасць публіцыстычнага стылю. ***Разважанне, апавяданне, апісанне*** — усе гэтыя тыпы маўлення сустракаюцца не толькі ў межах стылю ўвогуле, але і ў межах аднаго тэксту.

Публіцыстычны тэкст часта мае вольную кампазіцыю (дарожныя нататкі, дзённікі і інш.); у некаторых жанрах (нататка, інфармацыйнае паведамленне) пераважаюць тэксты стэрэатыпнай будовы.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**235.** Прачытайце тэкст. Пералічыце асноўныя стылёвыя прыметы, якія дапамаглі вам вызначыць стыль гэтага тэксту.

СЯБРОЎКІ

Увайшоў у змрочны бор. Доўга хадзіў і слухаў. Ага, нехта стукае, варакузіцца.

Іду на стук. Убачыў — сядзіць у камлі яліны чорная птушка ў акуратным чырвоным барэціку і дзяўбе кару.

Жаўна! Лапатая, кіпцюрастая, дзюба на краёчках светлая, у кутках жаўтлявая, а шапачка чырвоная-чырвоная. Вока ў белай аблямоўцы.

Прайшоў далей, пад двухпутку, па якой падвозяць да ТЭЦ паліва. На бетонных сценах падземнага перахода крыжы і зоркі, жывапіс у выглядзе рокераў з адпаведнымі надпісамі. Выйшаў на святло, па снезе, утыканым цыбукамі палыну і сухімі суквеццямі крываўніку, зноў трапіў у глухі, запаветны бор. Убачыў сойку. Скакала па яловым шыгаллі, дзяўбла нешта. Вунь яшчэ птушка мільгнула. Села на пень паміж мной і сойкай. Жаўна! Старая знаёмая?!

Жаўна як села на пень, дык адразу ў работу — толькі трэскі ляцяць. Падышоў бліжэй. Сойка не спудзілася, не заверашчала. Бо чорны дзяцел ёй як вартаўнік. Раз завіхаецца каля пня, значыць, усё спакойна. Яны побач, за два-тры метры. І не сварацца, не замінаюць адна адной. Быццам добрыя сяброўкі — жаўна і сойка. «Розныя харчовыя базы», — патлумачаць арнітолагі. Дзве сяброўкі... Ну, а я — трэці лішні. Завярнуўся і пайшоў у іншы бок.

*(З феналагічнага дзённіка А. Наварыча)*

## § 39. Рэпартаж

**236.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і жанр, сваю думку абгрунтуйце.

У МІНСКІМ ЗААПАРКУ НАРАДЗІЛАСЯ ЛАМА

Вось ужо некалькі дзён наведвальнікаў Мінскага гарадскога заапарка радуе новы жыхар.

У мясцовай сям'і лам Кузьмы і Машы нарадзілася дачка Кума (імя складаецца з першых складоў імёнаў бацькоў).


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Лама, як вядома, амаль з нараджэння становіцца на ножкі. Кума таксама праз паўгадзіны навучылася бегаць, а цяпер ужо вельмі лёгка скача. Нованароджаную Куму можна ўжо ўбачыць у вальеры. Маленькая лама — жывёла вельмі ласкавая, дзеці спакойна могуць яе пакарміць з рукі, пагладзіць.

● Пералічыце асаблівасці нататкі як жанру публіцыстычнага стылю.

Адным з жанраў публіцыстыкі з'яўляецца рэпартаж.

Р э п а р т а ж — гэта жывое апавяданне відавочцы пра якую-небудзь падзею з грамадскага жыцця. Задача аўтара рэпартажу — расказаць пра падзею так, каб слухачы ці чытачы быццам бы ўбачылі яе наяву.

Рэпартаж і інфармацыйная нататка маюць агульны змест: паведамленне пра якую-небудзь значную грамадскую падзею. Аднак паміж імі ёсць і істотнае адрозненне: нататка толькі *паведамляе* пра падзею як пра факт, што адбыўся, рэпартаж — *адлюстроўвае* падзею як працэс.

У інфармацыйнай нататцы аўтар свядома «застаецца ўбаку», не раскрываючы сваіх адносін да падзеі. У рэпартажы, наадварот, асоба аўтара заўсёды прысутнічае, праяўляюцца яго адносіны да падзеі.

**237.** Вызначце стыль і жанр тэксту. Сваю думку абгрунтуйце, абапіраючыся на тэарэтычныя палажэнні параграфа.

НЕ ПРАХОДЗЬЦЕ МІМА

Пра што вы падумаеце ў першую чаргу, калі пачуеце слова «профіль»? Хутчэй за ўсё, успомняцца элегантныя выявы антычных герояў на карцінах, гравюрах і манетах.

Вось і мне, калі я збіралася на фотавыставу «Профілі Беларусі», якая размясцілася ў сталічнай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна, здавалася, што я ўбачу нашых суайчыннікаў у вобразе велічных цэзараў і непрыступных клеапатр. Аднак, як аказалася, на выставе не было ніякага намёку на антычнасць...

Так, не было багінь і багоў, цароў і царыц, затое былі афіцэры, фотажурналіст, манахіня, мастачка і шмат-шмат


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

іншых, не менш каларытных асоб. Не было царскай фанабэрыстасці і боскай недасягальнасці, затое былі шчырасць, непасрэднасць і праўдзівасць.

Аўтар работ Даян Макдональд — не прафесійны фатограф, а аташэ па пытаннях інфармацыі, адукацыі і культуры Пасольства ЗША ў Беларусі. Мэта яе праекта — не дасягненне нейкіх вышынь у тэхніцы фатаграфіі, а адлюстраванне цудоўных, мімалётных імгненняў жыцця людзей.

Даян адзначае, што фатаграфія ў профіль можа вельмі шмат расказаць пра чалавека, нават больш, чым здымак у анфас*. ...Такія розныя, дарослыя і юныя, сумныя і вясёлыя, сур'ёзныя і камічныя, рашучыя і цярплівыя, але такія аднолькава простыя ў сваёй сапраўднасці героі праекта «Профілі Беларусі».

Не пакідае раўнадушным трыпціх «Змена настрою» — тры здымкі Валерыя Анісенкі (мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі), якія адпавядаюць яго зусім розным настроям. Адухоўленасцю павявае ад фотаработы «Мастачка», дзе паказана дзяўчына, захопленая сваёй работай.

Увогуле, гэта толькі некаторыя фрагменты аднаго вялікага палатна, якім уяўляецца выстава, таму што цудоўных работ — дзесяткі. Як і шмат людзей, вартых стаць героямі падобных праектаў! Цудоўна, што знайшоўся чалавек, які здолеў нам гэта паказаць. *(В. Пруднікава)*

● Паспрабуйце запісаць гэты тэкст у форме інфармацыйнай нататкі. Што для гэтага трэба зрабіць?

**238.** Прагледзьце 2—3 нумары любой газеты, знайдзіце рэпартажы. Пра якія падзеі ў іх апавядаецца? Назавіце тэмы. Якія дэталі апісання дапамагаюць вам «убачыць» падзеі?

Знайдзіце ацэначныя словы і выразы, у якіх выяўляюцца адносіны рэпарцёра да падзеі.

**239.** Складзіце памятку для таго, хто будзе пісаць рэпартаж. Якія пункты вы ў яе ўключыце?

Адзіных, абавязковых для ўсіх выпадкаў правіл пабудовы рэпартажу няма: кожны піша па-свойму.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Аднак выдзяляюць з а ч ы н — пачатак рэпартажу. Гэта можа быць апісанне месца дзеяння, навакольнага стану і інш. — усё залежыць ад аўтарскай задумы.

Зачын павінен быць *дынамічны*. Дынамічным яго робіць выкарыстанне разнастайных аднасастаўных сказаў, бездзеяслоўных канструкцый. Рэпартаж можа пачынацца з непасрэднага звароту да чытачоў. Напрыклад:

*1. Давайце пройдземся паміж радамі ганчароў і паназіраем за іх працай. Спачатку падыдзем...*

*2. Восем гадзін раніцы. Пахне мятай. Ужо пад'язджаюць пчаляры...*

*3. Поўдзень. Мы на самым высокім пагорку ў вёсцы. Добра відаць...*

**240.** З папярэдніх тэкстаў практыкаванняў № 236, 237 прывядзіце прыклады, якія ілюструюць тэарэтычныя палажэнні параграфа.

**241.** Адрэдагуйце пачатак рэпартажу. Перабудуйце, дзе гэта магчыма і дарэчы, двухсастаўныя сказы ў аднасастаўныя. Вызначце іх стылістычную функцыю. Завяршыце зачын двухсастаўным сказам, у якім намячаецца тэма рэпартажу і раскрываюцца адносіны аўтара да архітэктурнага помніка.

Мы знаходзімся ў Мінску. Мы знаходзімся на галоўнай плошчы горада — плошчы Незалежнасці. Мы падышлі да Чырвонага касцёла. Мы знаёмімся з архітэктурай і гісторыяй помніка.

Ц э н т р а л ь н а я ч а с т к а рэпартажу — апавяданне пра падзею — звычайна ўяўляе сабой *апавяданне.*

Як вядома, галоўнымі словамі ў апавядальным тэксце з'яўляюцца *дзеясловы.* Часцей за ўсё яны ўжываюцца ў цяперашнім часе. Гэта стварае ўражанне «імгненнасці», «маментальнасці» падзеі.

К а н ц о ў к а рэпартажу ўтрымлівае ацэнку падзеі, кароткі вывад, да якога прыходзіць аўтар і да якога ён падводзіць чытача.

У рэпартажы заўсёды прысутнічае асоба аўтара, раскрываюцца яго адносіны да апісваемай падзеі (радасць, гонар, спачуванне і інш.). Выказаць гэтыя пачуцці дазва-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

ляюць розныя сінтаксічныя канструкцыі: пытальныя сказы ці цэлы ланцужок іх, клічныя сказы, звароткі, пабочныя словы і сказы і інш.

**242.** Уявіце сабе, што вам даручылі весці рэпартаж на адну з тэм: «Хакейны (футбольны) матч», «На ўроку роднай мовы», «Свята нашай вёскі (горада)». Запішыце 5—7 сказаў. Падкрэсліце дзеясловы. Не забудзьце пра галоўнае: вы не проста апавядаеце пра падзею, а паказваеце, як гэта адбывалася («цяперашні час» рэпартажу).

● Пасля напісання рэпартажу вусна пракаменціруйце, як вам удалося (з дапамогай якіх моўных сродкаў) перадаць адносіны да апісваемай падзеі.

## Кантрольныя пытанні і заданні

### Варыянт 1

1. Якія сказы называюцца аднасастаўнымі?
2. Якія віды сказаў вылучаюцца ў аднасастаўных з галоўным членам выказнікам?
3. Што абазначае і якімі формамі дзеяслова выражаецца выказнік няпэўна-асабовых і абагульнена-асабовых сказаў?
4. Чаму абагульнена-асабовыя сказы часцей сустракаюцца ў прыказках (прымаўках)?
5. Выпішыце з тэксту аднасастаўныя сказы. Зрабіце іх сінтаксічны разбор.

*З самых юначых гадоў марыў стаць паляўнічым, а ніколі не ўдалося нават пахадзіць па лесе са стрэльбаю. Даўно чуў, што рыбацтва — найлепшы спорт і найлепшы адпачынак.* (Я. Скрыган)

### Варыянт 2

1. Чым выражаецца выказнік у безасабовых сказах?
2. Якія сказы адносяцца да назыўных? Што яны абазначаюць?
3. Якімі часцінамі мовы выражаецца дзейнік у аднасастаўных сказах? Прывядзіце прыклады.
4. Якую функцыю выконваюць аднасастаўныя сказы ў маўленні? Раскажыце на прыкладзе аднаго віду.
5. Выпішыце з тэксту аднасастаўныя сказы. Зрабіце іх сінтаксічны разбор.

*Мокры, халодны чэрвень.*

*Каля поўдня выглянула сонца. Мацней запахла летняй граззю і зялёнаю вільгаццю. Іду ў сваю вёску. За грэбляй сухая сцежка, абапал якой яшчэ нярослае, але ўжо каласістае, сіва-зялёнае жыта.* (Я. Брыль)


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## НЯПОЎНЫ СКАЗ

### § 40. Няпоўны сказ і яго будова

Паводле будовы і значэння сказы могуць быць поўныя і няпоўныя. П о ў н ы м і лічацца сказы, у якіх ёсць усе члены сказа, неабходныя для поўнага разумення сэнсу: *Сын чытае цікавую кнігу*. Выказнік *чытае* дапасуецца да дзейніка *сын* і кіруе дапаўненнем (чытае што?) *кнігу*, азначэнне *цікавую* дапасуецца да дапаўнення *кнігу*. У выніку ўтвараецца непарыўны ланцужок сувязей паміж словамі. Змест такіх сказаў зразумелы сам па сабе, ён не патрабуе папярэдняга кантэксту*: *Салавейка летняй ночкай разлівае сваю трэль.* (А. Русак) *Світае. Кружыцца снег.* (З. Бядуля) *З кім жыць, таго не гнявіць.* (Прыказка) *Восеньская ноч. Туман. Вецер. Дождж.* (В. Быкаў)

У маўленні часта ўжываюцца і няпоўныя сказы, у якіх адсутнічаюць якія-небудзь члены сказа, а гэта значыць ланцужок сувязей парушаецца:

— *Якую кнігу чытаеш?*

— *Цікавую.*

Адказ на пытанне з'яўляецца няпоўным сказам, паколькі ў ім прысутнічаюць не ўсе звёны ланцужка слоў, хоць адказ зразумелы з кантэксту (моўнага акружэння). Азначэнне *цікавую* патрабуе звяна *кнігу*, слова *кнігу* патрабуе кіруемага дзеяслова *чытаю,* а дзеяслоў сваім асабовым канчаткам падказвае звяно *я*.

Няпоўныя сказы, узятыя самі па сабе, асобна ад іншых, становяцца незразумелымі. Так, напрыклад, незразумелы ўзяты асобна сказ: *Ідзе хутка.* Невядома, хто ідзе (ён, яна, яно, Алесь і г. д.). Аднак у кантэксце *Ірына спяшаецца. Ідзе хутка* нам вядома, што ідзе *Ірына*, а не хто іншы. Гэтым няпоўныя сказы адрозніваюцца ад аднасастаўных сказаў, сэнс якіх зразумелы, хоць у іх можа адсутнічаць дзейнік ці выказнік: *Іду хутка.* Зразумела, што іду *я* — *моўца* (той, хто гаворыць).



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**243.** Разгледзьце табліцу і адкажыце, якія члены сказа могуць апускацца ў няпоўным сказе. Што садзейнічае гэтаму? Ці з'яўляецца адсутнасць членаў сказа перашкодай для разумення сэнсу выказвання?

| Апушчаныя члены сказа | Прыклады |
|---|---|
| а) Дзейнік | *Пад столлю вялізнай залы гучыць мяккая, як ручаіна, пявучая, як голас птушкі, гнуткая і цвёрдая адначасова, лаканічная мова.* ***Гучыць упершыню за шмат год.*** (У. Караткевіч) |
| б) Выказнік | *З аднаго боку дарогі стаяў хвойнік,* ***з другога — кусты ядлоўцу, а далей — алешнік.*** (Я. Колас) |
| в) Абодва галоўныя члены сказа | *Гадзіны тры прайшло, а потым дождж закапаў.* ***Спачатку рэдка, а потым усё часцей ды часцей.*** (А. Чарнышэвіч) |
| г) Даданыя і галоўныя члены сказа | *— Ты ела сёння, Таня?*<br>***— Ела, — прашаптала дзяўчына.*** (І. Шамякін) |

Н я п о ў н ы м і называюцца сказы з апушчанымі галоўнымі ці даданымі членамі.

Апушчаныя члены сказа могуць быць як у простым сказе, так і ў складаным. Як правіла, няпоўную форму мае апошняя частка складанага сказа: *Спяшаецца ў далёкі рэйс пілот,* ***прараб — на будаўнічую пляцоўку.*** (С. Грахоўскі) Зрэдку ў складаных сказах можа апускацца цэлая граматычная (прэдыкатыўная) частка: *«Я за тралейбусам пабег, а ты за мной не пабегла!..»* — ***«Бо вуліцу перабягаць няможна!»*** (Я. Брыль)

**244.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Абгрунтуйце сваю думку. Выпішыце няпоўныя сказы. У складзе якіх сказаў яны ўжыты? Якія члены сказа ў іх апушчаны?

У Італіі, у адным з найстарэйшых у свеце Падуанскім універсітэце, ёсць славутая «Зала сарака». На покуці стаіць зробленая з тоўстых дошак, сёння паточаная ўжо шашалем трыбунка-кафедра. Яна памятае, як некалі тут чытаў лекцыі Галілей. Цяпер на гэтым месцы стаіць бюст геніяльнага вучонага.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

У «Зале сарака» — сорак вялікіх партрэтаў слаўных з найслаўнейшых. Сярод іх другі ад покуці — Францыск Скарына.

За тысячы кіламетраў ад Беларусі, у далёкай Італіі, ушаноўваецца памяць аб нашым першадрукару Францыску Скарыну. *(Паводле А. Клышкі)*

- Сфармулюйце правілы правапісу слоў *памяць, геніяльны, вялікіх.*
- Выпішыце прыметнікі, якія маюць ступень параўнання. У якой форме яны ўжыты і як утвораны? Якая іх стылістычная роля ў тэксце?
- Вызначце, якім спосабам утвораны словы *паточаная, першадрукар.*

↑ Якое значэнне мела для Ф. Скарыны вучоба ў Падуанскім універсітэце?

**245.** Запішыце сказы-пытанні і дайце на іх адказы няпоўнымі сказамі. Якія члены сказа вы апусцілі?

1. Хто напісаў аповесць «Жураўліны крык»? 2. Каго сустракаеш? 3. Снег ідзе? 4. Аб чым паведамілі па радыё?

- Вызначце будову сказаў-пытанняў.

**246.** Прачытайце тэксты і дакажыце, што яны адносяцца да мастацкага стылю. Назавіце няпоўныя сказы і аднавіце апушчаныя ў іх члены сказа. Зрабіце сінтаксічны разбор няпоўнага сказа з першага тэксту і растлумачце пастаноўку ў ім знакаў прыпынку.

I. Вось з-за лесу ўстала сонца. Рассыпае каснікі, залатыя ручаінкі, і цалуе праз аконца збітых кудзер валаконцы. *(Я. Колас)*

II. ...Я ўбачыў, што ўжо не толькі светла, але вось-вось узыдзе сонца. За намі быў блакітны туманны Дняпро. Перад намі — роў, невялікае, ледзь узгорыстае поле, а далей — лясістыя ўзгоркі і сярод іх ружавеючая роўнядзь Святога возера.

Сонца ўжо выкінула з-за лесу тысячы чырвоных дзід, заліло расплаўленым золатам маленькія воблачкі ля далягляду. *(У. Караткевіч)*

- Ці даводзілася вам назіраць узыход сонца? Вусна апішыце яго.
- Растлумачце значэнне слова *дзіда.* У якім значэнні (прамым ці пераносным) яно ўжыта?
- Сфармулюйце правілы правапісу слоў, якія пішуцца праз злучок у тэкстах.
- Выпішыце ўрыўкі з апісаннем узыходу сонца іншымі пісьменнікамі.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**247.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль. Знайдзіце ў тэксце простую мову, на аснове яе складзіце дыялог суразмоўцаў, каб у ім ужываліся няпоўныя сказы. Запішыце дыялог. Якія члены сказа ў ім апушчаны?

...Эразм не спяшаўся падыходзіць: аднекуль у яго свядомасці з'явілася вострае адчуванне значнасці гэтай хвіліны. «Хто гэта?» — спытаўся ён у суседа-шляхціца, і той адказаў: «Сын баярскі[1] Мікола. З Гусава родам».

Калі Вітэліус нарэшце наблізіўся, лоўчага ўжо атачылі дамы. Яны нешта ўзахапы шчабяталі свайму ратавальніку, і Эразм пачуў, як той смела адказаў камусьці на добрай лаціне: «Aut Caesar aut nihil»[2].

Такое было іхняе знаёмства...

- Ці ведаеце вы, пра якіх людзей ідзе гаворка ў прыведзеным урыўку з аповесці У. Арлова «Час чумы»? Раскажыце пра іх.
- Растлумачце сэнс фразеалагізма «Aut Caesar aut nihil». Якія яшчэ лацінскія фразеалагізмы вы ведаеце?
- Як вы разумееце значэнне слова *атачылі?* Падбярыце да яго сінонімы.
- Чаму ў слове *Вітэліус* пішацца *у* складовае? Прывядзіце свае прыклады на гэта правіла.

## Паслухайце мовазнаўцаў

Няпоўныя сказы суадносяцца з адпаведнымі поўнымі сказамі, бо не маюць уласнай структурнай схемы і абапіраюцца на схему поўнага сказа ці на пазамоўную сітуацыю. Як і поўныя сказы, яны могуць быць аднасастаўнымі і двухсастаўнымі, неразвітымі і развітымі, простымі і складанымі і г. д. *(Л. Бурак)*

Адсутны член няпоўнага сказа можа:
а) узнаўляцца з кантэксту:
— *Хто сёння будзе прыбіраць клас?*
— *Міхась.*

У другім сказе апушчаны выказнік *будзе прыбіраць,* дапаўненне *клас* і акалічнасць часу *сёння.* Гэтыя члены сказа

[1] У Вялікім княстве Літоўскім баяры займалі становішча паміж шляхтай і народнымі нізамі.

[2] Ці пан ці прапаў *(лац.).*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

ўзнаўляюцца з папярэдняга сказа. (Параўн. з адпаведным поўным сказам: *Сёння Міхась будзе прыбіраць клас.*);

б) падказвацца маўленчай сітуацыяй:



*Бач, круглыя, цвёрдыя. Як капыткі. А чыстыя, як сырок.* (Ф. Янкоўскі) Дзейнік *грыбы* адсутнічае, бо прадмет гутаркі ўспрымаецца зрокава: суразмоўца глядзіць у кошык з грыбамі і выказвае думку няпоўнымі сказамі. (Параўн.: *Бач, грыбы, круглыя, цвёрдыя. Грыбы як капыткі. А грыбы чыстыя, як сырок.*)

Калі ў няпоўны сказ уставіць апушчаныя словы, выявіцца ненатуральнасць, штучнасць у яго будове, парушыцца стылістычнае афармленне.

**248.** I. Прачытайце жарт.

Настаўнік спытаў у вучня:
— Скажы, якое дрэва самае нізкае?
— Пень, — адказаў вучань.

II. Адгадайце загадку.

Вясна яе хавае,
лета — ажыўляе,
восень — дастае,
зіма — падае. (Бульба)

- Разбярыце сказы па членах. Назавіце няпоўныя сказы.
- Растлумачце, чаму адсутныя члены сказа лёгка ўзнаўляюцца.

**249.** Прачытайце дыялог. Звярніце ўвагу на формы ветлівага звароту да суразмоўцы. Растлумачце мэтазгоднасць выкарыстання няпоўных сказаў.

— Мяне завуць Андрэй Беларэцкі, пані. Я вучоны-фальклярыст.

Яна́ [Яноўская] зусім не здзівілася. Здзівіўся я, даведаўшыся, што гэта слова ёй знаёма.

— Што ж, вельмі цікава. А чым вы зацікаўлены? Песнямі, прымаўкамі?


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

— Легендамі, пані. Старымі мясцовымі легендамі. *(У. Караткевіч)*

↑ Каго з беларускіх фалькларыстаў вы ведаеце? Якія кнігі па беларускім фальклоры чыталі? Запішыце іх назвы. Выпішыце 5—6 прыказак.

● Напішыце сачыненне-мініяцюру, выкарыстаўшы адну з запісаных вамі прыказак.

**250.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль і тып. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары і раскрыйце дужкі. Вызначце няпоўныя сказы. Якія члены сказа ў іх апушчаны? Якім спосабам іх можна ўзнавіць?

Чатыры сасны засталіся стаяць пасярод *(леса)* секі. Тры так, што кранaлі адна адну галлём, а чац*(?)*вёртая воддаль, каля маладога бярэзніку. І была гэтая сасна самая прыгожая і высокая з усіх сваіх сяс*(?)*цёр. Здавалася, яе кашлатая шапка кранaлася цяжкай зімовай хмары, што *(не)* рухома вісела над лесам. Нібы с*(?)*вечка быў яе ствол. *(З)* нізу *(цёмна)* карычневы, з тоўстай парэпанай карой. *(З)* верху, каля галля, гла..кі і залаты. *(І. Шамякін)*

● Назавіце словы, якія ўтвораны спосабам складання, і растлумачце іх напісанне.

● Назавіце словы, у якіх адбылося падаўжэнне зычных.

● Назавіце словы, напісанне якіх не супадае з вымаўленнем. Чаму гэта адбываецца?

## § 41. Працяжнік у няпоўным сказе

У вусным маўленні на месцы пропуску члена сказа робіцца невялікая паўза, а на пісьме — ставіцца працяжнік: *Куляй пацэліш у аднаго, а трапным словам — у тысячу.* (Прыказка) *Рана загоіцца, а злое слова — ніколі.* (Прыказка) *Хто пра што думаў у гэтыя дні, а стары — найбольш пра пчол.* (Г. Далідовіч)

**251.** Запішыце прыказкі, крылатыя выразы, афарызмы* аб слове, у якіх прапушчаны члены сказа. Прачытайце іх услых, захоўваючы патрэбную інтанацыю, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Д а в е д к а. Можна выкарыстаць наступную літаратуру:

1. Ліцьвінка В., Царанкоў Л. А. Слова міма не ляціць: Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі.— Мн., 1985.

2. Міхневіч А. Я. Якуб Колас разважае, радзіць, смяецца... (Выбраныя выслоўі народнага песняра).— Мн., 2002.

3. Мудрыя дарадцы / склад. А. У. Янголь.— Мн., 1983.

4. Санько З. Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак, фразем.— Мн., 1991.

5. Шкраба І., Шкраба Р. Крынічнае слова: Беларускія прыказкі і прымаўкі.— Мн., 1993.

6. Янкоўскі Ф. М. Крылатыя словы і афарызмы.— Мн., 1960.

**252.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль. Выпішыце сказы, у якіх апушчаны пэўныя члены. Пастаўце неабходныя знакі прыпынку.

На свеце шмат розных рэчак. Адны шырокія, як мора. Другія вірлівыя і бруістыя. Трэція вузкія і выгінастыя. І ёсць адна незвычайная рака: яна цячэ... пад зямлёю. Гэта Няміга.

Цяжка нават уявіць, што калісьці Мінск быў падобны на Венецыю — горад на вадзе. Толькі замест мораў і каналаў праз яго працякала рака. Гэта была адзіная ў Беларусі рака-вуліца.

У межах горада цераз Нямігу былі пракладзены шматлікія масткі, а ў некаторых месцах суцэльныя драўляныя насцілы. Па іх людзі хадзілі і ездзілі, а пад насціламі мог праплысці човен. Чым толькі не гандлявалі на гэтых мастках! Але найбольш славіўся рыбны кірмаш. Рыбу прадавалі вэнджаную, салёную, вяленую і, вядома, свежую, жывую. Кажуць, калі гандляры не паспявалі за дзень прадаць усю жывую рыбу, то ўвечары яе выпускалі ў Нямігу. Прасцей было налавіць зноў, чым трымаць да раніцы наступнага дня.

*(Паводле К. Тарасава)*

- Знайдзіце азначэнне-прыдатак. Як ён аформлены на пісьме?
- Растлумачце правапіс мяккага знака ў словах *калісьці, найбольш*.
- Што яшчэ вы ведаеце пра раку Нямігу? Што вам вядома аб рацэ (возеры) вашай мясцовасці? Адказы запішыце.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## § 42. Роля і ўжыванне няпоўных сказаў

**253.** Запішыце па памяці выказванне вучонага-лінгвіста.

Сувязь слоў у тэксце — гэта перш за ўсё сувязь сэнсаў. *(Л. Шчэрба)*

У сказе звычайна выдзяляюць дзве часткі: першая — гэта тое, што нам вядома з папярэдняга тэксту ці з маўленчай сітуацыі, і другая — гэта тое, дзеля чаго будуецца сказ.

Першая частка называецца в я д о м а е, другая частка — н о в а е. Напрыклад: *Кропка — адзін з самых старажытных знакаў прыпынку. Яна ўжывалася ў пісьмовай практыцы з II стагоддзя да нашай эры.* (В. Старычонак) У першым сказе в я д о м а е — *кропка*, н о в а е — *адзін з самых старажытных знакаў*. У другім сказе в я д о м а е — *яна* , усё астатняе — н о в а е.

**254.** Прачытайце тэкст, назавіце вядомае і новае ў кожным сказе.

Колька Лецечка быў самым звычайным хлопцам. Вельмі ўжо прыгожым ён сябе не лічыў і крыху нават шкадаваў аб гэтым, калі цішком разглядваў у люстэрку свой звычайны твар. Хацелася яму крыху больш пунсовасці на твары, больш прывабнасці, носа іншага, вастрэйшага, точанага, рымскага, а не бульбачкай. Да рымскага носа патрэбны і вочы іншыя, цыганскія, а ў яго паляшуцкія вочы. Да чорных вачэй пасавалі б і валасы кучаравыя, чорныя з бляскам. А ў яго не такія. *(Паводле В. Казько)*

● Разгледзьце схему будовы тэксту. Пастарайцеся растлумачыць, чаму такі спосаб сувязі сказаў у тэксце называецца ланцужковым. Як развіваецца думка ў сказах з ланцужковай сувяззю?

$$[В^1\text{-}Н^1] \rightarrow [В^2\text{-}Н^2] \rightarrow [В^3\text{-}Н^3]$$

**255.** Запішыце па памяці верш. Назавіце «новае» ў трох апошніх сказах.

Кахаю —
Людзі закрычалі.
Каго?


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Паэт сказаў:
Айчыну!
Жаўнер:
Дзяўчыну!
Хтось: сябе!

*А. Сыс*

● Па аналогіі з тэкстам прыдумайце пытанне; адкажыце на яго сказам, які ўяўляе сабой толькі «новае».

Агульнай асаблівасцю граматычнага саставу няпоўных сказаў з'яўляецца тое, што ў іх захоўваюцца, як правіла, тыя члены сказа, якія ўваходзяць у «новае» выказвання, і, наадварот, звычайна апускаюцца (поўнасцю ці часткова) тыя, якія выражаюць «вядомае». Прапушчаныя члены сказа дазваляюць актуалізаваць наяўныя (непрапушчаныя). Звычайна захоўваюцца тыя члены сказа, якія дадаюць новае паведамленне да таго, што ўжо вядома. Пры гэтым узмацняецца іх сэнсавая значнасць. Напрыклад:

— *А хто там ідзе, а хто там ідзе*
*У агромністай такой грамадзе?*
— ***Беларусы.***
< . . . >
— *А чаго ж, чаго захацелася ім,*
*Пагарджаным век,*
*ім, сляпым, глухім?*
— ***Людзьмі звацца.*** (Я. Купала)

Апушчаныя выказнікі ў няпоўных сказах дазваляюць засяродзіць увагу на змесце новага паведамлення: Хто ідзе? — *Беларусы.* Чаго ім захацелася? — *Людзьмі звацца.*

**256.** Запішыце прыведзеныя вышэй радкі з верша Янкі Купалы «А хто там ідзе?» па памяці.

**257.** Прачытайце пытанні, паслядоўна выдзеліце лагічным націскам кожны член сказа. На пастаўленае пытанне адказвайце няпоўным развітым сказам. Як змяняецца сэнс выказвання ў залежнасці ад пастаўленага пытання?

1. Алеся пайшла ў бібліятэку? 2. Вінцук збірае новыя паштоўкі? 3. Табе весела? 4. Валя любіць чытаць казкі? 5. Турысты вяртаюцца з паходу?


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Асноўная сфера ўжывання няпоўных сказаў — вусная мова, паколькі будова сказа ў вуснай мове вызначаецца ў пэўнай ступені сітуацыяй зносін, агульным вопытам тых, хто гаворыць, інтанацыяй, мімікай, якія дапаўняюць выказванне. Гэта і дазваляе апускаць тыя члены сказа, адсутнасць якіх не перашкаджае разуменню думкі.

У кніжных стылях мовы, асабліва ў афіцыйна-дзелавым і навуковым, няпоўныя сказы ўжываюцца вельмі абмежавана.

У творах мастацкай і публіцыстычнай літаратуры яны шырока ўжываюцца пры перадачы дыялога і ў апавядальных аўтарскіх тэкстах.

Дыялог

— *Дзе ты спынілася?*
— *У сваякоў. Станцыя па Яраслаўскай дарозе.*
— *Ведала, што я тут?*
— *Нядаўна даведалася.*
— *Здзівілася?*
— *Не вельмі.* (У. Караткевіч)

Апавядальны тэкст

*Адразу за сядзібай пачынаўся беластволы бярэзнічак. Бярозкі адна ў адну, стройныя, высокія. Крыху далей, на самым санцапёку, раслі маладыя сосны, за імі — зараснікі арэшніку, яшчэ праз некалькі крокаў — густы асіннік.* (З. Бандарына)

Няпоўныя сказы надаюць мове лёгкасць, лаканічнасць, жывасць і эмацыянальнасць.

Няпоўныя сказы з'яўляюцца адным са сродкаў сінтаксічнай сувязі сказаў у тэксце.

**258.** Прачытайце тэкст. Да якога тыпу ён адносіцца? Назавіце сродкі сувязі сказаў у тэксце. Вызначце ролю няпоўных сказаў. Спішыце, уставіўшы прапушчаныя знакі прыпынку. Растлумачце іх пастаноўку.

Звернемся да гравюрнага партрэта Францыска Скарыны, які быў надрукаваны ў Бібліі. Ф. Скарына ў доктарскай мантыі і берэце сядзіць за невялікім столікам. Перад ім **кніга,** у руцэ пяро. Стол накрыты сурвэткай з адлюстраваннем асабістага сігнета* асветніка. Злева ад яго кнігі. Вышэй


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

касмічны глобус, сведчанне таго, што вучоны муж захапляўся астраноміяй і астралогіяй. Ззаду арка з калон, упрыгожаная вянком з дубовых галінак. Гэтыя калоны сімвал Падуанскага універсітэта, дзе Ф. Скарына абараняў вучоную ступень доктара. На калонах барэльефы мядзведзяў з таямнічымі геральдычнымі* знакамі. Збаны. У правым ніжнім кутку гравюры кошыкі, як мяркуюць, для збору лекавых траў. Побач выгравіраваны літары,— верагодна, ініцыялы гравёра. У левым ніжнім кутку падсвечнік з патушанай свечкай. Побач адлюстраванне насякомага: ці то муха, ці то аса, ці то пчала. Зверху дата выканання гравюры, запісаная кірыліцай: 1517 год. Унізе мудрагелістай вяззю напісана: доктар Францыск Скарына. *(Р. Равяка)*

- Назавіце словы з прыстаўнымі зычнымі.
- Растлумачце правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны.
- Выпішыце з першых двух сказаў словазлучэнні з дзеясловам у ролі галоўнага слова, зрабіце іх сінтаксічны разбор.

↑ Падкрэсліце граматычныя асновы першага сказа. Які гэта сказ па сваёй будове? Чаму?

- Перакажыце змест тэксту, выкарыстоўваючы ўклейку ў падручніку «Ф. Скарына. Аўтапартрэт».

**259.** Прачытайце першы абзац тэксту. Ці вядома, пра каго ідзе размова? Чаму? Прачытайце тэкст цалкам. Вызначце яго тып і будову. Якую стылістычную ролю выконваюць няпоўныя сказы?

Спрадвеку цякла за сялом і аддавала сябе ўсяму свету. Нябёсам — каб заўсёды былі блакітнымі. Жаваранку — каб ягоная песня звінела званчэй. Сонцу — каб свяціла ярка і доўга.

Аднойчы запыталіся ў крыніцы:

— А што нябёсы, жаваранак ды сонца далі табе?

У адказ пачулі:

— Сонца — сваю цеплыню. Жаваранак — сваю галасістасць. Нябёсы — блакіт свой.

Так бы кожнаму з нас. *(Я. Пархута)*

- Дайце тэксту загаловак.
- Сфармулюйце асноўную думку тэксту. Прасачыце, як развівае яе аўтар. Падумайце, чым абумоўлены менавіта такі парадак сказаў у тэксце. Ланцужковая ці паралельная сувязь сказаў у тэксце?
- Каму прызначаецца тэкст? Назавіце адрасата.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**260.** Складзіце свой дыялог з няпоўнымі сказамі (або выпішыце з мастацкага твора) у гутарковым стылі, выкарыстоўваючы для стварэння маўленчай сітуацыі рэмаркі*, рэплікі аўтара ці апавядальніка.

**261.** Уявіце сабе сітуацыю: па тэлебачанні ідзе спектакль, пастаўлены па аповесці У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». Раптам экран гасне. Вы пачулі наступны дыялог:

— Рыгор, дарагі, чаму не прыйшоў развітацца?

— Гэта вам, Надзея Раманаўна... Можа, паставіць дзе... успамінаць будзеце...

— Будучай жонцы тваёй.

— Бывайце вы... Жадаю вам найлепшага, самага добрага на зямлі.

● Выканайце ролю аўтара-сцэнарыста, устаўце аўтарскія рэмаркі: *Палез рукою ў кішэнь і, пачырванеўшы, дастаў гліняную ляльку. Надзея ўзяла яго за скроні і пацалавала ў лоб. Пасля дастала з вушэй завушніцы і паклала іх у шырокую чорную далонь паляўнічага. Рыгор крэкнуў, пакруціў галавою.*

● Запішыце адноўлены тэкст. Якую ролю выконваюць аўтарскія рэмаркі?

↑ **262.** Прачытайце дыялог. Вызначце няпоўныя сказы і апушчаныя ў іх члены сказа. Якую стылістычную ролю выконваюць няпоўныя сказы?

— Антон, душа цёмная, Грышка, Пятрусь! Халера вас там схапіла, ці што?

З’явіліся Антон, Грышка і Пятрусь, згінаючыся пад цяжарам нейкіх вялікіх пакункаў.

— Ну, разявакі-салапякі, кладзіце ўсё да ног гаспадыні. Разгортвай! Э-э, пэцкаль, у цябе што, рукі са... спіны растуць? Трымай, донька.

Перад Яноўскай ляжаў на падлозе вялізны пушысты кілім.

— Трымай, доня. Дзедаўскі яшчэ, але зусім неўжываны. Пакладзеш у спальні. У цябе там дзьме, а ногі ва ўсіх Яноўскіх былі нямоцныя. Будзе табе цёпла. *(У. Караткевіч)*

● Як лексіка рэплік моўцы характарызуе яго? Як вы думаеце, хто ён?



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

● Знайдзіце ў тэксце фразеалагізм. Растлумачце яго значэнне. Запішыце некалькі фразеалагізмаў, у састаў якіх уваходзіць слова *рукі.* Карыстайцеся фразеалагічным слоўнікам.
● Растлумачце знакі прыпынку.

**263.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып. Абгрунтуйце сваё меркаванне. Растлумачце сувязь сказаў у тэксце.

Знайдзіце няпоўныя сказы. Разважайце наступным чынам: калі ў сказе граматычная аснова прадстаўлена двума членамі, такі сказ — двухсастаўны; калі граматычная аснова прадстаўлена адным галоўным членам, дзейнікам ці выказнікам, неабходна глядзець: а) ці патрэбны другі галоўны член сказа для разумення яго сэнсу; б) ці ёсць у сказе члены сказа, якія паказваюць на неабходнасць другога галоўнага члена. Калі другі галоўны член патрэбны для разумення сэнсу сказа і ёсць члены сказа, якія паказваюць на яго неабходнасць, то такі сказ — двухсастаўны няпоўны.

Добра было б, каб адзін са сваіх сшыткаў вы назвалі «Мая бацькаўшчына» або «Мой родны кут». І ў ім запісвалі ўсё самае цікавае, пра што дазнаецеся ад старэйшых людзей, бацькоў і настаўнікаў. Якой была ваша мясцовасць у даўнейшыя часы. Якія былі і куды вялі шляхі-дарогі. Якія былі лясы, балоты, рэкі, крыніцы. Як называліся. Як цяпер называюцца гэтыя мясціны. Якія цікавыя людзі жылі ў вашым паселішчы і якімі справамі, учынкамі, розумам, здольнасцямі яны запомніліся. Што ўмелі рабіць. Адкуль пайшлі іх прозвішчы. Якую назву мае ваша паселішча і як яе паходжанне тлумачаць людзі. *(В. Вітка)*

● Назавіце няпоўныя сказы. Якія яны па будове?
● Якую ролю выконваюць у тэксце няпоўныя сказы?
● Растлумачце значэнне слова *паселішча.*
● Чаму спалучэнне *шляхі-дарогі* пішацца праз злучок?
● Ці ведаеце вы сваю радаслоўную? Раскажыце аб ёй.

**264.** І. Прачытайце канцоўку тэксту з аповесці У. Караткевіча «Сівая легенда». Ці зразумела, пра каго ідзе гаворка? Чаму? Якіх членаў сказа не хапае? Што неабходна для таго, каб сэнс гэтых сказаў стаў зразумелы?

Сядзіць, бы ў воблаку.
І на каленях скруціўся свойскі белы гарнастай.

II. Запішыце тэкст поўнасцю, аднавіўшы яго будову.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

А на пані Любцы ўсё дарэчы. Шырокая ў падоле блакітная з золатам сукня*. Пояс, што завязваецца па клубах і падае спераду двума канцамі, быццам падзяляючы ногі. Тонкая ў поясе казнатка*, таксама блакітная.

І што лепей за ўсё — на галаве «караблік», быццам ляжачы маладзік, быццам рожкі над вушамі. Рожкі тыя залацяцца, а на іх зверху накінуты рантух, зусім празрыстае пакрывала паміж каленяў.

● Да якога стылю і тыпу належыць тэкст? Назавіце моўныя сродкі з тэксту, характэрныя для гэтага стылю.

● З 2-га і 4-га сказаў выпішыце сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні і зрабіце сінтаксічны разбор гэтых сказаў.

● Абазначце графічна марфемны склад дзеясловаў *завязваецца, сядзіць, скруціўся.*

● Намалюйце ілюстрацыю да гэтага тэксту.

**265.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль і тып. Знайдзіце няпоўныя сказы, раскажыце пра іх будову і значэнне.

У канцы жыцця Еўфрасіння выправілася ў падарожжа па Святой Зямлі. Так называлі тыя мясціны, дзе нарадзіўся і вучыў людзей Ісус Хрыстос. Па дарозе полацкую князёўну паўсюль сустракалі з пашанаю. Пра яе самаахвярнае жыццё ведалі ў розных краінах.

У горадзе Іерусаліме падарожніца захварэла і памерла. Пазней яе астанкі прывезлі на Бацькаўшчыну.

Еўфрасіння Полацкая зрабіла для нашага народа столькі добрага, што людзі назвалі яе святой. Пасля смерці яе пачалі маляваць на абразах і прасіць у яе дапамогі супраць злых сіл.

Нашы продкі верылі, што за вялікія заслугі Бог забраў асветніцу на неба і адтуль яна спрыяе землякам ва ўсіх добрых справах. У Спаса-Еўфрасіннеўскай царкве ў Полацку захавалася келля, дзе святая пражыла свае апошнія гады. Дык верма, што прыйдзе дзень, калі сюды вернецца і святы крыж, які зрабіў Лазар Богша. *(У. Арлоў)*

● Растлумачце знакі прыпынку ў апошнім сказе. Як вы разумееце значэнне дзеяслова *верма?* У якой граматычнай форме ён ужыты? Прывядзіце прыклады такога тыпу дзеясловаў, якія сёння дастаткова шырока пачалі ўжывацца ў мове.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

● Сфармулюйце правілы напісання слоў з вялікай літары ў тэксце.

● Што вы яшчэ ведаеце пра Еўфрасінню Полацкую? Чаму яе назвалі святой?

● Хто такі Лазар Богша? Чаму яго імя звязана з дзейнасцю Еўфрасінні Полацкай і Спаса-Еўфрасіннеўскай царквой?

● Зрабіце вуснае паведамленне на тэму «Нябесная заступніца Беларусі», выкарыстайце ў сваім паведамленні ўклейкі ў падручніку (С. Лагуновіч-Чарапко «Еўфрасіння Полацкая», А. Марачкін «Еўфрасіння Полацкая», Я. Кулік. Трыпціх «Еўфрасіння Полацкая», Т. і У. Васюкі «Еўфрасіння Полацкая»).

**266.** Спішыце, пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку. Зрабіце сінтаксічны разбор няпоўных сказаў.

Славяне здаўна шанавалі сваіх продкаў якіх называлі дзядамі. Увесну хадзілі да іх на магілы з ежаю і пітвом каб падзяліцца радасцю сонечнае цеплыні і зямнога абуджэння. Увосень дзядоў чакалі дома. Уся сям'я сядала за стол з багатым пачастункам і гаспадар клікаў продкаў на гасціны. Людзі верылі што болей за самыя смачныя ласункі дзяды любяць паважную гаворку з успамінамі пра іх і іхнія добрыя справы.

Мудрыя старажытныя святы ўшанавання продкаў захаваліся ў нас дасёння. Вясновы дзень сустрэчы з імі завецца Радаўніца а восеньскі Дзяды. *(У. Арлоў)*

● Растлумачце правапіс слоў *увесну, увосень, восеньскі, продкі.*

● Падбярыце сінонімы да слова *паважная (гаворка).*

● Растлумачце значэнне слова *пачастунак.* Зрабіце яго марфалагічны разбор.

● Якія яшчэ старажытныя святы вы ведаеце? Раскажыце пра іх.

● Як у вашай мясцовасці называецца вясновы дзень ушанавання продкаў?

**267.** Спішыце, пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку. Зрабіце сінтаксічны разбор няпоўных сказаў.

У паветры звіняць пчолы пры дарозе стракочуць конікі а з поўдня, з-пад Касішча, мяккі вільготны вецер прыносіць духмяны, мядовы водар канюшыны. І так хораша робіцца на сэрцы, што, здаецца, не ідзеш, а нібы ляціш па паветры. Успамінаецца пражытае, усё да драбніц, асабліва басаногае маленства. Вось тут, у Дружбенскім лужку, калісьці пасвіў



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

калгасныя коні. Ля цагельні ў зарасніку беразаку збіраў чырвонагаловікі, у Вілах баравікі. Тут кожная мясціна дарагая і блізкая. *(В. Дайліда)*

- Назавіце безасабовыя сказы. Чым выражана ў іх граматычная аснова?
- Падбярыце антонімы да прыметнікаў *мяккі, вільготны.*
- У ролі якой часціны мовы ўжыта слова *перажытае?* Абгрунтуйце сваю думку.
- Ці ёсць у вас дарагія і блізкія сэрцу мясціны? Раскажыце пра іх.

**268.** Прачытайце, захоўваючы правільную інтанацыю. Назавіце ў дыялогах няпоўныя сказы. Якія члены сказа апушчаны? Ці зразумелы сэнс выказванняў?

I. — Бадровіч, — Чэлсі мела манеру звяртацца да нас па прозвішчы, — з чаго складаецца homo sapiens?

Чэлсі ніколі не называла чалавека чалавекам, а толькі так, навукова: «чалавек разумны». Не мураш, значыць.

— З вады, — напружыў свае звіліны мой таварыш.

— Адказ не прымаецца.

— Чаму? Усім вядома, што ў целе чалавека каля 10 галонаў* вады. Адной крыві сколькі!

— Бадровіч, я маю на ўвазе не будаўнічы матэрыял...

— А будаўнічы матэрыял — гэта клеткі, з якіх складаецца ўся жывая прырода, у тым ліку і чалавек.

Сябар адзіны ў нашым «штрафным класе» меў IQ (каэфіцыент інтэлекту) 150. Таму Чэлсі любіла пагутарыць з ім «па душах». Але Бадровіч знарок, потым растлумачу чаму, прыкідваўся прасцячком. Вось і цяпер ён цудоўна ведаў, што настаўніца мае на ўвазе не будову чалавека ці клеткі, а тое, што робіць яго «гома сапіенсам». *(В. Кастручын)*

II. — З кійком для арыгінальнасці ходзіш? Як дэндзі лонданскі?

— Кіну. Скора кіну... Але нага яшчэ баліць, як наступаеш... Во тут, у лытцы, пералом быў. Абедзве костачкі — хрэп!


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

— Пад машыну падлез? І гэты «стоп-сігнал» на ранцы не памог?

— З каня зляцеў. І так няўдачна!

— У школе на фізкультуры? У нас хлопцы лёгка «каня» пераскокваюць.

— У вёсцы летам быў, у бабулі. І з сапраўднага каня, на поўным галопе — шмяк! Конь не аб’езджаны быў. *(П. Місько)*

- Вызначце сэнсава-стылістычную ролю няпоўных сказаў.
- Чаму зручней ужываць у дыялогу няпоўныя сказы?

## Кантрольныя пытанні і заданні

**Варыянт 1**

1. Дайце азначэнне няпоўнаму сказу.
2. Якія віды няпоўных сказаў выдзяляюцца паводле будовы? Пакажыце на прыкладах.
3. Якія ўмовы садзейнічаюць узнаўленню прапушчаных членаў сказа?
4. Якія члены сказа часцей захоўваюцца ў няпоўных сказах? Якая іх роля ў змесце паведамлення?
5. Уявіце сабе: вы з сябрам заблудзіліся ў лесе. Складзіце дыялог аб пошуках выйсця з выкарыстаннем няпоўных сказаў.
6. Зрабіце сінтаксічны разбор няпоўнага сказа: *Ты марыш быць паэтам, быць трактарыстам — я.* (А. Куляшоў)

**Варыянт 2**

1. Чым адрозніваюцца няпоўныя сказы ад аднасастаўных? Адказ праілюструйце прыкладамі.
2. Як абазначаецца на пісьме адсутнасць членаў сказа?
3. Якія члены сказа могуць апускацца ў няпоўных сказах? Ад чаго гэта залежыць?
4. У якіх стылях мовы часцей ужываюцца няпоўныя сказы?
5. Уявіце сабе надыход восені. Дайце апісанне дрэў у парку з выкарыстаннем няпоўных сказаў.
6. Зрабіце сінтаксічны разбор няпоўнага сказа: *Гуляюць дзеці каля возера, а неба з сонцам — у вадзе.* (П. Панчанка)



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## УСКЛАДНЕНЫ СКАЗ

Па будове і значэнні простыя сказы могуць быць ускладнены аднароднымі і адасобленымі членамі, пабочнымі словамі і сказамі, звароткамі, параўнальнымі зваротамі.

**269.** Выразна прачытайце тэкст услых, захоўваючы патрэбную інтанацыю.

У ПРЫПАР

Прыпарыла,
Нахмурыла,
І ўдарыла!
— Святы Ілля…[1]
Маланка ўраз з'явілася,
Мільгнула і звалілася,
І дождыкам аблілася
Гарачая зямля.
Кроплі разам, згодна, жвава,
Пояць ўсё, што хоча піць:
Збожжа, дрэвы, кветкі, травы,
Вулкі хочуць затапіць,
Б'юць у стрэхі, мыюць шыбы,
Мыюць хаты, мочаць сад,
Ў рэчцы спожыў маюць рыбы…
— Хто ў прыпар дажджу не рад?
Сцішаецца,
Змяншаецца,
Ўнімаецца,
— Няма!
І слонка паказалася,
Маўляў, само купалася,
Прыемна усміхаецца,
Блішчыць, пераліваецца,
Яскрава адбіваецца
На траўцы, на лісточку,
У рэчцы, ў раўчачочку,
На вулачцы, ў садочку,

[1]*Ілля (Ілья)* — у беларускай міфалогіі і фальклоры распарадчык дажджоў і навальніц.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Зямля ўздыхае поўнымі,
Шчаслівымі, чароўнымі
Грудзямі усіма.

*А. Гарун*

● Назавіце сказы, у якіх ёсць аднародныя члены. Якімі членамі сказа яны з'яўляюцца? Як яны звязаны паміж сабой? Чым выражаны? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах.

● Ці ўтвараюць аднародныя члены сказа паміж сабой словазлучэнні? Якая сувязь паміж імі — падпарадкавальная ці раўнапраўная? Чаму?

● Словы якой часціны мовы найбольш яскрава передаюць названую ў вершы з'яву прыроды? Чаму яны пераважаюць у вершы?

● Назавіце словы і формы слоў, якія сёння з'яўляюцца ўстарэлымі.

## § 43. Сказы з аднароднымі членамі

Члены сказа, якія адказваюць на адно і тое ж пытанне, адносяцца да аднаго і таго ж слова і вымаўляюцца з інтанацыяй пералічэння, называюцца а д н а р о д н ы м і:

што рабіў? які?

*Трэці дзень нехта невідочны і агромністы раз'ятрана ляпаў аканіцамі і шпурляў ва ўзорыстыя шыбы прыгаршчы каляных круп.* (У. Арлоў)

Аднародныя члены ўтвараюць раўнапраўныя па сваім саставе спалучэнні слоў, г. зн. нельга паставіць пытанне ад аднаго слова да другога (*невідочны і агромністы, ляпаў і шпурляў*).

Аднароднымі могуць быць як г а л о ў н ы я, так і д а д а н ы я члены сказа: *Высока над зямлёю прыгожымі шнурамі ляцелі **жураўлі** і **гусі*** (Я. Колас) — аднародныя дзейнікі; *Байцы высока **цанілі, берaглі** шчырае слова пісьменнікаў-франтавікоў.* (А. Вялюгін) — аднародныя выказнікі; *Над Прыпяццю зіхаціць **ясная, сонечная** рані-*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

*ца.* (В. Вольскі) — аднародныя азначэнні; *Бярыце з роднага парога і **хлеб**, і **песню** ў шлях з сабой.* (П. Прыходзька) — аднародныя дапаўненні; *Вясёлых елачак прысады то **ўніз** бягуць, то **на гару**.* (А. Бачыла) — аднародныя акалічнасці месца.

Аднародныя члены сказа могуць быць р а з в і т ы я і н е р а з в і т ы я: *Лістападу радуйся, і снежню, і вятрам асеннім, і снягам.* (П. Панчанка)

У сказе аднародныя члены звычайна выражаюцца словамі адной часціны мовы, але могуць выражацца словамі розных часцін мовы: *Пахне **мёдам, кветкамі**.* (А. Асіпенка) *Цімошка **пільна** і **з трывогаю** пазіраў на кожную новую асобу.* (Я. Колас)

У рад аднародных членаў могуць уваходзіць непадзельныя словазлучэнні і фразеалагізмы: *Пад раніцу **Аляксей і двое танкістаў** былі ў горадзе.* (І. Новікаў) *Праз хвілін дзесяць бор аглушыўся грымотным выбухам. Гнеды **навастрыў вушы, зафыркаў**.* (А. Якімовіч) (*Навастрыў вушы* — ‘насцярожыўся’.)

У сказе можа быць ужыты не адзін рад аднародных членаў, а два і больш: *Дарослыя і дзеці бяруць садовыя і лясныя дрэўцы і клапатліва высаджваюць іх на калгасных сядзібах, паабапал дарог у заводскіх дварах, на вуліцах і пляцоўках.* (К. Кірэенка) У гэтым сказе чатыры рады аднародных членаў: аднародныя дзейнікі (*дарослыя* і *дзеці*), аднародныя выказнікі (*бяруць, высаджваюць*), аднародныя азначэнні (*садовыя* і *лясныя*), аднародныя акалічнасці (*на сядзібах, паабапал дарог, у дварах, на вуліцах* і *пляцоўках*).

Пры чытанні на кожны аднародны член падае лагічны націск (↑), а перад ім робіцца невялікая паўза (/):

*Дзічэюць ↑агароды, / ↑дрэвы, / ↑хаты*

*Без чалавечай ↑ласкі / і ↑рукі.* (С. Законнікаў)



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**270.** Удумліва прачытайце § 43. Падрыхтуйце звязнае выказванне «Сказы з аднароднымі членамі». Падмацоўвайце тэарэтычныя палажэнні вашага адказу прыкладамі з наступных тэкстаў. Патрэбныя прыклады выпішыце ў сшытак.

I. Вазьмі ў сваё сэрца на схову
Дрымоту маўклівых ракіт,
І поле, і луг каляровы,
І родны блакіт.

*А. Кавалюк*

II. У нас сваіх хапае слоў,
Крамяных,
росных,
васільковых,
Ад мурагоў і ад лясоў,
Ад светлых высяў жаўруковых.

*Ю. Свірка*

III. Усе сыны усіх народаў
На памяць помняць родны верш
І ганарацца песняй роднай,
З якой з калыскі ты жывеш.

*П. Панчанка*

IV. Слушна кажуць: трэба слова ўзважыць,
Перш чым ім каго з размаху спляжыць.
Балбатнеш, а потым пнешся задам.
Заўтра ж сітуацыя другая:
«Ну, скажы хоць слова», — вымагае.
Прамаўчыш — таксама ўсё не ладам.

*У. Папковіч*

V. Закаханы ў жыццё і ў кожную мушку,
Я іду каля хат і росных садоў.
І са мной размаўляюць звяры і птушкі
На дзесятках і тысячах розных моў.

*У. Караткевіч*

VI. Пацалую вачмі шэрай сцежкі сувой,
Пакланюся бярозам сівой галавой
І ўсміхнуся апошняму цуду...

*С. Законнікаў*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

VII. Яны даспадобы мне, хай і старыя,
Не толькі ў гучанні хвалюючы змест.
Як многа гавораць мне назвы такія —
Мінск,
Пінск,
Брэст.

*П. Броўка*

**ЗАПОМНІЦЕ!** Аднароднымі членамі сказа не з'яўляюцца і не вымаўляюцца з інтанацыяй пералічэння:

1. Словы, якія паўтараюцца з мэтай узмацнення сэнсу: ***Лятуць*** *ды* ***лятуць*** *кволыя сняжынкі.* (З. Бядуля)

2. Устойлівыя спалучэнні слоў тыпу ***ні свет ні зара, то бокам то скокам, ні жывы ні мёртвы, ні слова ні паўслова***. Такія словы цесна звязаны паміж сабой і з'яўляюцца адным членам сказа: *Коні стаялі* ***ні жывыя ні мёртвыя****, форскалі толькі...* (І. Пташнікаў) (*Ні жывы ні мёртвы* — 'страшэнна напалоханы'.)

3. Словы, якія ўдакладняюць, канкрэтызуюць сэнс папярэдніх слоў: *Дзесьці высока-высока,* ***за самымі хмарамі,*** *курлыкалі жураўлі.* (М. Лынькоў)

4. Спалучэнні дзеясловаў, якія выступаюць у ролі адзінага выказніка: *Сям-там* ***цвісці спрабуе*** *вішня.* (П. Глебка)

**271.** Прачытайце верш. Вызначце ў ім сказы з аднароднымі членамі. Якія гэта члены сказа? Чым яны звязаны? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Да вас звяртаюся, нашчадкі,
Да суайчыннікаў сваіх,
Пакіньце злосць і зайздрасць, звадкі, —
Мы нацярпеліся ад іх.
Любіце травы, дрэвы, рэкі,
Прастор палёў, блакіт нябёс,
Цаніце Працу, Чалавека, —
І Бог вам дасць спагадны лёс.
А каб цанілі вас у свеце,
(Я лепшых слоў не падбяру),
Шануйце дзіва на планеце —
Святую нашу Беларусь.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

І мову Коласа, Купалы
Вы беражыце з роду ў род,
Каб наша воля не прапала,
Каб не загінуў наш народ.
*А. Ставер*

- Назавіце словы, у якіх адбываецца: а) аглушэнне звонкага зычнага перад глухім; б) аглушэнне звонкага зычнага на канцы слова; в) памякчэнне цвёрдага зычнага перад мяккім зычным.
- Чаму словы *Праца, Чалавек* у вершы напісаны з вялікай літары?

**272.** Прачытайце. Назавіце рады аднародных членаў у кожнай частцы складанага сказа. Чым выражаны аднародныя члены і як яны звязаны паміж сабой? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Разам з роднаю моваю, нацыянальнымі, духоўнымі, культурнымі традыцыямі чалавек страчвае вельмі многае, мяняюцца ягоныя псіхіка, характар, натура, паводзіны, учынкі, а потым і знікае пачуццё самапавагі, годнасці, адказнасці за сваю зямлю, яе будучыню, за лёс нашчадкаў у гэтым свеце. *(С. Законнікаў)*

- Ці згодныя вы з думкай С. Законнікава? Прывядзіце прыклады з мастацкай літаратуры, вашага жыццёвага вопыту, якія пацвярджаюць (ці не) гэтую думку.
- Растлумачце значэнне слоў *самапавага, годнасць, адказнасць* з дапамогай тлумачальнага слоўніка. Складзіце сказы, каб гэтыя словы выступалі ў ролі аднародных членаў.

**273.** Спішыце тэкст, расстаўляючы, дзе трэба, знакі прыпынку. Вызначце яго стыль.

...Я збочыў з дарогі амаль адразу трапіў у нейкую твань перапэцкаў боты пасля выбіўся на сухі верас пасля зноў трапіў у гразь упёрся ў доўгае і вузкае балота. Лаючы сябе за тое, што зрабіў вялікі круг, я ўзяў налева, бліжэй да зараснікаў па беразе ракі (я памятаў, што там было суха, і да таго ж рака трохі асушае каля сябе вільготную мясцовасць) выбіўся хутка на тую самую сцежку, па якой ішоў да Дубатоўка, і, апынуўшыся ў палове вярсты ад яго хаты, пайшоў ля зараснікаў у напрамку Балотных Ялін. *(У. Караткевіч)*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

● Падумайце, выкарыстанне якіх моўных сродкаў узбагаціла тэкст інфармацыяй і надало яму лаканічнасць.

● Выпішыце з першага сказа па адным словазлучэнні, якія звязаны сувяззю дапасавання, кіравання і прымыкання. Пабудуйце іх схемы.

● Чаму напісанне і вымаўленне слова *сцежка* не супадаюць?

● Растлумачце значэнне словазлучэння *ўзяў налева*. Падбярыце да яго сінонімы.

**274.** Запішыце тэкст, расстаўляючы знакі прыпынку.

Поўны месяц залівае тарфяныя балоты пусткі парк Балотных Ялін блакітным срэбрам і далёка-далёка блішчаў у акенцы нейкай самотнай хаты. Ноччу пахаладзела і зараз балоты пацелі нараджаючы ў ямінках касмылі белых рухлівых туманаў. *(У. Караткевіч)*

● Растлумачце правапіс прыслоўяў і разбярыце іх па саставе.

**275.** Прачытайце загадкі, захоўваючы патрэбную інтанацыю пры аднародных членах сказа. Вызначце, якімі членамі сказа з’яўляюцца аднародныя члены і чым яны выражаны.

I. Белы голуб
Прыляцеў,
Белым крыллем
Шалясцеў
І з усёй зямлі навіны
Расказаў
За паўгадзіны.

(Газета)

Распрануўся мал-малышак
І саскочыў голы з вышак,
Пакаціўся на руках,
Апынуўся на зубах.

(Арэх)

*Н. Гілевіч*

II. Між агуркамі, буракамі — каза з зялёнымі рагамі.

(Цыбуля)



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Глядзяць і ўдзень, і ўночы,
Вытарашчыўшы вочы —
Ні на двары, ні ў хаце...
Як іх называці?

(Вокны)

*А. Клышка*

III. Сядзіць дзіця на гародзе і гаворыць: «У мяне ёсць бацька, маці, а я ім не сын».

(Дачка)

Крыкнуў вол на сто азёр, на сто міль, на ўвесь мір.

(Гром)

Сівая кабыла па лесе хадзіла, да нас прыйшла, на руках пайшла.

(Хмары і дажджы)

*(Народныя)*

● Вывучыце загадкі, якія вам больш спадабаліся. Загадайце іх сваім сябрам, бацькам, знаёмым.

● Якія зборнікі беларускіх загадак вы ведаеце? Выпішыце з іх некалькі загадак, у якіх ёсць аднародныя члены сказа.

Даведка. Можна выкарыстаць наступныя зборнікі літаратуры:
1. Беларускія загадкі / уклад. Я. Саламевіч.— Мн., 1989.
2. Гілевіч Н. Сіні домік, сіні дом... Загадкі.— Мн., 1961.
3. Загадкі / склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі.— Мн., 1972.

## § 44. Аднародныя і неаднародныя азначэнні

**276.** Правядзіце даследаванне: а) знайдзіце ў сказах азначэнні; б) вызначце, якія з іх вымаўляюцца з інтанацыяй пералічэння, а якія не; в) вызначце, паміж якімі азначэннямі можна паставіць злучнік *і*.

1. Чырвоныя, сінія, жоўтыя агеньчыкі мільгалі паміж соснамі. *(С. Грахоўскі)* 2. У лесе буяла мноства злой, калючай лясной крапівы. *(І. Мележ)* 3. Цёпламу, яснаму дню радуецца кожная жывая істота. *(І. Навуменка)* 4. Ціха брыла па абшарах у снежнай спадніцы марозная сіняя ноч. *(З. Бядуля)* 5. Адам Міцкевіч — адзін з найгеніяльнейшых славянскіх паэтаў. *(Я. Колас)*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**277.** Разгледзьце табліцу, падрыхтуйцеся і раскажыце, якія бываюць віды дапасаваных азначэнняў. Як характарызуюць прадмет аднародныя і неаднародныя азначэнні? Якімі граматычнымі формамі прыметнікаў яны выражаюцца? З якой інтанацыяй вымаўляюцца? Як практычна можна адрозніць аднародныя азначэнні ад неаднародных?

| Віды дапасаваных азначэнняў | Адрознівальныя прыметы | | |
|---|---|---|---|
| | сэнсавыя і граматычныя | інтанацыйныя | практычны спосаб |
| 1. Аднародныя | Называюць адрознівальныя прыметы розных прадметаў або аднаго і таго ж прадмета (*блакітныя, зялёныя, жоўтыя стужкі; роўны, прасторны выган*)<br>Характарызуюць прадмет з аднаго боку (*вясёлы, бадзёры настрой*); выражаюцца якаснымі прыметнікамі | Вымаўляюцца з інтанацыяй пералічэння | Можна ўставіць паміж імі злучнік ***і*** (*роўны і прасторны выган*) |
| 2. Неаднародныя | Характарызуюць прадмет з розных бакоў (*стары залаты гадзіннік*); выражаюцца спалучэннем якасных і адносных прыметнікаў | Не вымаўляюцца з інтанацыяй пералічэння | Нельга ўставіць паміж імі злучнік ***і*** |

**278.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль. Выпішыце сказы з дапасаванымі аднароднымі азначэннямі, а затым — з недапасаванымі. Карыстаючыся табліцай з практ. 277, абгрунтуйце іх адрозненне.

Прыгожыя лозы ля ракі ўвосень. Яны — чырвоныя, зялёныя, бурыя, жоўтыя — аж блішчаць на сонцы і цягнуцца лугам далёка-далёка, пакуль не схаваецца за лесам рака. Ірцы хочацца ісці і ісці туды, куды схаваліся лозы, дзе далёка яшчэ большыя, чым у іхняй Бярэзаўцы, лясы, дзе


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

зусім невядомы свет. І тады яна ўздыхае, папраўляе свае доўгія і тоўстыя чорныя косы, што расплялiся на грудзях, выцірае з ілба пот — горача як — і расшпільвае раскошную матчыну старую нужутку*.

...Ірка ўбачыла яшчэ, што да нагі ў яе прыліплі кавалачкі мяккай чырвонай гліны і смаляныя аскалёпачкі ад карчоў.

Збоку, на вырваным з зямлі верасе, ляжалі раскручаная белая бліскучая паперка, як ад цукерак, і шнурок — шэранькі, доўгі і тонкі, — як слівень*. *(І. Пташнікаў)*

- Зрабіце марфалагічны разбор слова *матчыну (нужутку).*

Дапасаваныя азначэнні, звязаныя паміж сабой толькі інтанацыяй, могуць быць аднародныя і неаднародныя.

Важна ўмець адрозніваць аднародныя азначэнні ад неаднародных, каб правільна ставіць знакі прыпынку.

Аднародныя азначэнні аднолькава адносяцца да азначаемага слова. У такім выпадку яны вымаўляюцца з інтанацыяй пералічэння і паміж імі можна паставіць злучнік ***і***. На пісьме яны аддзяляюцца коскай.

Параўн.: ***Буйное, густое*** *зарадзіла жыта.* (П. Броўка)
***Буйное*** *і* ***густое*** *зарадзіла жыта.*

Неаднародныя азначэнні адносяцца да азначаемага слова па-рознаму: непасрэдна да назоўніка адносіцца толькі першае, бліжэйшае з іх. А другое азначэнне адносіцца да ўсяго словазлучэння «назоўнік + першае азначэнне». У гэтым выпадку азначэнні вымаўляюцца без інтанацыі пералічэння і не дапускаюць устаўкі злучніка ***і***:

*Падзімаў, дыхаў* ***лёгкі летні*** *ветрык.* (Б. Сачанка)

Аднароднымі могуць быць і недапасаваныя азначэнні: *Дні* (якія?) ***трывог, страху*** *і* ***непакою*** *пачаліся для дзеда Талаша і яго сям'і.* (Я. Колас)


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**279.** Прачытайце сказы з правільнай інтанацыяй. Дакажыце, што азначэнні з'яўляюцца аднароднымі ці неаднароднымі. Спішыце сказы, падкрэсліце азначэнні як члены сказа.

1. Замоўклі белыя прасторы, змарыў іх ціхі зімні сон... *(М. Хведаровіч)* 2. Адшумелі свой час неспакойныя восеньскія вятры. *(Я. Колас)* 3. Харошая, памяркоўная, несварлівая трапілася мне жонка. Ды і я сам такі. Так што жылі добра, па-божаму. *(У. Караткевіч)* 4. Ён выцягнуў з кішэні вялізную срэбную з сіняй эмаллю цыбуліну гадзінніка. *(У. Караткевіч)* 5. Худзенькая, танюткая жанчына пазірала на мяне. Рысы твару былі выразныя, рэзка акрэсленыя. *(У. Караткевіч)* 6. А пад бэзам раслі высокія жоўтыя вяргіні. *(В. Каваль)*

**ЗАПОМНІЦЕ!** Заўсёды аднароднымі з'яўляюцца:

1) дапасаваныя азначэнні, якія стаяць пасля азначаемага слова: *Дымок **танюткі, белаваты** ўжо павіваецца над хатай.* (Я. Колас);

2) мастацкія азначэнні-эпітэты: *Па небе гуляла **вясёлае, ласкавае** сонца.* (А. Пысін);

3) азначэнні, адно з якіх выражана прыметнікам, а другое — дзеепрыметнікам: *У поцемку лесу нізкія елачкі трымалі **празрыстыя, заледзянелыя** пацеркі расы...* (В. Адамчык)

**280.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль. Выпішыце словазлучэнні з азначэннямі. Вызначце, аднародныя яны ці не. Пакажыце гэта на схемах.

І зноў пацягнула госця [немца] на параўнанне, на пошукі выслоўяў у іншых мовах. Просіць падаць яму з паліцы багатую рускую кніжку «Фразеологический словарь русского языка» і шукае фразеалагізм са словам «журавіны» — клюква. Там ёсць: *вот так клюква.* Яркі, выразны самабытны фразеалагізм; сэнс — выказванне расчаравання, здзіўлення (як і беларускія *вось табе і гацаца! вось табе і маеш! на табе!*). І зноў загадкі, і зноў пошукі ўразумення: рэаліі адны, фразеалагізмы розныя. *(Ф. Янкоўскі)*

● Якія беларускія фразеалагічныя слоўнікі вы ведаеце? Хто іх аўтары?



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

● Запішыце некалькі прыкладаў беларускіх фразеалагізмаў з адпаведнікамі ў іншых мовах.

● Затранскрыбіруйце слова *расчараванне*. Разбярыце яго па саставе і растлумачце правапіс.

**281.** Прачытайце тэкст. Пабудуйце схемы 2—3 сказаў, у якіх ёсць аднародныя члены. Выпішыце словазлучэнні з неаднароднымі азначэннямі.

Выснова напрошваецца сама: трэба наш родны дом зрабіць утульным. Каб душы чалавечай было ў ім хораша, цёпла, светла. Толькі і ўсяго. Але наш дом адно тады стане гэтакім, калі ў ім будзе ўсё тое, што ў родным доме павінна быць, менавіта:

калі ў ім будзе свабодна і натуральна, з ранку і да ночы, з вуснаў і старых, і малых гучаць роднае слова;

калі ў ім будуць чуцца пяшчотныя матчыны песні і мілагучныя бацькавы цымбалы, мудрыя дзедавы казкі і прыказкі, легенды і паданні;

калі ў ім будзе чуцён незаменны водар страў, які ты ўдыхаў ад калыскі, — водар найлепшых дароў нашай любай, самаахвярнай і мнагацерпнай зямлі-карміцелькі;

калі ў ім будзе вабіць твой зрок, і зачароўваць, і глядзець у душу табе — з пакрывалаў і посцілак, з паясоў і сурвэтак — «цвяток радзімы васілька»;

калі ў ім на стале, на белым абрусе, побач з боханам хлеба надзённага будуць ляжаць кнігі бібліі Францыска Скарыны, кнігі Кастуся Каліноўскага і Францішка Багушэвіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа, Максіма Багдановіча і Максіма Гарэцкага і многія іншыя кнігі свяшчэннага пісання нашага;

калі ў ім на самым пачэсным месцы, на покуці, пад ручнікамі, будуць абразы найвялікшых, найслынных сыноў і дачок Бацькаўшчыны — абразы святых і прасвятых зямлі нашай Беларускай.

А будзе ўсё гэта ў нашым родным доме толькі тады, калі мы захочам, каб было. *(Н. Гілевіч)*

● Пра які дом ідзе гаворка? Ці згодныя вы з аўтарам? Што, на вашу думку, неабходна рабіць, каб наш дом-Радзіма стаў утульным? Запішыце свае разважанні.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

З а ў в а г а. Аднародныя члены сказа графічна будзем абазначаць знакам ○.

Напрыклад: [⊜ і ⊜, ⊜ і ⊜] — у схеме адзначаны аднародныя выказнікі.

**282.** Прачытайце ўрыўкі з артыкула Н. Гілевіча. Выпішыце словазлучэнні з аднароднымі і неаднароднымі азначэннямі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Вялікай увагі заслугоўвае мова загадкавай паэзіі. Мова беларускіх загадак — гэта сапраўдная, жывая мова народа, незвычайна паслухмяны яму цудоўны інструмент, якім ён выяўляў і выяўляе самыя разнастайныя зрухі сваёй паэтычнай душы. Яркая, сакавітая прадметная лексіка, такая ж неаглядна багатая, як і сам неаглядны прадметна-рэчыўны свет. Гнуткі, рухавы, незакасцянелы сінтаксіс, надзіва прыдатны для перадачы любога павароту думкі, самых нечаканых псіхалагічна-эмацыянальных імпульсаў. І пры гэтым — выключная чысціня нацыянальных формаў, поўная суладнасць з духам і прыродным складам мовы, са строем душы і характару народа.

<...> Своеасаблівы сінтаксічны лад загадак. Будучы жанрам афарыстычным*, загадкі не церпяць мнагаслоўя і пустаслоўя, яны вельмі сціслыя, лаканічныя і зусім простыя па будове. Гранічная канцэнтрацыя моўна-вобразных сродкаў і крайняя эканомія слоў — вось асноўны сінтаксічны прынцып і «залатое правіла» загадак. Падпарадкоўваючыся жывой, размоўнай інтанацыі, загадка звычайна лёгка абыходзіцца без злучнікаў і ўвогуле без ускладненых сінтаксічных формаў.

↑ Паспрабуйце ахарактарызаваць сінтаксічны лад загадак з практ. 275, 287. Пакажыце, якую ролю выконваюць аднародныя члены сказа ў пабудове загадак.

**283.** Спішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку. Дапоўніце сказы аднароднымі (I частка) і неаднароднымі (II частка) азначэннямі.

I. 1. З поўначы дзьмуў моцны ... вецер. 2. На праглядзе былі паказаны французскія, іспанскія ... фільмы. 3. Прамысловасць рэспублікі выпускае шарсцяныя ... тканіны.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

4. У небе свяціліся ... сінія агеньчыкі салюту. 5. Удосталь хочацца напіцца ... свежай вадзіцы. 6. ... густы лес абступаў з двух бакоў балота.

II. 1. У мікрараёне «Захад» пабудавалі ... тэлефонную станцыю. 2. ... цагляны будынак выходзіць фасадам на магістраль. 3. Вера апранула новае ... паліто. 4. Наступіла ... восеньскае ранне. 5. ... пясчаныя фантанчыкі выкідвала з глыбіні лясная крынічка.

**284.** Прачытайце. Выдзеліце сказы, у якіх прыметнікі ўваходзяць у склад выказнікаў. Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку. Пабудуйце схемы 2-га і 5-га сказаў.

1. Чыстая глыбокая рэчка ў люстраной паверхні сваёй адбівае блакітнасць неба. *(П. Галавач)* 2. А навокал шуміць і шуміць і не моўкне дождж ліецца халодны сякучы і касы. *(П. Глебка)* 3. На месцы руін узняліся новыя прыгожыя шматпавярховыя дамы. *(А. Якімовіч)* 4. Раніца была яркая ціхая. Неба чыстае васільковае. *(А. Якімовіч)* 5. Зямля на Случчыне багатая ўрадлівая. *(В. Вольскі)* 6. Над шырокім прыцьмелым прасторам драмала доўгая зімовая ноч і снавалі ў вышыні зялёныя белыя сінія зоркі. *(В. Быкаў)*

**285.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль. Спішыце, пастаўце знакі прыпынку. Растлумачце іх пастаноўку. Знайдзіце сказы з аднароднымі і неаднароднымі азначэннямі, графічна пакажыце ў іх, як азначэнні звязаны з азначаемым словам. Замест кропак устаўце прапушчаныя літары.

Помню як на мінскіх вуліцах замест конкі з'явіліся першыя трамваі. Любіў Янка Купала іх зв..нкагалосую песню часта спыняўся на шумлівым трамвайным прыпынку. Паэт быў членам беларускага ўрада і меў права за..сці ў вагон трамвая праз пярэднія дзверы. Але ніколі ён гэтага не рабіў. Сціпласць і павага да людзей не дазвалялі яму так рабіць. Акрамя таго яму хацелася разам пабыць сярод в..сёлага гаманлівага натоўпу людзей пачуць іх дзелавую і жартоўную размову жывую в..сковую гаворку. *(М. Хведаровіч)*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

# § 45. Злучнікі пры аднародных членах сказа

**286.** Адкажыце на пытанні:

1. З якімі відамі сувязі аднародных членаў сказа вы знаёмы?

2. Якія злучнікі выкарыстоўваюцца для сувязі аднародных членаў?

3. У якіх сэнсавых і граматычных адносінах знаходзяцца аднародныя члены?

4. Якія бываюць віды злучальных злучнікаў паводле значэння? паводле спосабу ўжывання? (Выкарыстайце даныя табліцы.)

Злучальныя злучнікі

| | | |
|---|---|---|
| Спалучальныя ***і, ды*** (у значэнні ***і***), ***ні—ні*** (толькі паўторны і ўжываецца ў адмоўных сказах), парныя ***як—так і, не толькі—але і, не столькі—колькі:*** паказваюць на адначасовасць або паслядоўнасць | Супраціўныя ***а, але, ды*** (у значэнні ***але***), ***аднак, затое, хоць (хоць і)—але:*** выражаюць супастаўленне, неадпаведнасць | Размеркавальныя ***ці, ці—ці, або, або—або, то—то, ці то—ці то, не то—не то*** (толькі паўторныя), ***калі не—то:*** паказваюць на магчымасць толькі аднаго з двух (некалькіх) або на іх чаргаванне |

**287.** Прачытайце беларускія народныя загадкі, прыказкі і прымаўкі. Назавіце аднародныя члены сказаў, вызначце, якімі сродкамі яны звязаны паміж сабой. Выпішыце паасобку сказы са спалучальнымі, супраціўнымі і размеркавальнымі злучнікамі. Растлумачце знакі прыпынку ў сказах.

I. 1. Хто ходзіць зранку на чатырох, днём — на дзвюх, а вечарам — на трох нагах? 2. Не кароль, а ў кароне, не гусар, а пры шпорах, гадзінніка не мае, а час знае. 3. Стары і малы падыме, а цераз плот не перакіне. 4. Чатыры нагі маю, але не звер, пух і пер’е маю, але не птах, душу і цела маю, ды не чалавек. 5. Ішоў, ішоў, дзве дарогі знайшоў і ў абедзве пайшоў. 6. То наперад, то назад згрызе дрэва ў дробны мак.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Д л я   д а в е д к і: *піла, штаны, ложак, пух, певень, чалавек у розным узросце.*

II. 1. Чужому навучайся, ды свайго не цурайся. 2. Хутчэй, але не спяшайся. 3. Бяда хоць мучыць, але жыць вучыць. 4. Рыбка ў рацэ, ды не ў руцэ. 5. Языком у Вільні, а галавой за печчу. 6. Плётку ў адно вуха ўпусці, а ў другое выпусці. 7. У яго з адной губы і горача, і сцюдзёна.

● Прыдумайце сітуацыі, у якіх можна было б выкарыстаць тыя ці іншыя прыказкі. Складзіце з дзвюма сачыненні-мініяцюры, запішыце іх.

**288.** Прачытайце ўрывак з паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка». Вызначце рады аднародных членаў, растлумачце знакі прыпынку пры іх. Якія злучнікі выкарыстоўваюцца для сувязі аднародных членаў сказа?

На прыволлі, сеўшы ў полі,
Смутна стане хлопчык граць;
Льюцца, таюць зыкі болю,
Аж калоцяцца, дрыжаць
Ды заплачуць, затрасуцца,
Капнуць дробнымі слязьмі,
То ўгару яны памкнуцца,
То зноў нікнуць па зямлі.

● Ці з'яўляецца мастацкім апісанне гукаў музыкі? Абгрунтуйце сваю думку.

Аднародныя члены сказа могуць звязвацца паміж сабой інтанацыяй пералічэння або злучальнымі злучнікамі: *Свяжуткі, чысценькі нябёсы, бы тыя вочкі маладыя.* (Я. Колас) *Мір — гэта **і** праца, **і** шчасце, **і** радасць.* (М. Танк)

Для сувязі аднародных членаў у сказе ўжываюцца наступныя злучальныя злучнікі: спалучальныя ***і, ды*** (у значэнні *і*), ***ні—ні, як—так і, не толькі—але і;*** супраціўныя ***а, але, ды*** (у значэнні *але*), ***аднак, затое, хоць (хоць і)—але;*** размеркавальныя ***ці, ці—ці, або, або—або, то—то, ці то—ці то, не то—не то.***

Найбольш ужывальнымі ў мове з'яўляюцца спалучальныя злучнікі. З іх дапамогай часцей выражаецца значэн-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

не адначасовасці: *Каласяцца на палетках жыта **ды** пшаніца.* (К. Крапіва) або паслядоўнасці: *Стары лес закрываў раслінку ад паўночных вятроў **і** даваў ёй цяпло **і** зацішак.* (Я. Колас)

Супастаўляльнае значэнне перадаецца з дапамогай супраціўных злучнікаў: *Жыццё вымерваецца не гадамі, **а** тымі справамі, якія зрабіў чалавек.* (А. Асіпенка)

Размеркавальныя злучнікі перадаюць значэнне чаргавання прадметаў, з'яў, дзеянняў: ***То** знікне, **то** выблісне сонца ўгары.* (Н. Гілевіч), узаемавыключэння: *Мне хочацца паехаць **ці** пайсці ў падарожжа.* (А. Якімовіч) або няпэўнасці: *Неба на гарызонце зрабілася **не то** сінім, **не то** зусім белым.* (К. Чорны)

**289.** Прачытайце тэксты, дакажыце, што яны адносяцца да мастацкага стылю. Выпішыце сказы, у якіх аднародныя члены звязаны злучнікамі. Якое адценне значэння надаюць сказу злучнікі пры аднародных членах?

I. Хвілін пяць стаяла цішыня. Пасля няпэўны, ледзь чутны голас заспяваў дзіўную гартанную мелодыю. Праспяваў дзве-тры ноты і змоўк. Падхапіў другі жаночы голас, павёў яе, скардзячыся, і зноў змоўк... Трэці, чацвёрты голас... Песня мацнела, але да самага канца заставалася нягучнай. І раптам зноў цішыня. *(У. Караткевіч)*

II. І ўбачыў яе вочы. Сум трапятаў у іх, радасць, яшчэ нешта незразумелае, але, галоўнае, — гонар. Такі сціплы, але цвёрды гонар, якога яму не даводзілася бачыць. *(У. Караткевіч)*

**290.** Прачытайце тэкст услых, захоўваючы патрэбную інтанацыю. Вызначце яго стыль і тып.

...І тут пачалося. За акном як бач сцямнела. Шалёны віхор праляцеў дваром, задзёр шынель на галаву вартавому, нахіліў на страху стайні чорную вольху, і тая затрашчала, сагнуўшыся ў дугу.

Шаленства пераднавальнічнага ветру не скончылася на гэтым. Ён надумаў, відаць, наведацца ў госці да людзей у хаце. Раптоўна груькнулі дзверы, страшэнная пройма пацягнула да печы, дзьмухнула ў чалеснікі*, задзерла па дарозе


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

абрус, ледзь не сарвала яго са стала разам з наедкам і вылецела ў комін, сказаўшы выразным фальцэтам*:

— Аоў.

Гораў бачыў у акно, як гэты парыў проймы выкінуў з напаўразбуранага коміна галчына гняздо і пагнаў яго, як кола, па пыльнай дарозе.

— Сымон, чортаў сын, — крыкнуў Гораў, — каглу забыў зачыніць!

І сам кінуўся да печы, зачыніў каглу, падторкнуў яе анучаю.

Сымон скочыў у дзверы як апантаны, зачыніў іх, паправіў абрус, шуснуў у бакоўку і борздзенька выскачыў адтуль з запаленай свечкай. *(У. Караткевіч)*

● Вызначце з кантэксту значэнне слова *кагла* і падбярыце да яго літаратурны адпаведнік.

● Якую ролю выконваюць аднародныя выказнікі пры стварэнні малюнка буры? Як выражана значэнне адначасовасці ў першых двух абзацах?

● Назавіце сінонімы ў апошнім сказе. Вызначце іх ролю.

↑ Ці даводзілася вам назіраць буру, ліўні? Апішыце свае ўражанні або прывядзіце прыклады з мастацкай літаратуры (гл., напрыклад, практ. 269).

## § 46. Спосабы аб’яднання аднародных членаў сказа

**291.** Разгледзьце табліцу. Якія спосабы аб’яднання аднародных членаў паказаны ў прыкладах табліцы? Як яны звязаны з пастаноўкай знакаў прыпынку?

**Спосабы аб’яднання аднародных членаў сказа і знакі прыпынку пры іх**

| Лагічная і граматычная арганізацыя аднародных членаў | Прыклады |
|---|---|
| Паслядоўны рад аднародных членаў | *У векавечнай бацькаўшчыне клёны*<br>*Нячутна пачынаюць аблятаць*<br>*На рыжую траву, на мох зялёны,*<br>*На весніцы, на ціхі стаў, на гаць.*<br>У. Караткевіч |



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

| | |
|---|---|
| Папарна аб'яднаныя аднародныя члены | *Колькі кветак ля ракі!*<br>*Сінія, як вочкі,*<br>*Незабудкі і браткі,*<br>*Смолкі і званочкі.*<br>Н. Гілевіч |
| Рад аднародных членаў сказа з абагульняльным словам | *Павінны мы сваім нашчадкам*<br>*Усё пакінуць, чым жылі:*<br>*І белы луг, і рэчку з кладкай,*<br>*І лес паўз жытнія палі.*<br>В. Гардзей |

**292.** Прачытайце тэксты. Запішыце сказы, у якіх аднародныя члены звязаны: а) інтанацыяй і адным злучнікам ***і*** перад апошнім аднародным членам; б) парамі пры дапамозе злучніка ***і;*** в) паўторным злучнікам ***і;*** г) адзіночным злучнікам ***і***.

I. Пад гоманы бору, куванне зязюлі
Злажыў Багдановіч тут яркі вянок...
І поле, і пушчы, і рэкі тут чулі,
Як Цётка спявала, як марыў Бядуля,
Як слёзы рассыпаў Мацей Бурачок.

*М. Хведаровіч*

II. Раскінула ночка асеннія чары
Над рэчкаю казачнай, ціхаю Шчарай,
Заснулі навокал лясы і імшары,
І месяц укрыўся у шэрыя хмары.

*С. Шушкевіч*

III. Усё размерана на свеце:
Радзіны і хаўтурны звон,
Святы пакой і ліхалецце,
Пяшчотны слодыч і праклён.

*В. Зуёнак*

IV. Слова наша роднае, хапала
На стагоддзі доўгія цябе.
Багдановіч, Колас і Купала
Прыпадалі да цябе ў журбе...

*Г. Бураўкін*

● У якіх сказах пералічэнне можна прадоўжыць, а ў якіх нельга?



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

● Растлумачце знакі прыпынку пры аднародных членах. Пабудуйце схемы гэтых сказаў.

● Назавіце словы, у якіх ужываюцца прыстаўныя галосныя. Сфармулюйце правілы іх напісання.

## § 47. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа

К о с к а   с т а в і ц ц а:

1. Паміж аднароднымі членамі, якія звязаны паміж сабой інтанацыяй пералічэння, г. зн. без злучнікаў: [○, ○]; [○, ○, ○]: *Дзень быў* ***цёплы, ціхі.*** (І. Навуменка) *Згінулі* ***сцюжы, марозы, мяцеліцы.*** (Я. Купала)

2. Паміж аднароднымі членамі перад супраціўнымі злучнікамі: [○, *але* ○ ]: ***Драбнюткі, але спорны*** *дождж церушыў цэлыя суткі.* (П. Пестрак)

3. Паміж аднароднымі членамі перад другой часткай парных злучнікаў: [***як*** ○, ***так і*** ○]; [***хоць і*** ○, ***але*** ○] і інш.: *Мне заўсёды падабаліся* ***як вясёлыя, так і сумныя*** *песні роднага краю.* (У. Караткевіч) *Буслы вясной* ***хоць і нясмела, але вельмі важна*** *шпацыруюць па балоце і лузе, выглядаючы сабе здабычу.* (В. Вольскі)

4. Паміж аднароднымі членамі, звязанымі пры дапамозе паўторных спалучальных або размеркавальных злучнікаў: [***і*** ○, ***і*** ○, ***і*** ○, ***і*** ○]; [***ні*** ○, ***ні*** ○]; [***то*** ○, ***то*** ○, ***то*** ○]: *Вясёлае вясновае сонейка цешыла* ***і расліну, і птушку, і ваду, і*** *нашых* ***хлопцаў.*** (Я. Маўр) *Не чутно мне з былога* ***ні грому, ні звону.*** (П. Панчанка) *Безупынна ўспыхвалі ракеты і асвятлялі наваколле* ***то белым, то блакітным, то ружовым*** *святлом.* (Т. Хадкевіч)

5. Паміж аднароднымі членамі, калі злучнікі ***і, ды, або*** паўтараюцца і звязваюць не ўсе, а толькі частку аднародных членаў сказа: [○, ***і*** ○, ***і*** ○]; [○, ○, ***і*** ○, ***і*** ○]: *Пажаўцелі* ***травы, і лясы, і стэпы.*** (М. Калачынскі) *Абоз* ***імчыцца*** *па завулку,* ***грыміць, і трубіць, і звініць.*** (К. Крапіва)

6. Паміж парамі аднародных членаў, звязанымі спалучальным злучнікам ***і:*** [○ ***і*** ○, ○ ***і*** ○]: *Нас пакараюць* ***моры і рэкі, горы і нетры*** *зямлі.* (Я. Колас)



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

К о с к а  н е  с т а в і ц ц а:

1. Паміж аднароднымі членамі, звязанымі пры дапамозе адзіночных спалучальных ці размеркавальных злучнікаў: [○ *і* ○ ... ○ *ці* ○]: *Я **хацеў бы чытаць** свае вершы **Дзвіне і Бярозе ці** з чачоткавым кіем у Слуцк **ісці** па дарозе.* (П. Панчанка)

2. Паміж аднароднымі членамі, звязанымі неаднолькавымі злучнікамі: [○ *і* ○ *ды* ○]: ***Грузды і махавікі ды лісічкі** хутка напоўнілі нашы кошыкі.* (З. Бядуля)

З а ў в а г а. Не з’яўляюцца аднароднымі членамі і не раздзяляюцца коскамі словы ў складзе ўстойлівых спалучэнняў, звязаныя паўторнымі злучнікамі ***і—і; ні—ні; ці—ці:*** *і так і сяк; ні кала ні двара; то там то сям; ці блізка ці далёка* і інш.: *Іван ёй **ні сват ні брат**.* (М. Машара) *Тады **ні адтуль ні адсюль** чуўся часамі стогн і енк.* (К. Чорны)

**293.** Падрыхтуйце выказванне на тэму «Коска паміж аднароднымі членамі», карыстаючыся наступнай табліцай. Складзіце або выпішыце з твораў мастацкай літаратуры сказы, якія пацвярджаюць палажэнні вашага адказу.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Коска паміж аднароднымі членамі сказа | | | | | |
| ставіцца, калі яны спалучаны | | | | не ставіцца, калі яны | |
| інтанацыяй (без злучнікаў) | злучальнымі злучнікамі | | | спалучаны адзіночнымі спалучальнымі і размеркавальнымі злучнікамі | утвараюць непадзельныя спалучэнні |
| | супраціўнымі адзіночнымі | паўторнымі спалучальнымі і размеркавальнымі | парнымі | | |
| [○, ○] | [○, ***але*** ○] [○, ***а*** ○] | [***і*** ○, ***і*** ○] [***ці*** ○, ***ці*** ○] | [***як*** ○, ***так і*** ○] [***не толькі*** ○, ***але і*** ○] | [○ ***і*** ○] [○ ***ці*** ○] | [***і*** *так* ***і*** *сяк*] [***ні*** *пуху* ***ні*** *пер’я*] |


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**294.** Разгледзьце табліцу і перакажыце вядомыя вам правілы пастаноўкі знакаў прыпынку паміж аднароднымі членамі, звязанымі адзіночнымі злучнікамі. Прывядзіце прыклады. Да якіх груп па значэнні адносяцца прыведзеныя злучнікі?

| | | | |
|---|---|---|---|
| ○, *а* ○ | ***а, але, ды (=але), аднак, затое*** | ○ *і* ○ | ***і, ці, ды (=і), або*** |

**295.** Спішыце сказы, раскрываючы дужкі. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку. Растлумачце іх.

1. Павольна і ціха але шырока расчыняюцца дзверы, і парог пераступае тата. *(Ф. Янкоўскі)* 2. Раніца, сапраўды, была выдатная сонечная але *(не)* яркая а мяккая ціхая пяшчотная. *(А. Асіпенка)* 3. На Беларусі шмат вялікіх і малых рэк і азёр, багатых на рыбу. *(В. Вольскі)* 4. У хаце цесна затое весела. *(І. Мележ)* 5. Жыў сабе год чатырыста назад у беларускім горадзе Рагачове *(не)* багаты але добрага роду дваранін па прозвішчы Гервасій Выліваха. *(У. Караткевіч)* 6. Удзень і ўноч над палямі і лясамі чуліся выбухі снарадаў і аўтаматная страляніна. *(І. Мележ)*

● Разбярыце па саставе слова *расчыняюцца.* Ці супадае вымаўленне слова з напісаннем? Чаму?

**296.** Устаўце патрэбныя па сэнсе злучнікі. Запішыце сказы, расстаўляючы коскі.

1. На ранняй ралліцы родзіць жыта ... пшаніца ... на позняй ралліцы родзіць куколь ... мятліца. 2. Адзін дасуж ... не дуж. 3. Шалы ... балы да дабра не давядуць. 4. Сушыць не работа ... турбота. 5. Мужыка не тулуп грэе ... сякера.

**297.** Устаўце замест кропак аднародныя члены сказа з супраціўнымі злучнікамі. Запішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку.

1. Я доўга пісала сачыненне ... . 2. Гэта была не рэчка ... . 3. Вартавы прыгледзеўся ... . 4. Раніца была бязветраная ... . 5. Грыб вырас вялікі ... . 6. Чаравікі новыя ... . 7. Лес стары ... .


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**298.** Разгледзьце табліцу і сфармулюйце правілы пастаноўкі косак паміж аднароднымі членамі, звязанымі паўторнымі злучнікамі. Прывядзіце прыклады. Якія гэта злучнікі паводле значэння? Якое адценне надаюць сказу паўторныя злучнікі?

| | |
|---|---|
| ***і* ○, *і* ○**<br>***ні* ○, *ні* ○** | ***і—і, ні—ні, ці—ці, то—то, або—або, ці то—ці то*** |

**299.** Спішыце сказы, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку і растлумачце іх.

1. Лес і рэчку і клёкат бусловы чалавечую ўсмешку ўраз можна знішчыць адным толькі словам, што бяздумна вырвецца ў нас. *(В. Вітка)* 2. Мне дзіўны чуецца матыў на роднай мове матчынай і ў шолаху жытнёвых ніў і ў шуме соснаў мачтавых. *(М. Мятліцкі)* 3. Адна за адной то вясёлыя і шумлівыя то працяглыя і шырокія ліліся песні ў прастор. *(І. Шамякін)* 4. Вазьмі ў сваё сэрца на схову дрымоту маўклівых ракіт і поле і луг каляровы і родны блакіт. *(А. Кавалюк)* 5. Не шкадуй ні сіл ні часу папрацуй, юнача, дбала. *(П. Панчанка)* 6. Будзе дождж — будзе хлеб на стале, не будзе дажджу — не будзе ні хлеба ні ягад ні грыбоў ні арэхаў ні садавіны і агародніны. *(С. Александровіч)*

**300.** Запішыце сказы, замяняючы злучнік ***ці—ці*** злучнікам ***ці то—ці то***. Якое дадатковае адценне надаюць сказу гэтыя злучнікі? Пастаўце знакі прыпынку.

1. Песні жанчын чуліся ці ў лесе ці за рэчкай. 2. Вузкая сцяжынка ці хавалася ў жыце ці рэзка выбягала на прастор. 3. Няўмеламу ці цэп ці малатарня — усё страты. 4. Стары лес шумеў ці на гром ці на вецер.

**301.** Складзіце сказы з устойлівымі спалучэннямі слоў *ні свет ні зара, ні кала ні двара, ні слыху ні дыху, ці пан ці прапаў.*

**302.** Разгледзьце табліцу і сфармулюйце правіла пастаноўкі коскі паміж аднароднымі членамі, звязанымі парнымі злучнікамі. Прывядзіце прыклады. Якія гэта злучнікі паводле значэння?

| | |
|---|---|
| ***як* ○, *так і* ○** | ***не толькі—але (але і), не столькі—колькі, хоць (хоць і)—але, калі не—то*** |


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**303.** Запішыце сказы, устаўляючы патрэбныя па сэнсе злучнікі. Пастаўце знакі прыпынку і растлумачце іх.

1. ... хлопцы ... дзяўчаты могуць атрымаць прафесію юрыста. 2. ... суніцы ... чарніцы паспелі ў бары. 3. ... хочацца тых ягад ... пабыць у лесе падыхаць водарам лясных палян. 4. ... праз тыдзень ... крыху пазней я здам экзамен. 5. Гульня была настолькі цікавая, што захапіла ... дзяцей ... дарослых. 6. ... пакой невялікі ... чысты.

**304.** Спішыце сказы, пастаўце коскі. Растлумачце іх пастаноўку.

1. Думкі пра сад супакойвалі душу Францыска Скарыны настройвалі на філасофію. *(А. Лойка)* 2. Хоць стомленая але вясёлая вярнулася Фрося дадому. *(З. Бядуля)* 3. Пра яго гаварылі не столькі добрага колькі смешнага. *(Я. Колас)* 4. Пра Мінск пра Беларусь ведаюць людзі за самымі далёкімі морамі; Беларусь для іх не толькі мірная і добрая краіна але і цягавіты трактар і вынослівы самазвал і элегантны гадзіннік. *(М. Танк)*

● Выпішыце з 1-га сказа словазлучэнні «наз. + наз.», «дзеясл. + наз.». Вызначце ў іх від сінтаксічнай сувязі.

● Сфармулюйце правіла правапісу слова *цягавіты.* Назавіце 3—4 словы на гэта правіла.

**305.** Складзіце сказы з развітымі і неразвітымі аднароднымі членамі па наступных схемах:

[○, ***але*** ○]. [***і*** ○, ***і*** ○, ***і*** ○]. [○, ○ ***ці*** ○]. [○, ○, ***і*** ○, ***і*** ○].

**306.** Графічны дыктант.

1. З маленства люблю я лясы, іх сцішаны голас і шум патаемны. *(Я. Колас)* 2. На захадзе бліснула журботная, ласкавая ўсмешка сонца і патухла. *(Я. Колас)* 3. Сонца толькі што ўзышло, аднак прыгравала ўжо даволі горача. *(Э. Самуйлёнак)* 4. Вясна-красна наступае, вадой лугі залівае. *(Нар. песня)* 5. Дзед быў калі не дужы, то добры дарадчык. *(З. Бядуля)* 6. Пад узгорак або ў гразь конь насілу возьме. *(К. Крапіва)* 7. Дэталі можна не толькі выточваць, але і штампаваць. *(У. Шахавец)* 8. Я закаханы ў нёманскія плёсы, у старыцы і ў светлыя лясы, у шумныя асеннія бя-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

розы і ў кропелькі сцюдзёнае расы. *(С. Грахоўскі)* 9. Вось ён спатыкнуўся ці то аб камень, ці то аб корань. *(М. Лынькоў)* 10. Кахаю моцна, горача, праўдзіва і песню запяваю ля крыніц. *(Я. Пушча)*

↑ **307.** Прачытайце тэкст. Выпішыце сказы з аднароднымі членамі, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.

У часы барока лічылася, што ежа павінна не толькі насыціць, але і ўразіць гасцей сваім смакам, колерам, формай, сумяшчэннем несумяшчальнага. Спалучалі салодкае і кіслае, салодкае і горкае, кіслае і салёнае. У торт саджалі жывых птушак, якія ўзляталі ў час «івату»[1]. На стол падавалі цэлых дзікоў, напоўненых унутры каўбасамі, індыкамі, курапаткамі, або доўгіх шчупакоў, «засмажаных у галаве, звараных у сярэдзіне і печаных у хвасце».

Традыцыйнай сенсацыяй застолля быў «цэлы» каплун*, засаджаны ў «бутлік» (для гэтага з каплуна здымалі скуру, запіхвалі ў бутэльку, напаўнялі праз лейку малаком і яечнымі жаўткамі, а потым усё разам варылі ў кіпені). Рыбу фаршыравалі свінінай, свіней — індычацінай, індыкоў — рыбай. Птаству, піша Кітовіч, «выкрыўлялі дзівачна ногі, крылы, галовы, рабілі фігуры, да стварэння Божага непадобныя, і такія стравы лічыліся самымі моднымі і густоўнымі». *(А. Мальдзіс. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя)*

● Падзяліцеся сакрэтамі ўпрыгожвання святочнага стала ў вашай сям'і. Ці карысталіся вы парадамі рубрыкі «Гаспадыня» з часопіса «Бярозка» або іншых часопісаў?

↑ Растлумачце, чаму ў тэксце некаторыя словы, словазлучэнні і часткі сказа ўзяты ў двукоссе.

↑ **308.** Удумліва прачытайце тэкст вядомага мовазнаўцы А. Я. Міхневіча. Пры неабходнасці карыстайцеся тлумачальным слоўнікам.

З мноства ўласцівасцей чалавека адна, найбольш істотная, — валоданне мовай. Натуральная чалавечая мова — адзіная ў жывым свеце сістэма камунікавання*, якая ха-

[1] *У час «івату»* — час віншавання, здравіца.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

рактарызуецца вельмі разгалінаванай, непаўторнай сістэмай сацыяльных функцый. Дзякуючы мове чалавек здольны назапашваць веды і перадаваць іх іншым людзям, навукова пазнаваць свет і эстэтычна асэнсоўваць, засвойваць яго, прыгадваць мінулае і праектаваць будучыню, ствараць сям'ю і ўмацоўваць дзяржаву (адна з функцый літаратурнай мовы). Мова ідзе за чалавекам ва ўсіх яго дачыненнях з прыродай, грамадствам, розумам. Яна ў самым грунце чалавечых мар і здзяйсненняў, пачуццяў і думак. Мовай мацуецца повязь пакаленняў, яна шмат у чым вызначае статус асобы, ступень яе сацыялізаванасці*, уключанасці ва ўсе бясконца разнастайныя праявы жыцця. Мова насычае сэнсам іншыя камунікатыўна-знакавыя сістэмы, якімі карыстаецца чалавек. Яна служыць крыніцай натхнення, дае радасць самаўсведамлення дзіцяці і асалоду самавыяўлення паэту. Падае руку немаўляці і суцяшае старэчае сэрца. Вядзе нас па жыцці, ахоўвае і перасцерагае. Спаталяе прагу духоўнасці і лечыць ад страт. Яна — магутная, прыгожая, велічная...

- Якую функцыю выконвае мова ў жыцці грамадства? Паспрабуйце растлумачыць тыя функцыі мовы, якія пералічвае навуковец.
- Якія камунікатыўна-знакавыя сістэмы вы ведаеце?
- Як вы разумееце сцвярджэнне аўтара аб тым, што «ўмацоўваць дзяржаву — адна з функцый літаратурнай мовы»?
- Вызначце стыль тэксту. Якую ролю ў ім выконваюць няпоўныя сказы і сказы з аднароднымі членамі? Вызначце спосабы аб'яднання аднародных членаў.
- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах.

**309.** Удумліва прачытайце тэкст. Спішыце яго, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Растлумачце іх.

«Не ўрадлівасцю ніў не адрозненнем адзення не прыроднай прыгажосцю краіны не моцай гарадоў і замкаў квітнеюць народы а больш за ўсё тым, што берагуць і ўжываюць сваю мову, якая згуртоўвае грамадства ўмацоўвае дружбу і брацтва. Мова гэта вузы ўсеагульнай любові маці адзінства бацька грамадства абаронца дзяржавы. Ліквідаваць мову ўсё роўна што патушыць сонца парушыць сусветны парадак пазбавіць свет жыцця і славы» — з такімі словамі звяртаўся


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

да сваіх суродзічаў-літоўцаў гуманіст і дзеяч эпохі Адраджэння Мікалоюс Даўкша (1538—1613).

↑ Падумайце, што меў на ўвазе М. Даўкша, сцвярджаючы, што «ліквідаваць мову — усё роўна што ... парушыць сусветны парадак».

● Правядзіце словаўтваральны аналіз слова *суродзічы*. Запішыце 5—6 аднакаранёвых слоў, разбярыце іх па саставе.

**310.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль і тып. Выпішыце сказы з аднароднымі членамі, расстаўляючы знакі прыпынку. Зрабіце іх сінтаксічны разбор, пабудуйце схемы.

Мне ўспомніўся паляк Міхал Федароўскі. Вялікі ён і дарагі Беларусі беларусам. Вялікі ён і дарагі Польшчы палякам. У свае немаладыя гады, ходзячы і ездзячы па Беларусі, Федароўскі любаваўся беларускімі набыткамі знаходкамі ў словах фраземах прыказках вітаннях зычэннях прыгаворках жартах песнях казках... Дзівіўся Федароўскі і з такога мілага яму: беларусы нарадзілі далікатныя і мілагучныя Міхась Антось Адась Юрась Карусь Пятрусь... *(Ф. Янкоўскі)*

↑ Хто такі Міхал Федароўскі? Падрыхтуйце невялікае паведамленне пра яго.

● Назавіце прыклады беларускіх вітанняў і зычэнняў. Складзіце і запішыце невялікія дыялогі з вітаннямі і зычэннямі.

**311.** Прачытайце ўслых, захоўваючы патрэбную інтанацыю, два вельмі блізкія па сэнсе сказы. Які з іх вы лічыце больш выразным? Пры дапамозе чаго гэта выразнасць дасягаецца?

Кожны чалавек па-свойму перажывае радасць, смутак, бадзёрасць, стомленасць, захапленне, адчай, любоў, нянавісць.

Кожны чалавек па-свойму перажывае радасць і смутак, бадзёрасць і стомленасць, захапленне і адчай, любоў і нянавісць.

Адзін з сінтаксічных сродкаў выразнасці маўлення — парнае спалучэнне аднародных членаў сказа.

У ролі аднародных членаў, аб'яднаных папарна, нярэдка ўжываюцца антонімы: *Мова дае каларыт твору, робіць яго* ***баявым*** *або* ***спакойным, паэтычным*** *або* ***нудным, лірычным*** *або* ***суровым***... (Я. Скрыган)



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**312.** Прачытайце тэксты, захоўваючы патрэбную інтанацыю.

I. Я жыву на граніцы —
На граніцы вёскі і горада,
Травы і бетону,
Цішы і грому.

*П. Макаль*

II. ...Гэтыя кнігі карысна чытаць усякаму чалавеку: мудраму і неразумнаму, багатаму і беднаму, маладому і старому. А найперш тым, хто мае намер засвоіць добрыя норавы, спасцігнуць сапраўдную мудрасць і навуку. *(Ф. Скарына. Прадмова да кнігі «Прытчы Саламона»)*

● Які сінтаксічны сродак выразнасці выкарыстаны ў тэкстах? Складзіце сказы, ужываючы падобныя канструкцыі.

**313.** Спішыце тэкст, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Растлумачце іх. Пабудуйце схемы сказаў з аднароднымі членамі.

Гэты мой знаёмы шчыры чалавек — немец. Яшчэ ў свае універсітэцкія гады ён пачаў займацца славянскімі мовамі іх сродкамі экспрэсіі* выразнасці. Калі ён, ужо сталы і сур'ёзны чалавек, **завітаў** у Мінск то чытаў і ведаў «Чаго вам хочацца, панове?» і «Вобразы родныя» «Ты не згаснеш, ясная заранaчка» і «Судзі мне, доля, мужнаму памерці» «Новую зямлю» і «Курган» «Жменю сонечных промняў» і «Галю» «Нёманаў дар» і «Аленяў»... Чытаў багата што і ведаў. *(Ф. Янкоўскі)*

● Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленага слова.
● Ці чыталі вы пералічаныя творы? Хто іх аўтары?

**314.** Удумліва прачытайце тэкст. Ці згодныя вы з думкай аўтара? Ці можаце прывесці прыклады страчаных слоў? Як вы разумееце сэнс апошняга абзаца?

Наша жывая мова страціла безліч слоў. Слоў, створаных па ўнутраных законах развіцця мовы, слоў, якія неслі колер і водар самой беларускай зямлі, беларускай прыроды. Мову пачалі адрываць ад зямлі, на якой яна ўзнікла, складвалася, набіралася моцы і сілы, а зямлю — пазбаўляць мовы, рабіць бязмоўнай і безыменнай. І не бачна канца гэтаму варварска-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

му разрыву непарыўнага — разрыву адвечнага адзінства зямлі і мовы. Але ў мове не толькі аблічча, фарбы і гукі зямлі, а філасофія і мараль народа, працоўнага чалавека. І гэта ўсё таксама разам з мовай нявечыцца і забіваецца!

Так наступае ўсеагульнае абядненне і апусташэнне душы чалавечай. *(Н. Гілевіч)*

● Пабудуйце схемы сказаў з аднароднымі членамі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Вызначце, якую ролю выконваюць аднародныя члены, звязаныя папарна.

↑ **315.** Прывядзіце прыклады, якія ілюструюць, як філасофія і мараль народа, яго светапогляд адлюстроўваюцца ў мове. Паразважайце, напрыклад, чаму ў рускай мове кажуць «жениться на Марье», а па-беларуску — «ажаніцца з Мар'яй», «смеяться над ним» — «смяяцца з яго», «пойти за водой» — «пайсці па ваду» і інш.

● Што адбылося, калі з нашай мовы былі выкінуты словы *Радаўніца, Дзяды, Каляды?*

**316.** Прачытайце тэкст, вызначце яго асноўную думку. Ці сугучная яна з думкай Н. Гілевіча, выказанай у тэксце практ. 314?

Як лепш пісаць: на Беларусі ці ў Беларусі? Скажаце, можна і так, і так. Але калі мяняюцца словы — мяняецца і сэнс. Паспрабуем яшчэ раз: можна сказаць «на Беларусі», «на Літве» і «на Украіне», але ўжо «на Францыі» ці «на Аўстрыі» не скажам. Толькі гэтыя тры краіны ва ўсім свеце можна ўжыць з прыназоўнікам «на». А каб зразумець, чаму так, трэба трошкі ўспомніць гісторыю. Якія тэрыторыі ўваходзілі ў склад старабеларускай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага? Сучасныя Беларусь, Літва і Украіна. Многія пра гэта забыліся ці ўвогуле не ведалі, а мова памятае. *(М. Клімковіч)*

● Пабудуйце схемы сказаў з аднароднымі членамі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.

**317.** Прачытайце і спішыце тэкст, пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку і растлумачце іх.

Мова ёсць самая жывая самая багатая і самая моцная сувязь, якая злучае аджыўшыя жывучыя і будучыя пакаленні народа ў адно вялікае гістарычнае жывое цэлае. Яна не


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

толькі выяўляе жыццёвасць. Калі знікне мова — народа больш няма... Адыміце мову — і ён ніколі ўжо больш не створыць яе; нават новую радзіму можна стварыць але мову — ніколі; вымерла мова ў вуснах народа — вымер і народ. **Але калі чалавечая душа скаланецца перад забойствам і аднаго недаўгавечнага чалавека, то што ж павінна адчуваць яна, замахваючыся на жыццё «шматвяковай гістарычнай асобы народа — гэтага найвялікшага з усіх тварэнняў на зямлі?»** *(К. Ушынскі)*

- Растлумачце пастаноўку працяжніка ў сказах.
- Назавіце словы, у якіх выяўляюцца адметныя фанетычныя рысы беларускай мовы.
- Удумайцеся ў сэнс выдзеленага сказа. Запомніце гэту думку сусветна вядомага педагога.

**318.** Прачытайце тэкст. Спішыце, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку.

У шматлікія і разнастайныя слоўнікі мы амаль не заглядваем, а калі і разгортваем пры неабходнасці перакласці нейкае слова — дык хапаем **першае** па чарзе яго значэнне (трэба ж хутчэй!), хаця ёсць і **другое** і **трэцяе** а то і **чацвёртае** і **пятае.** Вось адкуль гэтыя бясконцыя «паставіць у вядомасць» і іншыя падобныя фразы-пачвары. *(Н. Гілевіч)*

- Вызначце тэму тэксту, яго асноўную думку.
- Да якой часціны мовы належаць выдзеленыя словы?
- Назавіце словы, якія ўтвораны спосабам складання. Растлумачце іх правапіс.

**319.** Прачытайце тэкст. Спішыце, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку.

Культура мовы гэта і культура мыслення і культура працы вытворчасці і культура ўзаемаадносін культура пачуццяў. Тут поўнае непадзельнае адзінства. Без культуры мовы — адзінства цэлага разбураецца. Аднабаковая культура гэта, выбачайце, не культура. *(Н. Гілевіч)*

- У чым, на вашу думку, заключаецца культура мовы? Запішыце сваё меркаванне.
- Пабудуйце схемы сказаў з аднароднымі членамі.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**320.** Напішыце сачыненне на тэму «Роля роднай мовы ў жыцці грамадства». Адрасата і жанр сачынення выберыце самастойна (напрыклад, выступленне з дакладам на школьнай навуковай канферэнцыі; размова з незнаёмым чалавекам ля газетнага кіёска ці ў кніжнай краме; адказ на пытанне суседкі, якая выбірае школу для свайго сына-першакласніка, і інш.). Пры падрыхтоўцы выкарыстайце матэрыялы практ. 314, 315, 316, 317, 318, 319 і ілюстрацыю падручніка (У. Крукоўскі «Шануйма родную мову»).

**ЗАПОМНІЦЕ!** Пры спалучэнні аднародных членаў у сказе неабходна кіравацца наступным:

а) у рад аднародных членаў уключаюцца словы з сумяшчальнымі паняццямі, г. зн. такія, якія адпавядаюць адной прымеце;

б) спалучаюцца словы, якія адказваюць на адно пытанне і выражаны адной часцінай мовы;

в) нельга ўключаць у склад аднародных членаў сказа дададую частку складанага сказа.

**321.** Прачытайце сказы, вызначце, у якіх з іх: а) у рад аднародных членаў уключаны несумяшчальныя паняцці; б) аднародныя члены адказваюць на розныя пытанні; в) спалучаны аднародныя члены і даданая частка складанага сказа. Запішыце сказы ў выпраўленым выглядзе.

1. Уся суша раздзелена на шэсць частак свету: Еўропу, Азію, Афрыку, Амерыку, Аўстралію, Антарктыду, Японію і Францыю. 2. У садзе раслі яблыні, слівы, грушы, бярозы, дубы. 3. Міхась быў адважны і смелым. 4. Ежа павінна быць смачнай, каларыйнай і прыгожа аформлена. 5. Вучні любілі спевы, фізкультуру і маляваць. 6. Сяброўка спытала аб уроках і як мае здароўе.

**322.** Прачытайце сказы, знайдзіце памылкі ва ўжыванні азначэнняў. Запішыце сказы ў выпраўленым выглядзе. У чым сутнасць дапушчаных памылак?

1. У краме на Чырвонай вуліцы вялікі выбар мужчынскага, жаночага і гумавага абутку. 2. У праграме вечара планаваліся беларускія і эстрадныя песні. 3. Лісцевыя і вільготныя лясы распаўсюджаны на тэрыторыі Беларусі. 4. Лексіку сучаснай беларускай мовы складаюць спрадвеч-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

ныя беларускія і кніжныя словы. 5. На сустрэчу былі запрошаны беларускія, польскія і народныя пісьменнікі.

## § 48. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа

**323.** Прачытайце сказы. Падбярыце да аднародных членаў сказа слова або словазлучэнне з больш шырокім, абагульняльным значэннем — абагульняльнае слова.

1. Восенню каля вашага дома будуць трымацца шпакі, дразды, амялушкі, снегіры. 2. Сонца ярка асвятляла палі, вёску, рэчку і луг. 3. Побач са старажытнымі дубамі ў парку можна ўбачыць вязы, клёны, грабы, ясені. 4. На падаконніках у класе стаялі кактус, альяс і дрэўца лімона. 5. У лесе дзеці шмат набралі сыраежак, лісічак, баравікоў і падасінавікаў. 6. Сонца зайшло. Птушкі змоўклі і ў лесе, і ў полі.

**324.** Прачытайце верш, захоўваючы патрэбную інтанацыю. Вызначце яго асноўную думку.

Усё было мне міла тут:
Над Нёманам зялёны кут,
Палі шырокія, узгоркі,
І смоль сасны, і ў небе зоркі,
І пах асіны гаркаваты,
Сады зялёныя ля хаты,
І гучны перазвон крыніц,
І сполах вечарам зарніц,
І Нёман мой, як шкло, празрысты,
І маладзік у небе чыстым,
І шумны за ракой начлег,
Дзяўчат-красунь вясёлы смех,
І кроплі жніўеньскай расы,
На лузе першы звон касы,
І кожнае жывое слова
Прыветнай беларускай мовы...

*А. Астрэйка*

● Назавіце слова, якое паясняецца аднароднымі членамі. Якое яго значэнне? Чым яно выражана і як размяшчаецца адносна рада аднародных членаў? Якія гэта аднародныя члены сказа?


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

А б а г у л ь н я л ь н а е  с л о в а пры аднародных членах сказа — гэта слова, якое выражае больш шырокае значэнне, чым аднародныя члены, і суадносіцца з аднароднымі членамі як радавое і відавое паняцце. Абагульняльнае слова з'яўляецца тым жа членам сказа, што і аднародныя члены: *Паэтам сваёй працы павінен быць* ***кожны****: каваль і інжынер, матэматык і гісторык, географ і выкладчык літаратуры.* (В. Вітка) *Чутно вясны дыханне* ***ўсюды****: на сініх далях, на лясах, на дрэвах, што вартуюць шлях.* (Я. Колас)

У ролі абагульняльных слоў часцей за ўсё ўжываюцца займеннікі ***(усё, усе, кожны, ніхто, нішто)***, прыслоўі ***(усюды, заўсёды, ніколі, нідзе)***, назоўнікі *(****дрэвы:*** *дубы, бярозы, клёны;* ***кветкі:*** *васількі, званочкі, незабудкі).*

Абагульняльнае слова можа стаяць перад аднароднымі членамі і пасля іх; ад гэтага залежыць пастаноўка знакаў прыпынку.

Калі абагульняльнае слова стаіць перад аднароднымі членамі, то пасля яго ставіцца двукроп'е: *А на рабочым варштаце* ***прылады****: клешчы, жалеза, балты і ключы...* (М. Танк)

[◎ : ○, ○, ○ *і* ○].

Калі абагульняльнае слова стаіць пасля аднародных членаў, то перад ім ставіцца працяжнік: *Акадэмікі і хірургі, паэты і маршалы —* ***усе*** *былі вучнямі, іх талент разбудзіў просты вясковы настаўнік.* (С. Грахоўскі)

[○ *і* ○, ○ *і* ○ — ◎].

Калі абагульняльнае слова стаіць перад аднароднымі членамі, але імі не заканчваецца сказ, то перад аднароднымі членамі ставіцца двукроп'е, а пасля іх — працяжнік: ***Усё:*** *і хмурнае неба, і мёрзлая чорная зямля — было ахоплена нечым сумным, халодным і грозным.* (К. Чорны)

[◎: *і* ○, *і* ○ — ... ].

**325.** Разгледзьце табліцу, раскажыце аб знаках прыпынку ў сказах з абагульняльным словам пры аднародных членах. Падмацуйце адказ уласнымі прыкладамі.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

[◎: ○, ○, ○].
[○, ○, ○ — ◎].
[◎: ○, ○, ○ —...].

1. | Усюды | панавала цішыня: у полі, на лузе, у гаі.
2. У полі, на лузе, у гаі — | усюды | панавала цішыня.
3. | Усюды | : у полі, на лузе, у гаі — панавала цішыня.

**326.** Прачытайце тэксты, выпішыце сказы з абагульняльным словам пры аднародных членах. Растлумачце ў іх пастаноўку знакаў прыпынку, спосабы выражэння абагульняльных слоў. Пабудуйце схемы гэтых сказаў.

I. Бясконцай вечнасці хвіліна.
Запомніце і зберажыце:
І ты, мая асенняя каліна,
І позні васілёк у спелым жыце.
Як першае прызнанне і ахвяра,
Так нечакана жыта загучала.
І шчасце горкае, і страх, і кара —
Усё злучылася ў адным харале.

*В. Вітка*

II. І ва ўмелых, і няўмелых
Ён бывае розны, ўсякі:
Пытляваны, сітны, белы,
Шэры, чорны і ніякі.

*В. Вітка*

III. Няма дзяцей бяздарных,
Мы з талентамі ўсе:
І лекар, і пажарнік,
І слуцкі хлебасей,
Каваль, даяр, ліцейшчык,
І кожны чалавек —
У геніяльнай дзежцы
Замешаны навек.

*П. Панчанка*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**327.** Спішыце, расстаўце, дзе трэба, знакі прыпынку і растлумачце іх. Пабудуйце схемы 3-га, 4-га і 5-га сказаў.

1. Разуменне дакладнасці слова ўменне карыстацца ім культура мовы і нават пісьменнасць усё залежыць ад таго, як загучала для вас слова, пачутае ў маленстве. *(В. Вітка)* 2. Колькі ў кроплю фарбаўназаткана, быццам свет увесь у ёй сабраны поле луг сады ўсяго пасёлка і рака і неба і вясёлка! *(П. Броўка)* 3. У багатае і дажджом і сонцам лета грыбы ідуць усюды па бары па бярэзніку па верасе. *(І. Навуменка)* 4. Пайсці ў грыбы ці ў тую ж рыбу або паехаць на сялібу ці ў млын малоць на хлеб збажыну ўсё гэта вабіла хлапчыну. *(Я. Колас)* 5. Нельга даць у крыўду нічога жывога ні чалавека ні ластаўкі ні вішнёвага дрэва. *(М. Лужанін)*

**328.** Падбярыце абагульняльныя словы да аднародных членаў і перабудуйце сказы так, каб аднародныя члены знаходзіліся ва ўсіх трох пазіцыях (гл. узор у практ. 325).

1. Наша літаратурная мова стваралася Скарынам, Коласам, Купалам, Багдановічам і іншымі майстрамі слова. 2. Бэз пах у садзе, на вуліцы, у хаце. 3. І дрэвы, і хмызнякі, і лясны подсціл набрынялі вільгаццю.

**329.** Падбярыце да абагульняльных слоў (словазлучэнняў) аднародныя члены і пабудуйце з імі сказы, выкарыстаўшы ўсе варыянты пастаноўкі знакаў прыпынку.

Пералётныя птушкі; настольныя гульні; музычныя інструменты; прылады.

**330.** Прачытайце сказы. Разбярыце іх па членах сказа, растлумачце знакі прыпынку. Чым адрозніваюцца сказы ў парах?

1. Хадасевіч, Міцкевіч, Саладуха — выдатнікі нашага класа. На алімпіяду па беларускай мове паехалі Хадасевіч, Міцкевіч, Саладуха — усе выдатнікі нашага класа.

2. Дабрыня, розум, справядлівасць — самыя лепшыя якасці чалавека. Дабрыня, розум, справядлівасць — усе самыя лепшыя якасці спалучаліся ў гэтым чалавеку.

3. Мы збіралі апалыя лісты клёна, ясеня, бярозы і асіны. Мы збіралі апалыя лісты розных дрэў: клёна, ясеня, бярозы і асіны.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

4. У прыгожым кошыку былі два баравікі, сыраежкі і чырвонагаловік. У прыгожым кошыку былі грыбы: два баравікі, сыраежкі і чырвонагаловік.

**331.** Увядзіце ў сказы абагульняльныя словы. Запішыце. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку. Разбярыце па членах сказа.

Чаму выдзеленыя словы не з'яўляюцца абагульняльнымі?

1. Ні ў паветры ні на вадзе ні пад зямлёй **ніколі** не павінна быць ядзерных узрываў. 2. Літаратура музыка мастацтва **заўсёды** цікавілі чалавека. 3. У холад і спёку раніцай і днём вечарам і ноччу пагранічнікі **бесперапынна** нясуць варту.

## § 49. Паглыбленне звестак пра апісанне як тып тэксту

**332.** Прачытайце тэксты практ. 258, 273, 281. Вызначце тып кожнага тэксту, сваю думку абгрунтуйце.

У залежнасці ад зместу, гэта значыць ад таго, якое пытанне раскрываецца ў паведамленні, наша маўленне будуецца па-рознаму. Гэта можа быць апісанне (хто? які?); апавяданне (што гэта? як адбываецца?); разважанне (чаму гэтыя прадметы, з'явы такія? чаму гэта так адбываецца? і інш.). Гэта розныя тыпы маўлення.

Пад тыпам маўлення разумеецца тэкст (ці фрагмент тэксту) з пэўным абагульненым значэннем (прадмет і яго прыметы; прадмет і яго дзеянне; прычынна-выніковыя адносіны і інш.), якое выражаецца пэўнымі моўнымі сродкамі.

Апісанне — гэта перадача словамі выявы якога-небудзь прадмета, з'явы рэчаіснасці шляхам пералічэння іх істотных прымет. Для *пейзажу* гэта будзе знешні выгляд дрэў, травы, неба, ракі; для *партрэта* — рост, узрост, паходка, пастава, выраз вачэй, усмешка, унутраны стан чалавека; пры апісанні *прадмета* — гэта паведамленне пра яго прызначэнне, выкарыстанне, знешні выгляд, часткі і інш. Усё гэта можна ўбачыць разам, адначасова (напрыклад, на адным фотаздымку, малюнку). Апісанне характарызуецца статычнасцю.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Выдзяляюць некалькі відаў апісання: прадмета, месца, стану чалавека, стану навакольнага асяроддзя і інш.

**333.** Выберыце з мастацкага твору (твораў) невялікія ўрыўкі, у якіх ёсць апісанне стану чалавека, апісанне месца і інш. (можна выкарыстаць тэксты падручніка па беларускай мове і «Дыдактычнага матэрыялу для IX класа»). Дакажыце, што гэтыя тэксты з'яўляюцца апісаннямі.

**334.** Уважліва разгледзьце рэпрадукцыі мастацкіх твораў С. Лагуновіча-Чарапко, А. Марачкіна, Т. і У. Васюкоў «Еўфрасіння Полацкая», У. Сулкоўскага «Елка ў пары з хваіною», «Спаса-Еўфрасіннеўская царква ў Полацку», У. Масленікава «Зямля дзядоў». Апішыце твор, які вас найбольш зацікавіў. Якія тыповыя фрагменты тэксту вы ўключыце ў сваё сачыненне (апісанне месца, апісанне прадмета, апісанне стану навакольнага асяроддзя, апісанне знешнасці)?

Пералічваць прыметы можна ў рознай паслядоўнасці ў залежнасці ад мэты выказвання, таму кампазіцыя і, як вынік, планы тэкстаў-апісанняў могуць быць розныя.

К а м п а з і ц ы я (ад лац. *compositio* — сачыненне, складанне, спалучэнне) — будова, размяшчэнне і суадносіны састаўных частак тэксту.

Характэрнымі элементамі кампазіцыі апісання з'яўляюцца:

1) агульнае ўяўленне аб прадмеце;
2) асобныя прыметы прадмета;
3) аўтарская ацэнка, вывад, заключэнне.

**335.** Прачытайце тэксты, вызначце іх тып і стыль. Якую ролю выконваюць аднародныя члены ў пабудове тэксту?

I. Васька пакуль што не зусім добра ведае лугавыя лекавыя расліны, аднак падбел сярод іх лёгка адрозніць па роўных і булаватых сцяблінках, па жоўтых кветках, сабраных у вузкія і дробныя вяночкі. Падбел, надзвычай карысны ад кашлю, спачатку цвіце, а потым ужо абрастае чырванавата-бурым лісцем. Цікавы ён і тым, што, як ганарлівы шляхціц, мае яшчэ дзве запасныя назвы: маташнік, маці-мачыха. Слова «маташнік», зрэшты, нічога не гаворыць, другую ж


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

назву расліны займальна тлумачыць баба Марка. Аказваецца, сэрцападобны, з вострымі зубчыкамі па краях, зялёны ліст падбелу спадыспаду мяккі ад пуху і цёплы на дотык — адсюль «маці», зверху той жа ліст гладкі і халодны — адсюль «мачыха». Як вядома, маці ў Ваські няма, а бурклівая мачыха, напэўна, і забыла, што непадалёк у дзедавай хаце жыве і гадуецца яе непаслухмяны, наравісты пасынак. Іменна вось таму ён не любіць гэтую дзіўную лекавую траву. *(В. Гардзей)*

II. Падбел звычайны — Tussilago farfara L.

Сям'я складанакветкавыя — Compasitae.

Шматгадовая травяністая расліна да 20 см вышынёй, з паўзучым карэнішчам. Сцябло прамастойнае, укрыта лускападобным лісцем, з'яўляецца ранняй вясной і мае па адным кветкавым кошыку. Як язычковыя крайнія кветкі, так і трубчастыя сярэдзінныя залаціста-жоўтага колеру. Пасля адцвітання ў расліны развіваецца разетка прыкаранёвых доўгачаранковых лістоў. Пласцінка ліста акруглая або шырокая, яйкападобная, нераўнаямная, зверху цёмна-зялёная, амаль голая, знізу белавата-лямцавая. Плод — сямянка з чубком.

Падбел шырока распаўсюджаны ў Беларусі, нярэдка ўтварае вялікія зарасці. Расце на глiністых і пясчаных глебах, па канавах, на палях, па берагах рэк, каля дарог, а таксама на асушаных тарфяніках.

З найбольшым поспехам лісце падбелу выкарыстоўваецца пры захворваннях дыхальных шляхоў і лёгкіх. Лісце падбелу разам з лісцем крапівы (у роўных суадносінах) выкарыстоўваюць для мыцця галавы пры наяўнасці вялікай колькасці перхаці і выпадзенні валасоў.

Мы рэкамендуем лісце падбелу пры пнеўманіях, бранхітах, бранхіяльнай астме, ахрыпласці голасу. *(Я. Шмярко, І. Мазан)*

**336.** Прааналізуйце тэксты з практ. 335. Ахарактарызуйце іх кампазіцыю, запішыце план кожнага тэксту, выкарыстоўваючы аўтарскія словы. Вусна перакажыце змест аднаго з тэкстаў.

У апісанні больш значная, чым у апавяданні, вага слоў, якія абазначаюць якасці, уласцівасці прадметаў.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Дзеясловы ў апісанні выступаюць, як правіла, у формах незакончанага трывання, часта ў прошлым часе, а для асобай нагляднасці — у форме цяперашняга часу. Важна, што ў апісанні формы дзеяслоўнага часу абазначаюць не паслядоўную змену дэталяў, а іх размяшчэнне на адной плоскасці, як бы на адным палатне. У мастацкім і навуковым стылях падыход да выдзялення ў прадмеце тых бакоў, дэталей, якія апісваюцца, розны. У **навуковым стылі** характарыстыка прадмета павінна быць як мага больш поўнай, а ў **мастацкім стылі** акцэнт робіцца толькі на самых яркіх дэталях, якія дазваляюць тым самым стварыць вобраз прадмета. У мастацкім стылі моўныя сродкі для абазначэння прымет значна больш разнастайныя, чым у навуковым. Калі ў **навуковым апісанні** прыметы выражаюцца пераважна прыметнікамі і назоўнікамі, прычым кніжнымі, з прамым, часта адцягненым значэннем, то ў **мастацкім** выкарыстоўваюцца прыметнікі з больш канкрэтным значэннем, назоўнікі, дзеясловы, прыслоўі; вельмі часта выкарыстоўваюцца параўнанні, прамыя і пераносныя значэнні мнагазначных слоў і інш.

Якасць апісання ў многім залежыць ад удалага выбару гэтых слоў.

**337.** Параўнайце апісанні кветкі (маці-мачыха, ці падбел) у першым і другім тэкстах з практ. 335. Чым адрозніваюцца апісанні?

Якая ваша любімая кветка? Пісьмова апішыце яе ў розных стылях.

**338.** Падумайце, чым карысныя наступныя парады. Пастарайцеся часцей выконваць іх.

1. а) Уважліва на працягу 30 секунд разглядвайце якінебудзь прадмет (вазу з кветкамі, статуэтку, чайны сервіз і інш.);

б) Схавайце прадмет, апішыце яго па памяці;

в) Зноў паглядзіце на прадмет, параўнайце з ім сваё апісанне: ці дастаткова яно поўнае?

2. Зрабіце тое ж самае, што і ў заданні 1, выкарыстоўваючы ўклейку ў падручніку (У. Хадаровіч «Памяці Францыска Скарыны», «З думай аб Радзіме», «Вясковы нацюрморт»).


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

З а ў в а г а. Заданні 1, 2 можна выконваць як у вуснай, так і ў пісьмовай форме, аднаму ці разам з іншымі (членамі сям'і, аднакласнікамі, сябрамі).

**339.** Прачытайце тэкст, захоўваючы патрэбную інтанацыю. Вызначце яго тып, абгрунтуйце сваю думку. Якога кампазіцыйнага элемента не хапае ў тэксце? Паспрабуйце дапісаць яго.

Відаць, мы ў цемры ўзбіліся на бакавы ганак, бо проста направа ад мяне быў парадны ўваход: шырокія, таксама стральчатыя, дзверы, падзеленыя драўлянымі калонкамі на тры часткі. На калонках была трохі пашчапаная часам разьба: кветкі, пялёсткі і плады. За дзвярыма, у глыбіні вестыбюля, — уваходныя дзверы, масіўныя, дубовыя, акутыя пацямнелымі цвікамі з квадратнымі галоўкамі. А над дзвярыма — вялізнае цёмнае акно ў ноч і цемру. На акне — мастацкай работы выгінастыя краты. *(У. Караткевіч)*

- Выпішыце сказы з абагульняльным словам і аднароднымі членамі. Зрабіце сінтаксічны разбор двух апошніх сказаў.
- Якую ролю ў тэксце выконваюць аднародныя члены і няпоўныя сказы?
- Якія яшчэ формы мае назоўнік *дзверы* ў Т. скл.? Запішыце.
- Паспрабуйце апісаць дзверы дома, у якім вы жывяце, або дзверы таго дома, які б вы хацелі пабудаваць. Можна апісаць дзверы музея, тэатра і г. д.

**340.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль і тып. Вусна апішыце палац Міхала Клеафаса Агінскага, захоўваючы аўтарскі стыль і кампазіцыю апісання. Дапоўніце апісанне сваёй ацэнкай ці вывадам.

У канцы XVIII — пачатку XIX стагоддзя прафесар архітэктуры Віленскага універсітэта Міхаіл Шульц, а потым знакаміты дойлід Іозеф Пусье ўзводзяць у Залессі (Смаргонскі раён) мураваны палац у сядзібе Міхала Клеафаса Агінскага — таго самага, што ўдзельнічаў у паўстанні пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі і напісаў славуты паланез «Развітанне з Радзімай». Аблічча маёнтка створана згодна з добрым густам класіцызму. Цэнтральная частка мела чатырохкалонны порцік і вежу з гадзіннікам на чатыры бакі. У шары над вежай змяшчаўся гадзіннікавы звон. Прастора перад маёнткам утульна спланаваная, сюды ўлетку выносілі


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

з аранжарэі вазоны з экзатычнымі кветкамі і раслінамі — рыса, характэрная для сядзібнага побыту XVIII—XIX стагоддзяў. З вестыбюля можна было трапіць у анфіладу*, якую складалі салон, ружовая гасцёўня, сталовая, більярдная, а праз яшчэ адну гасцёўню — у аранжарэю.

На другім паверсе знаходзіліся бібліятэка і галерэя з відам на парк, сажалку, звярынец.

У XVIII—XIX стагоддзях сцены аздабляліся шпалерамі, габеленамі, карцінамі з упрыгожанага арабескамі* тонкага аксаміту, якія выраблялiся на радзівілаўскіх мануфактурах у Міры і Нясвіжы, Альбе і Слуцку, мануфактурах Сапегаў у Ружанах і Дзярэчыне, на каралеўскіх мануфактурах Тызенгаўза ў Гародні. На Слонімскай мануфактуры Міхала Клеафаса Агінскага выраблялі тканіны накшталт французскіх XV стагоддзя. Тканыя з тонкага аксаміту карціны ўпрыгожвалі палацы Радзівілаў у Альбе.

<...> Дапаўнялі ўбранне інтэр'ераў люстры і бра, кандэлябры і падсвечнікі. У іх формах і аздабленні ўжываліся варыяцыі расліннага і зааморфнага паходжання, а таксама мудрагелістыя элементы стыляў барока і ракако. Шырока вядомы ў тыя часы крыштальныя люстры налібоцкіх майстроў. Модным дапаўненнем інтэр'ера лічыліся гадзіннікі, як правіла, замежнай вытворчасці. Мастацкае ўбранне іх футаралаў з дрэва, фарфору, бронзы ўключала кветкавы антураж*, кампазіцыі з фігурамі анёлаў і міфічных істот. *(А. Лакотка)*

- Якую ролю ў тэксце выконваюць аднародныя члены сказа?
- Прывядзіце прыклады апісання будынкаў ці памяшкання ў мастацкіх творах.
- Апішыце мясцовы архітэктурны помнік.

**341.** Прачытайце тэкст. З якіх частак ён складаецца? Ахарактарызуйце іх паводле тыпу маўлення. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту, падбярыце загаловак.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа ў структурнай частцы «апісанне». Якую ролю ў пабудове гэтай часткі выконваюць аднародныя члены?

Над пераможанай імперыяй Гітлера грымелі апошнія залпы. Лілася кроў, абрушваліся будынкі, падалі і паміралі людзі, грозна гулі ў небе эскадрыллі бамбардзіроўшчыкаў.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Горад Дрэздэн, які называлі «сталіцай мастацтваў», ляжаў у руінах. Знакамітая мастацкая галерэя, якая захоўвала сотні лепшых твораў сусветных мастакоў, знікла. Па словах уцалелых жыхароў, карціны былі вывезены яшчэ да бамбёжкі, але ніхто не мог сказаць, дзе тая часовая схованка (а значыць, і не прыстасаваная для карцін), якая паглынула скарбы сусветнага мастацтва.

Салдаты нашай арміі аглядалі пустыя склепы. Падсвечваючы кішэннымі ліхтарыкамі, яны абстуквалі сцены ў пошуках гэтага сховішча. Спускаліся ў глыбокія шчыліны закінутых, залітых вадою каменяломень. Расчышчалі груды друзу. Абясшкодзілі сотні мін. І яны атрымалі яшчэ адну перамогу: раскіданыя па розных тайніках, асуджаныя на пагібель ад вільгаці ці выбуху скрыні з бясцэннымі скарбамі мастацтва былі вернуты чалавецтву.

Калі адчынілі адну са скрынь, вынесеную з глыбіні залітай вадой каменяломні, уражаныя салдаты ўбачылі карціну незвычайнай прыгажосці і выразнасці. Маладая жанчына з немаўлём на руках... Босыя ногі лёгка ступаюць па воблаках. Шырока расплюшчаныя, удумлівыя і крыху сумныя вочы глядзелі кудысьці ўдалячынь. Уся яе пастава, простая і адначасова ўрачыстая, адухаўлёная, поўная пяшчоты, рамантычнасці, узнёсласці, любві і строгай велічы, скарыла прысутных пры гэтым відовішчы.

У незвычайнай дакладнасці кампазіцыі карціны не было нічога выпадковага, нічога нязначнага. Маці з дзіцем у цэнтры і ўкленчаныя фігуры святых, размешчаныя трохкутнікам, ствараюць сваёй геаметрычнай пабудовай уражанне ўраўнаважанасці і спакою. Складкі вопраткі, як на антычных статуях, звязваюць усё ў адно цэлае. Адгорнуты край мантыі святога паўтарае лініі плашча маладой жанчыны, нават абрысы яе злёгку сагнутай у калене нагі. Усе тры фігуры былі зусім простымі, рэальнымі і зямнымі, хоць вакол іх клубіліся воблакі.

А ў самай ніжняй частцы карціны выглядаюць з-за простага драўлянага плоту двое цудоўных дзяцей. У іх крыльцы за плячыма, у знак таго, што яны жыхары нябёсаў. Але больш нічога анёльскага няма ў гэтых хлапчукоў. Адзін з іх, старэйшы, падпірае шчаку рукой і зручна абапіраецца на


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

плот. Другі яшчэ не дарос. Яму ўдалося толькі пакласці свае пухлыя ручкі і ўтыкнуцца ў іх падбародкам.

У карціне пераважаюць яркія колеры. Жоўтая, сіняя і зялёная фарбы падкрэсліваюць ярка-чырвоную падкладку мантыі святога і барвовую сукенку жанчыны. Сукенка полымем гарыць на фоне бела-блакітных аблокаў. Але кантрастнасць усіх гэтых колераў з геніяльным майстэрствам згладжвалася дадатковымі адценнямі, якія аб'ядноўвалі ўсё ў адзінае гарманічнае і высакароднае цэлае.

Ніякіх знешніх эфектаў салдаты не ўбачылі ў гэтай карціне, але ўсе адчулі, што яна незвычайная, яна ўражвае. Карціна захапляе, пакарае і падпарадкоўвае сабе кожнага. Як самага вялікага гонару дабіліся тады салдаты права на ахову выратаванага імі скарбу. Гэта была сусветна вядомая «Сіксцінская мадонна» Рафаэля. *(М. Андрэеў)*

а) *Варыянт 1.* Падрабязна перакажыце змест тэксту, захоўваючы яго тып і стыль.

↑ б) *Варыянт 2.* Раскажыце пра сюжэт, кампазіцыю і мастацкую выразнасць карціны Рафаэля «Сіксцінская мадонна». Выкарыстайце для гэтага як матэрыял тэксту, так і іншыя, знойдзеныя вамі крыніцы (гл. уклейку).

↑ **342.** Прачытайце тэкст. Выпішыце з яго сказы з аднароднымі членамі, зрабіце іх сінтаксічны разбор. Перабудуйце выдзелены сказ у сказ з аднароднымі членамі.

Гэта адбывалася роўна трыста гадоў назад. 1700 год. У гора было сваё найменне — Паўночная вайна. І хоць, здаецца, павінна яна была адбыцца на поўначы, але ж адным з яе эпіцэнтраў сталася наша Беларусь. Больш за дваццаць гадоў мерыліся сіламі малады ды ваяўнічы кароль Карл Шведскі з царом расійскім Пятром Аляксеевічам. Здаецца на першы погляд — чужая для нас гэта справа. Калі б толькі гэтае няшчасце не кранала сэрца Еўропы — Беларусь. Пазнейшыя гісторыкі скрупулёзна падлічаць, што ледзь не кожны трэці ліцвін-беларусец склаў галаву на той вайне. Шмат нашых паселішчаў зведалі спусташэнні. Не мінула бяда і ружанскія муры. Здавалася, ужо назаўсёды «адцвіце ружа-кветка», як у песні пяецца. Ды толькі казачнае адраджэнне чакала Ружаны ў канцы XVIII стагоддзя. І было


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

яно знітавана з імем цудоўнага іншаземнага дойліда*, што на доўгія гады прапісаўся ў Сапегавых уладаннях.

Яго імя, што назаўсёды застанецца ў гісторыі архітэктуры, — Ян Самуэль Бекер. Падобна, майстар адшукаў на Беларусі сваё шчырае захапленне, нават любоў. І яе імя было Ружаны. Ніводзін архітэктар на працягу шэрагу стагоддзяў не прыкладаў столькі намаганняў для абнаўлення мястэчка, як гэта зрабіў Ян Бекер. Адзін толькі пералік ягоных пабудоў уражвае! **За няпоўныя два дзесяцігоддзі (паміж 1779 і 1792 гадамі) дойлідам былі пабудаваны ў Ружанах Петрапаўлаўская царква ды кляштар (манастыр) уніяцкага ордэна базыльянаў, а затым — каталіцкі касцёл у імя Святога Казіміра, абнавіў свой выгляд Троіцкі касцёл, вядомы ад часоў Льва Сапегі...**

А колькі беражлівасці і прыгажосці заклаў таленавіты майстар, каб адбылося другое нараджэнне Ружанскага палаца, адной з найлепшых зорак беларускага дойлідства часоў Вялікага княства Літоўскага. Здаецца, у ягоных руках цяплеў нават камень. У атачэнні класічнага парка Бекер распачаў будаваць сапраўдны палацавы комплекс.

Будынкі размяшчаліся строга па частках свету. На поўначы знаходзіўся гэтак званы Галоўны корпус, які, па задуме Бекера, быў значна перабудаваны. Па правую руку месціўся Усходні корпус, падзелены на Манеж і Тэатр. (Дарэчы, у тым Тэатры выступалі каля 60 артыстаў, спевакоў ды танцоўшчыкаў, існавалі оперная ды балетная школы для дзяцей прыгонных сялян.) Заходні корпус, ад якога да нашых дзён не захавалася нават і каменьчыка, быў знакаміты сваёй шыкоўнай карціннай галерэяй. Дзе цяпер тая прыгажосць, расцярушаная па свеце, вынішчаная войнамі, скрадзеная сквапнымі захопнікамі? Пытанне — нябёсам...

Ружанскі палац уяўляўся надзвычай цэльным. Гэтае ўражанне стваралі аркады*, якія злучалі Галоўны корпус з Усходнім і Заходнім. На поўдні (паралельна Галоўнаму корпусу) знаходзілася ўязная брама з флігелямі. Сваім знешнім выглядам яна нагадвала трыумфальную арку. Магчыма, тым самым Сапегі, якія на той час пачалі карыстацца княжацкім тытулам, хацелі лішні раз падкрэсліць веліч сваёй радзімы. Браму багата аздобілі разьбою і геральдычнымі выявамі.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

У 1785 ці 1786 годзе канцлер ВКЛ Аляксандр Сапега вырашыў перанесці сваю рэзідэнцыю ў Дзярэчын, а палац перадаць у арэнду прадпрымальнаму чалавеку, каб «ружанская птушка» (як часам паэтычна называлі палац) прыносіла яшчэ і фінансавую карысць. Тут пачала працаваць суконная мануфактура, якая вырабляла шаўковы матэрыял, дарагія (так званыя слуцкія) паясы. Да таго ж мануфактура выпускала байку, атлас ды прыгожыя абрусы. Здаецца, пачаў дабрабыт сяліцца ў мястэчку. І не дзіўна — напрыканцы XIX стагоддзя тут налічвалася каля двух дзесяткаў розных прадпрыемстваў!

Аднак, як гэта ўжо неаднойчы здаралася ў нашай гісторыі, наступнае XX стагоддзе прынесла новыя разбурэнні, выкліканыя дзвюма сусветнымі войнамі. Спачатку першая прынесла вялікі пажар, які знявечыў знешні твар палаца, а потым другая (у 1944 годзе) даруйнавала, данішчыла тое, што было народжана ад моцнай любові і захаплення майстра-стваральніка. *(А. Бензярук)*

● Зрабіце выбарачны пераказ тэксту на тэму: «Ружа-кветка Яна Самуэля Бекера», выкарыстаўшы пры гэтым тып тэксту «апавяданне з элементамі апісання».

↑ **343.** Па аналогіі з тэкстамі практ. 341, 342 раскажыце пра лёс якога-небудзь выдатнага твора мастацтва (помнік беларускай культуры, гістарычны дакумент, рэч, якая належала вядомай асобе). Пажадана, каб гэта было апавяданне пра экскурсію ў музей (па горадзе ці вашым населеным пункце) з апісаннем асобных прадметаў.

## *Кантрольныя пытанні і заданні*

**Варыянт 1**

1. Якія члены сказа называюцца аднароднымі? Якія члены сказа могуць быць аднароднымі?
2. Ці могуць аднародныя члены сказа выражацца рознымі часцінамі мовы? Прывядзіце прыклады.
3. Як вызначаюцца аднародныя і неаднародныя дапасаваныя азначэнні? Пакажыце на прыкладах-схемах.
4. Якія злучнікі пры аднародных членах заўсёды з'яўляюцца адзіночнымі? Якія — адзіночнымі і паўторнымі?


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

5. Пастаўце знакі прыпынку ў сказах, растлумачце іх. Зрабіце пісьмовы сінтаксічны разбор сказаў і пабудуйце іх схемы.

*1. Успомняцца стэпы пушчы і бор і горы і моры і зорны прастор.* (П. Броўка) *2. Тут было ўсё звычайным імхі на купінах балотцаў сухі верас паміж імі мышка-малютка...* (У. Караткевіч)

**Варыянт 2**

1. Калі паміж аднароднымі членамі коска ставіцца, а калі не ставіцца? Прывядзіце прыклады.
2. Якія знакі прыпынку ставяцца пры аднародных членах у сказах з абагульняльнымі словамі?
3. Якую ролю выконваюць аднародныя члены ў мове?
4. Якія існуюць правілы пабудовы сказаў з аднароднымі членамі?
5. Пастаўце знакі прыпынку ў сказах, растлумачце іх. Зрабіце пісьмовы сінтаксічны разбор сказаў і пабудуйце іх схемы.

*1. А цяпер цярусіцца то на сіта сеецца то слупамі круціцца сыпкая мяцеліца.* (М. Лужанін) *2. Трывогу радасць смутак і адчай усё аддай краіне маладой.* (М. Машара)

**344.** Выканайце тэставыя заданні.

**Частка I.**

Прачытайце сказы і выканайце заданні: А1; А2; А3.

А. І зажмурыўся ад болю, аслеп на міг...

Б. Прыставіў бінокль да вачэй, глянуў на поле.

В. Гэта ўжо канец зімы.

Г. Сонца плавілася на снезе, адбівалася ад яго, быццам ад люстэрка, і, сфакусаванае оптыкай бінокля, асляпіла мяне.

**А1.** У якой паслядоўнасці патрэбна размясціць сказы, каб атрымаўся тэкст.

1. А, Б, В, Г
2. Б, А, Г, В
3. В, А, Б, Г
4. Г, Б, В, А

**А2.** Адзначце памылку ў сінтаксічнай характарыстыцы сказаў.

1. Сказ А просты, аднасастаўны, пэўна-асабовы, развіты, ускладнены аднароднымі выказнікамі *зажмурыўся, аслеп*.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

2. Сказ Б просты, аднасастаўны, пэўна-асабовы, развіты, ускладнены аднароднымі выказнікамі *прыставіў, глянуў*.

3. Сказ В просты, двухсастаўны, няпоўны (прапушчаны выказнік *наступіў*), дзейнік *канец зімы*, развіты.

4. Сказ Г складаны, складаецца з дзвюх граматычных частак.

**А3.** У якіх сказах ёсць прыслоўе?

1. А
2. Б
3. В
4. Г

**А4.** Адзначце словы, у якіх напісанне і вымаўленне супадаюць.

1) адценне
2) мундзір
3) расчыніць (дзверы)
4) згінуць

**А5.** Адзначце словы, у якіх пішацца літара *е*.

1) тыс..ча
2) ц..гавіты
3) пам..ць
4) л..генда

**А6.** Адзначце словы, у якіх пішацца літара *у* (складовае).

1) Вітэлі(у,ў)с
2) вогне(у,ў)стойлівы
3) па(у,ў)за
4) пасля (у,ў)ніверсітэта

**А7.** Адзначце словы, у якіх не пішацца мяккі знак.

1) каліс..ці
2) наймен..ш
3) ліпен..скі
4) яблын..ка

**А8.** Адзначце выпадкі, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні.

1) Лоўчага *атачылі* дамы.
2) *Забушаваў* бэз.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

3) Сонца *распусціла* косы.
4) *Расцвіла* яблыня.

**А9.** Адзначце беларускія адпаведнікі рускаму фразеалагізму «Вот так клюква».
1) Вось табе і маеш!
2) Заламаць калена.
3) Альбо пан, альбо прапаў.
4) На табе!

**А10.** Якому слову адпавядае наступнае лексічнае значэнне 'вельмі ўстрыманы чалавек, які вядзе суровы лад жыцця'?
1) здранцвелы
2) легальны
3) пастар
4) аскет

**А11.** Адзначце словы, якіх пішуцца праз злучок.
1) (бела)ружовы мармур
2) (бела)мармуровы палац
3) (шляхі)дарогі
4) (дзяўчаты)красуні

**А12.** Адзначце назоўнікі, якія ў форме Р. скл. ужываюцца з канчаткам *-у (-ю)*.
1) з выган..
2) з кварцыт..
3) з кужал..
4) з аўтобус..

**А13.** Адзначце прыслоўі, якія пішуцца разам.
1) ішоў (па)малу
2) нырнуў (у)глыб
3) ныраць (у)глыб вады
4) (далёка)далёка відаць

**А14.** Адзначце радкі, дзе часціца *не* пішацца разам.
1) (не)забудка
2) (не)далёка ад горада
3) нельга (не)заўважыць
4) (не)адно пакаленне бачыла


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**А15.** У якіх спалучэннях *не* са словамі пішацца асобна?
1) зусім (не)цікавая гісторыя
2) праца (не)завершана
3) трава яшчэ (не)скошана
4) (не)адну справу закончыў

**А16.** Будова якіх слоў адпавядае марфемнай схеме:



1) памыецца
2) завязваецца
3) прыдняпроўскі
4) любавацца

**А17.** Адзначце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам.
1) седзячы (на лаве)
2) лекавыя (расліны)
3) пэўна-асабовы (сказ)
4) падмурак

**А18.** Адзначце радкі, у якіх усе спалучэнні слоў з'яўляюцца словазлучэннямі.
1) быць у лесе, перад домам, хлопчыкі і дзяўчынкі
2) вельмі позна, самы лепшы, буду вучыць
3) гуляць дапазна, вясёлы чалавек, купіў у краме
4) птушкі лятаюць, шукаць прыгод, годна прадставіць

**А19.** Адзначце радкі, дзе пералічаныя тэрміны не маюць адносін да сінтаксісу.
1) алфавіт, марфема, корань слова
2) просты сказ, выказнік, просты ўскладнены сказ
3) прыдатак, абзац, дзейнік
4) ланцужковая сувязь, азначэнне, прымыканне

**А20.** Адзначце словазлучэнні з прымыканнем.
1) усім вядома
2) увайшоў у клас
3) аб'яднаныя па-сапраўднаму
4) бітва пад Грунвальдам


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**А21.** У якіх словазлучэннях парушана спалучальнасць слоў?

1) зжаць жыта
2) балоцісты мох
3) даходлівае месца
4) зжаць ураджай

**А22.** У якіх словазлучэннях дапушчаны граматычныя памылкі?

1) пайшоў у вёску
2) пайшоў у суніцы
3) пайшоў за вадой
4) пайшоў па гаспадара

**А23.** Адзначце радкі, у якіх прадстаўлены словазлучэнні з граматычным значэннем ‘прадмет і яго прымета’.

1) слухаць музыку
2) пайшоў вучыцца
3) вялікае жаданне
4) купіў кнігу

**А24.** Адзначце непадзельныя словазлучэнні.

1) апусціць нос
2) завіхацца ля калодзежа
3) у дзевяць гадзін
4) вучні старшых класаў

**А25.** Адзначце сказы з састаўным дзеяслоўным выказнікам.

1) Пацяклі-паплылі за гадамі гады.
2) Пачалі разгружаць вагоны.
3) Пасля заканчэння універсітэта стану дызайнерам.
4) Я буду працаваць у фотастудыі.

**А26.** Знайдзіце памылкі ў дапасаванні выказніка да дзейніка.

1) Трое дзяўчат стаялі.
2) Два футбалісты выйшлі на поле.
3) Пяць мінула заснежаных зім.
4) Малады доктар Іванова паспяхова правяла аперацыю.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**А27.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца азначэннямі.

1) Пасля дажджу лес зрабіўся *непрытульны.*

2) *Алесевы* бацькі хацелі вучыць хлопца на настаўніка.

3) Жыццё *цяпер* — адна радасць.

4) *Трое* коней пасвілася на лузе.

**А28.** Адзначце сказы, у якіх выдзелены інфінітыў выконвае ролю азначэння.

1) Старанна працаваць — краіну *мацаваць.*

2) Больш за ўсё мы любілі *слухаць* жарты бабкі Насты.

3) У лесе я вучыўся *распазнаваць* галасы птушак.

4) Паляўнічага не кідалі надзеі *выратаваць* хлопцаў, якія апынуліся пад лёдам.

**А29.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца прамымі дапаўненнямі.

1) Беларускі народ ганарыцца сваімі *героямі.*

2) Афіцэр закамандаваў *стаяць.*

3) Вецер моцна хістае галіны *дрэў.*

4) Сямёра *аднаго* не чакаюць.

**А30.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца акалічнасцямі.

1) *З пушчы* вецер гнаў на дарогу лісты.

2) *Да слёз* крануў мяне расказ старога пасечніка.

3) Наша хата *дзесятая ад канца сяла.*

4) З двара *насупраць* выбег на вуліцу белы певень з вялікім чырвоным грэбнем.

**А31.** У якіх сказах дапушчаны памылкі ў графічным абазначэнні членаў сказа?

1) Я люблю часіну навальніцы.

2) З берагу неслася моцнае «ўра».

3) На школьным двары было вялікае ажыўленне.

4) Зярняткамі зор Млечны Шлях зацярушаны.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**А32.** Адзначце сказы, у якіх прыдатак не пішацца праз злучок.

1) Па кустах праскакаў дожджык грыбасей.

2) Плывуць вянкі па рацэ Гайне.

3) Дуб волат раскінуў свае доўгія галіны.

4) Лес прыгажун скінуў свой залаты ўбор.

**А33.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску неабходна паставіць працяжнік.

1) Моцнае дрэва ... дуб.

2) Азначэнне ... гэта дадаены член сказа, які абазначае прымету прадмета.

3) Вывучаць філалогію ... вось мой любімы занятак.

4) Васіль ужо ... амаль афіцэр.

**А34.** Адзначце абагульнена-асабовыя сказы.

1) Чакай мяне сёння ў госці.

2) Чужым дабром не цешацца.

3) Просяць захоўваць цішыню.

4) За пастой грошы не бяруць.

**А35.** Адзначце назыўныя сказы.

1) Дзень цёплы, сонечны. Пад нагамі апалае лісце.

2) Вось і бераг... Жоўты спад і круча.

3) На вуліцы холадна.

4) Вада ў рэчцы чыстая і халодная.

**А36.** Адзначце няпоўныя сказы.

1) Выходжу з лесу.

2) Цішыня наўкол.

3) І не вярнуцца ў бор мне немагчыма.

4) Грыбамі пахне замшэлы дол.

**А37.** Адзначце сказы, у якіх прапушчана коска (коскі).

1) Восень была сонечная ясная, але халодная.

2) Месяц бледны высокі і не такі круглы і вялікі звёўся за тыдзень, застаўся толькі сярпок.

3) Жоўтыя залатога колеру праменні сонца асвятлялі сквер.

4) У скверы стаялі напалову аголеныя старыя ліпы.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**А38.** Адзначце сказы, у якіх прапушчаны працяжнік.

1) Паэзія Янкі Купалы гэта дыханне народа,ператворанае ў песню.

2) Справа цягнецца, віхляе поле, а злева лес.

3) І двор, і кветнік, і белыя бярозы ўсё зіхацела ў ранішніх буйных росах.

4) Страшэнны штукар і свавольнік гэты Нёман.

**А39.** Адзначце сказы, у якіх дапушчаны памылкі ў пастаноўцы знакаў прыпынку.

1) Маёй карціннай галерэяй у дзяцінстве былі мясцовыя краявіды зараснікі алешніку, пагоркі за вёскай, лес, рэчка.

2) Раніца была сухая. Нідзе ні расінкі ні на траве, ні на лісці.

3) Хлопцы ўраз зарагаталі ды ўраз жа смех той абарвалі.

4) Свіцязь дзіва-возера, казка-возера, легенда-возера.

**А40.** Адзначце правільныя варыянты пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах.

I. Я веру словам простым і надзейным зямля і хлеб і праца і любоў. *(П. Панчанка)*

1) чатыры коскі
2) адно двукроп'е, дзве коскі
3) працяжнік і дзве коскі
4) двукроп'е і тры коскі

II. А ў крыках спалох і трывога невыказная крыўда і сум. *(М. Аўрамчык)*

1) дзве коскі
2) чатыры коскі
3) працяжнік і адна коска
4) працяжнік і дзве коскі

**Частка II.**

**В1.** Знайдзіце граматычныя памылкі, звязаныя з ужываннем ступені параўнання прыметніка, запішыце правільна.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

1) Людская ўвага даражэй за ўсё на свеце.
2) Свая салома мякчэйшая за чужую пярыну.
3) Гэта быў самы зручнейшы момант.

**В2.** Выберыце ў дужках і запішыце правільную форму выказніка.

Кожнае лета ў дзедавым садзе голле (гнуцца, гнецца) ад груш, яблыкаў і сліў.

**В3.** Знайдзіце словазлучэнні, у якіх ёсць граматычныя памылкі, запішыце правільна.

1) паўнаводная Антарыо
2) прыгожы вуаль
3) смачная салямі

**В4.** Вызначце і запішыце від аднасастаўнага сказа.

Не сустракацца мне больш ніколі з маім маленствам у чыстым полі. *(А. Куляшоў)*

**В5.** Вызначце і запішыце стыль тэксту.

Юравічы — паселішча вельмі старажытнае, яно існуе з незапомных часоў. Людзі тут жылі задоўга да новага каменнага веку. Па колькасці і значэнні археалагічных знаходак Юравічы займаюць першае месца ў Беларусі, таму я і вырашыў наведаць гэтае мястэчка.

Да гэтага часу Юравічы былі мне вядомы завочна не толькі сваімі археалагічнымі вартасцямі, але і па рамане Івана Мележа «Людзі на балоце». Тут жыў старшыня выканкома Апейка. Тут сядзеў у воласці арыштаваны юнак Васіль Дзяцел. Сюды, у Юравічы, прыехала на кірмаш Ганна Чарнушка з бацькам і мачахай. *(В. Вольскі)*

**В6.** Запішыце не названы ў прыведзеным радзе тып маўлення.

Апавяданне, апісанне.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

# СКАЗЫ СА ЗВАРОТКАМІ, ПАБОЧНЫМІ СЛОВАМІ І ВЫКЛІЧНІКАМІ. СЛОВЫ-СКАЗЫ

У склад сказа могуць уваходзіць словы, якія не з'яўляюцца членамі сказа, не звязваюцца з іншымі словамі ні злучальнай, ні падпарадкавальнай сувяззю. Такія словы суадносяцца па сэнсе або з усім сказам, або з яго часткай. Яны служаць для таго, каб звярнуць увагу суразмоўцы на паведамленне або даць ацэнку паведамленню: *Хадзі, **Алесь,** да нас у хату.* Зваротак *Алесь* служыць для таго, каб звярнуць увагу Алеся на просьбу (зайсці ў хату). ***Безумоўна,*** *сёння будзе добрае надвор'е.* Пабочнае слова *безумоўна* выражае ступень упэўненасці ў тым, што сёння будзе добрае надвор'е.

Звароткі, пабочныя словы, выклічнікі, словы-сказы ***так, але, не*** могуць ужывацца не толькі ў сказе, але і самастойна. Напрыклад, на пытанне *Ты пойдзеш у кіно?* можна адказаць ***Так,*** *я пайду ў кіно* і проста адным словам ***Так***. Параўн. таксама: ***Алесь,*** *падыдзі сюды!* і проста ***Алесь!*** (у тым жа значэнні), ***Ай-яй-яй!*** *Як цудоўна навокал!* і сказ-выклічнік ***Ай-яй-яй!*** (у тым жа значэнні).

**345.** Прачытайце сказы ўслых. Параўнайце іх інтанацыю.

1. Гурткоўцы пагаварылі пра гумар і сатыру ў творах маладых паэтаў. 2. Гурткоўцы, пагаворым пра гумар і сатыру ў творах маладых паэтаў! 3. Алесь Жывень запісаўся ў гурток «Роднае слова». 4. Алесь Жывень, запішыся ў гурток «Роднае слова»!

● Паназірайце за інтанацыяй звароткa: асобае павышэнне голасу на слове-звароткy, паўза пасля яго. Якія сказы адпавядаюць першай схеме, якія — другой?

1. [— ↗ / = ↘ ... ].   2. [З, ↗ // = ↗ ↘ ... ]!

● Якой часцінай мовы і ў якой форме выражаецца зваротак? дзейнік? Як іх адрозніць?



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## § 50. Зваротак

З в а р о т а к — гэта слова (спалучэнне слоў), што абазначае асобу (прадмет), якой непасрэдна адрасавана выказванне: ***Таварыш камандзір****, Карнілаў цяжка паранены. Зашумі ты,* ***лес****, па-вясноваму!* (П. Трус) Асоба, да якой звяртаюцца з мовай, можа называцца па імені, прозвішчы, сваяцтве, узросце, прафесіі, знешніх прыметах і г. д.

Зваротак — гэта самастойная канструкцыя: ён не з'яўляецца членам сказа.

Звароткі могуць быць аднародныя: *Мір вам,* ***людзі, лясы*** *і* ***дубровы!*** (П. Глебка)

Звароткі часцей за ўсё выражаюцца назоўнікамі ў форме назоўнага склону, а таксама прыметнікамі ці дзеепрыметнікамі ў тым жа склоне, калі яны ўжываюцца ў ролі назоўнікаў: ***Дняпро*** *і* ***Сож, Дзвіна*** *і* ***Прыпяць****, нясіце радасць нашу ўдаль.* (М. Чарот) *Ідзіце,* ***сінявокія****, у поле лён палоць.* (У. Хадыка) *Не плач,* ***забытая****, прыеду на пасёлак пазней ці ў травені, як зацвітуць сады.* (П. Трус)

З а ў в а г а. Сустракаюцца выпадкі, калі зваротак выражаецца клічнай формай назоўніка (старажытны клічны склон): *І будзе,* ***друга****, у доме шчасце, пакуль ёсць добры свет сяброў!* (К. Кірэенка) *Дзень добры,* ***суседзе****, у новую хату.* (М. Танк)

Зваротак можа быць неразвіты і развіты. Пры зваротку могуць быць прыдаткі: *Беларусь,* ***мая радзіма****, любы сэрцу твой прастор.* (М. Калачынскі)

**346.** Прачытайце наступныя тэксты. Выпішыце сказы са зваротkамі, ахарактарызуйце звароткі паводле: а) спосабу выражэння; б) структуры (развітыя ці неразвітыя); в) ужывання (адзіночныя ці аднародныя). Паназірайце за інтанацыяй вымаўлення зваротка і пастаноўкай знакаў прыпынку пры ім. Якое месца займае зваротак у сказе?

I. Адчыніце дзверы, людцы,
Адусюль хай далятае:
Словы родныя куюцца...
Кросны родныя снуюцца...


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Песні родныя пяюцца...
Мова,
Мова
Нас вітае.

*В. Куртаніч*

II. Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог,
Улажылі спаць мяне вы на зямлі.
Не курыцца светлы пыл усцяж дарог,
Ў небе месяца прагляну́ў бледны рог,
Ў небе ціха зоркі расцвілі.

*М. Багдановіч*

III. Не пакідай мяне, мой светлы сум,
З табой мне хораша на адвячорку
Хадзіць і слухаць лесу ціхі шум,
Пакуль суцемак не запаліць зорку.

*Н. Гілевіч*

IV. Мой сіні бор, мой родны бор зялёны!..
Ён ёсць у кожнага — свой бор, што вабіць,
Свой мілы кут, свае бярозы й клёны,
І ёсць свая лясная тайна, мабыць...

*Н. Гілевіч*

V. Бывай, журба! Хоць многа страчана,
Хоць многіх блізкіх нестае,
Са мной душа і мова матчына
І песня вечная мая.

*А. Пысін*

VI. Эх, сябры-браткі!
Самі знаеце:
Агню палкага
Іскры маеце.
Не тушыце ж вы
Той агонь святы.
Асвятляйце ім
Родны край, куты...

*Я. Колас*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**347.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку.

Зваротак — самы яркі этыкетны знак. Бо слова «этыкет» у першапачатковым французскім значэнні — «этыкетка», «ярлык». Называючы суразмоўцу, мы як бы выбіраем яму найбольш прыдатны ярлык.

Здавалася б, гэта так проста — назваць таго, з кім я хачу гаварыць! Асноўныя прыметы суразмоўцы лёгка распазнаць: пол, узрост (малады чалавек), а калі неабходна — прафесійную прыналежнасць (таварыш міліцыянер); калі неабходна — узровень адукаванасці і нават жыхарства ў горадзе ці ў вёсцы (не кожнай незнаёмай жанчыне можна сказаць «бабуля»). *(Н. Фарманоўская)*

**348.** Прачытайце верш з захаваннем патрэбнай інтанацыі. Выпішыце сказы са звароткамі, вызначце, па якой прымеце звяртаюцца да асобы. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры зваротку.

АД’ЕЗД МАЛАДОЙ

Бубны! Бубны!
Грукачыце, бубны!
Расступайцеся, дзяўчаты,
Расступайцеся, дзяды!
У шаўровых* чаравіках,
У адзенні шлюбным
Пад руку вядзе нявесту малады.
Заспявайце, маладзіцы,
Дружна!
Рассыпайце, маладзіцы,
Ружы!
Расчыняйце ўсе вароты
Насцеж!
Пажадайце на дарогу
Шчасця!
Дугі ў красках,
Ў стужках коні.
Шоры бразгаюць
І звоняць.
«Ну, дачушка, — бацька кажа, —
У шчаслівы пуць!


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Не саром сямейку нашу,
Добрай жонкай будзь».
Маці ж той не да гаворкі, —
На расстанні плача горка.
А падружкі раззлаваліся:
«Ты, Марылька, здрадніца.
Лепш бы ты не мілавалася
З Міхасём да раніцы.
Мы ж, — клянуцца, — самі
Век не выйдзем замуж».
— Но, пайшлі, стаеннікі!
— Бывайце здаровы!
Ля варот затор.
Хлопцы сталі ў рад суровы —
Непраходны бор.
«Гэй, жаніх, гані нам выкуп
І багаты, і вялікі
За кужэльныя косы,
За блакітныя вочы,
За вішнёвыя вусны!»
І паехалі ўдалеч, каля рэчкі, каля лоз.
Нашу слаўную дзяўчыну брыгадзір суседні звёз...

*П. Панчанка*

● Ці даводзілася вам прысутнічаць на вяселлі? Якія традыцыйныя вясельныя абрады вам спадабаліся?

↑ Уявіце сябе ў ролі свата (сваццi), суседа (суседкі) і павіншуйце маладых з уступленнем у шлюб.

Вымаўляецца зваротак з адметнай, клічнай інтанацыяй, якая залежыць ад сэнсавых і эмацыянальных функцый звароткa, ад яго месца ў сказе, ад структуры і стылю выказвання.

Звароткі могуць знаходзіцца ў пачатку, у сярэдзіне або ў канцы сказа. Калі зваротак стаіць у пачатку сказа, то пры звычайнай інтанацыі на пісьме аддзяляецца коскай: ***Радзіма***, *голас твой мяне спяваць вучыў, і ты мне аддала ад родных слоў ключы.* (Я. Пушча) Клічнік ставіцца тады, калі зваротак вымаўляецца павышаным тонам з працяглай паўзай: ***Дарагія дзеці!*** *Любіце кнігу, яна*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

*навучыць вас разумець жыццё, яна дасць вам розум і сілу.* (С. Александровіч)

Зваротак, які знаходзіцца ў сярэдзіне сказа, вымаўляецца больш хутка і паніжаным тонам, выдзяляецца невялікімі паўзамі, а на пісьме — коскамі: *Адгукніся,* ***вясна****, мне зязюляй з-за рэчкі.* (А. Куляшоў)

Калі зваротак стаіць у канцы сказа і выдзяляецца павышанай інтанацыяй або калі ўвесь сказ клічны, то ў канцы яго ставіцца клічнік, а перад зваротакм — коска: *Дзень добры вам,* ***лясы і гоні!*** (Я. Колас) Пасля звароткa ў канцы апавядальнага сказа ставіцца кропка, а ў пытальным сказе — пытальнік: *Над ракою быстрай не шумі,* ***чарот****.* (М. Танк) *Што з табою,* ***хлопча?*** *Што з табой,* ***смуглявы?*** (А. Звонак)

Калі аднародныя або развітыя звароткі разрываюцца на часткі членамі сказа, то кожная з частак выдзяляецца коскамі: *Ты красуй,* ***наш сад****, красуй і шумі,* ***зялёны!*** (Я. Пушча)

З а ў в а г і: 1. Выклічнікі, што стаяць пры зваротках, аддзяляюцца ад іх коскамі: ***Эх****, луг шырокі! Як жывы ты, праменнем сонейка заліты...* (Я. Колас)

2. Калі перад зваротакм стаіць выклічнік і займеннік ***ты*** або ***вы,*** якія з'яўляюцца дзейнікамі, то выдзяляецца коскамі толькі зваротак: *Ой ты,* ***маё сонца****, як жа свеціш ясна!* (Я. Купала) Гэтыя займеннікі ў гутарковым стылі могуць выступаць і ў ролі звароткаў. У такіх выпадках яны выдзяляюцца коскамі: *Эй,* ***ты****, падыдзі сюды!* (В. Хомчанка)

3. Часціца ***о*** ад звароткa коскай не аддзяляецца: ***О Нёман, о бацька мой Нёман****, як сонца, як дзень дарагі!* (А. Астрэйка)

**349.** Прачытайце вершы. Выпішыце сказы са звароткамі, пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку.

I. Бярозка мая белакрылая
Якая ж ты сонейка мілая
Спускаеш пушыстыя вецці
І сінімі іскрамі свеціш.
Глядзіць маладзік усміхаецца
К галоўцы курчавай схіляецца
І вісне бліскучай каронай
Над белллю тваёй заручонай.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

А вецці ўніз паспусканыя
Сярэбранай рызай убраныя
Нязвычна і ціха сягоння
Шклянымі званочкамі звоняць.
Бярозка мая белакрылая
Стаіш як нявеста ты мілая
Прыгожа снягі і марозы
Да шлюбу прыбралі бярозу...

*К. Буйло*

● Ці ёсць у вас любімае дрэва? Раскажыце пра яго (аповед запішыце).

II. Было спрадвеку слова ты
Крыніцай цудадзейнай сілы,
Што вызваляла з нематы,
Айчыны ніву каласіла.
Ты наталяла смяглы рот
І выкрасала ўдар грамовы,
Каб сам сабою стаў народ,
Пачуўшы гукі крэўнай мовы!

*Р. Барадулін*

● Зрабіце марфалагічны разбор слова *спрадвеку.*

Зваротак надае мове выразнасць, робіць яе больш эмацыянальнай. Выразнасць зваротка ўзмацняецца, калі ён паўтараецца або калі пры ім ёсць выклічнік: ***Хмаркі, хмаркі дарагія,*** *напаіце дожджыкам зямлю.* (Я. Колас) *Эх,* ***досвітак маленства, лета!*** *Вамі навек душа сагрэта!* (Я. Колас)

Звароткі шырока ўжываюцца ў размове для таго, каб прыцягнуць ці падтрымаць увагу суразмоўцы, у мастацкіх творах, пры перадачы дыялога, у публіцыстычных жанрах літаратуры, прамовах, закліках, адозвах, аб'явах, перапісцы і г. д. У паэтычнай мове многа зваротkaў не толькі да асоб, але і да неадушаўлёных прадметаў. У гэтым выпадку зваротак выкарыстоўваецца як прыём увасаблення: *Ты ляці,* ***маё слова,*** *праз палі і лясы, прывітайся з краінай маёй дарагою.* (П. Панчанка) *Кланяйся,* ***громе,*** *роднаму полю, родны вітай ты мой кут.* (Я. Колас)


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

У пісьмах да родных, блізкіх і сяброў звароткі з паясняльнымі словамі выкарыстоўваюцца для выражэння ветлівасці, павагі і іншых адносін аўтара да адрасата: ***Мілая, дарагая і слаўная мамачка!*** *Мне дужа сумна без цябе...* ***Дарагая і любая дачушка Настачка!*** *Як тваё здароўе? Як вучоба?*

У пісьмах і зваротах афіцыйнага характару назва асобы суправаджаецца азначэннямі *паважаны, шаноўны, глыбокапаважаны* і інш.: ***Паважаны Іван Андрэевіч!*** *Звярнуцца да Вас з гэтым пісьмом вымусілі абставіны, звязаныя з забеспячэннем жыллём працоўных.*

У вусным маўленні могуць выкарыстоўвацца звароткі з аслабленым лексічным значэннем: *дарагі, галубка, дружа, брат, добрыя людзі* і інш. Пры іх дапамозе выражаецца душэўная спагада, пяшчота, сардэчнасць, ласка і г. д.: *Ты не гніся,* ***брат,*** *ніколі траўкаю пахілай.* (Я. Колас) *Скажы мне,* ***любая,*** *скажы, на што таіць ў душы дакоры?* (П. Трус) *Увайшла гэта я,* ***мае вы людцы,*** *у цёмны лес.* (Народнае)

**ЗАПОМНІЦЕ!** Выбар пэўнай формы звароткa амаль заўсёды прама ці ўскосна адлюстроўвае адносіны да суразмоўцы, абумоўленыя самымі рознымі фактарамі, пачынаючы ад адносін (узроставых ці сацыяльных), якія звязваюць суразмоўцаў, і канчаючы асабістымі адносінамі паміж імі, эмацыянальным станам суразмоўцы, узроўнем яго этычнай культуры.

**350.** Запішыце варыянты свайго ўласнага імя. Якімі з гэтых слоў вас звычайна называюць бацькі, сваякі, знаёмыя, сябры? Які зваротак вам падабаецца больш за астатнія і чаму?

**351.** Прачытайце некалькі ўрыўкаў з лістоў Якуба Коласа да сваіх родных і блізкіх. Назавіце ў іх звароткі. У якіх формах яны ўжыты? Якія адносіны выражае аўтар да сваіх адрасатаў? Па чым вы гэта вызначылі?

1. Мой дарагі Данілачка! Мне надта хочацца ведаць, як ты жывеш дома, што робіш, як тваё здароўе. Напішы мне пра ўсё гэта. 2. Мае дарагія сябры-прыяцелі, мае былыя вучні і суседзі-люсінцы! Радасна было мне атрымаць ад вас пісьмо. Ваша Люсінская школа была маім першым настаў-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

ніцкім месцам, з якога пачалася мая дарога ў жыццё. 3. Дарагі Міхаіл Васільевіч! Атрымаў я, браток, тваё пісьмо. Я вельмі рад прыгадаць былое, свае маладыя гады, сваю першую школу, дзе я быў настаўнікам, і сваіх вучняў, у тым ліку і цябе, мой дарагі Міхалка.

**352.** Прачытайце вершы. Вызначце, якія адносіны да суразмоўцы перадаюць звароткі. Чым яны выражаны? Якія па форме? Выпішыце сказы са звароткамі.

I. Ах ты жогла*, жэўжык*, чмут*,
Скамячыў пасцель у жмут.
Ўстаўшы, не памыўся,
У цёмны кут зашыўся.

*В. Вітка*

II. Бысю, бысю, бысенька,
Беленькая лысінка,
Хто гэта набіў табе
Аж дзве шышкі на ілбе?
— Гэта я з Пятром бароўся,
Пабароў Пятро мяне.
З таго часу я зарокся,
Што не буду болей, не,
Бо калі яшчэ хоць трошкі
Болей саступлю яму,
Ой, баюся я, што рожкі
Вырастуць і ў Пеці: — М-му!

*В. Вітка*

● Хто адрасат маўлення? Па чым вы даведаліся? Дайце свае азначэнні адрасатам такога роду.

III. Дзяўчыначка-сэрца, сябе не трывож,
Не песці надзеі і жалю не множ.
З табою пабрацца мне волі няма, —
Даўно заручыўся я ўжо са трыма:

Айчызна, — я ёй у няволі жыву,
Штоноч яе бачу, маўляў, наяву.
За ёю сумую, журуся адно,
Бо шчырым каханнем звязаўся даўно.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Другая — матуля. Радзіўся калі
І голас мой першы падаў на зямлі,
Засмучаны твар усміхнуўся яе:
«Сыночак мой любы», — вітала мяне.

Аб трэцяй, дзяўчынка, скажу, што яна,
Другой ты не знойдзеш — на свеце адна:
За краты няволі паслала «люблю»,
Дык хіба ж з табою яе падзялю?

Пакінь жа, галубка, з каханнем сваім!
Шукай сабе шчасця за кім за другім;
Пяшчоты, залёты не трать з-за дарма,
Даўно заручыўся я ўжо са трыма.

*А. Гарун*

- Вызначце асноўную ідэю верша. Ці згодныя вы з аўтарам?
- Растлумачце ўжыванне часціцы ***не*** ў першым сказе.
- Зрабіце марфалагічны разбор лічэбнікаў *трыма, першы.*

**353.** Напішыце пачатак (першыя сказы) і канец: а) ліста, які б вы даслалі бацькам, сябру (сяброўцы), настаўніку, якога добра ведаеце; малазнаёмаму настаўніку, дырэктару школы, рэдактару любімай газеты ці часопіса, ужываючы пры зваротках адпаведныя азначэнні; б) віншавальных паштовак з днём нараджэння бацькоў, дзядулі, бабулі, сяброў.

**354.** Прачытайце тэкст, знайдзіце звароткі, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Як звароткі характарызуюць Цуда-Юду?

У поўнач удовін сын выйшаў на мост праверыць, ці стаіць яго таварыш. Паглядзеў туды-сюды — няма! Аж раптам бачыць: уз’язджае на калінавы мост трохгаловы Цуда-Юда. На сярэдняй галаве ў яго быстравокі сокал сядзіць, збоку быстраногі хорт бяжыць. Конь, як ступіў на мост, адразу заржаў, хорт* забрахаў, а сокал зашчабятаў.

Ударыў Цуда-Юда каня між вушэй:

— Ты чаго, травяны мех, заржаў? А ты, псінае мяса, чаго забрахаў? А ты, ястрабінае пер’е, чаго зашчабятаў? Калі супраціўніка майго чуеце...

- Дапішыце працяг фрагмента казкі, выкарыстоўваючы ў дыялогах звароткі. Не забудзьце пра асаблівасці мастацкага стылю. Захавайце структуру тэксту-апавядання.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**355.** З вашай любімай казкі выпішыце звароткі. Прааналізуйце запісы і раскажыце, як толькі па зваротках можна здагадацца аб узаемаадносінах герояў казкі, іх настроі, выхаванасці.

**356.** Наступныя звароткі зрабіце развітымі, выкарыстаўшы азначэнні *дарагі, мілы, шаноўны, любы, паважаны, мой родны* і інш. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку і растлумачце іх.

1. ... дзядуля ... дзядулечка ... саколік ... раскажы мне казку. 2. Ой ты ... дачушка спі. 3. Давайце ... сябры пагутарым аб шчасці. 4. ... ... мамачка даруй мне, што не патэлефанаваў учора. 5. ... Рыгор Васільевіч у адказ на Ваш ліст ад 15.04.1997 г. паведамляю, што Вы пастаўлены на чаргу на атрыманне кватэры. 6. ... жанчыны сяброўкі нашы віншуем Вас са святам 8 Сакавіка. 7. ... таварышы. Гэта Вольга Аляксандраўна, наша каляжанка, малады ўрач, будзе працаваць разам з намі. 8. ... грамада. Сёння лёсавызначальны дзень для нашых вяскоўцаў. 9. Хай вам шчасціць у дарозе ... сябры.

**357.** Перабудуйце сказы, увёўшы ў іх простую мову і зваротак.

У з о р. *Я спытаў хлопцаў, як ім удалося злавіць такого шчупака. — Я спытаў: «Хлопцы, як вам удалося злавіць такога шчупака?»*

1. Журналіст задаў пытанне Ядвізе Паплаўскай і Аляксандру Ціхановічу пра іх творчыя планы. 2. На сустрэчы Віталя Шчэрбу спыталі, ці будзе ён удзельнічаць у спаборніцтвах. 3. Гаспадыня запрасіла хлопцаў і дзяўчат зайсці ў хату. 4. Маці сказала сыну, што чалавек ніколі горшым не робіцца ад працы.

**358.** Спішыце сказы, падкрэсліце звароткі, выдзеліце іх знакамі прыпынку. Чым яны выражаны? Як называецца паэтычны прыём, выкарыстаны ў гэтых сказах?

1. Па сцежках роднай Беларусі з табой я ночка паплыву. *(М. Машара)* 2. О рэкі Беларусі сярод лугоў сярод лясоў! Калі я гімн саткаць збяруся з блакітных вашых паясоў? *(Г. Бураўкін)* 3. Сонца ўмыйся расою на світальнай зары. *(А. Бялевіч)* 4. Адкажы мне вербачка мілая, чаму ты ўсё смуцішся, журышся пахілая? *(Я. Колас)* 5. Пара ўжо сонца ўстаць з-за гаю паспелага жыта, жніво чакае. *(М. Танк)*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**359.** а) Прачытайце. Звярніцеся з пытаннем да незнаёмага (незнаёмай):

1) да маленькага дзіцяці, як яго завуць;
2) да групы дзяцей на вуліцы, дзе знаходзіцца бібліятэка;
3) да юнака з просьбай сказаць, дзе знаходзіцца ўваход у метро;
4) да мужчыны, як праехаць у цэнтр;
5) да міліцыянера, як прайсці на вуліцу Францыска Скарыны;
6) да вадзіцеля, ці свабоднае таксі;
7) да настаўніка з запрашэннем на ўрачыстае мерапрыемства;

↑ б) звярніцеся з трыбуны да аўдыторыі:

1) да дэлегатаў канферэнцыі;
2) да гасцей у актавай зале на вечары сустрэчы з выпускнікамі;
3) да аднакласнікаў на класным сходзе;
4) да выпускнікоў школы перад апошнім званком;
5) да першакласнікаў перад пачаткам навучання ў школе.

**360.** Прачытайце верш. Запішыце яго па памяці.

### СПАДАР І СПАДАРЫНЯ

Гэта нам як Божы дар.
І я шчыра ганаруся
Па ўсёй нашай Беларусі
Імёнамі маладымі:
Добры гаспадар — спадар,
Спадарыня — гаспадыня.

*В. Вітка*

● Пастаўце назоўнікі *спадар* і *спадарыня* ў множным ліку. Якія яшчэ словы-звароты да групы людзей выкарыстоўваюць беларусы? Запішыце іх, складзіце з імі сказы.

**361.** Прадоўжыце табліцу сваімі прыкладамі звароткаў (па 3—4 на кожны выпадак).

| У лозунгах, закліках, аб'явах | У мове вайскоўцаў | У лістах да знаёмых, родных | У паэтычнай мове |
|---|---|---|---|
| ***Беларусы!*** *Захаваем сваю прыроду.* | ***Радавы Пяткевіч,*** *станьце ў строй.* | ***Мілы мой Міхаська,*** *добры дзень.* | ***Бусел, бусел, клекатун,*** *пакажы раку Катунь.* (В. Вітка) |



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**362.** Прачытайце тэкст, звярніце ўвагу на ролю звароткаў у ім. Падрыхтуйцеся да выбарачнага пераказу. Запішыце дыялогі суразмоўцаў, выкарыстоўваючы звароткі.

### РОХЛЯ

На адной палянцы жыла-была Козачка з казлянятамі. Усё ў іх ішло добра. На градах такая капуста радзіла!.. А павырасталі казляняты, разбегліся хто куды. Козачка пастарэла — і грады пачалі дзёрнам зарастаць. І рашыла тады Козачка пайсці да свінні Рохлі дапамогі прасіць.

— Шаноўная Рохля, — сказала Козачка, — можа б, ты грады мае ўскапала?

Парохкала Рохля для прыліку і згадзілася:

— Лыч пакуль не падводзіць. Ускапаю!

Не паспела Козачка ў дуброве жалудоў назбіраць, каб разлічыцца з Рохляю за работу, як палянкі не пазнаць было. Грады ўздыбіліся камлыгамі. Куст каліны з каранямі выдраны. Суседняя лугавінка рыжым жвірам паблісквае. Бярозка, што вока цешыла, спляжаная ляжыць.

— Што нарабіла, Рохля?! — абурылася Козачка.

А Рохля яшчэ вышэй лыч задрала:

— Я, мілая, поўную меліярацыю правяла!..

Села Козачка на бярозку і заплакала. Яна і цяпер недзе плача.

— А казляняты? — запытаўся Заяц.

— Убачыце іх, дык скажаце, каб дамоў вярталіся, — адказаў Вожык. — Пастараюцца, то, можа, і ўратуюць сваю палянку... *(Я. Пархута)*

● Вызначце адрасата і асноўную думку тэксту.

**363.** Прачытайце тэкст. Вызначце сказы са звароткамі. Якая іх роля ў тэксце?

Бабы мужыкі макраносыя дзеці дзяды ішлі за труною і ціхае рыданне гучала ў паветры. Рыгор наперадзе нёс на спіне вялізны дубовы крыж. І ўсё галасней, і галасней плыло над галовамі людзей галашэнне баб-лямантух:

— А і на каго ж ты нас пакінуў? А і чаго ж ты заснуў, радзімец? А чаго ж твае ясныя вочы закрыліся, ручкі белыя скlаліся? А хто ж нас абароніць ад суддзяў няправедных?!


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

А галубочак ты наш, а куды ж ты ад нас адляцеў? А чаго ж ты пакінуў бедных дзетак? А хіба ж вакол нявест няма, што з зямелькаю ты абвянчаўся, саколік?! А што ж ты за хатачку абраў?! А ні вакон жа ў ёй, ні дзвярэй!..

Труна плыла над сапраўднымі чалавечымі рыданнямі, якіх не купіш нават у прафесіянальных лямантух. *(Паводле У. Караткевіча)*

- Запішыце першы абзац тэксту, расстаўце знакі прыпынку.
- Зрабіце марфалагічны разбор слова *дубовы.*

**364.** Запішыце тэкст па-беларуску.

Проявляйте искренний интерес к людям. Человек, который не интересуется другими, приносит людям вред.

Помните имена людей. Один из простых способов завоевать доброе отношение к себе — помнить имена людей. Техника запоминания имён проста. Если вы особенно не надеетесь на свою память, скажите собеседнику: «Извините, я плохо расслышал Ваше имя. Как оно пишется?» Повторите во время разговора имя собеседника несколько раз про себя, стараясь связать его с внешним видом человека. Незаметно запишите его.

Улыбайтесь людям. *(Р. Немов, А. Новиков)*

- Запомніце парады псіхолагаў. Яны дапамогуць вам у зносінах з іншымі людзьмі. З якімі камунікатыўнымі ўменнямі звязаны гэтыя парады?

**365.** Прачытайце ўдумліва наступнае азначэнне зваротка: «Зваротак — граматычна незалежны і інтанацыйна адасоблены кампанент сказа ці больш складанага сінтаксічнага цэлага, які абазначае асобу ці прадмет, якому адрасавана выказванне».

- Якая частка азначэння вызначае ролю зваротка не толькі ў сказе, але і ў тэксце?

↑ **366.** Развіце сказы са звароткамі-тэмамі ў тэкст.

1. Зямля мая, ты для мяне —
як дзіва.
*С. Законнікаў*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

2. Малюнкі родныя і з'явы!
Як вы мне любы, як цікавы!

*Я. Колас*

3. Ты, родны край, гармоніі нас вучыш,
Ты вучыш разумець людзей.

*А. Лойка*

4. Табе маё палкае слова, Свабодная Праца —
Стваральніца шчасця людскога і цудаў зямных.

*А. Звонак*

↑ **367.** Прачытайце верш, захоўваючы патрэбную інтанацыю.

МЕДСЯСТРЫ

Ідзі! Не марудзь, ідзі!
Іначай нельга ў жыцці.
Ідзі, белахалатая,
Ідзі да іх, да людзей,
Ідзі, з палаты ў палату, —
суцеш,
          супакой,
                    абнадзей!
Ідзі і цяплом абдорвай,
Ідзі, бо патрэбна ты...
Не ўсе хочуць быць добрымі,
ды хочуць ўсе дабраты.

*А. Вярцінскі*

Паназірайце, ці будзе зразумелы гэты тэкст, калі апусціць у ім загаловак і зваротак. Зрабіце вывад са сваіх назіранняў.

З а ў в а г а. Ролю першага сказа, які арганізуе тэкст, можа выконваць зваротак, які называе адрасата выказвання і з якім звязана ўся наступная частка тэксту. Апавяданне ў такіх тэкстах вядзецца ад другой асобы.

**368.** Прачытайце вершаваныя радкі. Вызначце ролю зваротка.

З хат хутчэй выходзьце, людзі...
Сад цвіце.
Ён кліча вас.

*С. Законнікаў*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

● Апішыце квітнеючы сад ці якую-небудзь іншую прыгожую з'яву прыроды. Запрасіце (паклічце, пераканайце) палюбавацца ёю іншых.

↑ **369.** Складзіце невялікі тэкст, пачаўшы яго зваротакам, які называе адрасата выказвання. Апавяданне вядзіце ад імя другой асобы. Падумайце, да каго ці да чаго вам лепш звярнуцца. Да сваякоў ці да героя кнігі, кінафільма? Да роднага краю, вёскі, горада ці да ракі, саду? Да любімай жывёлы, расліны ці да прадмета?

**370.** Спішыце сказы, пастаўце знакі прыпынку і растлумачце іх. Падкрэсліце звароткі аднародныя, паўторныя, з выклічнікамі.

1. Край наднёманскіх заранак край шумлівай Белавежы Ужо кругом пазааараны на тваіх палетках межы. *(П. Панчанка)* 2. Зіма зіма ідзі хутчэй сцялі снягі на поле на дарогі на нашу вуліцу. *(С. Грахоўскі)* 3. Ах валошка валошка сястрыца рамонка зноў вы побач на ўцеху душы зацвілі. *(Н. Гілевіч)* 4. Ой вёска вёска пры гасцінцы пад ціхі гоман вербалоз яшчэ з гадоў свайго дзяцінства я пакахаў цябе да слёз. *(П. Трус)* 5. О маці як я ганаруся тым што я — твой родны сын. *(М. Аўрамчык)* 6. Ой лес беларускі наш лес Я песень за век свой зложыў табе многа. *(Я. Колас)* 7. Як радасна мой дружа разумець што наш народ не пагражаў нікому не нападаў не гнаў нікога з дому і ў дом чужы не нёс ніколі смерць. *(Я. Сіпакоў)*

● Зрабіце сінтаксічны разбор 2-га і 4-га сказаў.

**371.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль, дайце загаловак. Выпішыце сказы, у якіх ёсць звароткі, выдзеліце іх знакамі прыпынку. Зрабіце сінтаксічны разбор гэтых сказаў.

Калі я ўпершыню надоўга пакідаў свой родны кут, ехаў у горад вучыцца, бацька вывеў мяне з хаты, сказаў:

— А цяпер сынок спыніся паглядзі на хату, у якой ты жыў, на сад наш. Добранька паглядзі! І на лес вокам кінь, на поле, неба. І ўсё, што ўбачыш, убяры ў сябе, запомні. Бо сюды, дадому, у сваю вёску, не аднойчы будзеш вяртацца, калі не наяве, дык у думках. І гэты зварот заўсёды будзе надаваць табе радасці, сілы, адвагі.

Мінае год за годам, а тыя словы, што сказаў, праводзячы мяне ў дарогу, бацька, не забываюцца...


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Дзякуй табе тата што сваю мудрасць жыцця, мудрасць любві і павагі да роднага кутка, да ўсяго нашага, беларускага, ты перадаў, прывіў і мне. *(Б. Сачанка)*

- Выпішыце з простай мовы дзеясловы-сінонімы. Дапоўніце гэты рад сваімі прыкладамі.
- Зрабіце марфалагічны разбор слова *мудрасць*.
- Назавіце ў тэксце дзеясловы загаднага ладу. Якая іх роля ў тэксце?

**372.** Прачытайце тэкст. Вызначце ў ім ролю звароткаў. Устаўце прапушчаныя літары і растлумачце іх правапіс.

Слабы аген*(?)*чык серніка кінуў кружок святла на стол, і я заўважыў на ім адну пальчатку і разарваны наўскос канверт, такі самы, як і ў Свецiловіча, тады, у той жахлівы вечар.

«**Пан Беларэцкі, паважаны брат. Я мала і кепска ведаю пра дзікае паляванне.** Але ўсё ж я магу раскрыць табе адзін сакрэт, та..мніцу н..каторых падзей у вашай хаце...

Магчыма, гэта проста выдумка, але мне здаецца, што ты шука..ш не там, дзе трэба, любенькі. Небяспека ва ўласным палацы пані Яноўскай. Калі хочаш ведаць тое-сёе пра Малога Чалавека Балотных Ялін — прыходзь сёння ў сем гадзін надвячоркам...» *(У. Караткевіч)*

- Зрабіце сінтаксічны разбор выдзеленых сказаў.

**373.** Прачытайце тэкст польскага пісьменніка Генрыха Сянкевіча.

## БАЙКА

За гарамі, за морамі, у далёкай краіне чараў, ля калыскі малой прынцэсы сабраліся добрыя варажбіткі на чале са сваёй каралевай.

Абступіўшы прынцэсу, глядзелі яны на сонны тварык дзіцяткі. І тады каралева варажбітак сказала:

— Няхай кожная з вас адорыць гэтае дзіця каштоўным дарам. Такім, якім кожная з вас валодае і якім вы хацелі б адарыць прынцэсу!

Тады першая варажбітка, нахіліўшыся над калыскай, сказала наступныя словы:



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

— Я даю табе чары прыгажосці, і з дапамогай моцы сваёй зраблю так, што кожны, хто ўбачыць твар твой, адразу падумае, што ўбачыў цудоўную веснавую кветку.

— Я, — сказала другая, — дам табе вочы светлыя і глыбокія, як віры.

— Я дам табе гнуткі і танюткі стан маладой пальмы, — адклікнулася трэцяя.

— А я, — сказала чацвёртая, — дам вялікі скарб залаты, што дагэтуль быў схаваны ў зямлі.

Задумалася каралева, а потым звярнулася да сваіх варажбітак:

— Прыгажосць людзей і кветак вяне. Чароўныя вочы гаснуць разам з маладосцю, ды ў маладосці часта слязьмі заліваюцца. Віхор можа зламаць пальмы, а вецер схіляе ўсё гнуткае. Хто не дзеліць золата між людзьмі, таго яны ненавідзяць, а хто золата падзеліць, таму ў скрыні пуста застанецца. Вось чаму нетрывалыя вашы дары.

— Што ж тады трывалае ў чалавеку? Чым жа ты адорыш малечу, о каралева наша? — запыталі варажбіткі. А каралева адказала:

— Я дам ёй дабрыню. Сонца — цудоўнае і яснае, але было б яно толькі мёртвым кавалкам, які свеціцца, калі б не саграваў зямлю. Дабрыня сэрца — тое ж самае, што цеплыня сонца: яна дае жыццё... Прыгажосць без дабрыні — як кветка без паху ці як храм без Бога. Вочы могуць любавацца толькі храмам, але душа не знойдзе ў ім ласкі. Багацце без дабрыні толькі песціць самалюбства. Нават любоў без дабрыні — гэта толькі агонь, які паліць і знішчае. Ведайце ж, што вашы дары знікнуць з часам, а дабрыня застанецца, бо яна — як крыніца, з якой, чым больш вады возьмеш, тым больш табе зноў прыбудзе. Гэтак жа і дабрыня — адзіны скарб невычэрпны.

Пасля гэтых слоў каралева варажбітак нахілілася над пануранай у сон прынцэсай і, дакрануўшыся рукой да яе сэрца, сказала:

— Будзь добрай.

*(Пераклаў з польскай мовы А. Айна)*

Падрыхтуйцеся да творчага пераказу апавядальнага тэксту з элементамі разважання: вызначце яго кампазіцыю і складзіце план, выкарыстоўваючы цытаты з тэксту. Пры перадачы зместу



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

захоўвайце аўтарскі стыль. Устаўце ў дыялогі звароткі, сачыце за тым, каб яны не былі аднастайныя.

● Ці згодныя вы з каралевай? Абгрунтуйце сваю думку і запішыце яе як працяг тэксту.

## § 51. Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы

**374.** Параўнайце сказы ў парах. Вызначце, у якіх сказах выдзеленыя словы з'яўляюцца членамі сказа, а ў якіх — не.

1. Садок быў, **праўда,** невялікі. *(Я. Колас)* **Праўда** вачэй не засмуціць. *(Прыказка)* 2. На схіле лясістага ўзгорка, **відаць,** растуць суніцы. *(В. Вольскі)* На возеры нікога не было **відаць,** і толькі шумелі і набягалі на бераг хвалі. *(С. Грахоўскі)* 3. У журботную восень, **здаецца,** зямля ўся галосіць. *(П. Панчанка)* Пугач **здаецца** тлустым з выгляду. *(В. Вольскі)*

● Назавіце сказы, у якіх выдзеленыя словы можна апусціць. Ці змяняецца ад гэтага сэнс выказвання?

П а б о ч н ы м і называюцца граматычна не звязаныя з членамі сказа словы, словазлучэнні і сказы, якія служаць для выражэння адносін таго, хто гаворыць, да выказваемай думкі: *Сёння, **мабыць,** вельмі холадна на дварэ.* (А. Кулакоўскі) ***На шчасце,*** *увечары дождж перастаў.* (Ц. Гартны)

Пабочныя словы не з'яўляюцца членамі сказа і маюць розныя значэнні.

Адносіны да выказвання можна выразіць таксама пры дапамозе пабочных сказаў. Значэнне пабочных сказаў адпавядае значэнню пабочных слоў. У сказе *Рэчка, **як нам здавалася,** пачынала мялець.* (І. Навуменка) пабочны сказ — *як нам здавалася;* ён выражае меркаванне да выказваемай думкі.

Пабочныя словы, словазлучэнні, сказы, як правіла, выдзяляюцца невялікімі інтанацыйнымі паўзамі, паніжаным тонам (без лагічнага націску) і больш хуткім тэмпам вымаўлення, а на пісьме — коскамі: ***Здаецца,*** *увесь поплаў звініць, спявае.* (А. Асіпенка) *У пушчы, **вядома,** стаяў вечны змрок.* (З. Бядуля) *Прыйшла самая гарачая пара, калі, **як кажуць хлебаробы,** дзень год корміць.* (І. Гурскі)


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

| Значэнні | Пабочныя словы і словазлучэнні | Прыклады |
|---|---|---|
| 1) розная ступень упэўненасці | *безумоўна, бясспрэчна, сапраўды, канешне, зразумела, вядома, несумненна* і інш. — большая ступень упэўненасці; *магчыма, мабыць, здаецца, мусіць, відаць, як відаць, відавочна, можа, можа быць, напэўна (пэўна)* і інш. — меншая ступень упэўненасці, меркаванне | *Вясна, **сапраўды,** была ранняя.* (П. Кавалёў) *Мікола, **канешне,** схаваўся ў гушчары лесу.* (Р. Сабаленка) ***Відаць,** сама прырода нараджае музыку роднай зямлі.* (І. Навуменка) *Пушчы, **здавалася,** не было канца-краю.* (Т. Хадкевіч) |
| 2) розныя пачуцці (эмоцыі): задавальненне, радасць, захапленне, здзіўленне, жаль, засмучэнне | *калі ласка, на шчасце, на радасць, на маё здзіўленне, на жаль, на бяду, на дзіва, шчыра кажучы* і інш. | *Цяпер, **калі ласка,** чытайце пісьмо.* (М. Гарэцкі) *Лісіца, **на сваю бяду,** папала з берага ў ваду.* (В. Вітка) |
| 3) крыніца паведамлення (каму належыць паведамленне) | *кажуць, як кажуць, як паведамляе, паводле звестак, па-мойму, па-вашаму, на маю (нашу) думку, на мой погляд, з пункту гледжання* і інш. | *Сарамлівасць, **на маю думку,** сведчыць пра сціпласць.* (А. Асіпенка) ***Па-мойму,** ураджай сёлета што трэба.* (М. Паслядовіч) |
| 4) парадак думак і іх сувязь, паслядоўнасць выкладання | *па-першае, па-другое, нарэшце, напрыклад, так, у прыватнасці, такім чынам, значыць, наогул, наадварот, дарэчы, гэта значыць, між іншым, менавіта, скажам, апрача таго* і інш. | ***Кажуць,** што не месца ўпрыгожвае чалавека, а, **наадварот,** чалавек упрыгожвае месца.* (Я. Брыль) *Я, **напрыклад,** лічу, што прапанова Толі заслугоўвае ўвагі.* (П. Рунец) |
| 5) заўвагі аб спосабах афармлення думак | *адным словам, інакш кажучы, можна сказаць, ва ўсякім выпадку, трэба думаць* і інш. | ***Адным словам,** выгляд у нас быў сапраўдных паляўнічых.* (І. Гурскі) *Чалавек ён быў, **можна сказаць,** культурны.* (К. Чорны) |


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

З а ў в а г а. Злучнікі ***а, і*** не аддзяляюцца коскай ад наступнага пабочнага слова ці словазлучэння, калі яны ўтвараюць з ім адно цэлае: ***а можа, а галоўнае, а праўда*** і інш. Для праверкі неабходна пабочнае слова пераставіць у сказе на іншае месца; калі перастаноўка магчымая (без парушэння структуры сказа), то злучнік не звязаны з пабочным словам і аддзяляецца ад яго коскай: *Была яна невысокая, павольная і,* ***відаць,*** *дужая.* (І. Мележ) Параўн.: ***А прызнацца****, страшна было ў лесе.* (Р. Мурашка) *А дождж,* ***і праўда****, так і паўзе за каўнер.* (В. Быкаў) — апусціць або пераставіць пабочныя словы нельга, паколькі яны звязаны са злучнікамі ***а, і.***

**375.** Выпішыце сказы з пабочнымі словамі і словазлучэннямі, якія абазначаюць: а) упэўненасць; б) няўпэўненасць, меркаванне; в) розныя пачуцці. Пастаўце неабходныя знакі прыпынку.

1. Хлеб чорны, хлеб жытні я шчыра ўслаўляю — смачнейшае ежы па праўдзе не знаю. *(П. Броўка)* 2. Калі гаспадар скача, гаспадыня напэўна плача. *(Прыказка)* 3. Але на шчасце ад гэтага звера хлопцам ніякай небяспекі не пагражала. *(Я. Маўр)* 4. Можа свет і любім мы за тое, што ў стрыечнай блізкасці жывём. *(А. Пысін)* 5. У птушак свой закон вядома і свой адлёт, і свой прылёт. *(П. Прыходзька)* 6. А лес здаецца закружыўся ў вальсе. *(П. Панчанка)* 7. Ён на здзіўленне ўсяму сялу пачынаў купацца ў красавіку. *(І. Шамякін)*

● Дайце тлумачэнне слову *стрыечны.*

**376.** Спішыце сказы. Падкрэсліце пабочныя словы і сказы, вызначце іх значэнні. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку і ўстаўце прапушчаныя літары.

1. Такіх прыгожых месцаў, якім быў гэты куток, рэдка дзе можна знайсці. Прынамсі так думаў д..ўганосы бусел, каторы меў тут, на старадрэвіне, пышны палац. *(Я. Колас)* 2. Мусіць у сераду радзілася, што да ўсяго згадзілася. *(З народнага)* 3. Свой другі паэтычны зборнік Язэп Пушча назваў лацінскім словам «Vita», што азначае жыццё. Як ён тлумачыць назва пры*(?)*шла па..час сустрэчы яго і паэта Н. Чарнушэвіча ў А. Бабарэкі ў траўні 1923 г. *(М. Мішанчук)* 4. Я на жаль упершыню бачыў Дунай, славутую раку,


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

апетую ў песнях і л..гендах. *(Т. Хадкевіч)* 5. Паміж лісця відаць маленькая белая хмарка, яна не плыве, а здаецца кружыць на месцы, быццам заблудзілася ў яснай, блакітнай бездані неба. *(І. Шамякін)* 6. А быць можа я ўсё прыдумаў? *(Г. Бураўкін)*

● Ці ведаеце вы значэнне слова *травень*? Якой назвай месяца мы карыстаемся сёння?

↑ **377.** Прачытайце верш. Вызначце ў ім пабочныя словы. Што яны выражаюць? Як выдзяляюцца на пісьме?

Так ужо заведзена спрадвеку —
Можа, прымха*,
Можа, Божы знак —
Толькі на Радзіме чалавеку
Ходзіцца і дыхаецца ўсмак.
І заўжды здаецца нават зверу
Найцяплейшай родная зямля.
Гэта ўсё я на сабе праверыў,
Даўшы па планеце кругаля.

*Г. Бураўкін*

● Ці згодныя вы з аўтарам? Творы якіх пісьменнікаў на гэтую тэму вы ведаеце?
● Запішыце 3—4 прыказкі, якія б адлюстроўвалі ідэю гэтага верша.
● Разбярыце словы *спрадвеку, усмак* па саставе.
● Зрабіце марфалагічны разбор слова *дыхаецца*.

**378.** Прачытайце тэкст. Назавіце ў ім пабочныя словы і словазлучэнні. Якое значэнне яны выражаюць? Як зменіцца тэкст, калі пабочныя словы апусціць? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры пабочных словах.

## ДЭБАТЫ

Калі пачаліся дэбаты, выступіў Дуб.

— Сябры, — пачаў ён. — Тут многа гаварылі пра вузкія погляды Пілы. Заўвагі слушныя. Але, на маю думку, ва ўсім вінаватая Прырода: яна надзяліла Пілу такімі ўласцівасцямі. З яе трэба спытаць. Гэта па-першае. Па-другое, вы самі ведаеце, якая працавітая Піла і якога размаху можа


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

набраць у рабоце. Таму ні пра якую загану не можа быць нават размовы.

Пасля гэтага выступілі Клён, Бяроза, Вольха ды іншыя дрэвы. Яны пахвальна адгукнуліся на думку Дуба. Вось толькі Пень галасаваў супраць: ён ужо нічога не баяўся.

*(«Звязда»)*

● Да якога стылю належыць тэкст? Думку сваю абгрунтуйце. Чаму ў тэксце назвы дрэў пішуцца з вялікай літары?

● Напішыце сваю гумарэску з удзелам асноўных герояў тэксту, выкарыстайце пабочныя словы і словазлучэнні.

**379.** Уявіце сабе, што вы сустрэлі свайго сябра (сяброўку) і хочаце паведаміць яму (ёй), што:

1) а) не паспееце вывучыць ролю да прэм'еры школьнага спектакля; б) на вясенніх канікулах паедзеце ў вёску (у Англію, у Мінск ці інш.); в) вясна ў гэтым годзе будзе цёплая, аднак вы не ўпэўнены ў тым, што гаворыце. (Пры выкананні задання можна карыстацца табліцай на с. 223 падручніка.)

У з о р. ***Я, відаць (магчыма, здаецца, хутчэй за ўсё),*** *не паспею вывучыць ролю да прэм'еры спектакля.*

2) Паведаміце тое ж самае, указаўшы крыніцу інфармацыі (адкуль узята ваша паведамленне).

У з о р. ***Па-мойму,*** *я не паспею вывучыць ролю...* ***Як сказаў мой партнёр,*** *я не паспею...*

3) Вы хочаце сказаць свайму таварышу тое ж самае, але на гэты раз вы ўпэўнены ў тым, што паведамляеце.

У з о р. ***Безумоўна (бясспрэчна),*** *я не паспею вывучыць ролю да...*

4) Паведаміце тое ж самае, перадаўшы адчуванні, якія выклікае ў вас гэта паведамленне (радасць, здзіўленне, шкадаванне і г. д.). Растлумачце, чаму гэта іменна так, зрабіўшы сваё паведамленне больш разгорнутым.

У з о р. ***На вялікі жаль,*** *я не паспею падрыхтаваць ролю да прэм'еры школьнага спектакля, бо засталося вельмі мала часу. А мне яшчэ неабходна здаць экзамен на курсах па замежнай мове.*

**380.** Уявіце, што вы сустрэлі свайго аднакласніка (суседа, сябра з паралельнага класа). Абмяняйцеся з ім інфармацыяй па падрых-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

тоўцы да кантрольнай работы па гісторыі (мове, біялогіі ці іншых прадметах) і аб планах на канікулы. Запішыце гэты дыялог, выкарыстоўваючы пабочныя словы.

Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы надаюць мове выразнасць, эмацыянальнасць і дакладнасць. Яны выкарыстоўваюцца і ў кніжным, і ў гутарковым стылях. У мастацкай мове пабочныя словы і сказы з’яўляюцца важным сродкам для стварэння моўных характарыстык герояў. Напрыклад, пры ўжыванні пабочных словазлучэнняў *будзь (будзьце) ласкавы, зрабі (зрабіце) ласку, калі ласка* і інш. выражаецца далікатнасць, ветлівасць і выхаванасць гаворачай асобы: *Адкажыце, **зрабіце ласку,** на тое, аб чым вас пытаюць.* (Я. Колас) ***Калі ласка,*** *заходзьце да нас часцей. Мы заўсёды будзем рады бачыць вас.* (В. Хомчанка)

У афіцыйна-дзелавых паперах, навуковых працах часта ўжываюцца пабочныя словы і словазлучэнні *ў прыватнасці, напрыклад, такім чынам, як адзначалася вышэй, галоўным чынам* і інш.: *Нацыянальная адметнасць мовы выяўляецца, **напрыклад,** у фразеалогіі. **У прыватнасці,** за апошнія тры гады пабудавалі дзве школы, адзін дзіцячы садок і бібліятэку.*

Размоўна-прастамоўнымі з’яўляюцца пабочныя словы *відно, бач, маўляў, пэўна, мусіць* і інш.

Пабочныя словы ў маўленні асобных людзей становяцца «словамі-паразітамі», бо іх пачынаюць ужываць без усякай патрэбы і вельмі часта. Найчасцей гэта адбываецца са словамі *значыць, так сказаць, само сабой, як гаворыцца* і інш.: *«Будзем, **гэта значыць,** лячыцца ці адпачываць?», «На што, **так сказаць,** скардзіцеся?»* Такога тыпу ўжыванне пабочных слоў выяўляе не толькі нізкую маўленчую культуру моўцы, але і недастатковы ўзровень яго агульнай культуры.

**381.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову, запішыце яго.

Проявляйте уважение к мнениям других людей.

Прямо говоря человеку, что он не прав, мы наносим удар его самолюбию, чувству собственного достоинства. Это лишь вызывает раздражение и желание ответить тем же,



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

но редко заставит человека сразу же изменить своё мнение. Если спор неизбежен, не следует начинать его со слов «ты не прав». Это звучит почти так же, как «я умнее тебя». Человеку всегда можно дать понять, что он не прав, интонацией, жестом, причём столь же красноречиво, как и словами. Доказывая свою мысль, желательно изъять из лексикона безапелляционные выражения типа «несомненно», «абсолютно точно», «безусловно», «я убеждён». Лучше пользоваться словами «я полагаю», «возможно», «мне кажется». Их употребление не поколеблет вашей убеждённости и позволит скорее убедить собеседника. *(Р. Немов, А. Новиков)*

● З якімі камунікатыўнымі ўменнямі звязаны парады, выказаныя ў тэксце?

**382.** Спішыце тэкст, пастаўце знакі прыпынку.

Я адарваўся ад паперы і скалануў галавою, жадаючы пазбыцца дзікіх вобразаў. Берман чакальна глядзеў на мяне.

— Ну што пан прашу прабачэння думае пра гэта?

— Якая жахлівая прыгожая і фантастычная легенда, — шчыра ўсклікнуў я.

— О як бы гэта прабачце была толькі легенда...

— Паслухайце, — сказаў я. — Я магу канешне захапляцца старымі легендамі, але што на вашу думку мяне прымусіць верыць ім? *(Паводле У. Караткевіча)*

● Якую ролю выконваюць пабочныя словы ў тэксце?

● Складзіце дыялог на тэму «Умей слухаць» з выкарыстаннем пабочных слоў, якія выражаюць ветлівасць, прыцягваюць увагу суразмоўцы.

**383.** Прачытайце тэкст. Да якога стылю ён адносіцца? Назавіце ў ім пабочныя словы (словазлучэнні, сказы), растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх. Вызначце значэнне і ролю пабочных слоў (словазлучэнняў, сказаў) у тэксце.

Як адзначаў А. К. Сержпутоўскі[1], светаўспрыманне нашых далёкіх (і не вельмі далёкіх) продкаў было прасякнута вераю ў незвычайныя, чароўныя магчымасці звяроў, птушак, раслін і кветак. Заснавана гэта вера была, вядома, на

[1]А. К. Сержпутоўскі — беларускі фалькларыст і этнограф.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

тым, што жывёльны і раслінны свет, як і сам чалавек, нараджаецца, жыве, уплывае на навакольнае асяроддзе, хварэе, памірае...

Але ж і «нежывыя», неадушаўлёныя прадметы надзяляліся людзьмі ўласцівасцямі жывых істот, а назвы гэтых істот (у тым ліку і назвы чалавека) выкарыстоўваліся для абазначэння неадушаўлёных прадметаў. Напрыклад, слова *дзед* вядома перш за ўсё ў значэнні ‘бацькаў або матчын бацька; стары чалавек’. Словам *дзяды* называліся і продкі ўвогуле, і нездарма народнае свята памінання продкаў мае менавіта такую назву — *Дзяды*.

А чаму калючае пустазелле таксама называецца дзядамі? Магчыма, тут уся справа ў нейкім знешнім падабенстве. Сапраўды, пасля нядоўгіх разважанняў можна сказаць, што калючкі на гэтай расліне нечым нагадваюць няголеную бараду старога чалавека. Але найбольш верагодным, лічаць вучоныя, з’яўляецца меркаванне аб сувязі гэтага слова са старажытным культам памінання продкаў — *дзядоў*. Продкі, як вядома, усведамляліся як зберагальнікі дамашняга вогнішча і скарбу, як абаронцы ад уздзеяння «нячыстай сілы». Словам, мы прыходзім да думкі аб тым, што калючае пустазелле атрымала назву *дзяды*, паколькі яно выкарыстоўваецца як засцярога ад нечысці: снапы, пучкі гэтай расліны вешалі каля варот, дзвярэй хаты, каб адагнаць варожых духаў. Відаць, невыпадкова і тое, што гэтая расліна называецца таксама чартапалохам, чартагонам.

Дарэчы, слова *дзед* сустракаецца ў народных гаворках і ў іншых значэннях, таксама звязаных з культам продкаў: *дзед* — прыстасаванне, у якое ўтыркалася лучына пры асвятленні хаты (нельга не бачыць глыбокую сімволіку гэтага слова: *дзед* — продак, які падтрымлівае, зберагае агонь); *дзед* — першы сноп жыта (яго адразу, як толькі сажнуць, упрыгожвалі, заносілі ў хату і ставілі на пачэсным месцы, зерне з такога снапа выкарыстоўвалі ў першы дзень веснавой сяўбы, што павінна было забяспечыць добры ўраджай). Да гэтага кола ўяўленняў адносіцца, несумненна, яшчэ адзін *дзед* — слуп, які падтрымлівае бэлькі ў гумне. *(У. Коваль)*

↑ Выпішыце з тлумачальнага слоўніка ўсе значэнні слова *дзед (дзяды).* Запішыце шэсць слоў, утвораных ад гэтага слова.

● Зрабіце марфалагічны разбор слова *жыта.*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**384.** Прачытайце тэкст. Скажыце, хто з хлопчыкаў, па-вашаму, мае рацыю. Абгрунтуйце сваю думку.

Па заданні настаўніка васьмікласнікі выпісалі дома сказы з дзеепрыслоўнымі зваротамі. Барыс выпісаў наступны сказ: «Шчыра кажучы, незнаёмы расказаў нам далёка не ўсё».

— Што гэта ты выпісаў? — здзіўлена запытаўся ў Барыса яго сябар Віктар.

— Як «што»? Сказ з дзеепрыслоўным словазлучэннем, — пакрыўдзіўся Барыс.

— Ды якое ж гэта дзеепрыслоўнае словазлучэнне?

— А чаму ж не? Вось табе дзеепрыслоўе «кажучы» з залежным словам «шчыра», яны выдзяляюцца коскай. Што яшчэ табе трэба?

— А пра самае галоўнае ты забыўся: дзеепрыслоўнае словазлучэнне з'яўляецца членам сказа.

— Правільна. Тут «шчыра кажучы» — акалічнасць... спосабу дзеяння. Хаця не, хутчэй — прычыны, — ужо менш упэўнена паправіўся Барыс.

— А паспрабуй паставіць да яго пытанне, — усміхнуўся Віктар.

— Калі ласка. Чаму незнаёмы расказаў далёка не ўсё?

— Таму што... казаў? — засмяяўся Віця, а Барыс сярдзіта засоп.

● Складзіце два сказы, у якіх дзеепрыслоўі з'яўляюцца пабочнымі словамі.

**385.** Выпішыце сказы, у якіх ёсць пабочныя словы, і дакажыце, што ў астатніх сказах іх няма. Расстаўце знакі прыпынку.

1. Ваша прапанова здаецца мне непрымальнай. Мы здаецца многага не зразумелі. 2. Словам «дзяды» называліся продкі ўвогуле. Словам мы згадзіліся дапамагчы суседу. 3. Мне стала вядома, што паедзем на экскурсію ў суботу. Вядома мы радуемся, што даведаемся многа новага.

Пабочныя сказы, якія выражаюць дадатковыя заўвагі, удакладненні і тлумачэнні, на пісьме выдзяляюцца працяжнікамі або бяруцца ў дужкі: *У летні поўдзень — была спёка — выходзіць рой, снуе высока.* (Я. Колас)


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

*Партызанскі лагер! Дзеці былі ў захапленні ад такога адкрыцця (ім здавалася, што натрапілі яны на лагер выпадкова).* (І. Шамякін)

**386.** Прачытайце тэксты. Назавіце пабочныя сказы. Звярніце ўвагу на збег знакаў прыпынку ў апошніх сказах абодвух тэкстаў.

I. На першы дзень святых калядак —
Такі ўжо быў стары парадак —
Збіралі сена са стала,
Кармілі ім каня, вала
І ўсіх жывёлін, хоць па жмені,
А на стале ў драбнюткім сене —
Здавён-даўна вялося гэта —
Уважна зернетак шукалі
І па тых зернетках гадалі,
Які зародзіць хлеб налета.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Аздоблен квас быў і грыбамі,
Выключна ўсё баравічкамі:
Пільнуй — цішком скажу між намі, —
Каб і язык не ўцёк часамі. *(Я. Колас)*

Пра традыцыі якога свята ідзе размова ва ўрыўку з паэмы «Новая зямля»? Ці адзначаюць яго ў вашай сям'і? Раскажыце, як гэта робіцца ў вашай вёсцы (горадзе).

II. ...Дзяцінства. Сябры ідуць у грыбы. Усе астатнія дзяруцца ў нетры, а ён спакойна ідзе лясной дарогай і праз кожныя некалькі крокаў зрывае баравік, што вылез якраз між каляін. Цвёрды, спадыспаду нібы абсыпаны мукою (ішоў дождж, і кроплі, падскокваючы ад зямлі, білі пад ягоны парасон, а потым высахлі), крамяны, як сыр. *(У. Караткевіч)*

Прачытайце тэксты, апусціўшы пабочныя сказы. Як мяняецца характар выказвання?

**387.** Спішыце, пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры пабочных словах, словазлучэннях і сказах.

1. Доўга бадзяўся алень па гушчарах і правым рогам кляйміў дрэвы, пакуль нарэшце і той рог не скінуў. *(В. Ка-*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

*рамазаў)* 2. Два пакойчыкі былі абсталяваны вельмі сціпла. Самаробныя тапчаны, табурэткі і стол дзядзька Тарас быў і сталявар і цесля і шавец і жнец і ў дуду ігрэц. *(У. Караткевіч)* 3. На купінах каля пнёў, дзе каса не кранула травы яе цяжка касіць ля дрэва, застылі мусіць мокрыя ад расы балотныя званочкі. *(І. Пташнікаў)* 4. У слоўных баталіях з хлопцамі Ірына любіла не пакінуць ад апанента а сярод іх былі дасціпныя і сапраўды разумныя людзі каменя на камені. *(У. Караткевіч)* 5. Пад вечар Наталля Пятроўна бегла яна развучылася хадзіць звычайнай хадою да хворых у суседнія вёскі. *(І. Шамякін)* 6. Андрэй адчуў такі прыліў энергіі, што здаецца мог бы як кажуць варочаць горы. *(П. Пестрак)* 7. Колісь тут як расказваюць старыя людзі праўда самі яны не помняць быў мост. *(Я. Колас)* 8. Міхал навошта ўжо таіцца любіў-такі павесяліцца. *(Я. Колас)*

● З дапамогай тлумачальнага слоўніка растлумачце значэнне слова *апанент*.

● Растлумачце значэнне выразаў *не пакінуць каменя на камені, варочаць горы;* падбярыце да іх словы-сінонімы.

● Сфармулюйце правілы напісання слоў *любіў-такі, сталявар*.

● Зрабіце марфемны разбор слоў *развучылася, хадзіць, помняць*.

● Зрабіце фанетычны разбор слоў *нарэшце, цяжка*.

↑ **388.** Спішыце сказы, дапоўніўшы іх пабочнымі сказамі, што адказваюць на пытанні, пададзеныя ў дужках.

У з о р. *Век пражыць (ці ведае гэта кожны?) без дум і турбот нельга. — Век пражыць — ведае гэта кожны — без дум і турбот нельга.*

1. Алесь Іванавіч быў ужо тады (калі вы з ім пазнаёміліся?) чалавекам сталага ўзросту.

2. Настрой у людзей (хто заўважыў?) быў прыгнечаны, усіх непакоіла няўдача.

3. Рэчка (каму здавалася?) пачынала мялець.

4. Адсюль, з Любеча (пра гэта сведчаць быліны?), родам быў і сябра Ільі Мурамца Дабрыня Нікіціч.

● Якое значэнне выказванням надалі пабочныя сказы?

↑ Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў запісаным вамі 4-м сказе.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**389.** Уявіце, што вам неабходна пераканаць суразмоўцу ў карысці спартыўных заняткаў (чытання кніг, умення карыстацца камп'ютэрам, вывучэння роднай мовы). Ужывайце пры гэтым пабочныя словы, словазлучэнні, сказы, якія ўказваюць на паслядоўнасць думак і сувязь паміж імі. Тэкст запішыце.

У з о р. *Заняткі спортам вельмі карысныя.* ***Па-першае,*** *яны ўмацоўваюць здароўе,* ***па-другое,*** *павялічваюць працаздольнасць. І* ***нарэшце,*** *развіваюць валявыя якасці чалавека.*

**390.** Выкарыстоўваючы пабочныя словы, словазлучэнні, сказы, дакажыце правільнасць наступнага выказвання: «Ранішняя зарадка патрэбная кожнаму. Выконваць яе неабходна правільна».

**391.** Вызначце, да якога стылю належыць наступны тэкст. Дакажыце гэта, выкарыстоўваючы пабочныя словы. Перапішыце тэкст, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку.

Для кожнага стала звыклым, прывычным, што чырвоны колер св..тлафора папярэдж*(?)*вае: «Спыніцеся!» *(На)* жаль бываючы на прыродзе *(не)* заўсёды людзі спыняюцца перад раслінамі, якія прыгожа цвітуць а як правіла імкнуцца сарваць іх для букета.

Часам дзеля цікавасці сарвуць пакруцяць у руках і кінуць цудоўнае тварэнне прыроды. Няма слоў прырода бя..концая р..знастайная прыгожая і шчодрая але згадзіцеся нельга дазваляць, каб шчодрасць прыроды пераўтваралася ў яе знішчэнне. *(З «Кнігі для чытання па батаніцы»)*

У з о р  р а з в а ж а н н я. Дадзены тэкст належыць да публіцыстычнага стылю. Па-першае, тэма гэтага тэксту — бяздумныя адносіны да прыроды — актуальная праблема сучаснасці. Па-другое, мэта выказвання — пераканаць чытача ў неабходнасці беражлівых адносін да прыроды, заклікаць яго да абароны яе прыгажосці і багацця. А ўздзеянне на чытача, пабуджэнне да дзеяння — асноўная задача публіцыстычнага стылю. І нарэшце, у тэксце ярка выражаны такія рысы публіцыстычнага стылю, як экспрэсіўнасць, эмацыянальнасць, аўтарскія адносіны да выказвання.

**392.** Складзіце сказы па наступных схемах:

1. [Паб. сл., ...]. [..., паб. сл., ...], [.., паб. сл.].
2. [..., паб. ск., ...]. [... — паб. ск. — ...]. [... (паб. ск.) ...].



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Падрыхтуйце невялікія паведамленні пра:
а) знакі прыпынку пры пабочных словах і сказах;
б) адрозненне пабочных слоў і сказаў;
в) групы пабочных сказаў і знакі прыпынку, якія залежаць ад значэння кожнай з іх.

**393.** Запішыце тэкст, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.

На акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі ў лістападзе 1926 года Язэп Лёсік слушна на мой погляд гаварыў: «Правапіс гэта законы дысцыпліна і як кожны закон правапіс што-небудзь абмяжоўвае чаго-небудзь не дазваляе. Словам правапіс гэта тое самае, што парадак законнасць і дысцыпліна ў грамадскім жыцці».

*(Н. Гілевіч)*

- Як вы разумееце думку, выказаную Я. Лёсікам?
- Зрабіце марфалагічны разбор слова *абмяжоўвае.*

↑ **394.** Прачытайце тэкст. Запішыце яго па памяці. Растлумачце свой выбар знакаў прыпынку.

ЯЛТА, МАКСІМ, КІПАРЫСЫ

Ён навучыў здаецца гаварыць
Па-беларуску нават кіпарысы,
Барвінак на магільніку гарыстым
Ён навучыў здаецца гаварыць.
Паўднёва сонца плавіцца ўгары,
Зямля гарачая, нібыта прысак...
Ён навучыў здаецца гаварыць
Па-беларуску нават кіпарысы.

*Я. Сіпакоў*

- Ці ведаеце вы, пра каго ідзе гаворка ў вершы?
- Што значыць слова *прысак?*
- Зрабіце марфалагічны разбор слова *кіпарысы.*
- Сфармулюйце правілы напісання прыслоўяў *па-беларуску, угары.*

↑ **395.** Прачытайце верш. Зрабіце сінтаксічны разбор кожнага сказа.

На памылках ці трэба вучыцца?
Імі трэба, як зеллем, лячыцца.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Ад зласлівасці, ганарлівасці,
Ад халуйства, ад ліслівасці.
А калі хвароба не паддаецца, —
Значыць, сэрца ўхаластую б'ецца.

*А. Грачанікаў*

● Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў апошнім сказе.

● Зрабіце разбор па саставе слоў *зласлівасці, ганарлівасці, ліслівасці.* Як утвораны гэтыя словы?

↑ **396.** Удумліва прачытайце верш, напісаны Н. Арсенневай у дзевятнаццаць год. Вызначце, да каго звяртаецца аўтар, якую думку сцвярджае. Знайдзіце пабочныя сказы, выпішыце іх. Падумайце, як дапамагаюць яны аўтару выказаць асноўную думку верша.

МЭТА ЖЫЦЦЯ

Мэта жыцця, кажуць людзі без сілы,
Мэта жыцця — дачакацца магілы.
Як пражывеш ты, сумленна ці не,
Ці не ўсё роўна — бо смерць не міне.
Мэта жыцця, кажуць поўныя сілы,
З доляй змагацца да самай магілы,
Веры не траціць і страху не мець,
Смела байцамі памерці, згарэць.
Мэта жыцця, яшчэ кажуць, не йрвацца
У неба, а толькі зямлі прыглядацца.
Зведаць грахі ўсе, ўсяго спрабаваць,
Каб не так горка было паміраць.
Мэта жыцця, ўрэшце кажуць, хавацца
З сэрцам ад смуткаў, з слязіма не знацца.
Думкі аб праўдзе? Дурное — і ўсё!
Мэта жыцця — захаваць жыццё!

● У залежнасці ад кантэксту паспрабуйце замяніць або ўставіць у пабочныя сказы словы з антанімічных пар: *песіміст—аптыміст, рамантык—рэаліст.*

● Ці задумваліся вы пра сэнс жыцця?

● Перачытайце канцоўку тэксту. Знайдзіце пабочнае слова. Якую функцыю выконвае яно ў будове тэксту?

↑ Назавіце словы, якія не адпавядаюць арфаграфічным і граматычным нормам сучаснай беларускай літаратурнай мовы.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**397.** Перад вамі частка тэксту-апісання з твора У. Караткевіча. Як вы лічыце, якая моўная канструкцыя дазваляе дакладна вызначыць структурны кампанент названага тэксту?

Словам, хатка на курыных ножках. Не хапала толькі бабы-ягі, якая ляжала б на дзевятай цагліне і казала: «Фу-фу, чалавечым духам пахне!»

- Паспрабуйце дапісаць пачатак тэксту, каб атрымалася міні-апавяданне з элементамі апісання.
- Параўнайце сваё апісанне хаткі з тым будынкам, які ўбачыў герой твора У. Караткевіча.

Дом на каменным высокім падмурку, з каменным ганкам і драўлянымі калонамі, якія за памяці дзядоў былі, напэўна, пафарбаваныя ў белы колер, ён пахіліўся на мяне, як смяротна паранены, які вось-вось упадзе. Перакошаныя ліштвы*, абадраная ашалёўка, шыбы, вясёлкавыя ад старасці. На парадным ганку паміж прыступкамі выраслі лопухі,ваўчкі, магутны скрыпень*, які амаль закрываў дзверы. А да чорных дзвярэй праз калюжу пакладзены дзве цагліны. Дах быў зялёны, тоўсты ад тлустых пушыстых імхоў. У шэрае акенца ўнутранасць хаты здавалася панурай і занядбанай.

↑ **398.** Складзіце тэкст тыпу «разважанне» на тэму «Што ёсць агульнага паміж зваротkам і пабочнымі словамі і чым яны адрозніваюцца?». Пры адказе выкарыстоўвайце пабочныя словы.

**399.** Прачытайце тэкст. На матэрыяле тэксту напішыце інструкцыю ў афіцыйна-дзелавым стылі «Як захавацць сябе ад удару маланкі». Самастойна выберыце ступень катэгарычнасці фармулёвак, выкарыстоўваючы для гэтага дзеясловы ці ў форме загаднага ладу, ці ў неазначальнай форме, а таксама словы *лепш, пажадана, можна, нельга, неабходна, патрэбна.*

Свет, у якім мы жывём, невычарпальны, бязмежны ў сваім праяўленні. З кожным днём і кожным стагоддзем мы даведваемся пра нешта новае, невядомае раней. Але заўсёды ёсць і загадкі. Вось і тут перад намі адна з самых цікавых загадак прыроды, якую яшчэ неабходна раскрыць навуцы. І хто ведае, можа, сярод вас расце той чалавек, які прысвеціць сваё жыццё вывучэнню маланкі, у якой нашы продкі бачылі страшную зброю багоў.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

А цяпер некаторыя парады. Вядома, што атмасферныя разрады часцей за ўсё трапляюць у высокія дрэвы, што стаяць асобна. Шукаць пад імі схованку ад навальніцы — значыць падвяргаць сябе небяспецы. Яшчэ больш легкадумна робіць той, хто ў час навальніцы купаецца: галава плыўца над воднай гладдзю ўяўляе для маланкі самую высокую кропку.

А ці ведаеце вы, што некаторыя пароды дрэў проста-такі прыцягваюць да сябе маланку.

Аказваецца, што са 100 выпадкаў маланка часцей за ўсё трапляе ў дуб — 54 разы, у таполю яна трапляе 24 разы, у елку — 10, у сасну — 6, у грушу і вішню — 4. У бярозу і клён маланка зусім не трапляе (канечне, калі яны знаходзяцца ў змешаным лесе, а не растуць асобна на прасторы). Чаму? Дастаткова пераканальнага адказу яшчэ няма. Магчыма, гэта звязана з каранёвай сістэмай дрэў.

На лузе няможна хавацца ў стозе сена. Увогуле на любой адкрытай і роўнай мясцовасці чалавек можа апынуцца ў небяспецы.

У час навальніцы пажадана знаходзіцца далей ад печаў. Атмасферныя разрады часта пападаюць у пячныя коміны. Былі выпадкі, калі маланка пападала ў людзей на адлегласці за два-тры метры ад правадоў. Які механізм тут дзейнічае? Невядома. *(«Звязда»)*

## § 52. Словы-сказы

Сказы, выражаныя адным словам, якія даюць станоўчы ці адмоўны адказ на чыё-небудзь выказванне, перадаюць розныя пачуцці або пабуджэнні, называюцца **словамі-сказамі**. Словы-сказы не маюць ні галоўных, ні даданых членаў сказа, не могуць быць развіты іншымі словамі: *Ты прачытаў кнігу?* — ***Так***. *(= Я прачытаў кнігу)* *Андрэй не заблудзіцца ў лесе?* — ***Не***. *(= Андрэй не заблудзіцца ў лесе)*. Слова-сказ *Так* выражае станоўчы адказ на пытанне, слова-сказ *Не* выражае адмоўны адказ на пытанне.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Ролю слоў-сказаў выконваюць таксама пабочныя словы *вядома, канешне (канечне), безумоўна, зразумела, магчыма* і інш. Яны не толькі выражаюць сцвярджэнне ці адмаўленне, але і перадаюць розныя пачуцці (упэўненасць, няўпэўненасць, меркаванне і інш.): *«Лёгка ісці па асфальце?» —* ***«Вядома».*** (А. Чарнышэвіч) *«У лясным азярцы шмат рыбы». —* ***«Магчыма».*** (Я. Маўр)

У якасці слоў-сказаў могуць ужывацца выклічнікі, якія выражаюць розныя пачуцці або пабуджэнні: ***Ого!*** *Я ніколі не бачыў такой бульбы.* (М. Парахневіч) ***Го!*** *Я сеў бы на каня і паказаў бы яшчэ, чаго варты стары Талаш!* (Я. Колас)

Да слоў-сказаў адносяцца і такія, што выражаюць падзяку, прывітанне, просьбу. Вельмі часта тут пры словах *дзякуй, здароў, бывай, выбачайце* і інш. ужываецца зваротак: ***Здароў****, Юрась.* ***Бывай****, Янка!* ***Дзякуй****, Аленка!* ***Выбачайце****, хлопцы!*

Калі словы-сказы і выклічнікі стаяць у пачатку сказа і вымаўляюцца з адпаведнай інтанацыяй, то яны аддзяляюцца ад сказа коскай: ***Так****, падарожжа было цікавае.* (Я. Маўр) ***Не****, не забывае Алёша сваіх сяброў.* (І. Грамовіч) ***Эх****, як прывольна ў лесе летам.* (Я. Колас) Пры ўзмоцненай інтанацыі ставіцца клічнік: ***Не****! Няправільна! Я так не пайду!* (І. Шамякін) *«****Ага!*** *Папаўся-такі. Не мінуў маіх рук!» — крычаў дзед.* (М. Лынькоў)

**400.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Сваю думку абгрунтуйце. Знайдзіце ў ім словы-сказы, вызначце, што яны выражаюць, якую ролю ў тэксце выконваюць. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

Гасцей усё не было, і я вырашыла збегаць на вуліцу паглядзець, ці не ідуць яны. А каб ніхто не заняў маё крэсла (а хто, акрамя брата Сашкі, гэта можа зрабіць?), я ўзяла паперку і вялікімі літарамі напісала: «Месца занята, Тома».

На вуліцы я гасцей не ўбачыла, затое сустрэла сваіх сяброўак... Словам, калі, спахапіўшыся, я прыбегла дадому, госці ўжо сядзелі за сталом і ўсе крэслы і табурэты былі занятыя, акрамя матулінага — побач з бацькам. А на маім крэсле з замілаванай усмешкай сядзеў — хто б вы думалі? — мой любы брацік Сашка.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Павітаўшыся з гасцямі, я падышла да яго і тузанула за рукаў.

— Злазь! — загадала я яму як мага цішэй.

— Чаму? — Сашка вылупіў на мяне свае хітрыя вочы.

— Гэта маё крэсла!

— Чаму гэта тваё! Яно што, падпісана?

— Так, падпісана! Тут была паперка!

— Ай, во і сапраўды нейкая цыдулка! — Сашка ўстаў — пад ім ляжала мая паперка. — О, дык я ўжо бачыў яе: «Месца занята, Тома», — прачытаў ён як мага гучней. — Ну, дык усё правільна. Тут нехта напісаў табе, што месца занята. Вось я і палічыў, што гэта да цябе звяртаюцца, а не да мяне, і сеў.

— Гэта я сама табе напісала, што месца занята, і падпісалася: «Тома». Во, во!.. — Я выхапіла паперку і пачала тыцкаць яму пад нос.

— Не, пачакай!.. — апраўдваўся Сашка. — Каб гэта ты напісала мне «Месца занята», то паставіла б кропку, а ты паставіла коску, значыцца, гэта зварот да цябе...

— Не, гэта зварот да цябе! — закрычала я і пачала сцягваць Сашку з крэсла, але брат учапіўся ў яго рукамі.

— Ану, абое, — марш з пакоя! — узвышаючы голас, прамовіў бацька.

Але тут у спрэчку ўступілі нашы госці... *(Т. Міжыгурская)*

● Запішыце працяг гэтай гісторыі, выкарыстоўваючы, па магчымасці, словы-сказы.

↑ Раскажыце пра ролю знакаў прыпынку ў маўленчых зносінах.

**401.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып, асноўную думку. Знайдзіце словы-сказы, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

— Вы любіце музыку? — спытала яна ў мяне.

— Не, — шчыра адказаў я.

— Чаму? — здзівілася яна. — Вы былі так уражаны канцэртам!

«Я быў уражаны **Вамі** і атмасферай **гасціннага** дома», — так захацеў сказаць я, але прамовіў:

— Я люблю паэзію.

— Так?! А хто з паэтаў вам найбольш падабаецца?



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

— Поль Верлен.

Я прачытаў яго вершы пасля таго, як Максім лёгка цытаваў караля паэтаў у музеі.

— Вы ведаеце вершы Верлена **на памяць?**

— Канечне! — узрадаваўся я, бо паспеў вывучыць. — Толькі не ў арыгінале, а ў перакладзе. У яго, дарэчы, ёсць цудоўныя вершы пра музыку. Паслухайце:

Раяль цалуе тонкая рука
Ў час вячэрні, **шэра-ружаваты,**
І на крылах, цішэй ад вецярка,
Ў паветры мяккім, пекным паплыла ты
Пужліва, песня, і срэдзь комнат хаты
Шчэ доўга веяў пах, як ад цвятка.

Верлен — самы музычны паэт, — дадаў я.

— І я адчула цудоўную музыку верша, — вочы былі шырока раскрытыя і глядзелі на мяне з асаблівай увагай.

Вось тады я і адкрыў для сябе новы закон: веданне паэзіі дапамагае ў жыцці. *(П. Качаткова)*

● Ці згодныя вы, што «веданне паэзіі дапамагае ў жыцці»? Прывядзіце свае доказы.

● Растлумачце правапіс выдзеленых слоў.

↑ **402.** Уважліва прачытайце тэкст. Пра якую моўную з'яву ідзе гаворка?

У друку гаварылася пра такую моўную загану: адказваючы на пытанне ці пацвярджаючы тое, што сказаў суразмоўнік, ужываюць звычайна слова *так:* «Ты хадзіў у кіно?» — «Так». «Спадабаўся фільм?» — «Так». У адпаведнасці з традыцыяй і спецыфікай беларускай мовы Я. Скрыган найчасцей ужывае слова *але* — адзіночнае ці паўторнае.

— Ты мяне звала, Ганна?

— Але. Вазьмі чалавека на пастой. *(«Месячная ноч»)*

Дарэчы выкарыстоўваецца і часціца *ага.*

— А помніш клуб Крэйнаса? Мы там ставілі «Паўлінку», і ты іграў Якіма Сароку.

— Ага. За Паўлінку была Гэля. *(«У старым доме»)*

*(А. Каўрус)*

● Ці згодныя вы з парадамі мовазнаўцы?


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

↑ **403.** Падрыхтуйцеся расказаць пра асаблівасці слоў-сказаў. У свой адказ уключыце прыклады з твораў вашых любімых пісьменнікаў-класікаў.

**404.** Складзіце і запішыце дыялог на самастойна абраную тэму, ужываючы ў ролі сказаў словы *так, не, канечне, магчыма, відаць, верагодна, выбачайце, даруйце.*

## Кантрольныя пытанні і заданні

**Варыянт 1**

1. Што называецца зваротkам? Якую ролю зваротак выконвае ў сказе?
2. Якімі часцінамі мовы можа выражацца зваротак? Прывядзіце прыклады.
3. Як інтануецца зваротак у вуснай мове?
4. Якімі знакамі прыпынку выдзяляецца зваротак на пісьме?
5. Як ставяцца знакі прыпынку, калі пры звароткu ёсць часціцы і выклічнікі?
6. Якое прызначэнне пабочных слоў, словазлучэнняў і сказаў?
7. Пастаўце знакі прыпынку ў сказах і растлумачце іх. Зрабіце сінтаксічны разбор сказаў: *1. Кут мой родны кут прыгожы да цябе я зноў прыйшоў.* (П. Броўка) *2. Тыдні праз два калі ласка забірай сваю машыну.* (М. Паслядовіч)

**Варыянт 2**

1. Якія словы, словазлучэнні і сказы называюцца пабочнымі?
2. Якія словы могуць выконваць і ролю пабочных слоў, і ролю даданых членаў сказа? Прывядзіце прыклады.
3. На якія групы падзяляюцца пабочныя словы паводле значэння?
4. Як інтануюцца пабочныя словы, словазлучэнні і сказы ў вуснай мове? Як яны выдзяляюцца на пісьме?
5. Што ёсць агульнага і рознага паміж звароткамі і пабочнымі словамі?
6. Якая роля слоў-сказаў у мове? Што яны абазначаюць і чым выражаюцца? Прывядзіце прыклады.
7. Пастаўце знакі прыпынку ў сказах і растлумачце іх. Зрабіце сінтаксічны разбор сказаў: *1. Жыватворнай працы многа ў цябе вясна-сяброўка...* (У. Хадыка) *2. З вялікім задавальненнем з асалодай можна сказаць слухаў Пракоп гэту прамову.* (Я. Колас)



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## АДАСОБЛЕНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА

### § 53. Паняцце пра адасабленне

А д а с а б л е н н е — гэта адзін са спосабаў сэнсавага выдзялення ці ўдакладнення часткі выказвання: ***Пакрытыя тоўстым пластом снегу**, галіны дрэў гнуліся да самай зямлі.* (Я. Колас) У гэтым сказе адасоблена азначэнне, выражанае дзеепрыметнікам з залежнымі ад яго словамі. Гэта азначэнне можна замяніць асобным сказам або даданай часткай складанага сказа: *Галіны дрэў гнуліся да самай зямлі. Яны былі пакрытыя тоўстым пластом снегу. Галіны дрэў гнуліся да самай зямлі, бо былі пакрытыя тоўстым пластом снегу.*

*Кіламетраў за трыццаць пяць на поўдзень ад Мазыра, **на правым беразе Прыпяці,** раскінулася па-над ракой невялікае мястэчка Нароўля.* (У. Краўчанка) У сказе дзве акалічнасці месца. Другая акалічнасць *(на правым беразе Прыпяці)* удакладняе першую *(кіламетраў за трыццаць пяць на поўдзень ад Мазыра).*

У вусным маўленні адасобленыя члены сказа вымаўляюцца з асаблівай інтанацыяй, а на пісьме выдзяляюцца коскамі.

У сказе могуць адасабляцца толькі даданыя члены сказа — азначэнні (у тым ліку прыдаткі), акалічнасці, дапаўненні. Галоўныя члены сказа не могуць быць адлучаны ад структуры сказа.

Адасобленыя члены сказа дзеляцца на дзве групы:

1) адасобленыя даданыя члены, блізкія па значэнні да сказа;

2) удакладняльныя члены сказа.

**405.** Параўнайце пары сказаў з адасобленымі і неадасобленымі членамі. У якіх сказах азначэнне выдзелена па сэнсе? Якімі сродкамі гэта дасягаецца?

1. Сонца, маладое і яркае, плыло над зямлёю. *(В. Хомчанка)* — Маладое і яркае сонца плыло над зямлёю. 2. Зіма, устрывожаная, ратунку не знойдзе. *(М. Танк)* — Устрывожаная зіма ратунку не знойдзе. 3. Пад вечар пачаўся дождж,


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

вялікі, доўгі. *(Я. Маўр)* — Вялікі, доўгі дождж пачаўся пад вечар.

**406.** Параўнайце наступныя тэксты. Чым яны адрозніваюцца? Якую ролю выконваюць адасобленыя азначэнні?

А хмары накіпалі, чорныя, нізкія, дажджавыя; над раўнінаю цягнуўся прысмерак, такі непрытульны і халодны, што мурашкі паўзлі па скуры. Недзе бліснула маланка, нясмелая, асенняя. *(У. Караткевіч)*

А чорныя нізкія дажджавыя хмары накіпалі; над раўнінаю цягнуўся такі непрытульны і халодны прысмерак, што мурашкі паўзлі па скуры. Недзе бліснула нясмелая асенняя маланка.

**407.** Параўнайце сказы ў правым і левым слупках. За кошт чаго ўдалося перадаць два паведамленні ў адным сказе? Якое паведамленне з'яўляецца асноўным, а якое — дадатковым?

1. Паветра было напоена густымі пахамі хвоі. Яно навісла шызаватай смугой. 2. Сена змачыў дождж. Яно запахла яшчэ мацней.

1. Паветра, напоенае густымі пахамі хвоі, навісла шызаватай смугой. *(М. Лужанін)* 2. Сена, змочанае дажджом, запахла яшчэ мацней. *(К. Кірэнка)*

● У сказах якога слупка ўдалося больш лаканічна перадаць два паведамленні?

## § 54. Адасобленыя азначэнні

Вялікую групу адасобленых членаў складаюць дапасаваныя азначэнні, радзей ужываюцца недапасаваныя, а таксама прыдаткі.

А д а с о б л е н ы я д а п а с а в а н ы я а з н а ч э н н і выражаюцца адзіночнымі прыметнікамі ці дзеепрыметнікамі, а таксама прыметнікавымі і дзеепрыметнікавымі зваротамі. Яны могуць стаяць перад назоўнікам, які паясняюць, або пасля яго: ***Стомленыя пасля пераходу***, *байцы раскінулі лагер у гушчары лесу.* (І. Новікаў) *Месяц,* ***яркі і круглы****, плыў над зямлёй.* (З. Бядуля) *Над зялёным лугам,* ***усыпаным рознымі кветкамі****, гулі пчолы.* (А. Якімовіч)



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

А д а с о б л е н ы я н е д а п а с а в а н ы я а з н а ч э н н і часцей выражаюцца назоўнікамі ва ўскосных склонах або спалучэннем назоўнікаў і колькасных лічэбнікаў. Яны могуць стаяць перад паяснёным назоўнікам або пасля яго: ***Без шапкі, у адной гімнасцёрцы,*** *Васіль з усяе сілы працаваў вёсламі.* (І. Шамякін) *Жанчына,* ***гадоў на сорак пяць****, прыязна паглядзела на мяне.* (П. Пестрак)

Ад размяшчэння адасобленых азначэнняў у сказе залежыць іх вымаўленне і, адпаведна, выдзяленне знакамі прыпынку на пісьме.

Калі адасобленыя дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні стаяць у пачатку або сярэдзіне сказа перад паяснёным словам, то яны вымаўляюцца павышаным тонам і перад словам робіцца паўза. Лагічны націск прыпадае на паяснёнае слова. Словы, якія ўваходзяць у зварот, вымаўляюцца злітна: ***Працяты марозам,*** *// снег хрустка скрыпеў пад нагамі дзеда Талаша.* (М. Лынькоў) ***У высокіх ботах,*** *// ён цяпер падобны на паляўнічага або рыбака.* (В. Мікуліч)

Калі адасобленыя азначэнні стаяць пасля паяснёнага слова і імі заканчваецца сказ, то яны вымаўляюцца паніжаным тонам, робіцца паўза паміж паяснёным словам і зваротам: *Шуміць рака, //* ***вясёлая, жывая.*** (А. Бачыла) *Свяціліся радасцю вочы дзяўчыны, //****сухія, палінялыя, з цемнаватым абоддзем.*** (У. Краўчанка) *Вёска стаяла паміж балота, //* ***парослага густою лазою і алешнікам.*** (М. Чарот)

Калі адасобленыя азначэнні стаяць у сярэдзіне сказа, то яны выдзяляюцца паўзамі з двух бакоў: *Рака, //* ***спакойная ўчора,*** *// уночы выйшла з берагоў.* (А. Бачыла) *У вячэрнім паветры, //* ***крыху вільготным ад блізкай ракі,*** *// прыемна пахне шыпшынай.* (В. Вольскі)



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**408.** Прачытайце сказы, захоўваючы патрэбную інтанацыю пры адасобленых азначэннях. Растлумачце, ад чаго залежыць іх вымаўленне і выдзяленне знакамі прыпынку. Чым выражаны адасобленыя азначэнні?

1. Нёман лянiва i пахмурна нёс **цёмна-зялёную** ваду. Вада, мутная, цяжкая, ціха білася аб бераг, калыхала прыбярэжныя кусты. *(В. Іпатава)* 2. Холад быў разліты па лесе, павуціна, мокрая ад ранішняга туману, **абчапляла** ўсе кусты і дрэвы, перапляла ўсе сцяжынкі. *(Л. Дайнека)* 3. Над горадам, прыбраная ў зоры, апускаецца ноч. *(Э. Самуйлёнак)* 4. Ігнась вярнуўся **дадому** праз два тыдні, схуднелы, абарваны. *(У. Луцэвіч)* 5. Стаяла вясна, дружная, цёплая, з дажджамі і навальніцамі. *(А. Асіпенка)* 6. Ходзячы па моху, Васіль пачаў натрапляць на баравікі. Яны былі відаць здалёк, з бурымі каптурыкамі, моцнымі, цвёрдымі ножкамі. *(І. Навуменка)* 7. Дзед Пархвен, высокі і худы, з глыбокімі вачаніцамі, стаяў пасярод пакоя пытальнікам. *(М. Ваданосаў)* 8. За будынкамі фермы адразу пачынаецца бор, стары і высокі. *(М. Ваданосаў)* 9. Трэці том папулярнай у свой час серыі «Живописная Россия», задуманай і ажыццёўленай вядомым рускім географам і падарожнікам **П. П. Сямёнавым-Цянь-Шанскім,** амаль цалкам складаецца з нарысаў А. Кіркора[1] і называецца «Літоўскае і беларускае Палессе». Гэты том надрукаваны ў 1882 годзе і факсімільна (у першапачатковым выглядзе) перавыдадзены «Беларускай энцыклапедыяй» у 1994 годзе. *(Часопіс «Бярозка»)*

● Пабудуйце схемы інтанавання 3-га, 4-га і 7-га сказаў. Растлумачце правапіс выдзеленых слоў.

На пісьме заўсёды выдзяляюцца коскамі:

1. Азначэнні, выражаныя дзеепрыметнікавымі або прыметнікавымі зваротамі, і аднародныя азначэнні, калі яны стаяць непасрэдна пасля назоўніка, які паясняюць: *На паляне,* ***пакрытай буйнымі кроплямі расы,*** *стаялі дзве казулі.* (Я. Маўр) *Вечар,* ***ціхі, цёплы,*** *ахутваў змрокам зямлю.* (А. Пальчэўскі) *Высокі дом,* ***з цагляным пад-***

[1]Адам Кіркор (1818—1886) — беларускі і польскі грамадскі дзеяч, публіцыст, выдавец, гісторык, археолаг, літаратуразнавец, этнограф.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

***муркам, з чарапічным дахам,*** *быў адным з самых прыкметных у вёсцы.* (М. Ткачоў)

2. Дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні, якія адносяцца да асабовага займенніка*: Я спыніўся, **асветлены сонцам,** толькі на ўзлеску, перад полем.* (Б. Сачанка) ***Захопленыя сваім заняткам,*** *мы і не заўважылі, як сонца схілілася да самага лесу.* (В. Вольскі)

ЗАПОМНІЦЕ! Азначэнні, якія стаяць перад назоўнікам, адасабляюцца ў наступных выпадках:

1. Калі яны маюць дадатковае акалічнаснае значэнне прычыны ці ўступкі: ***Мокрыя ад дажджу,*** *пліты настыла блішчэлі пад нізкім верасьнёўскім сонцам.* (Л. Левановіч) Параўн.: *Пліты настыла блішчэлі пад нізкім верасьнёўскім сонцам* (чаму?), *бо былі мокрыя ад дажджу.* ***Заўсёды смелы і вясёлы,*** *Мікола штосьці засумаваў.* (М. Хведаровіч) Параўн.: *Мікола штосьці засумаваў* (нягледзячы на што?), *хоць быў заўсёды смелы і вясёлы.*

2. Калі паміж азначэннем, якое паясняе дзейнік, і гэтым дзейнікам стаіць выказнік: ***Ахінутыя інеем,*** *прыгіналіся да самай зямлі кусты малінніку і парэчак.* (П. Броўка)

**409.** Спішыце, пастаўце коскі, падкрэсліце адасобленыя азначэнні і растлумачце ўмовы іх адасаблення.

1. Часам смешна ломячы лазу велікан адзіны ў сваім родзе ловіць трапяткую страказу ці маляўку на падсохлым бродзе. *(В. Гардзей)* 2. Сыходзіла зіма па сцежцы бітай лютым. *(Ю. Голуб)* 3. Спяваюць жаваранкі. Нябачныя яны трымцяць у **засмужаным** злёгку блакіце. *(І. Пташнікаў)* 4. Пасеяныя маладзіком цеплалюбныя памідоры растуць як на дражджах. *(В. Гардзей)* 5. На палянцы суніц было **многа.** Сакавітыя з мядовым пахам яны **самі** прасіліся ў рот. *(М. Гамолка)* 6. Сучком прыціснуты масляк з травы не вылезе ніяк. *(В. Зуёнак)*. 7. На доўгіх століках, **уроссып,** як карапузы-хлапчукі, нядаўна вымытыя ў росах на сонцы спяць баравікі. *(Н. Гілевіч)* 8. Асветлены бяссоннымі ліхта-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

рамі горада блішчыць гранітнай чырванню абеліск на брацкай магіле воінаў і партызан. *(Я. Брыль)*

- Растлумачце, як утвораны словы *бяссонныя, цеплалюбны.*
- Да якой часціны мовы належаць выдзеленыя словы?

**410.** Неадасобленыя азначэнні зрабіце адасобленымі, а адасобленыя — неадасобленымі. Запішыце. Адкажыце, як пры гэтым змяняецца інтанацыя і сэнс сказаў. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку і растлумачце іх.

1. Забалочаная паляна, акружаная з усіх бакоў цёмнай сцяною лесу, млела ад гарачыні. 2. Дарога тым часам перайшла ў алею, абсаджаную высокімі густымі ліпамі. 3. Рака, спакойная ўчора, уночы выйшла з берагоў. 4. Здалёку віднелася школа, зусім новая, свежа-белая, нядаўна ўведзеная ў строй. 5. Трава, рослая, густая, валілася на бок тугім валам. 6. Цёмны і ціхі вечар апусціўся на зямлю.

**411.** Перабудуйце і запішыце сказы такім чынам, каб іменная частка выказніка стала адасобленым азначэннем.

Узор. *Смуга тонкая, сіняватая. Смуга, тонкая, сіняватая, песціла лясы і лугі.*

1. Вясна была дружная і ранняя. 2. Сёння ранак ціхі, ясны. 3. Возера было глыбокае і вялікае. 4. Гэта дрэва высокае і галінастае.

**412.** Прачытайце. Дайце загаловак тэксту. Спішыце, устаўце прапушчаныя літары і раскрыйце дужкі. Падкрэсліце адасобленыя азначэнні і растлумачце ўмовы іх адасаблення.

Ёсць ночы ў канцы жніўня прасякнутыя журботным подыхам восен*(?)*скага набліжэння. *(З)* вечара хутка цямнее, і цемра *(не)* празрыстая і лёгкая як гэта бывае *(у)* весну, а глухая і цягучая. У пацямнелым небе загараюцца буйныя зоры, і Млечны Шлях нагадвае ячменнае зерне густа ра..сыпанае за пра*(?)*шоўшым возам. Стаіць ломкая цішыня, і, калі ападзе заўчасна звялы ліст з клён.., чуваць, як ён трапеч..цца ў паветры і падае на зямлю з мя..кім шэлестам. А то нечакана грукне з яблыні даспелая антонаўка ў бліжнім садзе, і водгалас тут жа замрэ прыглушаны цемрай і цішынёй.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Моцны пах антонавак змешаны з пахам іржышча і саломы насычае паветра. *(Т. Хадкевіч)*

- Зрабіце марфалагічны разбор слова *прыглушаны.*
- Сфармулюйце правілы правапісу слоў *Млечны Шлях, іржышча.*
- ↑ Ці ёсць у вас любімыя з'явы прыроды? Апішыце іх, выкарыстайце пры гэтым адасобленыя азначэнні.

**413.** Прачытайце ўрывак з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля». Назавіце сказы з адасобленымі азначэннямі, растлумачце знакі прыпынку. Якую ролю яны выконваюць у тэксце?

На прыгуменні, поруч з садам,
Павець з гумном стаяла радам,
...Гуменца, крытае саломай,
Ад доўгіх часаў пасівела;
Салома кудламі вісела,
Яе вятры параздзімалі,
На стрэху лазячы, бывала, —
Іх гэта забаўка займала...
...Будоўля, больш яшчэ старая,
З гнілой, вагнутаю страхою,
Стаяў хлявец якраз напроці
І чуць ліпеў, як бы на плоце
Гаршчок, разбіты качаргою.
...А збоку, ў полі, недалёка
Стаяў прыгрэбнік адзінока,
...У дол упёршыся страхою.
Ў глыбі двара стаяла хата
І выглядала зухавата
Паміж запушчанай будовы,
Як бы шляхцянка засцянкова,
Што ў дзень святы каля касцёла,
Чуць-чуць падняўшы край падола,
Так важна ходзіць з парасонам...

- Дайце апісанне сядзібы вашых бацькоў (родзічаў, знаёмых), што жывуць у вёсцы, па магчымасці выкарыстайце адасобленыя азначэнні.
- З дапамогай тлумачальнага слоўніка вызначце лексічнае значэнне слоў *павець, гумно, хлеў, прыгрэбнік, хата, будоўля.*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**414.** Правядзіце каменціраванае чытанне тэксту, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Я глядзеў на танцы, калі раптам адчуў нечы позірк. Непадалёк ад мяне стаяў танклявы, але, відаць, моцны малады чалавек, белавалосы, з вельмі прыемным і шчырым тварам, апрануты сціпла, але з падкрэсленай акуратнасцю.

Я не бачыў, адкуль ён з'явіўся, але ён адразу спадабаўся мне, спадабалася нават мяккая аскетычнасць* у прыгожым вялікім роце і разумных карых вачах. Я ўсміхнуўся яму, і ён, як быццам толькі і чакаў гэтага, падышоў да мяне вялікімі і плаўнымі крокамі, працягнуў мне руку:

— Прабачце, я без цырымоній, Андрэй Свеціловіч. Даўно жадаў пазнаёміцца з вамі. Я студэнт... былы студэнт Кіеўскага універсітэта. Зараз мяне выключылі... за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях.

Я таксама адрэкамендаваўся. Ён усміхнуўся шырокай белазубай усмешкай, такой яснай і добрай, што твар адразу зрабіўся гожым... *(У. Караткевіч)*

● Звярніце ўвагу на адпаведнасць знешнасці і рыс характару героя. Зрабіце выбарачны пераказ тэксту з апісаннем знешнасці Андрэя Свеціловіча.

↑ На вуліцы (у школе) паназірайце за кім-небудзь незнаёмым. Паспрабуйце на аснове назіранняў за знешнасцю і паводзінамі чалавека апісаць яго характар.

Адасобленыя азначэнні даюць больш нагляднае ўяўленне аб прадмеце гутаркі, падкрэсліваюць яго прымету. Прымета, выражаная адасобленым азначэннем, больш прыцягвае ўвагу. Параўн.:

| | |
|---|---|
| *Неба,* ***зацягнутае шэрымі хмарамі,*** *нізка навісла над лесам.* (У. Карпаў) | *Зацягнутае шэрымі хмарамі неба нізка навісла над лесам.* |
| *Маці,* ***маўклівая і паслухмяная,*** *пайшла ўслед за імі.* (К. Чорны) | *Маўклівая і паслухмяная маці пайшла ўслед за імі.* |

Адасобленыя азначэнні надаюць мове выразнасць, эмацыянальнасць. Яны найчасцей ужываюцца ў мастац-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

кім і публіцыстычным стылях, радзей — у навуковым: *У зборніку М. Багдановіча «Вянок» заплецены найпрыгажэйшыя краскі душы,* ***успоеныя сокамі родных беларускіх долаў.*** (Н. Гілевіч) Большасць адасобленых азначэнняў, выражаных дзеепрыметнікавымі зваротамі, можна перабудаваць у дадаmake азначальныя сказы: *Увосень цвітуць на ўзлеску верасы,* ***залітыя ласкавым сонцам.*** (Я. Брыль) — *Увосень цвітуць на ўзлеску верасы, якія заліты ласкавым сонцам.*

**415.** Прачытайце тэкст. Ахарактарызуйце яго, адказаўшы на наступныя пытанні: хто, каму, пра што, навошта, чаму і дзе піша? Якую ролю выконваюць адасобленыя азначэнні ў тэксце? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

Надзея Яноўская стаяла і слухала нас. Але гэта была не яна, гэта была мара, лясны дух, казачная здань. Яна была ў сярэдневяковай жаночай вопратцы: сукня, на якую пайшло пяцьдзесят локцяў залацістага аршанскага атласу, паверх яе — другая, белая з блакітнымі, адліваючымі срэбрам разводамі і шматлікімі разрэзамі на рукавах і падоле. Стан, сціснуты ў снуроўку, быў перавіты тонкім залацістым шнурам, які падаў амаль да зямлі двума кутасамі. <...> Валасы былі ўзяты ў сетку і ўпрыгожаны жаночым уборам, які трохі нагадваў караблік, зроблены са срэбных ніцей. З абодвух рагоў гэтага карабліка звісаў да зямлі тонкі белы вэлюм. *(У. Караткевіч)*

● Уявіце сябе: а) вядучым (вядучай) на паказе «Мадэлі сезона» і апішыце 1—2 мадэлі сучаснай вопраткі; б) кліентам атэлье па пашыве вопраткі і апішыце майстру мадэль, якую вы хочаце пашыць.
● Якое значэнне мае слова *локаць* у выразе «сукня, на якую пайшло пяцьдзесят локцяў залацістага аршанскага атласу»?

**416.** Спішыце тэкст, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку, падкрэсліце адасобленыя азначэнні.

У маленстве маім ёсць адна вельмі яркая дата. Недзе ў пачатку дваццатых гадоў у Слуцку, на Манастыршчыне, на беразе рэчкі я спыніўся каля чалавека, які паволі апранаўся, толькі што пакупаўшыся. Я стаяў і глядзеў на чалавека да таго часу, пакуль ён яшчэ малады з невялікімі вусікамі


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

здаецца ў саламяным капелюшы з чорным пакамечаным партфелем не пайшоў.

Пайшоў чалавек, а я не ведаў, як нарадавацца, што ўбачыў яго. Гэта быў Якуб Колас.

Да таго часу я ведаў Якуба Коласа толькі па кнігах. Гэта былі часамі вельмі ўжо зачытаныя кнігі з паабдзіранымі вокладкамі з паразрыванымі лістамі. Я чытаў і перачытваў гэтыя кніжкі па некалькі разоў. Які харошы шырокі прывабны і поўны хвалявання быў свет ад тых кніжак простых напісаных мовай самаю блізкаю сэрцу! *(Паводле Я. Скрыгана)*

↑ Ці бачылі вы на фотаздымках у альбомах, кнігах і г. д. партрэт Якуба Коласа? Дайце партрэтнае апісанне класіка беларускай літаратуры.

**417.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль. Зрабіце пераклад на беларускую мову. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку, растлумачце іх. Падкрэсліце адасобленыя азначэнні.

САД

Позади дома был старый сад уже одичавший заглушённый бурьяном и кустарником. Я прошёлся по террасе ещё крепкой и красивой; сквозь стеклянную дверь видна была комната с паркетным полом должно быть гостиная. От прежних цветников уцелели одни пионы и маки, которые поднимали из травы свои белые и ярко-красные головы; по дорожкам, вытягиваясь, мешая друг другу, росли молодые клёны и вязы уже ощипанные коровами. Было густо, и сад казался непроходным, но это только вблизи дома, где ещё стояли тополя сосны и старые липы-сверстницы уцелевшие от прежних аллей. Чем дальше вглубь, тем просторнее, и уже росли на просторе вишни сливы раскидистые яблони обезображенные подпорками и старые груши. Сад спускался к реке поросшей зелёным камышом ивняком. Около мельничной плотины был плёс глубокий и рыбный, сердито шумела небольшая мельница, неистово квакали лягушки. На воде гладкой как зеркало изредка ходили круги да вздрагивали речные лилии потревоженные весёлой рыбой. Тихий плёс манил к себе, обещая прохладу и покой. *(А. Чехов)*

● Якую ролю ў тэксце выконваюць адасобленыя азначэнні?



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**418.** Прачытайце тэкст. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры адасобленых азначэннях.

— Дык вось, слухай, — пачаў бацька. Голас зрабіўся ў нечым падобны да голасу Барыса Рыгоравіча, калі той пачынаў расказваць ім, вучням, розныя эпізоды з гісторыі, не звязаныя са школьнай праграмаю. Такім голасам — шчырым і даверлівым — звычайна дзеляцца з блізкімі сябрамі чымсьці запаветным, дарагім, бы адкрываюць нейкую сваю таямніцу. — Калі з трынаццатага па васемнаццатае стагоддзе наша Беларусь была магутнай незалежнай дзяржавай, Вялікім княствам, калі асноўнай моваю была беларуская, калі мы мелі свае законы, сваё войска — у нас, як ні дзіўна, напачатку не было сваіх грошай, калі не лічыць малюсенькія срэбныя манеткі — дэнарыі — вагою менш за адзін грам. Толькі пазней змаглі наладзіць выпуск сваіх талераў, якія чаканіліся ў Гродне. Напачатку ж карысталіся манетамі іншаземнымі, «імпартнымі», якія пастаўляла ў Вялікае княства амаль уся Заходняя Еўропа, — шылінгамі, дукатамі, дырхемамі, гэтак званымі «чэшскімі грашамі»... І вось наступіла шаснаццатае стагоддзе — самае цяжкае для княства. Пачалася Лівонская вайна з Масковіяй і цягнулася з перапынкамі амаль дваццаць пяць гадоў; аднначасова мы вымушаны былі адбівацца ад шведаў і крымскіх татар. Спачатку нашы ваявалі ўдала, але ворагаў было куды больш. Да таго ж вайна спусташала казну. Тады Жыгімонт II Аўгуст, які стаяў на чале Княства, успомніў, што некалі яго маці, неапалітанская прынцэса Бона Сфорца, пазычала каралю Філіпу значную суму дукатаў, але вяртання доўгу не дачакалася, бо памерла. Натуральна, Жыгімонт запатрабаваў цяпер ад іспанскага караля гэтыя грошы. Кароль вярнуў, прычым частка доўгу была вернута талерамі іспанскага чакану.

— Вось адкуль яны ў нас, — прамовіла дзяўчынка. — А я думала, у нас заўсёды былі толькі царскія, рускія грошы. Калі мы з Кацяю разглядалі калекцыю, я думала, гэта ўсё замежныя манеты. Гэта ж дзе Іспанія, а дзе Беларусь!

— Беларусь, дачка, зусім не такая бедная і не такая простая, як многія, і не толькі дзеці, прывыклі лічыць, — заўважыў бацька, на гэты раз чамусьці з сумам у голасе.

*(А. Федарэнка)*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

● Што вы ведаеце пра гістарычных асоб, якія згадваюцца ў тэксце?

● Вызначце асноўную думку тэксту, яго тып і стыль.

● Падрыхтуйцеся да выбарачнага пераказу на тэму «Грошы, якімі карысталіся ў Вялікім княстве Літоўскім».

● Змест свайго тэксту дапоўніце ўласнымі звесткамі з гісторыі грашовых адзінак на Беларусі.

**419.** Выпішыце сказы з адасобленымі азначэннямі, зрабіце іх сінтаксічны разбор.

Зусім іншымі вачыма дзяўчынка пазірала на ўсё гэта цяпер, пасля расказу бацькі. Цяпер гэтая рачулка, і поле, і лес, і ўвогуле ўся зямля, па якой яны ехалі, уявілася ёй нібыта сейфам. Сейфам, які час ад часу адчыняе свае дзверы выпадковым людзям і дзецям. Дзецям — значыць, і ёй, Аксане!

І дзяўчынцы ўбачылася цёмная ноч... Шчарбаты месяц хаваецца ў аблокі... Крык савы... Прыглушаныя галасы, гучны трэск галінкі пад нагою... Стук рыдлёўкі аб штосьці... Гаршчок, аплецены паржавелым медным дротам, заліты зверху воскам... Бляск залатых манетаў, залітых слабым месячным святлом... *(А. Федарэнка)*

● Уявіце сябе ў ролі шукальнікаў скарбаў на зямлі Беларусі. Апішыце свае прыгоды.

● Чаму ў другім абзацы тэксту ў канцы сказаў стаіць шматкроп'е? Што перадае ім аўтар?

## § 55. Адасобленыя прыдаткі

**420.** Успомніце, што называецца прыдаткам. Назавіце ў сказах адзіночныя прыдаткі з паяснялынымі словамі, звярніце ўвагу на афармленне іх на пісьме.

1. На сінім небе-акіяне павіслі хмаркі-астраўкі. *(А. Астрэйка)* 2. Рупны Мінск-гаспадар працай славіцца плённай. *(Р. Барадулін)* 3. Пяюць дзяўчаты «Рэчаньку», і аж да небакраю мільёны сонц-сланечнікаў на полі расцвітае. *(М. Танк)* 4. Лятуць журавы на гару Арарат. *(П. Панчанка)* 5. Поле — вольны акіян — хараством квітнее сёння, дзе нядаўна рос дзірван. *(П. Трус)*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Адасобленыя прыдаткі выражаюцца адзіночнымі назоўнікамі і назоўнікамі з паясняльнымі словамі.

Прыдатак, які мае пры сабе паясняльныя словы, з’яўляецца р а з в і т ы м: *Бывалі дзеці ў Белавежы, **зубрыным царстве на зямлі**.* (А. Астрэйка)

У вусным маўленні адасобленыя прыдаткі аддзяляюцца паўзамі, а на пісьме — коскамі.

Заўсёды адасабляюцца:

1. Незалежна ад месца ў сказе развітыя і адзіночныя прыдаткі, якія адносяцца да асабовага займенніка: *Яна, **Валя**, таксама любіла чытаць кнігі.* (А. Васілевіч) *Ён, **унучак дзедаў**, сядзеў на возе.* (П. Трус)

2. Развіты прыдатак, калі ён адносіцца да агульнага назоўніка і стаіць пасля яго: *Касцы, **ваякі мірнай працы**, выходзяць з косамі на пляцы.* (Я. Колас) *На сяле праспявалі апошнія пеўні, **вешчуны блізкай зары і новага дня**.* (В. Каваль)

3. Развітыя і адзіночныя прыдаткі, калі яны адносяцца да ўласнага імя і стаяць пасля яго: *Ганна, **маці Лабановіча**, была жанчына добрая, працавітая, руплівая.* (Я. Колас) *У канцы ліпеня прыехаў зусім нечакана Іван Смоліч, **бацька Аленкі**.* (У. Караткевіч)

З а ў в а г і: 1. Перад уласным імем і агульным назоўнікам прыдатак адасабляецца, калі ён мае акалічнаснае значэнне ўступкі або прычыны: ***Вядомы майстар**, Васіль Макаравіч застаўся сціплым чалавекам.* (В. Хомчанка) — *Васіль Макаравіч застаўся сціплым чалавекам, хоць і быў вядомы майстар. **Весялун і спявака**, кравец любіў песні.* (К. Крапіва) — *Кравец любіў песні, таму што быў весялун і спявака.*

2. Прыдатак адасабляецца, калі ён звязваецца з азначаемым назоўнікам словамі ***па прозвішчы*** (***мянушцы, клічцы*** і інш.): *Міхась, **па мянушцы Барадаты**, сядзеў на лаўцы свайго дзеда.* (Г. Далідовіч)

**421.** Прачытайце сказы. Назавіце прыдаткі і ўмовы іх адасаблення.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

1. Малайцы бабры, нашых рэк гаспадары, вартавыя крыніц і куніц, і суніц, і лясоў, і ласёў, і птушыных галасоў. *(В. Вітка)* 2. Яно, ласяня, нечакана прачнуўшыся, пачула, што нехта сюды ідзе. *(Г. Далідовіч)* 3. Яны ўдваіх, сынок і маці, з двара ідуць у бок ракі. *(Я. Колас)* 4. Мой бацька, Васіль Максімавіч, быў адным з самых пісьменных мужчын у нашай вёсцы. *(В. Вітка)* 5. Ці ж яму, **гарэзе**, усядзець на месцы? *(Я. Брыль)* 6. На возеры ў лодцы сядзеў каваль, па мянушцы Мамай. *(Я. Колас)* 7. Вясковае хлапчаня, я ведаў тады Талстога толькі, здаецца, па замалёўцы пра зайца-русака, прачытанай мне бацькам. *(Я. Брыль)*

● Да выдзеленага слова падбярыце сінонімы.

● Вызначце адрозненне ў значэннях слоў *пісьменны* і *пісьмовы.* Спалучыце гэтыя словы з адпаведнымі назоўнікамі.

Прыдатак можа звязвацца з назоўнікам ці займеннікам, да якога адносіцца, злучнікамі ***як, ці, або.***

Адасабляюцца прыдаткі:

1. Са злучнікам ***як,*** калі яны маюць дадатковае адценне прычыны: *Сцяпана,* ***як смелага салдата,*** *часта пасылалі ў разведку.* (М. Паслядовіч) Параўн.: *Сцяпана часта пасылалі ў разведку, бо ён быў смелы салдат.*

З а ў в а г а. Калі злучнік ***як*** мае значэнне ‘ў якасці’, то прыдатак коскамі не выдзяляецца: *У наш час шырока выкарыстоўваецца камень як будаўнічы матэрыял.* («Звязда») — Камень і ёсць будаўнічы матэрыял. *Ліда як сакратар сходу першая села за стол.* (Б. Сачанка) — Ліда і была, з’яўлялася сакратаром сходу.

2. Са злучнікамі ***ці, або,*** калі прыдатак мае ўдакладняльнае значэнне: *Чорны бусел, ці інакш бацян, любіць глуш і векавыя нетры.* (В. Гардзей)

На пісьме адасобленыя прыдаткі могуць выдзяляцца працяжнікамі, калі ім надаецца асаблівае значэнне і пры вымаўленні яны аддзяляюцца ад паясняльнага слова больш доўгай паўзай: *Светлыя хмаркі —* ***дзеткі прастору*** *— ціха па небе плывуць.* (Я. Колас) *Дадому з зімоўкі далёкай ляцяць нашы госці —* ***шпакі.*** (М. Хведаровіч)


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**422.** Спішыце сказы, выдзеліце, дзе трэба, прыдаткі знакамі прыпынку, падкрэсліце іх хвалістай лініяй.

1. Я думаю, што ўсе мы людзі беларускай зямлі не сказалі яшчэ таго слова ўдзячнасці такім волатам айчыннай літаратуры, як Пімен Панчанка, Максім Танк, Васіль Быкаў, Янка Брыль, якога яны заслугоўваюць. *(С. Законнікаў)* 2. На дварэ негр-кухар або «кок», як усюды завуць кухараў, зварыў ужо казан* чорнага варыва з бобу. *(Я. Маўр)* 3. Зялёнаю хваляй ракі гайдаецца жыта краса Беларусі калоссем цалуе блакіт. *(П. Глебка)* 4. Відаць, ён гэты боль вярнуў яе да прытомнасці. *(А. Васілевіч)* 5. Васька Жукаў чатырнаццацігадовы хлопчык аддадзены тры месяцы таму назад у рамеснае абутковае вучылішча, вярнуўшыся з работы, сеў у куток і пачаў пісаць. *(Я. Маўр)* 6. Самы старэйшы сын Міця радзіўся яшчэ на дзедавым котлішчы*. *(І. Навуменка)* 7. Яна прырода натуральна ўпрыгожыла столь і сцены падземнага палаца сваімі скарбамі. *(В. Вольскі)* 8. Непадалёк ад лясных рэчак выводзіць свае чароўныя трэлі сціплы начны спявак салавей. *(В. Вольскі)* 9. У гэтым жа годзе папаўняецца сям'я Ельскіх: нараджаецца любіміца бацькоў дачка Аляксандра або, як яе ласкава называюць, Алеся. *(В. Кушнер)* 10. Як правінцыяла ён пракаціў мяне з сталічным фасонам і на фаэтоне — ад вакзала да гасцініцы «Бельгія» *(Я. Скрыган)*

- Зрабіце сінтаксічны разбор 3-га сказа.
- Параўнайце род назоўніка *боль* у беларускай і рускай мовах, дапасуйце да яго прыметнікі. Прывядзіце прыклады на адпаведную з'яву.

**423.** Спішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку.

1. Скарына доктар **лекарскіх** навук у доўгай вопратцы на вежы сочыць зоры. *(М. Багдановіч)* 2. Усё сваё жыццё жаўна ці чорны дзяцел праводзіць на ствалах дрэў і ў дупле. *(В. Вольскі)* 3. Ён прыгожы наш Мінск і ў звычайныя будзённыя дні і вечары, але цяпер, пад Новы год, ён прыхарошаны яшчэ больш. *(Т. Хадкевіч)* 4. Стары каваль па прозвішчы Дубовік гартаваў сякеру. *(П. Пестрак)* 5. Міхал з Антосем як старыя займалі месцы канцавыя. *(Я. Колас)* 6. Старыя сябры і прыяцелі Турсевіч і Лабановіч **размясціліся** ў кватэры найлепшым чынам. *(Я. Колас)*

- Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленых слоў.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**424.** Прачытайце ўзор даверанасці, знайдзіце прыдаткі, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Даверанасць.

Я, Азевіч Алеся Барысаўна, давяраю Дубко Вінцуку Іванавічу атрымаць у паштовым аддзяленні № 134 г. Мінска адрасаваную мне бандэроль (паведамленне № 5).

13 сакавіка 1997 г.

А. Б. Азевіч.

Подпіс А. Б. Азевіч сведчу.

Дырэктар СШ № 3 г. Полацка П. А. Некрашэвіч.

● Запомніце форму напісання даверанасці і напішыце свой варыянт.

**425.** Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку. Вызначце стыль тэксту.

Распіска

Я Кісель Рыгор Аляксандравіч атрымаў пасведчанне аб заканчэнні 9 класаў.

15 чэрвеня 1997 г. Р. А. Кісель.

**426.** Уявіце, што вы паступаеце ў вучылішча (тэхнікум ці педагагічны каледж) і вам патрэбна напісаць аўтабіяграфію. Карыстаючыся ў якасці ўзору дадзеным пачаткам, коратка напішыце аўтабіяграфію.

Я, Лісіца Ганна Генадзьеўна, нарадзілася 25 верасня 1983 года ў горадзе Ліда Гродзенскай вобласці. Мая маці, Лісіца Вольга Паўлаўна, працуе медыцынскай сястрой у дзіцячай паліклініцы. Бацька, Лісіца Генадзь Мікалаевіч, інжынер-энергетык. Мой брат, Лісіца Мікалай, студэнт Белдзяржуніверсітэта.

● Назавіце прыдаткі ў гэтым тэксце і ў напісанай вамі аўтабіяграфіі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў вашым тэксце.

**427.** З двух простых сказаў складзіце адзін, зрабіўшы выказнік другога сказа прыдаткам да дзейніка першага.

Узор. *Марфалогія вывучае формы слоў. Марфалогія — раздзел навукі аб мове. — Марфалогія, раздзел навукі аб мове, вывучае формы слоў.*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

1. Азначэнне можа быць адасобленым. Азначэнне — даданы член сказа. 2. Адасобленыя азначэнні могуць быць выражаны прыметнікамі, дзеепрыметнікамі, назоўнікамі. Адасобленыя азначэнні — гэта члены сказа, якія выдзяляюцца па сэнсе з дапамогай інтанацыі. 3. Прыдатак таксама можа быць адасоблены. Прыдатак — гэта разнавіднасць азначэння, якое выражана назоўнікам і дае другую назву прадмету.

**428.** Вызначце, у якіх выпадках прыдатак са злучнікам ***як*** мае значэнне прычыны і выдзяляецца коскамі (у гэтым выпадку злучнік можна апусціць). Чым можна замяніць злучнік ***як*** у тым выпадку, калі спалучэнне з ім не адасабляецца?

1. Мой брат як лепшы фізік у класе пойдзе на раённую алімпіяду. 2. Мой брат вядомы як лепшы фізік восьмага класа. 3. Яго залічылі ў брыгаду як слесара-наладчыка. 4. Як вайсковец ён разумеў, што так рабіць нельга. 5. Такі гатунак бульбы як самы скараспелы высаджваюць яшчэ ў маі.

● Запішыце тры сказы, падкрэсліваючы прыдаткі са злучнікам ***як*** і выдзяляючы іх, дзе трэба, коскамі.

**429.** Спішыце тэкст, расстаўляючы знакі прыпынку. Знайдзіце азначэнні і прыдаткі. Скажыце, чым яны выражаны і чаму адасабляюцца ці не адасабляюцца.

Нізкія рукой падаць хмары пахнулі вугальным дымам. А можа гэта і быў дым. Яго несла варочала цягнула над Мікалаеўскім вакзалам над плошчай над завулкамі тупікамі над горадам над усім светам.

Менавіта ў такі дзень, гнілы лютаўскі дзень 1862 года, прыехаў у Маскву будучы камісар паўстанцаў Ніжняга Прыдняпроўя князь Алесь Загорскі з сябрам Мсціславам Маеўскім старым «дзядзькам» Кірдуном (а па прозвішчы «Халява») і дзядзькаваным* сваім братам вольнаадпушчанікам Кандратам Кагутом. *(У. Караткевіч)*

Адасобленыя прыдаткі падкрэсліваюць прымету, вылучаюць яе на першы план. Параўн.:

| | |
|---|---|
| *— Саханюк,* ***тутэйшы педагог.*** *Будзьце ласкавы, зніміце паліто, сядайце.* (Я. Колас) | *— Тутэйшы педагог Саханюк. Будзьце ласкавы, зніміце паліто, сядайце.* |



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

*На сходзе выступіў Мікалай Фёдаравіч,* ***малады інжынер.***

*На сходзе выступіў малады інжынер Мікалай Фёдаравіч.*

Асабліва экспрэсіўнымі з'яўляюцца адасобленыя прыдаткі, што адносяцца да асабовых займеннікаў: ***Сын лесніка,*** *я сам з маленства любіў паліць касцёр, пасядзець ля вогнішча.* (І. Шамякін) *І вось перад ім стала яна,* ***Марына.*** (К. Чорны)

У творах мастацкай літаратуры шырока ўжываюцца развітыя прыдаткі з мэтай характарыстыкі персанажаў, апісання мясцовасці, пейзажу: *Вобраз мамы,* ***добрай, ненаглядная мамы,*** *не адступаўся ад Юркі.* (Я. Колас) *Адзін толькі лес,* ***нямы сведка гэтай праявы,*** *стаяў вакол густой сцяной і маўчаў.* (Я. Колас) *Гудуць вячэрняю парой дубы —* ***старыя бандурысты.*** (М. Танк) *Шэпча хвалямі ціха гуллівымі чараўніца —* ***прыгожая Прыпяць.*** (М. Чарот)

**430.** Прачытайце тэкст. Як вы лічыце, навошта Я. Брыль расказаў нам гэтую гісторыю? Вызначце тып і стыль тэксту, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Знайдзіце адасобленыя члены сказа, вызначце, якую ролю ў гэтым тэксце выконваюць адасобленыя прыдаткі.

Голас дзятла (бо стуканне — гэта ж не голас) я чуў толькі раз. Дзяцел той верашчаў, як парасятка, якое паднялі за заднюю нагу, толькі па-свойму верашчаў, пакуль мы не пачулі яго крык, а тады беглі, а потым меркавалі, як тут памагчы…

У ствале старой яліны, на чалавечы рост ад зямлі, было дупло. І залез ён туды, па справе ці ад дурасці, ну, а назад — ніяк. Дзірка з двара ўсярэдзіну звужалася, дупло было цеснае — не павярнуцца, не то што раздзёўбваць выхад адтуль. І ён, стракаты цесля, забыўся пра ўсю сваю самавітасць — заверашчаў.

Ніводная рука не лезла ў тую яловую пастку. <…> Мы былі калектыўна ў грыбах і невялікаю групаю далёка забрылі ад усіх астатніх і аўтобуса. Дзяцел крычаў. Яшчэ, відаць, з большага страху, убачыўшы нас. І мы як быццам


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

схамянуліся — убачылі, што з намі ёсць маленькі чалавек, які і бег не вельмі ззаду. Як ні напружваю памяць праз нейкіх дваццаць год, ніяк не ўспомню — быў гэта хлопчык ці была дзяўчынка. Хацелася б ведаць, як яна вырасла, тая дзіцячая ручка, і што яна робіць цяпер... Ды гэта, можа, і не важна, бо найважней — яна была, тая маленькая ручка, і я выразна бачу, як яна працягнулася да дупла, як дрыжала ад страху ды радасці, пакуль дзіця трымалі пад пахі, узняўшы на патрэбную вышыню, як яна, ручка, усё-такі пралезла ў дупло, як ён там матлашыўся, дзяцел, і пішчаў і як яго тая ручка, заўзятая і дастаткова моцная, выцягнула на свет без страт у апярэнні, як ёй хацелася птушку патрымаць, а можа, і забраць з сабою...

Ды дзяцел вырваўся і паляцеў.

Каб зноў ніколі не верашчаць, не клікаць нас, людзей, на дапамогу.

Каб толькі як быццам гулліва, але ж дзеля хлеба, упарта і майстравіта, абстукваць ствалы і галіны. *(Паводле Я. Брыля)*

- Растлумачце правапіс часціц у тэксце.
- Падбярыце сінонім да слова *цесля.*

## § 56. Адасобленыя дапаўненні

Дапаўненні, выражаныя назоўнікамі або займеннікамі ва ўскосных склонах з прыназоўнікамі ***акрамя, апрача, замест, за выключэннем,*** маюць удакладняльнае значэнне і заўсёды адасабляюцца. Такія дапаўненні паказваюць на ўключэнне ў лік ці выключэнне прадмета ці з'явы з ліку іншых або на замяшчэнне яго: ***Акрамя рыбы,*** *у рэчцы было багата ракаў.* (М. Лынькоў) *На свеце ўсё знойдзеш,* ***апрача бацькі і маці.*** (Прыказка) *На голых дрэвах,* ***замест лісця,*** *паклалі шэрань маразы.* (Я. Колас) *Усё лета,* ***за выключэннем некалькіх дзён,*** *Сымон працаваў на калгасных палях.* (К. Чорны)

З а ў в а г а. Дапаўненне з прыназоўнікам *замест* не адасабляецца, калі прыназоўнік мае значэнне 'за'. Параўн.: *Сёння Міхась дзяжурыў замест сябра* і *Сёння Міхась дзяжурыў за сябра.*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Адасабляюцца ўдакладняльныя спалучэнні, якія пачынаюцца словамі ***асабліва, нават, пераважна, у тым ліку, у прыватнасці, напрыклад*** і інш. Яны надаюць удакладненню сэнсавае адценне выдзяляльнасці, узмацняльнасці: *Многія,* ***асабліва мужчыны****, так і не вярнуліся з вайны.* (А. Асіпенка) *Ніхто,* ***нават вецер****, не кранае галін яблынь і груш у белай квецені.* (П. Пестрак) *Уперадзе каля самай дарогі стаяў лясок,* ***пераважна бярозавы****.* (Я. Колас)

Заўвага. Калі словы *асабліва, нават, пераважна* не маюць удакладняльнага значэння, перад імі коска не ставіцца: *Лес быў пераважна хваёвы.* (І. Шамякін) *Паветра было такое чыстае, што не мігацелі нават далёкія агні.* (У. Караткевіч) *Дзень быў асабліва цёплы.* (А. Якімовіч)

**431.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх адасобленыя дапаўненні з удакладняльным значэннем. З якімі прыназоўнікамі яны ўжытыя? Спішыце сказы, падкрэсліце адасобленыя ўдакладняльныя дапаўненні.

1. Не, у Марынкі, акрамя яе вонкавай прыгажосці, было нешта сваё, прыгожае ў натуры, што вабіла Паходню. *(Т. Хадкевіч)* 2. Апроч той зямлі і зямное арбіты, былі ў ім яшчэ і сузор’і адбіты. *(А. Куляшоў)* 3. Акрамя кучаравых бярозак, на ўзгорку расла высокая сухаверхая хвоя. *(З. Бядуля)* 4. Раней існавала памылковае ўяўленне аб тым, быццам на Беларусі няма нічога, апрача торфу. *(В. Вольскі)* 5. Увесь дзень, за выключэннем перапынку на абед і снеданне, быў прызначан агляду калгаснай гаспадаркі. *(Я. Колас)*

- Зрабіце разбор слова *сухаверхі* па саставе і растлумачце спосаб яго ўтварэння.
- Назавіце ў слове *кучаравы* няпарныя гукі. Паводле якіх прымет яны няпарныя?

**432.** Спішыце сказы, пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку і растлумачце іх.

1. Мы адліць усё патрапім апроч звону векавога таго звону, які ўсе мы роднай мовай завём. *(М. Танк)* 2. Над Беларуссю ноч была, пажар гуляў замест заранкі. *(П. Броўка)* 3. У той вечар для Косціка апрача кніг нічога не было


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

даражэйшага на свеце. *(С. Александровіч)* 4. Ад зямлі награваецца паветра асабліва яго ніжнія слаі. *(А. Звонак)* 5. Глуха, непрытульна ў лесе зімой асабліва ў снежную замець. *(М. Лынькоў)* 6. Даўно ўжо не было такога непастаяннага надвор'я, як сёлета: апошнія часы за выключэннем некалькіх марозных дзён неба хмурнае і часта ідуць дажджы. *(У. Караткевіч)*

● Зрабіце марфалагічны разбор слова *награваецца.*

**433.** Запішыце сказы, устаўляючы замест кропак патрэбныя па сэнсе ўдакладняльныя дапаўненні.

1. Увесь месяц ... ішлі халодныя дажджы. 2. Мая старэйшая сястра ... захапляецца бальнымі танцамі. 3. З бакоў ... вуліца абсаджана ліпамі. 4. Увесь дзень ... мы працавалі ў бібліятэцы. 5. У лесе ... многа суніц. 6. Усё іншае ... доктар высвятляў пасля агляду хворага.

Для даведкі: *акрамя аэробікі; у тым ліку і прозвішча; апрача чарніц; за выключэннем перапынку на абед; апрача садоў і кветнікаў; за выключэннем сямі-васьмі дзён.*

**434.** Складзіце і запішыце сказы з адасобленымі дапаўненнямі, якія ўводзяцца ў сказ пры дапамозе спалучэнняў слоў *за выключэннем адсутных, замест запланаванай экскурсіі ў Мірскі замак, апрача футбола.* Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складзеных вамі сказах.

**435.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце адасобленыя дапаўненні. Спішыце, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку,услых каменціруючы іх пастаноўку.

Вясковым хлапчукам раней тыя кар'еры давалі занятак на цэлае лета: яны муцілі ваду і рукамі лавілі рыбу. Чорныя ад тарфяной «юшкі» як балотныя чэрці пакідалі кар'еры і беглі да рэчкі, што вілася непадалёк, мыцца. Пад вечар шчаслівыя і задаволеныя ўловам вярталіся дадому.

Пайшоў чацвёрты год, як вялікая плаціна перакрыла рэчку і кар'еры паступова схаваліся пад суцэльнай вадою ўтварыўшы штучнае возера. У ім апроч акунёў ды шчупакоў развялі карасёў карпаў і нават завезлі моладзь фарэлі або стронгі гэтай царскай рыбы з чырвонымі зорачкамі на баках.

*(М. Ваданосаў)*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## § 57. Адасобленыя акалічнасці

**436.** Назавіце ў сказах дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя словазлучэнні. Адкажыце, якія словы яны паясняюць. Якое дзеянне — галоўнае ці дадатковае — яны выражаюць? Якімі членамі сказа з'яўляюцца? Паназірайце за знакамі прыпынку пры іх.

1. Нельга не зачараваецца, гледзячы на высокі і стройны дуб. Каля трыццаці метраў увысь цягнецца гонкі ствол без адзінага сучка і дупла, а потым раскідваецца пяццю вялікімі сукамі, ствараючы пышную зялёную шапку. *(Т. Хадкевіч)* 2. Сонца ідзе на схіл павольна, не спяшаючыся, як бы шкадуючы развітвацца з бязмежнасцю зямлі і неба. *(І. Навуменка)* 3. Плывуць над Волгай хмары нізка, маланкі тушачы ў вадзе. *(С. Грахоўскі)* 4. Раскінуўшы крылы, чайка планіруе ў паветры, выглядаючы ў вадзе здабычу. *(В. Вольскі)* 5. То скачучы з купіны на купіну, то павольна ідучы па вузкіх дрыгвяністых сцежках, доўга хадзіў Мікола па балоце. *(К. Крапіва)*

**437.** Перабудуйце сказы так, каб выдзеленыя дзеясловы-выказнікі сталі дзеепрыслоўямі. Ці будуць захоўваць гэтыя дзеепрыслоўі значэнне дадатковага дзеяння? Чаму? У якіх сказах — з асабовай формай дзеяслова ці з дзеепрыслоўямі — перадаецца больш хуткае і напружанае дзеянне?

1. Кіраўнікі дзяржаў **падпісалі** дагавор і правялі прэс-канферэнцыю. 2. Дрэвы застылі ў цішыні і вяршалінамі **паказвалі** на яркія начныя зоркі. 3. **Прымасціўся** на елачцы дрозд і высвіствае свае песні. 4. Ліса **выбегла** з нары, агледзела наваколле і памчалася ў сасоннік. 5. Самалёт **адарваўся** ад зямлі і хутка схаваўся ў цемені ночы.

А д а с о б л е н ы я  а к а л і ч н а с ц і часцей выражаюцца адзіночнымі дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі. Яны абазначаюць дадатковае дзеянне ў адносінах да другога (асноўнага) дзеяння, якое выражана дзеясловам-выказнікам. У сказе яны выконваюць ролю акалічнасцей са значэннем: спосабу дзеяння: ***Не змаўкаючы,*** *гула завіруха.* (І. Мележ); часу: *Добра ў садзе хадзіць,* ***сустракаючы сонечны ранак.*** (П. Панчанка); прычыны: ***Пагойдваючыся ад ветру,*** *дрэвы скрыпелі.*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

(П. Галавач); мэты: *Каля хат,* ***чакаючы бацькоў****, стаялі дзеці.* (І. Мележ); умовы: ***Набраўшыся смеласці****, можна лёгка выканаць нават складаную работу.* (С. Баранавых); уступкі: ***Не зважаючы на дождж,*** *мы шпарка крочылі па лясной дарозе.* (З. Бядуля)

Адасобленыя акалічнасці ў вуснай мове выдзяляюцца інтанацыйнымі паўзамі: павышаным тонам, калі стаяць у пачатку ці сярэдзіне сказа, і паніжаным тонам, калі імі заканчваецца сказ. На пісьме адасобленыя акалічнасці выдзяляюцца коскамі: ***Паабедаўшы,*** *// касцы паселі ў цень пад разложыстым дубам.* (М. Машара) *Найкол пляменнікі сядзелі, на дзядзьку пільна ўсе глядзелі, як ён, //* ***рукавы закасаўшы,*** *// на тарцы шоргаў, //* ***шапку зняўшы.*** (Я. Колас)

На пісьме дзеепрыслоўныя звароты, а таксама адзіночныя дзеепрыслоўі, як правіла, адасабляюцца і выдзяляюцца коскамі: *Бяроза зламалася, але не ўпала,* ***затрымаўшыся на суседніх дрэвах.*** (У. Караткевіч) *Побач з хатай,* ***прыкрываючы яе ад летняга сонца,*** *красуецца высокая разложыстая груша.* (Я. Колас)

Заўсёды адасабляецца акалічнасць са значэннем уступкі, калі яна выражана назоўнікам з прыназоўнікам ***нягледзячы на:*** ***Нягледзячы на трывожны час,*** *рынак жыў сваім звычайным жыццём.* (А. Якімовіч)

Не адасабляюцца:

а) адзіночныя дзеепрыслоўі, якія сваім значэннем набліжаюцца да прыслоўяў спосабу дзеяння: *Воўк авечку бярэ* (як?) ***не выбіраючы.*** (Прыказка) *Песні салаўіныя льюцца* (як?) ***не сціхаючы.*** (П. Глебка);

б) фразеалагізмы, у складзе якіх ёсць дзеепрыслоўі: *Трэба быць аптымістам і жыць* ***не апускаючы рук.*** (М. Хведаровіч) *Не прывыкла мая бабуля сядзець* ***склаўшы рукі.*** (А. Васілевіч)

З а ў в а г і: 1. Калі дзеепрыслоўны зварот адносіцца да аднаго з аднародных выказнікаў, звязаных адзіночнымі злучнікамі ***і, ды*** (у значэнні ***і***), ***ці, або,*** то коска перад гэтымі злучні-



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

камі не ставіцца: *Уварваўшыся ў пакой, вецер смела зашалясцеў на стале паперамі, скінуў некалькі лістоў на падлогу і, забіўшыся пад шпалеры, захадзіў там, зашастаў.* (А. Савіцкі) *Возьме наш хлопец жалеза кавалак ды, кінуўшы ў горан, нагрэе ўдала.* (П. Броўка)

2. Перад злучнікам ***і***, які звязвае два дзеепрыслоўныя звароты ці адзіночныя дзеепрыслоўі, коска не ставіцца: *Сонца падымалася вышэй, рупліва аглядаючы зямлю* ***і*** *рассыпаючы над ёй святло і цеплыню.* (Т. Хадкевіч)

Адасобленыя акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўнымі зваротамі, можна перабудаваць у даданыя сказы з адпаведным значэннем. Гэта дае магчымасць выбраць той ці іншы спосаб перадачы аднолькавага сэнсу ў залежнасці ад кантэксту. Параўн.: ***Рана ўстаўшы****, многа зробіш.* (Прыказка) — ***Калі рана ўстанеш,*** *многа зробіш.*

Сказы з дзеепрыслоўнымі зваротамі ўжываюцца ва ўсіх стылях кніжнай мовы.

**438.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль і тып. Чаму ён не падзелены на абзацы? Назавіце адасобленыя дзеепрыслоўныя звароты і дзеясловы-выказнікі, з якімі яны звязаны. Якімі членамі сказа з'яўляюцца дзеепрыслоўныя звароты? Растлумачце знакі прыпынку пры іх.

У расчыненыя дзверы плыла вільготная свежасць. На дварэ бушаваў дождж. Пакой раз-пораз заліваўся мігатлівым водбліскам маланкі... Але навальніцы ўлетку імклівыя і кароткія. Хутка хмара, аддаўшы зямлі належнае, пасвятлела, разарвалася на шматкі, якія паступова раставалі ў небе. Дождж парадзеў, неўзабаве з блакітнага прасвету выглянула сонца, і над Дзвіной, злучаючы яе берагі, паўстала казачна яркай дугой у сваіх сямі колерах вясёлка. Знізу яна прасвечвалася, і круча на тым баку з кустамі і маладым сасняком на схіле была быццам падфарбаваная лёгкімі, паўпразрыстымі **мазкамі** мастака. *(Паводле Т. Хадкевіча)*

- Скажыце, ці можна ўсе дзеепрыслоўі ў гэтым тэксце замяніць адпаведнымі дзеясловамі-выказнікамі. У якіх сказах гэта магчыма зрабіць, а ў якіх — нельга?
- Вызначце значэнні слоў *на дварэ, на дворы.* Складзіце з імі сказы.
- Падбярыце сінонімы да выдзеленага слова.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**439.** Прачытайце, знайдзіце дзеепрыслоўі з залежнымі словамі.

Прыбралася страчаючы восень маладая рабінка змяніўшы свой сінявата-зялёны ўбор на ружавата-ліловы. І над ёю светлым надвячоркам дробна кішаць сабраўшыся ў прадаўгаваты эліпсавы круг рудаватыя камары. *(В. Адамчык)*

- Спішыце тэкст, расстаўце знакі прыпынку. Растлумачце з дапамогай схем іх пастаноўку.

**440.** Запішыце верш па памяці.

Назаўсёды зразумей,
Слова — не верабей.
Перад людзьмі сябе не плямячы,
Не гавары, не цямячы
Таго, што ты гаворыш:
Выпусціш — не зловіш.

*В. Вітка*

- Раскажыце пра пастаноўку знакаў прыпынку пры адасобленых акалічнасцях спосабу дзеяння.

**441.** Спішыце, раскрыйце дужкі і пастаўце знакі прыпынку. Падкрэсліце адасобленыя акалічнасці. Графічна выдзеліце суфіксы дзеепрыслоўяў.

1. Ні пра што *(не)* забыўшы ад той гераічнай і грознай пары больш за ўсё ты [Радзіма] вартуеш спакой, больш за ўсё цэніш міру дары. *(Н. Гілевіч)* 2. Скончыўшы навучанне і прагледзеўшы работы вучняў Лабановіч часта падводзіў падрахункі дню. *(Я. Колас)* 3. Жураўлі праляталі над полем забіраючы лета з сабой. *(Я. Колас)* 4. Сонца зрабіўшы свой *(што)* дзённы кругабег апусцілася зусім нізка і стаміўшыся пачало хіліцца на захад. *(Б. Сачанка)* 5. Жыву *(не)* трацячы надзей, бо верыцца ў дабро людзей. *(С. Грахоўскі)* 6. Ляўчук прыслухоўваючыся да наваколля доўга нёс камандзіра праз маўклівы насцярожаны лес. *(В. Быкаў)* 7. Дзедава вёска, Падвалока, стаіць на паўднёвым схіле *(не)* шырокай паўвыспы, якая ўразаючыся ў возера доўгай касой падзяляе яго на дзве затокі. *(Я. Брыль)*

- Зрабіце фанетычны разбор слоў *схіл, дзве.*
- Выпішыце з 2-га сказа словазлучэнні.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**442.** Спішыце сказы, раскрываючы дужкі і расстаўляючы, дзе трэба, знакі прыпынку. Падкрэсліце дзеепрыслоўныя звароты як члены сказа.

1. Я вярнуўся ў пакой і *(не)* запальваючы свечкі сеў на ложак. *(У. Караткевіч)* 2. Чалавек аднойчы прайшоўшы праз пажар вайны будзе помніць яе да скону год і да апошняга дня зычыць дзецям сваім не бачыць яе. *(А. Асіпенка)* 3. Падсунуўшыся бліжэй да акенца Наста цяпер усё добра бачыла, што робіцца ля пераезда. *(А. Савіцкі)* 4. Сады распускаюцьліcткі маладыя загледзеўшыся ў ціхія люстры азёр. *(П. Прыходзька)* 5. Зверына пахаваўшыся ў бярлогі і норы спіць чакаючы вечара, каб змрокам прачнуцца і ісці на пажыву. *(А. Чарнышэвіч)*

- Разбярыце па членах сказа 3-ці сказ.
- Зрабіце марфалагічны разбор слова *падсунуўшыся.*

**443.** Спішыце сказы. Пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Растлумачце, чаму ў адных выпадках акалічнасці адасабляюцца, у другіх — не адасабляюцца. Раскрыйце дужкі і растлумачце правапіс слоў.

1. Іван Васільевіч ішоў *(не)* спяшаючыся. *(І. Шамякін)* 2. Мікалай і Алімпіяда рассунулі верхняе жэрдзе ад логу ў плоце і пералезшы праз яго ішлі мяжой адно за адным. *(І. Пташнікаў)* 3. Нягледзячы на недалёкую восень лес жыў тым актыўным, багатым жыццём, якое заўсёды бывае ў канцы лета. *(Б. Сачанка)* 4. Некаторы час яна сядзіць склаўшы рукі на каленях. *(І. Капыловіч)* 5. Я *(не)* пярэчыў, *(не)* прывык сядзець склаўшы рукі. *(В. Шырко)* 6. Дзед Гарох замоўк як мыла з'еўшы. *(В. Карамазаў)* 7. Жылі сабе там людзі на лес гледзячы, *(ні)* хто іх *(не)* чапаў, *(ні)* хто ім *(ні)* якае бяды *(не)* рабіў. *(З народнага)* 8. Дзед Талаш і Мартын Рыль прылеглі *(не)* раздзяваючыся. *(Я. Колас)*

- Вызначце агульныя марфалагічныя прыметы слоў *з'есці— з'еўшы, пазіраць—пазіраючы.*
- Прывядзіце прыклады слоў, якія адпавядаюць схемам:





Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**444.** Спішыце сказы. Пастаўце, дзе трэба, коскі. Падкрэсліце неадасобленыя акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўямі, якія маюць значэнне прыслоўяў, і дзеепрыслоўнымі зваротамі, якія сталі ўстойлівымі фразеалагічнымі выразамі.

1. **Па-над** прасторамі ракі гудуць прачнуўшыся гудкі. *(М. Танк)* 2. Ніколі ж не быў, а то прыляцеў на ноч гледзячы. *(І. Грамовіч)* 3. Яшчэ **дзесятак** метраў быстрыні, і рукавы рэчкі вырваўшыся **з-за** вострава на шырыню злучыліся. *(Я. Брыль)* 4. Апрача таго, **венцяроўцы** лавілі шмат рыбы, білі розную **зверыну**, птушак і жылі прыпяваючы. *(М. Чарот)* 5. Мікола маўчаў зубы сцяўшы. *(Ц. Гартны)* 6. Цвітуць абняўшыся дзве вішні ля акна. *(М. Танк)* 7. Сцёпка сядзеў угнуўшы галаву. *(Я. Колас)* 8. Ён ужо не прыглядаўся і не прыслухоўваўся так уважна, а ішоў спакойна трохі апусціўшы галаву і **памахваючы** дубчыкам у правай руцэ. *(К. Крапіва)*

- Вызначце з дапамогай тлумачальнага слоўніка значэнні слова *рукаў*. Якое гэта слова? Абгрунтуйце сваю думку. Прывядзіце прыклады такога тыпу слоў.
- Растлумачце правапіс выдзеленых слоў.
- Разбярыце па саставе словы *цвісці, цвітуць, адцвіўшы.*

**445.** Складзіце сказы, у якіх акалічнасці выражаліся б наступнымі фразеалагізмамі. Вызначце віды гэтых акалічнасцей. Вусна растлумачце значэнне фразеалагічных выразаў.

Не пакладаючы рук, паклаўшы руку на сэрца, вушы развесіўшы, заплюшчыўшы вочы.

**446.** Спішыце тэкст, расстаўляючы знакі прыпынку.

Вы спрабавалі калі-небудзь спаць седзячы прыціснуўшы спіну да мура або, лепей, да дрэва? Паспрабуйце. Вы пераканаецеся, што пачуццё падзення, якое вы часам адчуваеце лежачы пад цёплай коўдрай ёсць шостае пачуццё, што перайшло нам у спадчыну ад продка нашага малпы што яно было ёй неабходна, каб не ўпасці з дрэва. І седзячы ля дрэва вы ў сне будзеце падаць вельмі часта і адкрываць вочы і зноў засынаць. *(У. Караткевіч)*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**ЗАПОМНІЦЕ!** Каб вызначыць адасобленыя акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўнымі словазлучэннямі, неабходна: 1) бачыць сувязь дзеепрыслоўя з дзеясловам-выказнікам (дзеепрыслоўе часцей падпарадкоўваецца выказніку) і 2) знаходзіць словы, якія залежаць ад дзеепрыслоўя, г. зн. уваходзяць у склад дзеепрыслоўнага звароту.

**447.** Прачытайце сказы. Вызначце межы дзеепрыслоўных зваротаў. Растлумачце, якія варыянты пастаноўкі знакаў прыпынку магчымыя ў гэтых сказах. Як пры гэтым змяняецца сэнс выказвання?

1. Спартсмен бег прыгожа хутка абганяючы сапернікаў. 2. Гаварыў Віктар павольна расцягваючы словы. 3. Хлопчык спыніўся ў здзіўленні азірнуўшыся назад.

● Запішыце сказы парамі з улікам варыянтаў пастаноўкі знакаў прыпынку. Дзеепрыслоўныя звароты падкрэсліце. Якімі членамі сказа з'яўляюцца ў гэтых прыкладах дзеепрыслоўі? На якія пытанні яны адказваюць?

**448.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўямі, і развіце іх.

1. Абуўшыся заклапочаны Васіль выйшаў з хаты. 2. Ззяючы асыпаўся іней з верхавін елак. 3. Хвалі набягаючы з шумам адкатваліся назад. 4. Падсілкаваўшыся Пятро рушыў далей і яшчэ да цямна мінуў балота. 5. Пачырванеўшы ён не мог вымавіць ні слова.

● Запішыце сказы парамі, пастаўце знакі прыпынку і растлумачце іх.

● Разбярыце па саставе дзеепрыслоўі і дзеясловы першых трох сказаў.

**ЗАПОМНІЦЕ!** Пры замене аднародных дзеяслоўных выказнікаў канструкцыяй «дзеяслоў-выказнік + дзеепрыслоўнае словазлучэнне» (і наадварот) неабходна памятаць асаблівасці гэтых блізкіх, але не зусім аднолькавых па сэнсе канструкцый. Гэта магчымасць вылучэння асноўнага і дадатковага, пабочнага, дзеяння, а таксама выражэнне акалічнасных значэнняў у сказах з дзеепрыслоўным словазлучэннем і выражэнне раўнапраўнасці і незалежнасці дзеянняў у аднародных выказніках. Імкненнем


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

вылучыць галоўнае дзеянне, падкрэсліць яго дэталі і зрабіць усю фразу больш цэласнай і сціслай тлумачыцца, напрыклад, праўка наступнага сказа з першай рэдакцыі рамана І. Мележа «Мінскі напрамак»: *Ён глядзеў на яе валасы, што выбіліся з-пад хусткі, на шыю, на бесклапотны, даверлівы ў сне твар і тут упершыню адчуў, што шчасце яму без яе немагчыма.* У другой рэдакцыі сказ мае такую форму: *Гледзячы на яе валасы, што выбіліся з-пад хусткі, на шыю, на бесклапотны, даверлівы ў сне твар, ён адчуў, што шчасце без яе немагчыма.*

**449.** Перабудуйце сказы, зрабіўшы адзін з дзеясловаў-выказнікаў дзеепрыслоўем-акалічнасцю.

У з о р. *Касец стаміўся і прысеў на валок духмянага сена. — Касец, стаміўшыся, прысеў на валок духмянага сена.*

1. Слаба мігцелі і адлюстроўваліся на гладзі возера першыя зоркі. 2. Чароўны пах язміну ўрываецца праз расчыненыя вокны і запаўняе актавую залу. 3. Калі памыляешся, не бойся прызнаць сваю памылку. 4. Калі рана ўстанеш, многае паспееш. 5. Алеся стаяла ля калодзежа і паласкала бялізну.

**450.** У сказах замяніце дзеепрыслоўем спачатку першы дзеяслоў, затым — другі. Як змяняецца сэнс сказа? Ці заўсёды магчымая такая замена? Чаму?

1. Павел схапіў плашч-накідку і выбег пад дождж. 2. Дзеці з нецярпеннем чакалі бацьку і прыслухоўваліся да кожнага кроку ў двары. 3. Пятрусь Рыбка зацікавіўся біялогіяй і стаў наведваць батанічны сад. 4. Паляўнічы азірнуўся і ўбачыў, як мільгануў і знік звярок.

## § 58. Адасобленыя ўдакладняльныя акалічнасці

**451.** Прачытайце сказы, вызначце, у якіх сказах акалічнасці з’яўляюцца аднароднымі, а ў якіх — удакладняюць змест іншых акалічнасцей. Якое значэнне ўдакладняецца ў сказах?

1. Над зямлёй, над жоўтымі пяскамі сонца разгараецца ярчэй. *(А. Звонак)* 2. І ў садзе, і на рацэ стаяла дзівосная


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

цішыня. *(Л. Кулакоўскі)* 3. На ўзгорку, між ліпавага парку, бялеў двухпавярховы будынак. *(П. Броўка)* 4. Там, за поплавам, на пагорку, купалася ў сонечным святле вёска. *(А. Асіпенка)* 5. Увесь гэты дзень, цэлы вечар і ноч не меў Максім супакою. *(Я. Колас)* 6. Учора, пад вечар, сыпануў дробны і халодны дождж. *(І. Шамякін)* 7. У маі, на Міколу, помню я, дарыла аднакласніку Міколу тры гронкі бэзу вучаніца школы, Анюта — сямікласніцы імя. *(М. Аўрамчык)*

- Разбярыце па саставе слова *разгараецца.*

**452.** Да падкрэсленых членаў сказа падбярыце па сэнсе ўдакладняльныя акалічнасці месца і часу. Запішыце, выдзяляючы ўдакладняльныя акалічнасці коскамі.

1. Недалёка ад Мінска (дзе іменна?) нарадзіўся класік беларускай літаратуры Янка Купала. 2. Раніцай (калі іменна? у колькі гадзін?) па радыё перадавалася фізічная зарадка для школьнікаў. 3. Тут (дзе іменна?) захаваўся маленькі пакойчык-келля, дзе святая Еўфрасіння Полацкая пражыла свае апошнія гады.

У сказе могуць быць дзве і нават тры акалічнасці, якія адказваюць на адно і тое ж пытанне, але не з'яўляюцца аднароднымі; яны лічацца ўдакладняльнымі, паколькі кожная наступная акалічнасць канкрэтызуе змест папярэдняй, абмяжоўвае і звужае яе значэнне: ***Дзесьці высока-высока, за самымі хмарамі,*** *курлыкалі журавы.* (М. Лынькоў) ***Там, удалечыні, каля лесу,*** *раскінулася прырэчная лагчына.* (Ц. Гартны)

Адасобленыя ўдакладняльныя акалічнасці выражаюцца назоўнікамі з залежнымі словамі ці без іх і прыслоўямі: *Там,* ***за дуброваю,*** *жнейкі-красуні звоняць сярпамі сталёвымі.* (П. Трус) *Воддаль,* ***пад стромкімі бярозамі,*** *цэлымі сямейкамі растуць мухаморы.* (З. Бядуля) *Будынак упрыгожылі хораша,* ***па-святочнаму.*** (Т. Хадкевіч)

Удакладняльнымі членамі сказа часцей выступаюць акалічнасці месца, часу, радзей — спосабу дзеяння: *Тут,* ***за рэчкай,*** *адразу пачыналася поле.* (К. Чорны) *Учора,*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

***раніцай,** дзеці хадзілі ў грыбы.* (Б. Мікуліч) *Алена гаварыла хутка, **слова за словам.*** (П. Пестрак)

Удакладняльныя акалічнасці выдзяляюцца паўзамі і вымаўляюцца павышаным тонам. На пісьме яны выдзяляюцца коскамі:

*Тут, // **на палянцы,** // **сярод цёмнага лесу,** панавала незвычайная цішыня.* (З. Бядуля)

З а ў в а г а. Калі другая акалічнасць мае больш шырокае значэнне, чым першая, то адасабленне не адбываецца: *Зусім інакш ішло жыццё ў сасняку **за горадам,** дзе быў штаб фронту.* (І. Мележ)

Адасобленыя ўдакладняльныя акалічнасці часцей ужываюцца ў мастацкім і публіцыстычным стылях, радзей — у гутарковым.

**453.** Прачытайце тэкст. Вызначце, ці ёсць у ім удакладняльныя акалічнасці. Чым яны адрозніваюцца ад аднародных акалічнасцей?

Поле ўрадлівае працы не шмат патрабуе,
Толькі ў жніво ды ў касьбу і на ніве, і ў лузе
Бела ад хустак, намітак, кашуль і бравэрак.
Па сенажацях, гаях і па ялавых гонях
Коні пасуцца, а скрозь на прыволлі, на ўзлессі,
Статак скарбовы амаль што купаецца ў травах.

*М. Гусоўскі*

**454.** Прачытайце. Выпішыце сказы з удакладняльнымі акалічнасцямі. Вызначце, чым яны выражаны, што абазначаюць.

1. Тут, у вас, я штовечар хаджу ў кавярню. *(Г. Багданава)* 2. Нібы пажар б’е крыніцай там, на небасхіле. Сноп праменняў, пышна ўзняты, сее бляск-чырвонцы... *(Я. Колас)* 3. Са мною там, у цырку, адбылося нешта дзіўнае. *(Г. Багданава)* 4. Горка, узахлёб, плакаў над нябожчыкам стары добры Дубатоўк. *(У. Караткевіч)* 5. Міхась прыйшоў на луг позна, гадзін у дзесяць. *(М. Ваданосаў)* 6. Перада мною на стале, сярод іншых кніжак, пяць аднолькава афармленых важкіх тамоў, быццам пяць самавітых, напакаваных незвычайным скарбам куфраў. Я часта, як цяпер во, бяру


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

адзін з іх у рукі, адкрываю вокладку-вечка і... папраўдзе, не папракайце таго ў гультайстве, у чыіх руках убачыце кнігу, напісаную Янкам Брылём. *(У. Ягоўдзік)*

**455.** Спішыце, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Зрабіце разбор двух апошніх сказаў па членах сказа.

1. У тую ноч за возерам па сухой імшары затрубіў лось б'ючы капытом прымоклую зямлю. *(І. Чыгрынаў)* 2. Міхал ідзе туды на поле, дзе Нёман выгнуўшыся дужкай абводзіць лес прыгожай стужкай. *(Я. Колас)* 3. Недзе тут у лесе між негустых таўшчэзных хваін павінна была трапіцца яму старая дарожка. *(В. Быкаў)* 4. Там за вёскай у полі дзве стаялі таполі. *(Я. Купала)* 5. У кутку двара каля веснічак быў нізкі калодзеж з калаўротам. *(А. Федарэнка)*

**456.** Развіце сказы ўдакладняльнымі акалічнасцямі месца і часу. Запішыце новыя сказы, расстаўляючы знакі прыпынку.

1. У пачатку чвэрці ... у наш клас прыйшла новая вучаніца. 2. Тут ... змрок здаваўся яшчэ гусцейшым. 3. За паваротам ... паказаўся купал царквы. 4. Возера робіцца асабліва прыгожым на світанні ... .

**457.** Складзіце і запішыце сказы, выкарыстоўваючы ў якасці ўдакладняльных акалічнасцей наступныя спалучэнні слоў.

Позна вечарам, каля адзінаццаці гадзін; у скверыку, ля тэатра імя Янкі Купалы; на наступны дзень, гадзін каля дзвюх; каля клуба, на клумбах; сёння, 25 сакавіка.

**458.** Прачытайце тэкст услых, сачыце за інтанацыяй. Знайдзіце ўдакладняльныя акалічнасці часу і месца, ставячы да ўдакладняльных і ўдакладненых членаў сказа пытанні *дзе? дзе іменна? калі? калі іменна?*

### ВАНЬКА ЖУКАЎ

Калі я быў яго аднагодкам — пасвіў каровы. Увосень, пасля атавы, выганялі іх па-тагачаснаму вельмі далёка: на сенажаці, пад самы лес, кіламетраў за пяць ад дому. На прыволлі заліўных лугоў цячэ ціхая, паўнаводная Вуша, што паблізу ўпадае ў Нёман — недзе вунь там, на даляглядзе, дзе таксама сінее лес, што называецца Налібоцкай пушчай. *(Я. Брыль)*



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**459.** Разгледзьце схемы пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з рознымі відамі акалічнасцей — аднароднымі, удакладняльнымі акалічнасцямі часу і месца. Растлумачце, у чым цяжкасць адрознення гэтых акалічнасцей.

1. Ранняй вясной у гаі расцвітаюць пралескі.

калі? дзе? ...

2. Здалёк, з цішы заснежаных дрэў, з сіняй цішы, пачалі далятаць ціхія галасы.

адкуль?, адкуль іменна?, ...

3. Праз пушчы, праз лугі вяртаецца хлопец дадому.

(–·–), (–·–) ...

**460.** Спішыце тэкст. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку і пабудуйце схемы пастаноўкі знакаў прыпынку пры розных відах акалічнасцей.

Пахаджае рупліва
па скверы па снезе
Грак штаны падкасаўшы турбуе вясна;
Ад Херсона на поўнач
праз стэпы й Палессе
Пяцьдзесят кіламетраў штодня
праходзіць яна.

*А. Русецкі*

**461.** Прачытайце тэкст, знайдзіце сказы з удакладняльнымі акалічнасцямі. Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку.

З першымі тактамі «Ветрыка» ён [Дубатоўк] стукнуў абцасамі і пайшоў крокам, то з правай, то з левай нагі. І яго туша рухалася нечакана лёгка спачатку прыстукваючы абцасамі пасля кожных трох крокаў а пасля проста так, на цыпках. А поруч з ім плыла яна проста плыла ў паветры залацістая белая блакітная як райская птушка і вэлюм яе віўся ў паветры.

Пасля яны круціліся плылі то зближаючыся то аддаляючыся то перасякаючы адзін аднаму шлях.

Гэта быў сапраўдны «Ветрык», які паступова пераходзіў у буру, і вось толькі круціўся ў паветры вэлюм мільгацелі ногі...

І тут туша памчалася наперад загрукала абцасамі па-кацячы мякка пачала заносіцца ў паветра стукаючы ў ім нагой аб нагу. А поруч плыла яна лёгкая ўсмешлівая вялікасная.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Гэта было сапраўднае дзіва, нябачаны цуд: два чалавекі ў старажытных вопратках стваралі перад намі гэтую казку. *(Паводле У. Караткевіча)*

● Якія танцы любіце вы? Паспрабуйце апісаць адзін з іх.

**462.** Устаўце ў тэкст на месцы пропускаў адасобленыя члены сказа.

Рака шалела. Нізавыя парывы вятрыску раскалыхалі вялікія ... хвалі. Яны каціліся супраць плыні ... . Хвалі ішлі адна за адной, і процілеглы бераг губляўся ў чарнільнай навальнічнай цемры. Але і адтуль ... далятаў усхваляваны, нізкі гук вады. Рака таўклася ў берагі ... . Праз пляму святла на вадзе слізгануў на хвалях дзіравы кошык, потым — цэлае дрэва ... , ... . Дзіўна было бачыць на яе галінах ... галінах, якія круціліся ... два ці тры яблыкі. *(Паводле У. Караткевіча)*

Для даведкі: *шоргаючы белымі грабянцамі; са змроку; у рост чалавека; апырсканых пенай; то знікаючы пад вадой, то зноў выплываючы; хочучы вырвацца з іх; яблыня, вымытая з карэннямі.*

● Параўнайце зыходны тэкст і тэкст, запісаны вамі. Якую сэнсава-стылістычную ролю выконваюць адасобленыя члены сказа ў мастацкім тэксце?

**463.** Прачытайце тэкст, вызначце яго тып і стыль. Выпішыце сказы ўскладненай будовы, графічна абазначце, якімі членамі яны ўскладнены.

Толькі тут, на мокрай сцежцы, я змог добра разгледзець гэты дом-палац. Уначы ён здаўся мне меншым, бо абодва яго крылы надзейна хаваліся ў паркавым гушчары і ўвесь першы паверх цалкам зарос здзічэлым, вялізным, як дрэва, бэзам. А пад бэзам раслі высокія, вышэй за чалавека, жоўтыя вяргіні, мясісты дзядоўнік, глухая крапіва. Высоўваў там-сям, як ва ўсіх вільготных мясцінах, свае лапчастыя сцяблiны падтыннік, буялі мядзведжая дуда, шыпшына, ліснік. І на чорнай ад вільгаці зямлі сярод гэтага разнатраўя ляжалі белыя ад цвілі, абламаныя ветрам, каржакаватыя сукі дрэў.

І дом выглядаў змрочна і холадна. Быў ён двухпавярховы, з вялізным бельведэрам* і невялікімі вежкамі па


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

краях. <...> Тоўстыя яліны — дваім не абхапіць — падступалі да самых муроў палаца, заглядалі лапамі ў вокны, узвышаліся сіне-зялёнымі конусамі над дахам. Стаўбуры іх зацягнула сівая барада імхоў і лішайнікаў, ніжнія галіны звісалі да зямлі, як шатры, і алея нагадвала вузкае міжгор'е.

Толькі ля самага дома бачны былі там-сям пахмурныя, чорныя ад дажджу, амаль голыя волаты-ліпы і адзін каржакаваты дуб. *(Паводле У. Караткевіча)*

● Складзіце план тэксту, перакажыце яго, па магчымасці выкарыстоўваючы сказы ўскладненай будовы.

**464.** Прачытайце тэкст. Сфармулюйце пытанні па яго змесце і адкажыце на іх.

У лацінскай мове ёсць дзеяслоў publicare — 'зрабіць агульным набыткам, адкрыць для ўсіх ці растлумачыць усенародна, абнародаваць'. З ім і звязана па паходжанні слова п у б л і ц ы с т ы к а. Публіцыстыка — гэта асобы тып літаратурных твораў, у якіх асвятляюцца, тлумачацца актуальныя пытанні грамадска-палітычнага жыцця, узнімаюцца маральныя праблемы. Публіцыстычны стыль спалучае функцыю паведамлення з функцыяй уздзеяння, таму што адкрывае магчымасці ацэнкі выказанага, для таго каб паўплываць на думкі і пачуцці чытачоў.

Найбольш вядомыя жанры публіцыстыкі: інфармацыя, крытычная нататка, інтэрв'ю, артыкул, рэцэнзія (на новую кнігу, фільм, спектакль і інш.), замалёўка, нарыс, фельетон.

*(К. Нікіціна)*

● Выберыце з апошніх нумароў якой-небудзь газеты найбольш значныя, на вашу думку, матэрыялы; вызначце і запішыце тэму кожнага з іх; назавіце аўтараў.

**465.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму і асноўную думку. Падбярыце да тэксту загаловак.

Ахарактарызуйце форму тэксту: стыль, тып, кампазіцыю. Запішыце яго план.

● Назавіце сукупнасць прыёмаў, выяўленчых (лексічных і стылістычных) сродкаў, выкарыстаных аўтарам:

вызначце: а) метафары і ўвасабленні (I, II, IV абзацы); б) параўнанні (I, II, III абзацы); в) градацыю (VIII абзац); г) і інш. сродкі;


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

знайдзіце: а) антонімы (I, IX абзацы); б) фразеалагізмы (VI, VIII абзацы); в) сінонімы і інш.

● Ахарактарызуйце сінтаксічны лад тэксту:

вызначце спосабы і сродкі сувязі сказаў у тэксце (I, II абзацы; V, VI абзацы);

вызначце ролю аднасастаўных сказаў (I абзац); няпоўных сказаў (II абзац); простых ускладненых сказаў з адасобленымі членамі; клічных сказаў (IX, XI абзацы) і інш.;

знайдзіце сказы з адваротным парадкам слоў і вызначце іх сэнсавую ролю (VI абзац).

Якія яшчэ моўна-выяўленчыя сродкі, выкарыстаныя аўтарам, ёсць у тэксце? Адзначце іх.

## СЛАВА ПРОДКАЎ НЕ ЗГАСЛА

I. 1410 год. 15 ліпеня. Самая сярэдзіна лета.

II. Сонца, адпачыўшы за ноч, шчодра ліло свае залатыя праменні на даліну, што шырока раскінулася каля вёсак Грунвальд і Таненберг. Заходні край даліны павольна ўзнімаўся ўгору, пераходзячы ва ўзвышша. Усходні хаваўся ў лесе, які нагадваў наднёманскія пушчы. Сама даліна як вымерла. Пустынная. Бязлюдная.

III. У высокім малочна-блакітным небе плылі бялявыя аблачынкі. Яны то запавольвалі свой бег, то быццам намагаліся дагнаць адна другую, каб злучыцца ў хмару і праліцца дажджом на засмяглую траву, на спакутаваную гарачынёй лістоту.

IV. «Зусім як нашы харугвы, — падумаў вялікі князь Вітаўт, — што з усяго Літоўскага княства, з усяе Польшчы сабраліся ў адзінае войска. Быццам тыя аблачыны — у хмару. На чыім жа баку будзе вецер перамогі?»

V. Нямецкае войска павольна спускалася з узвышшаў. Вось яно прамінула Грунвальд і спынілася пасярод даліны. У поўным баявым парадку. Крыжаносцы бачылі ў даліне толькі некалькі варожых харугваў. Ім не было вядома, якія сілы крыюцца ў сховах лесу. Перакананы ў непераможнасці рыцарскага войска, вялікі магістр Ульрых паслаў рашучы выклік.

VI. Неўзабаве загучалі баявыя трубы. Першымі прынялі на сябе націск крыжакоў вялікалітоўскія ваяры. Саступаючы нямецкім рыцарам узбраеннем, яны ніколечкі не саступа-



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

лі ім у смеласці і сіле. Дарма што літвіны, як звалі тады сябе беларусы, і жмудзіны-летувісы былі ў большасці ў звярыных шкурах, з лёгкімі мячамі ў руках. Яны з месца пусціліся наўскач на сваіх нізкарослых, але вёрткіх коніках. Насустрач цяжкаўзброеным, закутым у латы рыцарам. Чатырнаццаць крыжацкіх харугваў* на рослых конях кінуў Ульрых супраць вялікалітоўскага войска. Іскры сыпаліся з мячоў і шчытоў. Ламаліся коп'і. Падалі людзі пад капыты коней. Бой ішоў не на жыццё, а на смерць. Доўга ніводзін з бакоў не меў перавагі. Але радзела Вітаўтава войска, усё меней і меней заставалася ваяроў. І загадаў вялікі князь аслабелым харугвам з боем адыходзіць да ўзлеску, адцягваючы за сабой сілы крыжакоў.

VII. І вось тут кідае на поле бою свае галоўныя сілы польскі кароль Ягайла. Віхура смерці забушавала з новай сілай. Шалі шчасця вагаліся бесперапынна. Крыжацкія харугвы, якія цяснілі літвінаў і жмудзінаў да лесу, ужо радаваліся перамозе. Вярнуўшыся ад лесу ў даліну, убачылі, што тут бой у самым разгары, і ўрэзаліся ў фланг польскага войска.

VIII. І тут на дапамогу польскаму каралю прыйшло нечаканае падмацаванне: гэта князь Вітаўт, сабраўшы ў кулак свае харугвы, зноў павёў іх у бой. Крыжакі не вытрымалі, пачалі адыходзіць. А неўзабаве і проста пабеглі з поля бою, ратуючыся ад пагібелі і палону.

IX. О колькі палегла ў той дзень і з таго і з другога боку! Больш як палова ваяроў, прыведзеная Вітаўтам, не вярнулася дамоў з-пад Грунвальда. Яшчэ больш загінула крыжакоў. Знайшоў тут сваю смерць і вялікі магістр Ульрых.

X. Ніхто не заўважыў, як і калі бялявыя аблачынкі згрувасціліся ў цёмна-сінюю хмару, што спынілася раптам над полем бою. Першыя кроплі дажджу пачалі змываць пыл і кроў з пасечаных шаломаў, з працятых жалезам шчытоў і латаў, з рук і твараў мёртвых і жывых. Адных яны ашчадна абмывалі перад пахаваннем, другім давалі палёгку і надзею. Засмяглая трава і спакутаванае лісце прагна пацягнуліся насустрач жыццядайнай вільгаці.

XI. Шмат гадоў прамінула з таго часу. Але слава продкаў не згасла. Слава продкаў жыве! *(Паводле А. Вольскага)*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

● Правядзіце каменціраванае чытанне тэксту па ланцужку: растлумачце найбольш складаныя (на ваш погляд) арфаграмы і пунктаграмы па тэме «Знакі прыпынку ў простым ускладненым сказе».

● Пісьмова перакажыце тэкст, захоўваючы стыль аўтара, каб атрымалася яскравае апісанне гістарычнай падзеі (гл. уклейку ў падручніку: М. Басалыга «Грунвальдская бітва. 1410»).

**466.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загалоўкі, якія б адлюстроўвалі: а) тэму тэксту; б) асноўную думку. Адзін з іх запішыце. Вызначце тып і стыль тэксту, сваю думку абгрунтуйце.

На Грунвальдскае поле ў свой час я трапіў позняй восенню. Турысцкі сезон скончыўся, нішто не замінала спакойна агледзецца засяродзіцца. Было даволі золка, на гары, дзе месціцца мемарыял, дзьмулі вятры ганяючы хмары па небе. Магчыма якраз гэты несупынны рух цёмных хмар і даваў адчуванне надчасавасці далучанасці да вялікай падзеі мінуўшчыны. Само поле бітвы недалёка курганы Ягайлы і Вітаўта, адкуль яны кіравалі сваімі шыхтамі*.

Пад Дуброўна — такая славянская назва Грунвальда — зніклі слава і магутнасць Тэўтонскага ордэна, самага небяспечнага ворага славян на працягу двух стагоддзяў. Біліся з крыжакамі аб'яднаныя войскі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. З 91 харугвы 40 было з беларускага боку. Вёў іх у бой слаўны Вітаўт. Уласна, ліцвіны першымі і пачалі сечу, у паветры гучаў баявы кліч вояў Вялікага княства Літоўскага «Вільня!». Нашы продкі фактычна вырашылі і канец бітвы, калі пасля ўдалых манеўраў нанеслі апошні ўдар. Варта памятаць слаўную дату — 15 ліпеня 1410 года. Грунвальдская бітва, адна з найвялікшых бітваў еўрапейскага сярэднявечча, — самая важная падзея ў нашай гісторыі з далёкага XV стагоддзя. Вялікую дапамогу ў перамозе аказалі смаленцы і татарская конніца. *(У. Мароз)*

● Запішыце першы абзац тэксту, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку.

● Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў простых ускладненых сказах другога абзаца.

↑ Якім вам уяўляецца мемарыял на Грунвальдскім полі? Вусна апішыце яго.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**467.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку.

### АРХІТЭКТУРНЫЯ ПОМНІКІ БЕЛАРУСІ

Архітэктура — мастацтва, але мастацтва незвычайнае. Яе мова не мае словаў, але ў перадачы духоўных эмоцый яна дасягае такіх вышыняў, як ніводнае іншае мастацтва.

Вялікі пісьменнік і філосаф Ёган Вольфганг Гётэ сказаў: «Архітэктура — застылая музыка». **У гэтых словах адлюстраваны ўзвышаныя эстэтычныя эмоцыі, выкліканыя ў нас творам дойлідства**. Яны ўзнікаюць пры асэнсаваным успрыманні архітэктурна арганізаванай прасторы ансамбля будынкаў, суразмерных з чалавекам маштабу, прапорцый і рытму аб’ёмаў, пластыкі формаў, дэкору*, фактуры*, колеру і іншых выразных сродкаў архітэктуры.

**Але гэта толькі верхавіна айсберга, званая мастацтвам архітэктуры**. Пад ёй схавана працаёмкае будаўнічае рамяство, якое патрабуе вялікіх эканамічных рэсурсаў, кваліфікаванай працоўнай сілы і будаўнічых матэрыялаў. Так, помнікі архітэктуры — гэта ўзоры майстэрства нашых продкаў.

Ёсць яшчэ адно вядомае вызначэнне архітэктуры як мураванага летапісу гісторыі. У ёй адлюстраваны прыродна-кліматычныя асаблівасці кожнага рэгіёна, узровень навукова-тэхнічнага прагрэсу на пэўным этапе, эканоміка і ідэалогія дзяржавы, мастацкія пошукі і традыцыі. **Усё роўна ў чым — у камені ці цэгле, у дрэве ці метале, у шкле ці бетоне — дойлідства заўсёды дакладна ўвасабляе сваю эпоху. Помнікі дойлідства з’яўляюцца, па сутнасці, захавальнікамі часу, канцэнтрацыяй духоўнасці народа, накіраванай з мінулага ў будучыню.**

Твор архітэктуры, у адрозненне ад твораў іншых відаў мастацтва, непарыўна звязаны з зямлёю, на якой ён узведзены. Архітэктура замацоўвае гісторыю кожнага народа на яго зямлі, з’яўляецца важнейшым нацыянальным набыткам. Таму стан архітэктурнай спадчыны, клопат пра яе захаванне характарызуюць эканамічны і культурны ўзровень грамадства. *(Н. Снагоўская)*

● Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў выдзеленых сказах. Якая моўная з’ява ў іх найбольш часта паўтараецца? З якой мэтай?


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**468.** Перакладзіце тэкст з рускай мовы на беларускую. Падкрэсліце ў ім лексічныя і граматычныя сродкі сувязі паміж часткамі тэксту. Лексічныя сродкі пазначце літарай *л*, а граматычныя — літарай *г*.

## ПАМЯТНИКИ АРХИТЕКТУРЫ БЕЛАРУСИ

Культура народа... Это сокровищница духовных его ценностей, из которых высочайший карат принадлежит языку. Но наряду с языком излучает свою исключительную красоту зодчество, истоки которого уходят в глубину столетий. Именно так я чувствую и понимаю ценности зодчества своего народа.

Если бы можно было взглянуть с заоблачных высот на родную землю, то лучи от каждого памятника слились бы в одну зарницу. К сожалению, остаётся только гадать, насколько были бы ярче рассвет и день нашей культуры, если бы уцелели до сегодняшних дней все памятники зодчества Белоруссии.

Путешествия по Беларуси, и прежде всего встречи с «музыкой в камне», не оставляли меня в покое. Тема вызревала где-то под сердцем, будто бы росток в зёрнышке, брошенном в землю.

Можно ли пройти мимо Сынковичского храма и не отозваться на его таинственную прелесть или разве можно найти языковые и изобразительные средства, чтобы воспеть его величественную красоту?.. Разум оставляет надежды, но сердце заставляет взять в руку карандаш и бумагу. Так вызревал замысел и начиналась работа, которая затянулась более чем на 10 лет.

Серия «Памятники зодчества Белоруссии» — мой скромный ответ на прославление дела белорусских зодчих.

Всё наше зодчество спаяно связями с европейской архитектурой, но по-своему переосмысленной и поэтому не менее ценной.

Каменецкая башня и Коложская церковь в Гродно, Спасо-Евфросиньевская церковь в Полоцке — свидетели нашей славной истории со времён Киевской Руси. Они изувечены древностью, но ещё стоят, и будем надеяться, что они сохранятся на долгие века.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Как не остановиться перед образцами белорусской готики и не восславить их, если дорога привела тебя к стенам башен Мирского замка или ко входу в костёл в Ишколди.

Черты ренессанса в башне замка в Любче, в Спасо-Преображенской церкви в Заславле или в замковой башне в Несвиже восхищают чистотой формы и решением объёмов.

А на какой высокой ноте наши зодчие пропели свои барочные песни! Достаточно один раз взглянуть на Софию в Полоцке, францисканские костёлы в Гродно и Пинске или на иезуитский костёл в Несвиже, чтобы понять, что это великое искусство, которое обогащает души людей.

Сокровищница нашего зодчества заставляет двигаться дальше, остановиться уже невозможно, и, видимо, так суждено мне на всю жизнь слиться в своём творчестве с этой красотой. *(В. Басалыга)*

↑ Што вы ведаеце пра У. Басалыгу як мастака?

↑ Ці супадаюць вашы погляды на архітэктурныя помнікі з поглядамі аўтара?

**469.** Правядзіце каменціраванае чытанне тэксту: растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў першым і другім абзацах.

У старым Полацку шчыравала на ніве асветніцтва Еўфрасіння Полацкая, унучка легендарнага Усяслава Чарадзея. Яна не пакінула нам уласных твораў, але справамі была не менш слаўная. Еўфрасіння дзяўчом (свецкае імя яе было Прадслава) пастрыглася ў манахіні і ўсё жыццё аддала служэнню Богу, людзям і краю. Яна сама перапісвала кнігі ў келлі Сафійскага сабора. Кідала зерне асветы, якое з часам дало ўраджай. Вялікая палачанка заснавала два жаночыя манастыры, а пры іх — школы. Спаскі існуе ў Полацку і сёння. А ў манастыры гэтым белаю свечкаю ўзнёсся Спаса-Прэабражэнскі храм, падобнага якому не было яшчэ ні ў полацкай зямлі, ні ва ўсёй старажытнай Русі. Пабудаваў яго на замову Еўфрасінні дойлід Іаан.

Спаса-Еўфрасіннеўская царква амаль у першапачатковым выглядзе (у XIX стагоддзі толькі перабудаваны дах) захавалася да нашых дзён. Уваходзіш у сярэдзіну — і быццам трапляеш і ў тыя далёкія часы. Чатыры масіўныя, але


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

стромкія калоны ў цэнтры трымаюць барабан купала. На іх гранях, а таксама на сценках — унікальныя фрэскі. Мяркуюць, што на адной з фрэсак выяўлены лік самой Еўфрасінні. За ўваходам направа — вузкая цёмная лесвіца, што вядзе як у іншасвет на хоры і да келлі-галубніцы. Тут найпадобнейшая аддавалася духоўнай працы. Толькі адзінае вузкае акенца злучала яе з навакольным светам. Магчыма, малілася яна на абраз Эфескай Маці Божай, напісаны, паводле падання, евангелістам Лукой. Гэты абраз прыслалі ў Полацк па яе просьбе візантыйскі імператар і патрыярх.

З імем Еўфрасінні звязана і найгалоўнейшая святыня зямлі беларускай — напрастольны Крыж, створаны ён быў полацкім ювелірам Лазарам Богшам з найвялікшым майстэрствам. Але каштоўнасць крыжа найперш не мастацкая, хоць гэта непаўторны шэдэўр, а духоўная, бо ў ім знаходзіліся хрысціянскія рэліквіі: кроплі крыві Ісуса Хрыста, кавалачак Крыжа Гасподняга, каменьчыкі ад дамавіны Багародзіцы... Няпросты лёс святыні праз вякі — знік з Беларусі канчаткова Крыж у апошнюю вайну.

На схіле свайго жыцця Еўфрасіння зрабіла паломніцтва на Святую зямлю, дзе і скончыўся яе зямны шлях. Першая сярод жанчын далучана яна была да ліку святых. І сёння нябесная апякунка з тымі, хто кладзе свае сілы на адраджэнне Бацькаўшчыны. *(У. Мароз)*

- Колькі частак мае тэкст? Якія тыпы тэкстаў яны сабой уяўляюць? Падбярыце да іх загалоўкі.
- Падрыхтуйцеся да творчага выбарачнага пераказу па варыянтах:
  *1 варыянт.* Асветніца Еўфрасіння Полацкая.
  *2 варыянт.* Спаса-Еўфрасіннеўская царква ў Полацку.
  *3 варыянт.* Напрастольны крыж Еўфрасінні Полацкай.
- Дапоўніце свае тэксты ўражаннямі ад разгляду адпаведных ілюстрацый, змешчаных у падручніку. Можна дадаткова прачытаць тэкст практ. 265.
- Каб вашы тэксты былі больш выразныя, пастарайцеся выкарыстоўваць і сказы з адасобленымі членамі.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**470.** Разгледзьце схему.




- Якія члены сказа могуць адасабляцца?
- На якія віды падзяляюцца адасобленыя азначэнні?
- Чым выражаюцца дапасаваныя азначэнні?
- Чым выражаюцца адасобленыя акалічнасці?

**471.** Знайдзіце сказы, якія ілюструюць кожны від адасаблення, прадстаўлены ў схеме з практ. 470. Зрабіце сінтаксічны разбор 2—3 сказаў.

1. Узыходзіла, прабіваючыся праз імглу, сонца. 2. У багатым палацы, абкружаным мноствам лёкаяў і лісліўцаў, жыве Сын Шчасця. 3. Я — Сын бацькоў, гнаных Бураю і Неспакоем. *(Я. Баршчэўскі)* 4. Сонная, яна хістанулася на нагах і шпарка пайшла ў хату. *(К. Чорны)* 5. На станцыю павёз Архіпа той жа сват, сівы дзед Яхім. *(М. Гарэцкі)* 6. Прабег прамень, ад сонца ясны веснік, і абвясціў людзям: вясна ідзе! *(Я. Пушча)* 7. Летам, асабліва ў ліпені і ў жніўні, двор пусцеў, зарастаў травою. *(М. Калачынскі)* 8. Над кубкам возера, глыбокім і шкляным, у тонкай просіні між кросен багавіння, лілеі плакалі ў хвалях сініх... *(П. Трус)*

## Кантрольныя пытанні і заданні

**Варыянт 1**

1. Што называецца адасабленнем? Якія члены сказа могуць быць адасобленымі? Чаму?


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

2. Як інтануюцца адасобленыя члены сказа? Пакажыце на прыкладах.
3. Пры якіх умовах адасабляюцца дапасаваныя і недапасаваныя, развітыя і адзіночныя азначэнні? Якімі знакамі прыпынку перадаецца на пісьме іх адасабленне? Пакажыце на схемах.
4. Якія ўмовы адасаблення прыдаткаў і правілы пастаноўкі знакаў прыпынку пры іх вы ведаеце?
5. Пастаўце і растлумачце знакі прыпынку ў сказах. Пабудуйце схемы інтанавання і пастаноўкі знакаў прыпынку: *1. Узнімаю я коўш вінаграду напоўнены цераз край.* (П. Броўка) *2. Купка дужых дубоў стаўшы роўным паўколам вартуе леснікову сядзібу.* (М. Лужанін) *3. Нягледзячы на позні час у кватэры Садовіча гарэла лямпа.* (Я. Колас)

**Варыянт 2**

1. З якімі прыназоўнікамі ўжываюцца адасобленыя дапаўненні? Як яны выдзяляюцца на пісьме?
2. Калі адасабляюцца акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўнымі зваротамі і адзіночнымі дзеепрыслоўямі? Калі не адасабляюцца? Пакажыце на прыкладах.
3. Якую ролю выконваюць адасобленыя члены сказа ў мове? У якіх стылях мовы яны ўжываюцца?
4. Назавіце ўмовы адасаблення ўдакладняльных акалічнасцей. Пакажыце на прыкладах.
5. Пастаўце і растлумачце знакі прыпынку ў сказах. Пабудуйце схемы інтанавання і пастаноўкі знакаў прыпынку: *1. Дарога выйшла на край узгорка адкрыўшы перад намі новыя краявіды.* (Я. Скрыган) *2. Адтуль з захаду дзьмуў свежы адліжны вецер з ледзь улоўным пахам вільгаці.* (А. Асіпенка) *3. Дарослыя з зайздрасцю пазіралі з берага на нас хлапчукоў, але ўзысці на лёд не адважваліся.* (В. Хомчанка)

## § 59. Параўнальныя звароты

**472.** Прачытайце радкі з верша Янкі Купалы.

ЖНЯЯ

Як сама царыца
Ў залатой кароне,
Йдзе яна ў вяночку
Паміж спелых гоняў.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

З каласкоў вяночак —
Моладасці сведка —
На ёй зіхаціцца,
Як у садзе кветка.

● Які вобразна-выяўленчы сродак, выкарыстаны аўтарам, дазволіў вам убачыць прыгажосць жняі?
● Успомніце з урокаў беларускай літаратуры, што вы ведаеце пра параўнанне.

П а р а ў н а н н е — гэта супастаўленне прадметаў і з'яў па якіх-небудзь агульных рысах.

У параўнанні звычайна выдзяляюць тры элементы:
1) тое, што параўноўваецца, п р а д м е т;
2) тое, з чым нешта параўноўваецца, в о б р а з;
3) тое, па падабенстве чаго адно параўноўваецца з другім, п р ы м е т а.

**473.** Запішыце па памяці радкі з верша А. Ставера. Назавіце параўнанні і іх элементы.

Мы радуемся слову,
Адкрытаму ў народных сховах,
Незацяганаму,
Крамянаму,
Як раніцай трава, непатаптанаму,
Як жарабок, брыкліваму,
Як ястрабок, узлётнаму,
Яшчэ і не крыкліваму,
Яшчэ і не грымотнаму,
Не знаўшаму авацый,
Ні мору,
Ні інфляцый,
Як дар,
Як памятка вякоў,
Яно не хоча быць прыспаным,
Забытым скарбам,
Закапаным.

Моўныя сродкі параўнання неаднародныя. Сярод іх адрозніваюць лексічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**Марфалагічныя сродкі параўнання**

- Творны склон параўнання (назоўнікі ў форме Т. скл.)
- Прыназоўнікі *накшталт, падобны да* і інш.
- Параўнальныя злучнікі *што, нібы, як, быццам* і інш.

**474.** Спішыце, падкрэсліце параўнанні і вызначце, чым яны выражаны.

1. Па каменях, бы тая змейка, вілася шумная Вілейка... 2. Па-над парканам пышным валам стаяў вішняк густы, прыўдалы. 3. Кажух на лаву дзед скідае і бубен-рэшата хватае. 4. Не хатка — проста катушок, няма дзе нават павярнуцца, як у сабачай цеснай будцы. 5. Кабеты тварамі самкнуліс і так прыемна ўсміхнуліс, як бы злучыліся дзве рэчкі, гарохам сыплюцца славечкі. *(Я. Колас)*

**475.** На аснове прыведзеных ніжэй або самастойна падабраных прыкладаў раскажыце пра марфалагічныя сродкі параўнання.

1. Чорнай маланкай лётаў кажан. *(П. Панчанка)* 2. А сам дырэктар, з вузел ростам, у сваім уборы бедным, простым, у зрэбных портках і кашулі стаяў, як бы яго прыгнулі. *(Я. Колас)* 3. Спелая гронка рабіны, нібы раскошная кветка, заглядвала ў акно. *(Я. Купала)* 4. Маршалак, таўшчэразны, непаваротны чалавек накшталт гіпапатама, прыйшоў у вялікае абурэнне. *(Я. Колас)* 5. Рака віецца па траве, як стужка ў дзявочых косах. *(П. Панчанка)*

- Зрабіце сінтаксічны разбор 4-га сказа.
- Падбярыце сінонім да слова *гіпапатам.*

**476.** У беларускай мове ёсць шмат фразеалагічных параўнанняў. Напрыклад, *як Піліп з канапель; як у полі вецер; як уюн на гарачай патэльні* і інш.

- Прадоўжыце спіс прыкладаў фразеалагічных параўнанняў.
- Складзіце невялікі тэкст з адным з фразеалагічных зваротаў.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Параўнальнымі зваротамі не лічацца фразеалагізмы, якія ў сказах выконваюць функцыю акалічнасці: *Усё відаць **як на далоні**.* (М. Лынькоў) — *як на далоні* 'вельмі добра', а таксама словы са злучнікам *як*, што ўваходзяць у састаў выказніка: *У гэтыя хвіліны яна для яго **як маці**.* (І. Навуменка)

**477.** а) Прачытайце, знайдзіце ўстойлівыя спалучэнні слоў (фразеалагізмы), ахарактарызуйце іх як члены сказа.

І. 1. На храп і дабраўся Міколка да дзеда. Той, палажыўшы пад галаву бярозавы цюльпак, спаў як пшаніцу прадаўшы. *(М. Лынькоў)* 2. Стаяць на заставе было цяжка. Каторы дзень дождж ліў як з вядра. *(В. Быкаў)* 3. Я засяпшаўся, пацягнуўся бы нітка за іголкай услед за бацькам. *(Б. Сачанка)* 4. Ну, а воз — як чорт панёс, ажно цяжка згледзець. *(А. Сушко)* 5. Я або за плячамі, або захінуты крысом кажуха сяджу як у Бога за пазухаю... *(Ф. Янкоўскі)* 6. Заяц сядзеў як нежывы, баяўся паварухнуцца. *(В. Карамазаў)*

↑ ІІ. 1. Тыдзень часу, і грэбля была б як яечка. *(Я. Колас)* 2. Бярвёны да таго ўдала падагналі адно да аднаго цесляры, што загадзя можна было сказаць: варывенька атрымаецца як яечка. *(А. Макарэвіч)* 3. Вельмі ўжо ён цацкаецца з князем, нібы з велікодным яйкам. *(В. Вольскі)* 4. Першае пісьмо звалілася як снег на галаву. *(А. Жук)* 5. Яго тэлеграма была як снег на галаву. *(І. Шамякін)*

б) Выпішыце фразеалагізмы і растлумачце іх значэнне. Запішыце да фразеалагізмаў словы-сінонімы.

1. Трэба яна мне як леташні снег. *(І. Мележ)* 2. Людзі жылі як гарох пры дарозе, людзі жылі ў штодзённай трывозе. *(У. Дубоўка)* 3. Сіроткі вы мае няшчасныя! Засталіся вы цяпер адны, бы гарох пры дарозе. *(У. Праскураў)* 4. Не ўправіўся скончыць думку — перад ім як з зямлі вырас механік іх карабля. *(У. Дамашэвіч)* 5. Далібор як язык праглынуў. *(Л. Дайнека)*

● Падбярыце да фразеалагізма з першага сказа сінанімічныя фразеалагізмы.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Д л я  д а в е д к і: *як дзірка ў мосце; як зайцу стоп-сігнал; як пятае кола ў возе; як рыбе парасон; як у полі вецер; як пугай па вадзе; як тры грошы даў; як сабаку пятая нага.*

Сінтаксічнымі сродкамі рэалізацыі параўнання з'яўляюцца в ы к а з н і к і з адценнем параўнання, п р ы д а т к і, п а р а ў н а л ь н ы я  з в а р о т ы.

**478.** Спішыце, падкрэсліце галоўныя члены сказа, вызначце іх тып і марфалагічнае выражэнне.

1. Жытняя рунь нібы цёмна-зялёны аксаміт. *(Т. Хадкевіч)* 2. Аблокі нібы воўна. *(Я. Янішчыц)* 3. Возера як люстэрка. *(І. Навуменка)* 4. Снег што вата. *(А. Жук)* 5. У такую пару дрэвы што ружовыя воблакі. *(Я. Брыль)* 6. Мамінаю хусцінкаю свеціцца над зямлёй, у сэрцы звініць трасцінкаю — любоў да Айчыны сваёй. *(В. Зуёнак)* 7. Неба — як разведзенае чарніла. *(В. Карамазаў)* 8. Лебедзь што цар на сінім плёсе. *(У. Караткевіч)* 9. Ноч нібы казка. *(І. Навуменка)*

● Якую функцыю выконваюць злучнікі ў сказе? Як зменіцца сэнс выказванняў, калі ў сказах апусціць злучнікі?

Перад выказнікам-параўнаннем коска не ставіцца; пры сэнсавым і інтанацыйным выдзяленні зрэдку дапускаецца пастаноўка працяжніка: *Хмары — быццам кусты беласнежных руж.* (У. Караткевіч) *Дзяўчына — бы ягадка тая.* (М. Танк)

Вобразныя выказнікі-параўнанні часта можна замяніць прыдаткам: *Ночка як чарнамазая цыганка* і *ночка-**цыганка**; Сляза як горкі палын* і *сляза-**палын***.

Сказам, у якім ёсць выказнік з адценнем параўнання, можа пачынацца тэкст.

**479.** Складзіце і запішыце сказы, замяніўшы прыдаткі выказнікамі-параўнаннямі.

У з о р. *Валасы-кужаль — Валасы ў маёй сяброўкі быццам белы кужаль.*

Палотны-туманы, неба-акіян, месячык-сярпок, іней-срэбра.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**480.** Разгарніце адзін з наступных сказаў у тэкст публіцыстычнага стылю.

Наш двор як кветнік.
Наш школьны двор як стадыён.

П а р а ў н а л ь н ы м і з в а р о т а м і называюцца словы і словазлучэнні, якія шляхам параўнання раскрываюць і ўдакладняюць змест усяго выказвання або пэўнага члена сказа і ўводзяцца ў сказ пры дапамозе злучнікаў ***як, бы, быццам, нібы, нібыта, чым, што, як бы, як быццам:*** *Русыя вусы пана звісалі абапал вострага падбародка,* ***як*** *вавёрчыны хвосцікі.* (У. Дубоўка) *Месяц круглы ўстаў на небе, <...> увесь чырвона-жоўты,* ***быццам*** *пугачова вока.* (М. Багдановіч) *Вакзал,* ***бы*** *ўзрушаны вулей, гудзе.* (А. Вольскі) *Дзяўчаты,* ***нібы*** *русалкі, карагоды водзяць.* (П. Панчанка) *Лягчэй камусьці парадзіць,* ***чым*** *сабе.* (Прыказка)

Параўнальныя звароты могуць размяшчацца ў пачатку сказа: ***Як ластаўка,*** *дзяўчына выпырхвае з двара.* (Н. Гілевіч); у сярэдзіне сказа: *Паселішчы,* ***як і людзі,*** *— без біяграфіі не маюць свайго аблічча.* (Я. Скрыган); у канцы сказа: *Гай заціх,* ***бы ў сне.*** (Я. Колас).

Найбольш выразна характар параўнання праяўляецца тады, калі параўнальныя звароты адносяцца да ўказальных слоў ***так, такі, такая:*** *Лес тут быў* ***не такі, як на пясчаніку.*** (І. Мележ ) ***Як у аратага плуг, у жняі серп, так*** *у пісьменніка слова.* (Б. Сачанка) *І дзе на свеце ёсць* ***такая, як Нёман,*** *рэчанька другая?* (Я. Колас)

З а ў в а г а. Параўнальныя звароты неабходна адрозніваць ад даданых параўнальных частак складаназалежнага сказа. Самай выразнай прыметай даданай параўнальнай часткі, якой яна адрозніваецца ад параўнальнага звароту, з’яўляецца наяўнасць у ёй выказніка або іншых членаў сказа з саставу выказніка. Так, у сказе *Патанулі птушкі ў дрэвах,* ***як тонуць рыбы ў водах.*** (П. Панчанка) у даданай частцы ёсць выказнік *тонуць* і даданы член сказа з саставу выказніка *ў водах.* А ў сказе *Рукі ў хлопца дрыжалі,* ***як асенняе лісце на дрэве.*** (І. Навуменка) у даданай параўнальнай частцы няма выказніка, але ёсць


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

член сказа з саставу выказніка *на дрэве (дрыжалі)*. У параўнальных зваротах выказнік адсутнічае: *Да праўды людской,* ***як да яблыка спелага****, прытуліся шчакой...* (П. Панчанка)

Параўнальныя звароты ў сказе могуць мець неразвітую і развітую будову.

Н е р а з в і т ы я параўнальныя звароты ўключаюць у свой склад адно самастойнае слова — назоўнік: *Квяцістыя зоры,* ***бы дыяменты,*** *усыпаюць усё неба.* (Я. Колас), прыметнік: *Колы стукацелі ў цвёрдых,* ***нібы каменных****, каляінах, трэсліся, хісталіся.* (І. Мележ), займеннік: *Асцярога і асцярожнасць ужо іх прытаміла,* ***як і мяне****.* (Ф. Янкоўскі), дзеяслоў: *Дзень скончыўся не так,* ***як зачаўся****.* (Я. Колас), прыслоўе: *Дні стаяць цёплыя, сонечныя,* ***як летам.*** (І. Навуменка).

Р а з в і т ы я параўнальныя звароты звычайна складаюцца з назоўніка і залежных ад яго слоў іншых часцін мовы: *Тут сыр,* ***як першы снег****, бялюткі.* (Я. Колас) ***Як помнік лету****, за ракой стаялі стройныя стагі.* (А. Бачыла)

У сказе параўнальныя звароты могуць паясняць і ўдакладняць любы член сказа — галоўны або даданы. Так, у сказе ***Як чорны парасон,*** *вісела цемра над зямлёй.* (М. Калачынскі) параўнальны зварот паясняе дзейнік (г. зн. цемра падобная на чорны парасон), а ў сказе *Хмары чорныя,* ***як смуга****, засланілі сонца.* (М. Хведаровіч) — азначэнне (такія чорныя, як смуга). Найбольш пашыраныя ў мове параўнальныя звароты, якія паясняюць дзеяслоў-выказнік і сваёй функцыяй нагадваюць акалічнасць (часцей — спосабу дзеяння): *Ачнецца лес, звіняць прагалы,* ***як мнагаструнныя цымбалы.*** (Я. Колас) (звіняць як? — *як мнагаструнныя цымбалы).*

Параўнальныя звароты ў сказе могуць выступаць у ролі:

1) выказніка: ***Як мора*** *— лес,* ***як неба*** *— долы.* (Я. Колас) *Бульба —* ***як арэхі****.* (І. Пташнікаў);

2) акалічнасці: ***Быццам у кручыне****, галаву схіляе старадаўні дуб.* (П. Глебка) *Ляжаць,* ***нібы ў абрусе беленым****, лясы, палеткі і лугі.* (А. Асіпенка);

3) азначэння: *І травы,* ***нібыта зялёныя хвалі****, на міг ускіпелі, заціхлі, зжаўцелі.* (В. Шніп);

4) прыдатка: *Збоку вербачкі крывыя,* ***бы кабецінкі старыя****, нуднай кучкаю ляжаць.* (Я. Колас)



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**481.** Прачытайце, знайдзіце параўнальныя звароты і ахарактарызуйце іх па схеме:

а) пры дапамозе якога злучніка ўведзены ў сказ;
б) месца размяшчэння ў сказе;
в) развіты ці неразвіты;
г) які член сказа паясняе ці ўдакладняе;
д) якім членам сказа з'яўляецца (падкрэсліце).

1. Вісела ноч, чорная, як перааранaя зямля. 2. Не баючыся, ля самых ног хадзілі чорныя, бліскучыя, як аблізаныя, шпакі. 3. Цененька, як іголкай, калола холадам у шчаку... 4. Хлопцы пасля крыху пасмялелі і ўлеглі на парэчкі, што куры. 5. Даг-даг-даг... — ляскоча ззаду на ямах кулямёт, што малатарня. 6. Гудзелі самалёты цяжка, суха. На Пячным за маяком паварочвалі ўлева, задзіралі ўгару крыло і падалі, як лянівыя каршуны. 7. У сасніку ля зямлі папоўз сівы туман, нават відаць, як ён падымаецца ў лагчыне за дарогай, што пара, нібы там паставілі, выняўшы з печы, гаршкі з бульбай. *(І. Пташнікаў)*

**482.** Прачытайце. Назавіце сказы а) з параўнальнымі зваротамі і б) з дадзенымі параўнальнымі часткамі. Адказ абгрунтуйце.

1. Дзесяткі тонкіх, як сонечныя промні, струменьчыкаў ускідвалі пад сонца залатыя пясчынкі, падалі разам з імі на бліскучыя, нібы адпаліраваныя, каменьчыкі. *(К. Кірэенка)* 2. На палях шугаў цёплы, быццам недзе здалёк нагрэты, вецер. *(У. Караткевіч)* 3. Пачырванеў юнак, як хмарка той парою, калі яна на ўсходзе стрэнецца з зарою. *(А. Міцкевіч)* 4. Пацешныя, як важаняты, дзве маленькія кабеты ў шэрых шубках тэпалі побач з высозным бацькам. *(Я. Брыль)*. 5. Самота выльецца слязамі, як хмара цёмная — дажджом. *(Е. Лось)* 6. Лёгкі туман праплывае над Мінскам, быццам пялёсткамі сыплюць сады. *(С. Грахоўскі)* 7. Вунь, нібы маланка з хмары, мядзведзь мільгануў, як прывід у кашмары, вялізны, гнедай масці, кіжлаваты і дужы: тулава яго ў два абхваты. *(А. Міцкевіч)*

Параўнальныя звароты ў вуснай мове выдзяляюцца інтанацыйна, а на пісьме — коскамі: ***Як і брат***, *я любіў футбол*. (У. Караткевіч) *Лыжаў след*, ***як дзве струны***,



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

*пралёг праз перавал.* (М. Танк) *Начамі, **што яблыкі,** падаюць зоры.* (П. Броўка)

Параўнальныя звароты не выдзяляюцца коскамі:

1) калі яны з'яўляюцца выказнікам або ўваходзяць у склад выказніка: *Галіны **як крыжы.*** (Я. Купала) *Пасля дажджу ўсё здаецца **як бы абноўленым.*** (І. Шамякін) *Сэрца **нібы варам аблілося.*** (І. Мележ);

2) калі параўнальныя звароты ўваходзяць у склад устойлівых (фразеалагічных) словазлучэнняў тыпу *зняло як рукой, біцца як рыба аб лёд, як у Бога за пазухай, як маслам па душы, як гром з яснага неба, як мае быць, як у ваду глядзеў, як без рук, як вадою змыла, злы як сабака, гол як сакол, чырвоны як рак, палахлівы як заяц, не бачыць як сваіх вушэй, ведаць як свае пяць пальцаў, прыстаў як смала* і інш.: *Учора павіншаваў **як тры грошы даў.*** (К. Крапіва) *Дождж ліў **як з вядра...*** (Б. Сачанка) *Надвор'е стаяла **як па заказу.*** (Я. Сіпакоў);

3) у зваротах, дзе на першы план выступае акалічнаснае значэнне (звычайна спосабу дзеяння — *як?*): ***Як дым** развеяліся мары; **Як град** пасыпаліся стрэлы;*

4) у зваротах са злучнікам *як*, што мае значэнне 'ў адпаведнасці, у якасці' або тоеснасці: *У мястэчку бацька быў вядомы **як выключны ювелірны майстар*** (бацька і быў ювелірным майстрам); ***Як вучань** брат адказна ставіўся да вучобы* (брат і быў вучнем);

5) калі ў параўнальным звароце паўтараюцца аднолькавыя назоўнікі: *Хата як хата.* (Р. Няхай) *Госць як госць, а валакіты дасць.* (І. Навуменка);

6) спалучэнні, у якіх дзеясловы самі па сабе не выражаюць выказніка: *гэта гучыць як іронія; вызначыць як член сказа; вылучыць як кандыдата; кваліфікаваць як парушэнне парадку; разглядаць як асобы выпадак; гучыць як заклік; склалася як традыцыя* і пад.;

7) калі параўнальнаму звароту папярэднічае адмоўная часціца ***не*** або прыслоўі ***зусім, амаль:*** *паступіў не як сябар; трымаўся не як дарослы чалавек; прыгравала амаль (зусім) як улетку; паводзіў сябе амаль як дзіця* і інш.;

8) калі звароты *(не)больш чым, (не)менш чым, (не)раней чым, (не)пазней чым, (не)часцей як, (не)радзей як, усё роўна як* і пад. маюць значэнне прасторавага, часа-



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

вага ці колькаснага абмежавання: *На дарогу спатрэбіцца* ***не менш як*** *тры гадзіны* (параўн.: *не менш трох гадзін*); *Ісці заставалася* ***больш чым*** *вярсту* (параўн.: *больш за вярсту*); *У вышыню вішня вырасла* ***больш чым*** *пяць метраў* (параўн.: *больш пяці метраў*).

З а ў в а г а. У такіх спалучэннях коска перад ***як*** і ***чым*** ставіцца тады, калі яны выражаюць супастаўляльнае значэнне: *Лес патрэбен людзям не меней, чым хлеб.* (І. Навуменка) *Людзей у лесе было больш, як грыбоў.* (Я. Колас) *Стаў есці больш, як еў.* (Я. Купала)

**483.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму, стыль, сваю думку абгрунтуйце. Зрабіце сінтаксічны разбор выдзеленых сказаў. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі.

МОВА ЯК МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ

Патэнцыял кожнай дзяржавы ў значнай ступені залежыць ад яе матэрыяльных і інтэлектуальных рэсурсаў. Вядома, што Беларусь не надта багатая на прыродныя рэсурсы. У асноўным гэта лясы, вада і паветра, а таксама карысныя выкапні.

Ёсць у Беларусі яшчэ адзін матэрыяльны рэсурс. **Ён, як карысны «выкапень», ляжыць у нас пад нагамі.** Мы, можна сказаць, топчам яго нагамі, але амаль не карыстаемся. Гэты рэсурс — беларуская мова.

Чаму ж яе можна і трэба аднесці да матэрыяльнай каштоўнасці?

**У міжнародным праве ёсць такое паняцце, як інтэлектуальная ўласнасць.** Да яе адносяцца літаратурныя і навуковыя творы, вынаходніцтвы, друкаваныя выданні, перадачы тэлебачання і радыё, музычная і канцэртная дзейнасць і г. д.

Творцаў гэтай інтэлектуальнай уласнасці абараняюць міжнародныя і дзяржаўныя законы аб аўтарскім праве. А вось на нацыянальным узроўні інтэлектуальную ўласнасць абараняе тая мова, на якой яна створана. **Гэта як бы своеасаблівы замок да сейфа,** дзе захоўваецца інтэлектуальная ўласнасць у адпаведнай матэрыяльнай форме выканання.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

І калі нехта захоча ёй карыстацца, то трэба мець адпаведны ключ — менавіта валоданне адпаведнай мовай.

Зараз уявім сабе тое нацыянальнае багацце, якое можна было стварыць на беларускай мове — цэлыя бібліятэкі. **Мы ж, як той ганчар, «лепім збаны з чужой гліны, забыўшыся пра сваю».** Таму і «збаны», адпаведна выкарыстанаму «матэрыялу» — мове, належаць да інтэлектуальнай каштоўнасці іншых краін. Прыкладам таму нашы землякі — Адам Міцкевіч, які лічыў сябе ліцвінам, але тварыў на польскай мове, ці таксама ліцвін Хведар Дастаеўскі, вядомы як вялікі рускі пісьменнік. *(У. Яцкевіч)*

● Вызначце асноўную думку тэксту. Ці згодныя вы з аўтарам? Свой адказ аргументуйце.

**484.** Прачытайце вершаваныя радкі. Тыя (2—3), якія вам найбольш спадабаліся, запішыце. Падкрэсліце параўнальныя звароты як члены сказа, а словы, якія яны паясняюць, абвядзіце кружком.

I. Славянскіх моў дыханне на вякі
Агнём салодкім сэрца апаляла
І нараджала волатаў такіх,
Як Пушкін, як Міцкевіч, як Купала.

*Н. Гальпяровіч*

II. Чую тваю жаўруковую музыку
Ў скошаных травах мурожных.
Мова! Як сонца маё беларускае,
Ты свецішся словам кожным.

*Я. Янішчыц*

III. Кажыце пра паэзію і джаз,
Я слухаю, нібы зачараваны.
Я стану самым лепшым дзеля Вас,
Я цэлы вечар буду толькі з вамі.

*М. Шабовіч*

IV. На скразняку, у пераходзе —
Вішнёвая віяланчэль.
Натоўп гудзіць, нібыта чмель,
Натоўп не слухае мелодый.

*Н. Гальпяровіч*


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**485.** Спішыце, пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку. Сфармулюйце правілы пастаноўкі знакаў прыпынку пры параўнальных зваротах. Падкрэсліце злучнікі, якімі параўнальныя звароты звязваюцца са словамі ў сказе.

1. Да Якуба Коласа як і да яго вялікага друга і паплечніка Янкі Купалы можна аднесці словы, сказаныя А. М. Горкім пра Пушкіна: «Ён у нас — пачатак усіх пачаткаў». *(М. Лужанін)* 2. Дзяўчынка была як водбліск сонейка на роснай траве. *(М. Маляўка)* 3. Спелая гронка рабіны нібы раскошная кветка заглядвала ў акно. *(У. Караткевіч)* 4. Захавай маю мову для родных маіх, захавай не як памяць а кветку жывую, захавай маю мову як зрок і як слых як мелодыю свету, якую я чую. *(Н. Гальпяровіч)* 5. Цыбулька гаварыў як найлепшы прамоўца. *(М. Гарэцкі)* 6. Твар Аўгінні расчырванеў як макаў цвет. *(Я. Колас)* 7. На нізкай і роўнай як стол мясціне рачулка часцей пятляе між кустоў алешніку. (*В. Гігевіч*) 8. І толькі над пожняй кугікае кнігаўка як заўсёды жалобна. *(В. Гігевіч)* 9. У Маскву Янка Купала прыехаў як дэлегат з'езда пісьменнікаў. *(В. Гарадзілава)*

- Зрабіце марфалагічны разбор слоў *найлепшы (прамоўца), жалобна (кугікае).*
- Сфармулюйце правілы напісання слоў *водсвет, з'езд, мелодыя, расчырванець.*
- Зрабіце сінтаксічны разбор 2-га і 3-га сказаў.

**486.** Спішыце, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку і растлумачце іх пастаноўку.

1. Амаль кожны верш Янкі Купалы як споведзь як дзённік, па якім можна ўзнавіць шлях паэта. *(У. Юрэвіч)* 2. За полем гараць асеннія вогнішчы лесу як сіняватыя вочы зямлі ляжаць між парыжэлых, вылінялых за лета броваў асакі невялікія лужкі і азерцы. *(А. Жук)* 3. Удалечыні замаячыў млын-вятрак, што стаяў у баку ад дарогі на гары нерухома як падстрэленая птушка апусціўшы ледзь не да самай зямлі крылы. *(Б. Сачанка)* 4. Сярод ярка-зялёнага як быццам падсвечанага знутры моху вогненна чырванелі шапкі сыраежак і чырвонагаловікаў. *(М. Капыловіч)* 5. Чор-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

ная яблыня густа наслала пад сабою лісця хаваючы дробныя і даўгаватыя як сліўкі пахучыя яблыкі. *(В. Адамчык)* 6. Купчастыя вершаліны клёнаў былі нібы полымем ахопленыя. *(І. Навуменка)* 7. Ён меў права затрымлівацца ў адным месцы не больш чым суткі. *(Я. Брыль)* 8. Менш чым праз хвіліну Несцяровіч вярнуўся ў хату. *(К. Чорны)* 9. Лёгкія ажурныя нібы цацачныя вісяць над ракой аркі шасейнага і чыгуначнага мастоў. *(І. Навуменка)*

● Сфармулюйце правілы напісання слоў *споведзь, млын-вятрак, ярка-зялёны, чырвонагаловікі.*

● Запішыце словаўтваральныя ланцужкі да слоў *апусціўшы (стаяў), падстрэленая (птушка), наслала (лісця).*

● Зрабіце сінтаксічны разбор 5-га сказа.

Параўнальныя звароты як вобразныя сродкі шырока выкарыстоўваюцца ў мастацкай літаратуры. Яны больш выразна, экспрэсіўна адцяняюць пэўныя прыметы, якасці, уласцівасці, дзеянні шляхам непасрэднага супастаўлення з іншымі прадметамі, вобразамі, дзеяннямі. Параўнанні маюць яркую суб'ектыўную афарбоўку і выяўляюць сілу пачуццяў і эмацыянальнага напружання аўтара, яго адносіны да з'яў і прадметаў рэчаіснасці.

**487.** Прачытайце тэкст. Назавіце параўнальныя звароты, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх і вызначце іх сэнсава-стылістычную ролю ў тэксце.

У Палюшыным гародзе было поўна вады, і ў ёй мітусіўся вялікі жоўты адбітак месяца: то дрыжаў, то падскокваў, як на хвалях, то збіраўся ў гармонік, а тады расцягваўся ў палоску. Завішнюк угледзеў, што за свірнамі выстраіліся ў два рады калёсы-разводы. На белых, як срэбра, вышараваных аб пясок шынах дрыжаў халодны, як зімовы, бляск месяца. *(І. Пташнікаў)*

● Якія вобразныя сродкі, апрача параўнальных зваротаў, дапамагаюць перадаць апісанне месячнай ночы?

↑ Прывядзіце прыклады апісання месячнай ночы з дапамогай параўнальных зваротаў у мастацкіх творах.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**488.** Прачытайце верш, захоўваючы патрэбную інтанацыю. Назавіце параўнанні і іх элементы. Вызначце сэнсавую і стылістычную функцыі параўнанняў у вершы.

Шумлівы лес —
Падручнік роднай мовы.
Тут дрэвы, як назоўнікі,
Стаяць,
А птушкі ўтвараюць дзеясловы —
Пяюць і свішчуць,
Звоняць і крычаць.

Прыметнікамі бор здалёк прыметны —
Зеленачубы,
Стройны,
Залаты.
Сустрэне гай займеннікам прыветным:
Нібы з сябрамі,
З намі ён на «ты».

Зязюля раніцай лічэбнік вучыць —
Плыве наўсцяж старраннае «ку-ку».
Цвіце багун.
Цвіце чабор гаючы.
Вісяць,
Што коскі,
Шышкі на сасне.

Грыбы, нібы часціцы і прыслоўі,
Хаваюцца
Сярод імхоў і траў.
У верасным,
Сунічным палясоўі
Я ласкавыя словы напаткаў.

Звіні ж вякамі,
Мова,
Па-над краем —
У жніўны дзень,
На лузе,
Пры сасне!


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Жыццё не адмаўляе,
А сцвярджае
Адмоўная часціца мовы — «не».

*В. Гардзей*

- Якія асацыяцыі выклікалі ў вас параўнальныя звароты? У чым іх вобразнасць?
- Зрабіце сваё апісанне лесу ў вашу любімую пару года, ужываючы параўнальныя звароты.

**489.** Прачытайце. Паспрабуйце ўдасканаліць тэкст, уключыўшы ў месцах пропуску параўнанні. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку і растлумачце іх.

Алесь, напэўна, паспеў бы лепей разгледзець усё гэта, але тут здалёк пачуўся тупат капытоў. Потым з вузкага жарала цёмнай алеі вырваўся ... коннік на белым кані і наўскапыта памчаўся да іх.

Асадзіў каня ля самага кабрыялета так рэзка, што конь ... ў зямлю. Алесь убачыў касы, нервовы зрак каня, яго раздзьмутыя ноздры. Здзіўлены, амаль спалоханы гэтым нечаканым з'яўленнем, не разумеючы яшчэ, што да чаго, ён баяўся ўзняць вочы і таму бачыў толькі белую скуру сядла і белы гарнітур для верхавой язды. Потым нясмела, спадылба, кінуў позірк вышэй і ўгледзеў вельмі загарэлы ...; усмешку, што адкрывала роўныя белыя ... зубы; белакурыя, хвалістыя вусы і грыву валасоў і, галоўнае, смяшлівыя васільковыя вочы з нейкім нетутэйшым, доўгім, міндалевідным разрэзам тонкіх павек. *(Паводле У. Караткевіча)*

Для даведкі: *як ядро з гарматы, як быццам урос усімі капытамі, амаль шакаладны твар, як снег.*

- Сфармулюйце правіла напісання слоў *кабрыялет, нервовы, раздзьмуты, не разумеючы.* Прывядзіце свае прыклады.
- Зрабіце марфемны разбор слоў *лепей, здалёк, спалоханы, кінуў, разгледзець, баяўся.*
- Якую сэнсавую і стылістычную нагрузку выконваюць параўнанні ў тэксце?
- Параўнайце свой тэкст з аўтарскім. Што дапамагала вам у выбары параўнанняў?



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Алесь, напэўна, паспеў бы лепей разгледзець усё гэта, але тут здалёк пачуўся тупат капытоў. Потым з вузкага жарала цёмнай алеі вырваўся, як ядро з гарматы, коннік на белым кані і наўскапыта памчаўся да іх.

Асадзіў каня ля самага кабрыялета так рэзка, што конь як быццам урос усімі капытамі ў зямлю. Алесь убачыў касы, нервовы зрак каня, яго раздзьмутыя ноздры. Здзіўлены, амаль спалоханы гэтым нечаканым з'яўленнем, не разумеючы яшчэ, што да чаго, ён баяўся ўзняць вочы і таму бачыў толькі белую скуру сядла і белы гарнітур для верхавой язды. Потым нясмела, спадылба, кінуў позірк вышэй і ўгледзеў вельмі загарэлы, амаль шакаладны твар; усмешку, што адкрывала роўныя белыя як снег зубы; белакурыя, хвалістыя вусы і грыву валасоў і, галоўнае, смяшлівыя васількова вочы з нейкім нетутэйшым, доўгім, міндалевідным разрэзам тонкіх павек. *(У. Караткевіч)*

**490.** У кнізе, якую вы цяпер чытаеце, знайдзіце 5—6 сказаў з такімі параўнальнымі зваротамі, якія вам падаюцца незвычайнымі, цікавымі, арыгінальнымі, запішыце іх.

**491.** Напішыце сачыненне-мініяцюру на тэму, якая вас хвалюе, ужыўшы ў ёй розныя тыпы параўнанняў.

## Кантрольныя пытанні і заданні

1. Што называецца параўнаннем?
2. З якіх элементаў складаецца параўнанне?
3. Якія існуюць марфалагічныя і сінтаксічныя сродкі параўнанняў?
4. Што такое параўнальны зварот?
5. Якія члены сказа могуць паясняць параўнальныя звароты?
6. Якую сінтаксічную ролю выконваюць параўнальныя звароты ў сказах?
7. Пры якіх умовах не выдзяляюцца коскамі параўнальныя звароты на пісьме? Адказ падмацуйце прыкладамі.
8. Пастаўце знакі прыпынку ў сказах і зрабіце іх сінтаксічны разбор: *1. Мова як і грамадства ўвесь час знаходзіцца ў няспынным развіцці і ўдасканальванні.* (А. Міхневіч) *2. Доўгае расстанне нібы пакаранне я прыняў пакорна як няўмольны лёс.* (Л. Пранчак)


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

# ПАДАГУЛЬНЕННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА Ў IX КЛАСЕ

**492.** Прачытайце тэкст. Вызначце ролю К. Каліноўскага ў станаўленні беларускай літаратурнай мовы. Запішыце, чым канкрэтна ўзбагаціў К. Каліноўскі беларускую літаратурную мову.

Узбагачаючы родную літаратуру ў ідэйных і жанравых адносінах, Каліноўскі смела ўводзіў у свае творы новыя паняцці і лексемы, чым істотна спрыяў развіццю нацыянальнай літаратурнай мовы. Нашы лінгвісты заўважылі: «У Каліноўскага сустракаем вялікую колькасць выразаў (словазлучэнняў), якіх раней у беларускай пісьменнасці не было і якія абумоўлены сацыяльнай, рэвалюцыйнай накіраванасцю яго твораў: *адняць свабоду, бараніць бацькаўшчыну, братні народ, выказацца за вольнасць, глум народа, глуміцель народа, здабыць свабоду, не даць загінуць праўдзе і справядлівасці, ісці за праўду і справядлівасць, народны дух, народнае сумленне, сіла народа, як сумленне кажа, служыць дзелу слова, туманіць розум, чалавечае і народнае права*». Нават выбраныя з кантэксту, гэтыя словы працягваюць жыць, будзяць думку, пякуць, заклікаюць. У творах Каліноўскага беларуская мова апрабавала многія новыя словы, звязаныя з грамадска-палітычным жыццём, словы з адцягненым значэннем, яе сінтаксіс узбагаціўся складанымі сказамі (Каліноўскаму ж увесь час даводзілася агітаваць, пераконваць, выстройваць ланцужок аргументацый). *(Г. Кісялёў)*

● Параўнайце словазлучэнні *глум народа* і *глуміцель народа*. У чым іх адрозненне?

● Выпішыце па два словазлучэнні, уведзеныя К. Каліноўскім, якія адпавядаюць наступным схемам: а) дзеясл. + наз.; б) наз. + прым.; в) наз. + наз.

● Выпішыце сказы, ускладненыя адасобленымі членамі, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

**493.** Прачытайце тэкст. Прааналізуйце яго. Знайдзіце прыклады: 1) простых і складаных сказаў; 2) аднасастаўных і двухсастаўных; 3) няпоўных; 4) ускладненых аднароднымі членамі; 5) ускладненых адасобленымі членамі.

У шырокім **трохстворчатым** акне, перад якім стаіць мой рабочы стол, — як у вялікай раме, — светлая, глыбокая карціна.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Позірк на свет з вышыні другога паверха. Спачатку — сад. Проста нібы паляна з рэдкіх карлікавых вішань. Куст ядлоўцу. Дзве **абяссілена-разгалістыя** яблыні. Сасоначка. Мноства белых галін расставіла маладая бяроза.

Далей — цёмны хваёвы лес. Над лесам сёння ясны блакіт і злёгку папялістыя хмаркі, знарок наскубленыя так, каб іх не хапіла на ўсё неба.

А на зямлі сёння — **доўгачаканы** снег, пакуль што рэдзенькі, з травянымі пралысінамі і злёгку прымарожаны. Пасля такой кіслай непагадзі, як учора, пазаўчора і некалькі дзён яшчэ, сонца, снег і марозік настройваюць пасвяточнаму. Добра працуецца, з ціхай урачыстасцю ў душы.

*(Я. Брыль)*

- Выпішыце словазлучэнні з аднароднымі і неаднароднымі азначэннямі, з дапасаванымі і недапасаванымі азначэннямі па схемах: ×наз. + прым.; ×дзеясл. + прысл.; ×прысл. + прым.
- Растлумачце правапіс выдзеленых слоў.
- Якую ролю ў тэксце выконваюць назыўныя сказы?
- Апішыце від з акна вашага пакоя (класа).

**494.** Прачытайце, выдзяляючы патрэбнай інтанацыяй адасобленыя і аднародныя члены сказа. Дайце загаловак тэксту.

Вясною, аглядаючы сады, людзі абразаюць з яблынь, груш, сліў галлё і выносяць, выкідаюць у раўчукі. Пазней, калі сады ўкрываюцца лісцем, адцвітаюць, зелянее раптам, зацвітае і абрэзанае, выкінутае ў раўчукі галлё.

І, ходзячы міма, я заўжды думаю пра тую вялікую сілу жыцця, што закладзена ва ўсім жывым, — нават адрэзаныя ад ствала, пазбаўленыя сокаў, каранёў, асуджаныя на смерць, небыццё, галінкі яшчэ некаторы час жывуць, зелянеюць, цвітуць... *(Б. Сачанка)*

- Вызначце адрасата і асноўную думку тэксту.
- Разбярыце 1-ы сказ па членах сказа, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў ім.
- Разбярыце па саставе словы *вясною, аглядаючы.*
- Выпішыце з апошняга сказа два дзеепрыметнікі і зрабіце іх марфалагічны разбор.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**495.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып, асноўную думку, адрасата. Дайце тэксту загаловак. Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку.

Любоў да радзімы ў чалавека яскрава праяўляецца тады, калі ён на час разлучыцца з ёю. І чым даўжэй ён будзе недзе далёка, тым мацней гэта пачуццё. Але чалавек здольны хаваць свае пачуцці. А вось у птушак гэта навідавоку.

Возьмем усім нам знаёмых жураваў. На радзіме яны апрача глухога балота з іржавай вадой ды чэзлага драбналесся нічога бадай за сямейнымі клопатамі не бачаць. У далёкіх жа краях птушак чакае багаты корм залітыя паўднёвым сонцам берагі маляўнічых рэк і азёр. І ўсё ж нягледзячы на гэта восенню пакідаюць жоравы радзіму вельмі неахвотна.

Паволі пралятаючы над вёскамі і пустымі палямі яны раз-пораз падаюць свае сумныя галасы — цяжка з роднай зямлёй развітвацца.

Неахвотна пакідаюць родную зямлю не адны жоравы.

*(Р. Ігнаценка)*

- Знайдзіце ў тэксце словы, ужытыя ў пераносным значэнні. Растлумачце іх значэнні.
- Выпішыце словы, якія адпавядаюць схемам:



- Назавіце словы, у якіх назіраюцца адметныя фанетычныя асаблівасці беларускай мовы ў параўнанні з рускай.

**496.** Прачытайце тэкст. Што ён сабой уяўляе (апавяданне, апісанне ці разважанне)?

Іван Патапавіч збірае старыя беларускія кнігі, прычым перавагу аддае прыжыццёвым выданням аўтараў.

Прызнацца, я пакепліваў, смяяўся ў душы заўсёды з усіх збіральнікаў, няхай гэта былі нумізматы, філатэлісты ці тыя ж кнігалюбы, наогул людзі апантаныя, якія, замест таго каб, скажам, чытаць кнігі, іх калекцыяніруюць, застаўляюць імі кватэры, з жытла робяць склады. І таму я не стрымаўся, спытаў у Івана Патапавіча:

— Выбачайце, а чаму вы аддаяце перавагу прыжыццёвым выданням? Які вы бачыце ў гэтым сэнс?

— О, малады чалавек, — захоплена, з імпэтам загаварыў Іван Патапавіч. — Калі-небудзь вы таксама зразумееце, што


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

значыць трымаць у руках, ну... Тую самую кніжачку, якую трымаў у сваіх руках Дунін-Марцінкевіч, Францішак Багушэвіч, Максім Багдановіч ці... Янка Купала. Гэта ж... Быццам дакранаешся да той эпохі, у якую жыў і тварыў пісьменнік. Адчуваеш і той далёкі час, і настрой, і радасць ад друкаванага слова. Дый... Прыжыццёвыя выданні заўсёды розняцца ад наступных выданняў. Па-першае, многія творы аўтар потым дапрацоўвае, правіць. Іншы раз — лепш, іншы раз — горш. А цікава ж — які быў пачатковы варыянт таго ці іншага верша, апавядання, што аўтарам потым перараблялася, што яго задавальняла, а што не задавальняла. Па-другое, цікава, як складалася тая ці іншая кніга, што за чым стаяла, як чыталася. Па-трэцяе, не ўсе творы, уключаныя ў тую ці іншую кнігу, перавыдаюцца потым. Некаторыя навечна астаюцца толькі ў першавыданнях. Чаму, якая прычына таго? Зноў жа цікава. Сабраныя ўсе кнігі таго ці іншага пісьменніка даюць можнасць уявіць па-сапраўднаму творчы шлях аўтара, бачыць узлёты і падзенні... *(Б. Сачанка)*

- Знайдзіце ў тэксце тэзіс, доказы і сфармулюйце вывад, зыходзячы са зместу тэксту, запішыце яго.
- Знайдзіце ўскладненыя сказы, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх. Вызначце ролю такіх сказаў у структуры тэксту.
- Правядзіце словаўтваральны аналіз слоў *прыжыццёвы, кнігалюб, цікава.*

**497.** Прачытайце тэкст, захоўваючы патрэбную інтанацыю пры зваротках, пабочных словах. Вызначце стыль казкі, сваё абгрунтаванне запішыце.

### ДЗВЕ КУМЫ

Вязала кабета на полі ячмень. Падымалася хмара. Бачыць баба, што да дажджу не ўправіцца ёй з ячменем.

Дай, думае, клікну на помач куму. А кума ўжо ўхадзілася са сваёю работаю і была дома.

— Памажы мне, галубка, звязаць ячмень, — просіць яна куму.

— Калі ж, кумка, жыбулькі надта колюцца, — адказвае кума. А зімою прыходзіць яна да кумы.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

— Дай мне, кумка, мукі на аладкі.

— Прыйшла кумка па муку, а жыбулька за руку. *(Я. Колас)*

- Што хацеў сказаць аўтар гэтай казкай? Прывядзіце прыклады падобных сітуацый з вашай жыццёвай практыкі.

**498.** Каменціраваны дыктант.

Залатое пяро апусціў у цяжкую, з чырвонага кварцыту, чарніліцу і буйнымі літарамі вывеў:

«Дарагі Вітольдзік, брат мой духоўны!»

Задумаўся. Брат духоўны? Напісаў адразу, не падумаўшы, з якіх слоў пачынаць ліст, але, калі б падумаў, хіба мог бы знайсці словы большае шчырасці і большае дакладнасці? Больш шчырых і дакладных не існавала.

«Ліст, які я атрымаў ад цябе, можа напісаць толькі закаханы. Я лічу, што чалавек, калі кахае, здольны ўзняцца да неверагодных вышынь духу». *(В. Карамазаў)*

- Успомніце, якую функцыю выконваюць у маўленні звароткі.
- Зрабіце сінтаксічны разбор няпоўных сказаў.

**499.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Спішыце.

Узыходзячы на круты коўзкі ўзгорак я зірнуў угору, туды, дзе побач з хатай на агародзе пад самыя хмары ўздымаецца змалку знаёмая старая ліпа.

На ліпу выкінуты быў белы сцяг вясны: там сядзеў першы сёлетні бусел. Вельмі ранні яшчэ нечаканы.

Я пастаяў каля плота шчасліва намагаючыся ўявіць ягоны шлях ад пірамідаў да нашых надрэчных лугоў.

Сашка найменшы ўнучак маёй сястры ўжо адчуў гэты вялікі цуд...

Белы сцяг вясны...

Тады ж адразу адчуўшы гэта я ўспомніў, што з’яву такую першы назваў так Міцкевіч, што па-нашаму па-пісьменніцку кажучы гэта чужое.

У яго толькі трохі інакш:

Bo już bocian przyleciał do rodzinnej sosny

I rozpiał skrzydła białe, wczesny sztandar wiosny.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Не белы сцяг а ранні. І не складзены так, як у гэтага, што на ліпе, а распасцёрты ў палёце. *(Паводле Я. Брыля)*

- У чым адрозненне вобразнага апісання бусла ў Я. Брыля і А. Міцкевіча?
- Назавіце сугучныя польскія і беларускія словы, якія пацвярджаюць роднасць славянскіх моў.

**500.** Прачытайце рымскую легенду. Вызначце яе асноўную думку.

Хачу расказаць вам рымскую легенду аб васільках.

— Багіня жніва і ўрадлівасці Цэрэра гуляла аднойчы па хлебных палях і цешылася з той удзячнасці, якую мела ад усяго чалавецтва. Раптам з гушчы каласоў дайшоў да яе жалобны голас васількоў: «О, Цэрэра, навошта ты загадала вырасці нам сярод збожжа? Сын зямлі зверне ўвагу толькі на той спажытак, які прынясуць яму твае шыкоўныя каласы, і нават не кіне на нас добрага позірку! Дай жа нам такую вершаліну, як у паніклых ад цяжару хлебных каласоў, альбо дазволь расці дзе-небудзь асобна, каб маглі пазбавіцца мы ад пагардлівых позіркаў людзей». На гэта багіня адказала сваім улюбёным кветкам: «Не, мілыя мае дзеці, не для таго я змясціла вас сярод шумлівых каласоў, каб вы прыносілі нейкую карысць чалавецтву. Не, ваша прызначэнне больш высокае, чым тое, якое вы можаце ўявіць і якое ўяўляюць людзі: вы мусіце быць пастарамі* сярод вялікага народа каласоў. Таму вам і не належыць, падобна ім, шумець і хіліцца цяжкаю галавою да зямлі. Наадварот, вы павінны вольна і весела квітнець і глядзець, як чысты вобраз ціхай радасці і цвёрдай веры, угору, на вечна сіняе неба, дзе жыве бажаство. З гэтай прычыны дадзена вам блакітнае, колеру нябёсаў, пастарскае адзенне, каб адзначыць вас як служкаў неба, пасланых на зямлю прапаведаваць людзям веру, а багам — вернасць. Майце толькі цярплівасць, прыйдзе дзень жніва, калі ўсе гэтыя каласы ўпадуць пад рукою жней. Тады вы, якія цяпер выглядаеце закінутымі і самотнымі, звернеце на сябе ўсеагульную ўвагу. Жнеі будуць шукаць і рваць вас, звіваць з вас вянкі і ўпрыгожваць імі свае галовы альбо зробяць з вас букецікі і прышпіляць сабе на грудзі». Словы гэтыя супакоілі пакрыў-


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

джаных васількоў. Удзячныя, яны змоўклі і радаваліся свайму высокаму прызначэнню.

Пасля ў мяне была магчымасць прачытаць «Апокрыф» Максіма Багдановіча і параўнаць з рымскай легендай. Там ужо было інакш... *(П. Качаткова)*

- Ці чыталі вы «Апокрыф» М. Багдановіча? Перакажыце яго змест, параўнайце яго асноўную думку з асноўнай думкай рымскай легенды.
- Знайдзіце ў тэксце прыклады сказаў з: а) аднароднымі выказнікамі; б) некалькімі радамі аднародных членаў; в) словамі-сказамі; г) звароткамі; д) параўнальнымі зваротамі; е) адасобленымі акалічнасцямі, азначэннямі.
- Зрабіце марфалагічны разбор слоў *улюбёным (кветкам), (супакоілі) васількоў.*

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

# УЗОРЫ РАЗБОРУ

## 1. Сінтаксічны разбор словазлучэння

**Пісьмовы:**

як? што? якая?

*Пушыста ўсцілае дол густая дзераза.* (А. Жук)

**Вусны:**

*Густая дзераза* — словазлучэнне. Будова: галоўнае слова — *дзераза,* выражана назоўнікам; залежнае слова — *густая,* выражана прыметнікам. Спосаб сінтаксічнай сувязі — дапасаванне. Граматычнае значэнне: прадмет і яго прымета.

*Усцілае дол* — словазлучэнне. Будова: галоўнае слова — *усцілае,* выражана дзеясловам; залежнае слова — *дол,* выражана назоўнікам. Спосаб сінтаксічнай сувязі — кіраванне. Граматычнае значэнне: дзеянне і прадмет, на які яно пераходзіць.

*Усцілае пушыста* — словазлучэнне. Будова: галоўнае слова — *усцілае,* выражана дзеясловам; залежнае слова — *пушыста,* выражана прыслоўем. Спосаб сінтаксічнай сувязі — прымыканне. Граматычнае значэнне: дзеянне і яго прымета.

## 2. Сінтаксічны разбор двухсастаўнага сказа

**Пісьмовы:**

*Хмаркі белыя марудна за лясы плывуць.* (Я. Колас)

**Вусны:**

Сказ просты, апавядальны, няклічны, двухсастаўны, развіты, поўны. (Што?) *хмаркі* — дзейнік, выражаны назоўнікам у форме Н. скл., мн. л.; *хмаркі* (што робяць?) *плывуць* — просты выказнік, выражаны дзеясловам у форме абв. ладу, цяп. ч., 3-й ас., мн. л.; *хмаркі* (якія?) *белыя* — дапасаванае азначэнне, выражана прыметнікам у форме Н. скл, мн.л.; *плывуць* (як?) *марудна* — акалічнасць спосабу дзеяння, выражана прыслоўем; *плывуць* (куды?) *за лясы* — акалічнасць месца, выражана назоўнікам у спалучэнні з прыназоўнікам *за* ў форме В. скл., мн. л.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## 3. Сінтаксічны разбор аднасастаўнага сказа

**Пісьмовы:**

*Пахла скошанаю травою.* (Я. Сіпакоў)

**Вусны:**

Сказ просты, апавядальны, няклічны, аднасастаўны з галоўным членам выказнікам, безасабовы, развіты, поўны. (Што рабілася?) *пахла* — просты выказнік, выражаны асабовым дзеясловам у безасабовай форме; *пахла* (чым?) *травою* — ускоснае дапаўненне, выражана назоўнікам у форме Т. скл., адз. л.; *травою* (якою?) *скошанаю* — дапасаванае азначэнне, выражана дзеепрыметнікам у форме Т. скл., адз. л.

## 4. Сінтаксічны разбор няпоўнага сказа

**Пісьмовы:**

*На даляглядзе — горы.* (В. Быкаў)

**Вусны:**

Сказ просты, апавядальны, няклічны, двухсастаўны, развіты, няпоўны, з апушчаным выказнікам. (Што?) *горы* — дзейнік, выражаны назоўнікам у форме Н. скл., мн. л.; (дзе?) *на даляглядзе* — акалічнасць месца, выражана назоўнікам у спалучэнні з прыназоўнікам *на* ў форме М. скл., адз. л. На месцы апушчанага выказніка ставіцца працяжнік.

## 5. Сінтаксічны разбор сказа з аднароднымі членамі

**Пісьмовы:**

*Спакойна, разважна цячэ размова.* (К. Чорны)

**Вусны:**

Сказ просты, апавядальны, няклічны, двухсастаўны, развіты, ускладнены аднароднымі членамі, поўны. (Што?) *размова* — дзейнік, выражаны назоўнікам у форме Н. скл., адз. л.; *размова* (што робіць?) *цячэ* — просты выказнік, выражаны дзеясловам у форме абв. ладу, цяп. ч., 3-й ас., адз. л.; *цячэ* (як?) *спакойна, разважна* — аднародныя акалічнасці спосабу дзеяння, выражаны прыслоўямі, спалучаюцца паміж сабой інтанацыяй, на пісьме раздзяляюцца коскай.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## 6. Сінтаксічны разбор сказа з пабочным словам (словазлучэннем і сказам)

**Пісьмовы:**

*На шчасце, увечары дождж перастаў.* (Ц. Гартны)

**Вусны:**

Сказ просты, апавядальны, няклічны, двухсастаўны, развіты, поўны, ускладнены пабочным словам *на шчасце,* якое выражае задавальненне. (Што?) *дождж* — дзейнік, выражаны назоўнікам у форме Н. скл., адз. л.; *дождж* (што зрабіў?) *перастаў* — просты выказнік, выражаны дзеясловам у форме абв. ладу, пр. ч., адз. л., м. р.; *перастаў* (калі?) *увечары* — акалічнасць часу, выражана прыслоўем. Пабочнае слова *на шчасце* не з'яўляецца членам сказа, стаіць у пачатку сказа, аддзяляецца коскай.

## 7. Сінтаксічны разбор сказа са звароткам

**Пісьмовы:**

*Давайце, добрыя сябры, пагутарым аб шчасці.* (П. Глебка)

**Вусны:**

Сказ просты, апавядальны, няклічны, аднасастаўны, з галоўным членам выказнікам, пэўна-асабовы, развіты, ускладнены зваротам, поўны. (Што зробім?) *давайце пагутарым* — просты выказнік, выражаны дзеясловам у форме заг. ладу, 1-й ас., мн. л.; *давайце пагутарым* (аб чым?) *аб шчасці* — ускоснае дапаўненне, выражана назоўнікам з прыназоўнікам *аб* у форме М. скл., адз. л. Зваротак *добрыя сябры* развіты, не з'яўляецца членам сказа, стаіць у сярэдзіне сказа, з двух бакоў выдзяляецца коскамі.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## 8. Сінтаксічны разбор сказа з адасобленымі членамі

**Пісьмовы:**

*Над горадам, прыбраная ў зоры, апускаецца ноч.*

(Э. Самуйлёнак)

**Вусны:**

Сказ просты, апавядальны, няклічны, двухсастаўны, развіты, ускладнены адасобленым азначэннем, поўны. (Што?) *ноч* — дзейнік, выражаны назоўнікам у форме Н. скл., адз. л.; *ноч* (што робіць?) *апускаецца* — просты выказнік, выражаны дзеясловам у форме абв. ладу, цяп. ч., 3-й ас., адз. л.; *ноч* (якая?) *прыбраная ў зоры* — адасобленае азначэнне, выражана дзеепрыметнікавым зваротам; *апускаецца* (дзе?) *над горадам* — акалічнасць месца, выражана назоўнікам у спалучэнні з прыназоўнікам *над* у форме Т. скл., адз. л. Адасобленае азначэнне стаіць у сярэдзіне сказа перад паяснёным словам і ад слова, якое паясняе, аддзелена выказнікам, таму з двух бакоў выдзяляецца коскамі.

## 9. Сінтаксічны разбор сказа з параўнальным зваротам

**Пісьмовы:**

*Хмары чорныя, як смага, засланілі сонца.* (М. Хведаровіч)

**Вусны:**

Сказ просты, апавядальны, няклічны, двухсастаўны, развіты, ускладнены параўнальным зваротам, поўны. (Што?) *хмары* — дзейнік, выражаны назоўнікам у форме Н. скл., мн. л; *хмары* (што зрабілі?) *засланілі* — просты выказнік, выражаны дзеясловам у форме абв. л., пр. ч., мн. л.; *хмары* (якія?) *чорныя* — дапасаванае азначэнне, выражана прыметнікам у форме Н. скл., мн. л.; *чорныя* (у якой меры? у якой ступені?) *як смага* — акалічнасць меры (ступені), выражана параўнальным зваротам; *засланілі* (што?) *сонца* — прамое дапаўненне, выражана назоўнікам у форме В. скл. без прыназоўніка. Параўнальны зварот стаіць у сярэдзіне сказа, з двух бакоў выдзяляецца коскамі.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

# ПУНКТУАЦЫЯ

## 1. Знакі прыпынку ў канцы сказа

[ ]. [ ]? [ ]! [ ]?! [ ]...

## 2. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам

1. Наз. — наз.
2. Неазн. ф. дзеясл. — неазн. ф. дзеясл.
3. Ліч. — ліч.
4. Наз. — неазн. ф. дзеясл.
5. Наз. — ліч.

## 3. Працяжнік у няпоўным сказе

1. *На паляне — дубок, на дубочку — лісток.* (З. Бядуля)
2. *Гуляюць дзеці каля возера, а неба з сонцам — у вадзе.*

(П. Панчанка)

## 4. Раздзяленне коскамі аднародных членаў, спалучаных адзіночнымі злучнікамі

| | |
|---|---|
| ○, *а* ○ | *а, але, ды (=але), аднак, затое* |
| ○ *і* ○ | *і, або, ці, ды (=і)* |

## 5. Раздзяленне коскамі аднародных членаў, спалучаных паўторнымі злучнікамі

| | |
|---|---|
| *і* ○, *і* ○ | *і—і, ні—ні, або—або, то—то, ці—ці, не то—не то* |


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

### 6. Раздзяленне коскамі аднародных членаў, спалучаных парнымі злучнікамі

| | |
|---|---|
| *як* ○, *так і* ○ | *як—так і,*<br>*не толькі—але і,*<br>*не столькі—колькі,*<br>*калі не—то* |

### 7. Знакі прыпынку ў сказах з абагульняльнымі словамі

[◎: ○, ○, ○].

[○, ○, ○ — ◎ ...].

[◎: ○, ○, ○ — ...].

### 8. Раздзяленне коскамі аднародных азначэнняў



### 9. Выдзяленне знакамі прыпынку звароткаў (З)

[З!] | [З, ...] | [..., З, ...] | [..., З]

### 10. Выдзяленне коскамі параўнальнага звароту (пз)

[Пз, ...] | [..., пз, ...] | [..., пз]

### 11. Адасабленне (выдзяленне коскамі) азначэнняў

×, дзеепрым. зв., ... | дзеепрым. зв., ═══ ×



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## 12. Адасабленне дапасаваных азначэнняў з дадатковым акалічнасным значэннем

прычына, × | уступка, ×

## 13. Адасабленне дапасаваных азначэнняў пры асабовых займенніках

асаб. займ., ~~~~~~~~, ... | ~~~~~~~~, асаб. займ.

## 14. Адасабленне дапаўненняў з прыназоўнікамі *акрамя, апрача, за выключэннем* і інш.

..., *акрамя...*, ... | *акрамя...*, ...

## 15. Адасабленне дзеепрыслоўных зваротаў

дзеепрысл. зв., × | ×, дзеепрысл. зв.

## 16. Адасабленне адзіночных дзеепрыслоўяў

... , дзеепрысл., × | × дзеепрысл.

## 17. Адасабленне зваротаў з *нягледзячы на, дзякуючы* і іншымі вытворнымі прыназоўнікамі

... , *нягледзячы на...*, ...

... , *дзякуючы...*, ...

## 18. Адасабленне ўдакладняльных акалічнасцей месца і часу

дзе?, дзе іменна?, ...

калі?, калі іменна?, ...



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## 19. Адасабленне пабочных слоў (пс) і словазлучэнняў

[Пс, ...] [..., пс, ...] [..., пс]

## 20. Выдзяленне коскамі, працяжнікамі і дужкамі пабочных сказаў

Пабочныя сказы выдзяляюцца

**коскамі** (сінанімічныя пабочным словам)

*На тым баку ракі, як нам здавалася, былі добрыя заліўныя лугі.* (М. Ваданосаў)

**працяжнікамі і дужкамі** (змяшчаюць дадатковыя заўвагі або тлумачэнні)

*На дажынкі — па даўнім звычаі — жанчыны прыбралі кветкамі і вянкамі першы сноп жыта.* (А. Васілевіч) *Ганька і ўсе яе сябры п'юць ваду толькі на Карабачы (так завецца Танін хутар).* (А. Васілевіч)

## 21. Выдзяленне знакамі прыпынку слоў-сказаў і выклічнікаў

***Так,*** *Алесь ведаў гэтага чалавека.*
***Ура!*** *Мы выйгралі!*
***Не****, мы яшчэ папрацуем.*
***Ах****, як цудоўна навокал!* (М. Лынькоў)
***Эх****, як слаўна сярод кветак!* (Я. Колас)


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

# ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК

**Азы́злы,** -ая, -ае. Настылы, азяблы.

**Антура́ж,** -а, *м.* Асяроддзе, акружэнне.

**Анфіла́да,** -ы, *ж.* Доўгі рад пакояў, у якіх дзверы размешчаны па адной прамой лініі.

**Арабе́ска,** -і, *ж.* Складаны арнамент са стылізаваных кветак або лісця першапачаткова ў духу арабскага стылю.

**Арка́да, -**ы, *ж.* Рад аднолькавых па форме і велічыні арак, якія абапіраюцца на слупы або калоны і складаюць архітэктурнае цэлае.

**Аске́т,** -а, -це, *м.* Вельмі ўстрыманы чалавек, які вядзе суровы лад жыцця.

**Аскеты́зм,** -у, *м.* Строгі ўклад жыцця з адмаўленнем ад матэрыяльных выгод.

**Аскеты́чнасць,** -і, *ж.* Тое, што і аскетызм.

**Афары́зм,** -а, *м.* Кароткае трапнае выслоўе.

**Афарысты́чны,** -ая, -ае. Уласцівы афарызму, падобны да яго; які мае ў сабе афарызмы.

**Баро́ка,** *нескл., н.* Мастацкі стыль XVI—XVIII стст., які вызначаўся дэкаратыўнай пышнасцю дэталей.

**Бельведэ́р,** -а, *м.* Невялікая вежа над будынкам або асобная невялікая пабудова на ўзвышаным месцы, адкуль можна наглядаць за наваколлем.

**Бліскаві́ца,** -ы, *ж.* Тое, што і маланка.

**Бравэ́рка,** -і, -рцы, -рак, *ж.* Верхняя кароткая мужчынская вопратка звычайна з аўчын, абцягнутых саматканым сукном.

**Брызглі́на,** -ы, *ж.* Кустовая расліна сямейства брызглінавых, якая ўтрымлівае ў сабе гутаперчу.

**Ве́сніцы,** -ніц. *Толькі мн.* 1. Вароты ў двор або ў агарод, у поле. 2. Плот з варотамі ў канцы вёскі *(уст.).*

**Вартава́ць,** -тую, -туеш, -туе, -туй; *незак.* Ахоўваць, сцерагчы каго-, што-н.

**Вы́ган,** -у, *м.* Месца каля вёскі, дзе пасецца жывёла.

**Гало́н,** -а, *м.* Адзінка вымярэння аб’ёму і ёмістасці ў ЗША, Вялікабрытаніі і інш. краінах.

**Гера́льдыка,** -і, *ж.* Гістарычная дысцыпліна, якая займаецца вывучэннем гербаў.

**Геральды́чны,** -ая, -ае. Які мае адносіны да геральдыкі.

**Гумно́,** -а, *н.* Вялікая халодная будыніна для складвання і абмалоту збожжа, а таксама пляцоўка перад гэтай будынінай.

**Дэко́р,** -у, *м.* *(спец.)* Сукупнасць, сістэма ўпрыгожанняў збудавання або вырабу.

**Дзядзькава́нне,** -я, *н.* *(гіст.)* Звычай на беларускіх землях канца XVI — пач. XVIII ст. аддаваць дзяцей шляхты ў сялянскую сям’ю,



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

каб выхаваць у іх станоўчыя фізічныя і духоўныя якасці простага народа: працавітасць, сілу, непатрабавальнасць да ежы і адзення, любоў да зямлі і вернасць ёй.

**До́йлід,** -а, *м.* Архітэктар.

**Дыяме́нт,** -а, -нце, *м.* Алмаз (спецыяльна агранены), брыльянт.

**Жо́гла,** -ы, *м. (разм.)*. Скнара.

**Жэ́ўжык,** -а, *м. ( разм.)* Свавольнік, гарэза.

**Здранцве́лы,** -ая, -ае. Які страціў адчувальнасць, гібкасць, адзеравянелы.

**Кабе́та,** -ы, *ж. (разм.)* Сталая замужняя жанчына.

**Каза́н,** -а , *м. (абл.)* Кацёл з круглым дном і шырокім верхам.

**Казна́тка,** -і, -тцы, *ж.* Шнураваная жаночая вопратка.

**Камунікава́нне,** -і, *н. Толькі адз.* Тое, што і камунікацыя, абмен думкамі, перадача інфармацыі пры дапамозе мовы.

**Камуніка́цыя,** -і, *ж.* 1. Шлях зносін, лінія сувязі, а таксама энерга-, цепла-, газа- і водазабеспячэння. 2. *Толькі адз.* Паведамленне, абмен думкамі, перадача інфармацыі пры дапамозе мовы.

**Кантэ́кст,** -у, -сце, *м.* Закончаны ўрывак пісьмовай мовы (тэксту), які дазваляе вызначыць сэнс кожнага слова або выразу, што ў яго ўваходзіць.

**Каплу́н,** -а, *м.* Пакладаны певень, якога адкормліваюць на мяса.

**Карэ́ц,** -рца́, *м.* Драўляны або металічны коўш з ручкай для зачэрпвання вады, квасу і пад.

**Кварцы́т,** -у, -ыце, *м.* Горная парода, якая складаецца пераважна з кварцу — распаўсюджанага мінералу.

**Ке́лля,** -і, *ж.* Асобны пакой манаха ў манастыры.

**Клёпка,** -і, *ж.* Кожная асобная дошчачка для бакавых сценак бочкі і пад.

**Кля́мка,** -і, *ж.* Прыстасаванне, з дапамогай якога зачыняюць і адчыняюць дзверы.

**Ко́тлішча,** -а, *н., (разм.) абл.* 1. Месца жыхарства, сяліба. 2. *(перан.)* Род, сям'я.

**Кро́сны,** кросен. *Толькі мн.* 1. Ручны ткацкі станок. 2. Ніцяная аснова, якая навіваецца на навой станка (*памянш.* **красёнцы,** -аў).

**Кра́ска,** -і, *ж.* Палявая кветка.

**Ку́жаль,** -ю, *м.* 1. Валакно ачэсанага лёну, а таксама ніткі з такога валакна. 2. Палатно з такіх нітак.

**Лаўжы́,** *мн.* ад лоўж, *м.* Галлё, скінутае ў кучу; куча галля.

**Лега́льны,** -ая, -ае. Дазволены законам.

**Лексе́ма,** -ы, *ж.* Слова як самастойная сэнсавая адзінка, якая разглядаецца ў мовазнаўстве ва ўсёй сукупнасці сваіх форм і значэнняў.

**Лі́штва,** -ы, *ж.* Накладная, звычайна фігурная планка вакол дзвярнога ці аконнага праёма.



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**Лука́,** -і, *ж.* Дугападобны паварот ракі, а таксама мыс, які абгінаецца ракой.

**Лятýнак,** -нка, *м. (разм.)* Мара, летуценні.

**Манумента́льны,** -ага. Грунтоўны, глыбокі па змесце.

**Мяжа́,** -ы, *ж.* Вузкая палоска неўзаранай зямлі паміж палеткамі, участкамі, уладаннямі.

**Нужýтка,** -і, -тцы, *ж. (дыял.)* Верхняя вопратка.

**Нумізма́т,** -а, *м.* Чалавек, які займаецца вывучэннем старажытных манет, грашовых зліткаў і медалёў.

**Палетак,** -тка, *м.* Участак поля, які выкарыстоўваецца пад пасевы.

**Па́стар,** -а, *м.* Пратэстанцкі святар.

**Па́старскі,** -ая, -ае. Які мае адносіны да пастара, належыць пастару.

**Па́стыр,** -а, *м.* Святар як кіраўнік паствы.

**Патро́н,** -а, *м.* У старажытным Рыме: асоба, якая брала пад сваю апеку бедных.

**Пры́мхі,** -хаў; *адз.* прымха, -і, Д., М. -мсе, *ж.* Забабоны, забабонныя прыметы.

**Пры́сак,** -ску, *м.* Гарачы распалены попел.

**Ракако́,** *нескл., н.* Архітэктурны і дэкаратыўны стыль XVIII ст., які ўзнік у Францыі і вызначаўся незвычайнай складанасцю форм і дзівосным арнаментам.

**Рэма́рка,** -і, -рцы, *мн.* -і, -рак, *ж.* 1. Заўвага, памета на палях (рукапісу, кнігі). 2. Тлумачэнне аўтара да тэксту п’есы (звычайна ў дужках), у якім даецца дадатковая характарыстыка абставін дзеяння, знешняга выгляду або паводзін персанажа.

**Сацыялізава́насць,** -і, *ж.* Прыстасаванасць да знаходжання ў соцыуме (грамадстве).

**Сацыя́льны,** -ая, -ае. Грамадскі, які мае адносіны да жыцця і людзей, да іх адносін у грамадстве.

**Се́рнік,** -а, *м. (абл.)* Запалка.

**Сігне́т,** -у, -еце, *м.* 1. Друкарская ці выдавецкая марка на кнізе. 2. Знак на творы мастацтва, які абазначае яго прыналежнасць пэўнаму мастаку і з’яўляецца сталай выявай (замест подпісу) якой-н. фігуры, сімвала.

**Сі́тнік,** -у, *м.* Травяністая расліна сямейства асаковых, якая расце пераважна на сырых, балоцістых месцах.

**Ска́рга,** -і, *ж.* 1. Выражэнне незадавальнення з прычыны непрыемнасці. 2. Афіцыйная заява аб незаконным дзеянні якой-н. асобы, установы, арганізацыі.

**Скры́пень,** -ю, *м.* Высокая травяністая расліна з мяцёлкай пурпурна-ружовых або белых кветак і пушыстым насеннем.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**Слі́вень,** слі́ўня, -і, *м.* Змяя сямейства вужоў бурага (самцы) або шэрага (самкі) колеру.

**Стае́ннік,** -а, *м.* Конь, якога трымаюць на стайні для выезду.

**Су́кня,** -і, *ж. (дыял.)* Сукенка.

**Сырадо́й,** -ю, *м.* Толькі што надоенае малако.

**То́есны,** -ая, -ае. Зусім падобны, аднолькавы, такі ж.

**Факту́ра,** -ы, *ж. (спец.)* 1. Своеасаблівая якасць апрацоўкі матэрыялу, яго паверхні. 2. Своеасаблівасць мастацкай тэхнікі ў творах мастацтва.

**Фальцэ́т,** -у, -цэце, *м.* Вельмі высокі гук пеўчага голасу, які патрабуе асобага прыёму выканання, а таксама такая манера спеву.

**Фаэто́н,** -а, *м.* 1. Лёгкі экіпаж з адкідным верхам. 2. Легкавы аўтамабіль, у якім можна адкідаць верх.

**Фрэ́ска,** -і, *ж.* 1. Карціна, напісаная вадзянымі фарбамі на свежаатынкаванай сцяне. 2. Від жывапісу — насценны роспіс.

**Хару́гва,** -ы, *ж.* 1. У старажытнасці: баявы вайсковы сцяг. 2. Замацаванае на доўгім дрэўку палотнішча з вобразамі святых, якое носяць у час рэлігійных шэсцяў.

**Хорт,** -а, *м.* Парода паляўнічага сабакі.

**Цэ́бар,** -бра, *м.* Шырокая драўляная пасудзіна з клёпак, з двума вушкамі.

**Чале́снікі,** -аў. *Толькі мн.* Уваходная выемка ў печы.

**Чмут,** -а, *м.* Распуснік, гарэза.

**Чаро́т,** -у, *м.* Высокая вадзяная або балотная расліна сямейства асаковых, а таксама зараснік гэтай расліны.

**Шаўро́вы,** -ая, -ае. Зроблены з мяккай тонкай скуры хромавага дублення, выробленай са шкур коз.

**Шы́хта,** -ы, *ж. (спец.)* Сумесь матэрыялаў (руда, флюсы, кокс, вугаль і інш.), узятых у пэўнай прапорцыі, якую загружаюць у плавільныя печы для перапрацоўкі.

**Шэ́рань,** -і, *ж.* Тонкі снежны слой, які ўтвараецца дзякуючы выпарэнням вільгаці пры рэзкім пахаладанні; туман з халодным дробным дажджом, імжа; смуга выпарэнняў у сырое надвор'е.

**Экзо́тыка,** -і, *ж.* Экзатычныя прадметы, з'явы.

**Экзаты́чны,** -ая, -ае. Незвычайны, малавядомы, дзівосны.

**Экспрэ́сія,** -і, *ж.* Выразнасць; сіла праяўлення якіх-н. пачуццяў, перажыванняў і пад.

**Э́тнас,** -у, *м.* Від устойлівай сацыяльнай групоўкі людзей, што ўзнік гістарычна (племя, народнасць, нацыя).

**Ярына́,** -ы, *ж.* Аднагадовыя сельскагаспадарчыя культуры, якія выспяваюць летам ці восенню ў год сяўбы.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

# АРФАЭПІЧНЫ СЛОЎНІК

## А

Абагу́ленасць [сьць]
Абагу́ленне [ньне]
Абгаро́дка [тк], абгаро́дцы [цц]
Абе́дзве [дзьве]
Аб’е́зд [ст]
Аб’е́зджванне [ждж] [ньне]
Аб’е́здчык [шч]
Абкало́цца [пк],
*зак.* абко́лешся [сься]
Абка́паны [пк]
Абкапа́ны і абко́паны [пк]
Абкла́дка [пк] [тк], абкла́дцы [цц]
Абкла́дчык [пк] [чч]
Абкрыва́цца [пкр],
*незак.* абкрыва́ешся [сься]
Абно́жка (*пылок з кветак*) [шк],
абно́жцы [сц]
Абплысці́ [ппл] [сьці]
Абпраме́ньванне [ппр] [ньне]
Абрэ́зчык [шч]
Абса́дка [пс] [тк], абса́дцы [цц]
Абскрэ́бці [пскр] [пці]
Абсма́жыць [псм]
Абсме́яны [псьм]
Абстры́гчыся [пстр] [хч]
Абсыпа́цца [пс],
*незак.* абсыпа́ешся [сься]
Абсцы́са [псц]
Абся́г [пс] [х]
Абтрэ́сці [птр] [сьці]
Абхо́д [пх] [т]
Абхо́дчык [пх] [чч]
Абця́жка [пц] [шк]
Абясшко́дзіць [шшк]
Аванпо́стны [сн]
Агаро́дчык [чч]
Агля́дчык [чч]
Адбе́гчы [хч]
Адве́зці [сьці]
Адво́зчык [шч]
Аддзяўбці́ [дзьдзя] [пц]
Адка́зчык [тк] [шч]
Адкла́сці [ткл] [сьці]
Адсячэ́нне [тс] [ньне]
Адцвісці́ [цьцьвісьці]
Адчэ́сваць [чч]
Адшчапе́нец [тшч]
Азбе́ст [зьбе]
Айсбе́рг [зьбе] [х]
Аспе́кт [сьпе]
Асцюкава́тасць [сьцю] [сьць]
Афганіста́н [ўг]

## Б

Ба́бка [пк]
Бага́цце [цьце]
Балансіро́ўка [ньсі]
Бала́стны [сн]
Бало́тца [цц]
Бамбё́жка [шк]
Бараццба́ [дзьб]
Баскетбо́л [дб]
Бе́дства [цтв]
Безжурбо́тнасць [жж] [сьць]
Белаве́жскі [ск]
Берагчы́ся [хч],
*незак.*беражэ́шся [сься]
Беразня́к [зьня]
Бесчалаве́чнасць [шч] [сьць]
Бізнесме́н [зьнесьме]
Брусча́тка [шч], брусча́тцы [цц]
Бры́дкасць [тк] [сьць]
Брызглі́навы [г *выбухны*]
Бу́гскі [хск]
Бясчу́ласць [шч] [сьць]
Бясшу́мнасць [шш] [сьць]

## В

Ва́жкасць [шк] [сьць]
Вакза́л [гз — г *выбухны*]
Валгагра́дскі [цк]
Варо́тцы [цц]
Ваяво́дства [цтв]
Ве́зці [сьці]
Во́тчына [чч]
Вы́грузка [ск]
Вы́прагчы [хч]


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Вы́разка [ск], вы́разцы [сц]
Вы́садка [тк], вы́садцы [цц]
Выслі́згванне [зг — г *выбухны*] [ньне]
Вэ́дзгаць [дзг — г *выбухны*]
Вя́зкасць [ск] [сьць]

### Г

**Г**азні́ца [г *выбухны*] [зьні]
**Г**а́нак [г *выбухны*]
Гара**д**скі́ [цк]
**Г**арсэ́т [г *выбухны*]
Гваздзі́ка [зьдзі]
**Г**валт [гв — г *выбухны*]
Глад**ч**э́й [чч]
**Г**о́нта [г *выбухны*]
Грама́**д**скі [цк]
Грыб**к**о́вы [пк]
Гу́**б**ка [пк]
Гу́**б**чаты [пч]
Гу**с**ля́р [сьля]

### Д

Дабе́**г**чы [хч]
Дагля́**д**чык [чч]
Дагры́**з**ці [сьці]
Дагрэ́**б**ціся [пц],
*зак.* даграбе́**ш**ся [сься]
Дадзяў**б**ці́ [пц]
Дано́**с**чык [шч]
Дара́**д**ца [цц]
Дара́**д**чык [чч]
Даро́**ж**ка [шк], даро́**ж**цы [сц]
Дву**х**гадо́вы [гг]
Дву**х**гало́**с**се [гг] [сьсе]
Двухсо**т**гадо́вы [дг]
**Дзве́с**це [дзьвесьце]
Дзе́**ж**ка [шк], дзе́**ж**цы [сц]
Дзе**д**са́д [цс]
Дзя́**дзь**ка [цьк]
Дзяў**б**ці́ [пц]
До́йлі**д**ства [цтв]
До́світак [сьві]
Дро́**г**кі [хк]
Дро**з**д [ст]
Ду́**д**ка [тк], ду́**д**цы [цц]
Ду́**ж**ка [шк]
Ды**с**гармо́нія [зг]
Дыспе́**т**чар [сьпе] [чч]
Дэ**з**інфарма́цыя [зын]

### Е

Е́**д**ка**с**ць [тк] [сьць]
Е́**з**джаны [ждж]
Е́**з**дзіць [зьдзі]
Е́**с**ці [сьці]

### Ё

Ёдзіста**с**ць [сьць]
Ёлка**с**ць [сьць]

### Ж

Жа́ла**с**лівы [сьлі]
Жы**ц**цялю́**б** [цьця] [п]
Жэ́р**д**ка [тк]

### З

За**б**е́**г**чыся [хч],
*зак.* забяжы́**ш**ся [сься]
Забра́**з**гаць [зг — г *выбухны*]
Зава**д**скі́ і заво́**д**скі [цк]
Запрэ́**г**чы [хч]
Зара́**д**ка [тк], зара́**д**цы [цц]
За**с**ве́**д**чыць [сьве] [чч]
За**с**цера**г**чы́ [сьце] [хч]
Зачар**сц**ве́ла**с**ць [сьцьве] [сьць]
**З**бера**г**чы́ся [зьбе] [хч],
*зак.* зберажэ́**ш**ся [сься]
**З**ве́**с**ці [зьве] [сьці]
Зво́**з**чык [шч]
Звы**ш**і́мклі́вы [шым]
Звя́**з**ка [ск], звя́**з**цы [сц]
Зга́**д**ка [тк]; зга́**д**цы [цц]
**Зг**ва́лціць [згв — г *выбухны*]
Згрэ́**б**ці [пц]
**З**жа́ты [жж]
**З**жаўце́лы [жж]
Зрэ́**д**ку [тк]
Зрэ́**д**час [чч]


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Зрэ́**з**чык [шч]
З’я**з**джа́цца [ждж],
*незак.* з’язджа́е**ш**ся [сься]

**І**

Істу́**ж**ка [шк]
**Í**хні [йі]

**К**

Ка́**з**ка [ск], ка́**з**цы [сц]
Кама**н**дзі́р [ньдзі]
Кампо́**ст**ны [сн]
Кантра́**ст**ны [сн]
Кля**ць**ба́ [дзьб]

**Л**

Ла**нд**ша́фт [нтш]
Лё**г**кі [хк]
Лё**т**чык [чч]
Ло**д**ка [тк], ло́**д**цы [цц]
Лы**ж**ка [шк], лы́**ж**цы [сц]
Лю**д**скі́ [цк]
Лю́**д**цы [цц]

**М**

Ма**г**чы́ма**с**ць [хч] [сьць]
Мане́**т**чык [чч]
Ма**н**цёр [ньцё]
Маро́**з**лівы [зьлі]
Ма́**т**чын [чч]
Му**ж**чы́на [шч]
Мы́**с**ле**нн**е [сьленьне]
Мядзве́**дзь** [дзьвець]

**Н**

На́**д**піс [тп]
Накла́**д**чык [чч]
Нарэ́**з**ка [ск], нарэ́**з**цы [сц]
Наса́**д**ка [тк], наса́**д**цы [цц]
Наску́**б**ці [пц]
На**с**чышча́ць [шч]
На**с**шыва́ць [шш]
Но́**с**чык [шч]
Но́**сь**біт [зьбі]
Ня**с**ві́**ж** [сьві] [ш]
Ня**с**ві́**ж**скі [сьвіскі]

**О**

О́**б**скі [пск]
О́ксфар**д**скі [рцк]

**П**

Падво́**з**чык [шч]
Пад’**е́зд** [йэст]
Падно́**с**чык [шч]
Па**д**пі́**с**чык [тпішч]
Па**д**ця́**ж**ка [цьцяшк]
Па**д**чапі́ць [чч]
Па**д**чы́**с**ціць [ччысьці]
Па**з**жына́ць [жж]
Пака́**з**чык [шч]
Пале́**сс**е [сьсе]
Пастры́**г**чы [хч]
Па**ц**ве́рдзіць [цьве]
Пе́**н**сія [ньсі]
Перагру́**з**ка [ск]
Перада́**т**чык [чч]
Перапі́**с**чык [шч]
По́**д**сціл [тсьці]
По**д**зві́**г** [дзьвіх]
Прыха**д**скі́ [цк]
Пя**с**ча́нік [шч]

**Р**

Ра**з**бе́**г**чыся [зьбе] [хч],
*зак.* разбяжы́**ш**ся [сься]
Ра**з**ве́**д**ка [зьве] [тк]
Ра**з**ве́**д**чык [зьве] [чч]
Ра**з**’язджа́ць [зьйа] [ждж]
Ра**с**чапле́**н**не [шч] [ньне]
Ра**с**чарава́на**с**ць [шч] [сьць]
Ра**с**чу́льваць [шч]
Ра**с**чэ́сваць [шч]
Ра**с**шавялі́ць [шш]
Ра**сш**нурава́ць [шшн]
Ра**сш**чапля́ць [шшч]
Ра**с**шыфрава́ць [шш]
Рэ́**д**ка [тк]
Рэ́**з**гіны [зг — г *выбухны*]

**С**

Садаво́**дст**ва [цтв]
**С**ве́**д**ча**н**не [сьвеччаньне]


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Скар**б** [п]
Сла́ўгара**д**скі [цк]
**С**ле́**д**чы [сьлечч]
Спа́**д**чына [чч]
Спа**ртс**ме́н [рцсьме]
**Сц**ве́рджа**н**не [сцьве] [ньне]
**С**чарві́вец [шч]
**С**чэ́знуць [шч]
**С**чэ́пка [шч]
**С**шыць [шш]

**Т**

Трыно́**ж**ка [шк]
Тун**е́**ль [нэ]

**У**

У**з**бе́**кс**кі [зьбецк]
У**з**бярэ́жжа [зьбя]
Уле́**г**цы [хц]
Упры́ся**д**кі [тк]
Ушэ́**с**це [сьце]

**Ф**

Фальшываман**е́т**чык [чч]
Фу**т**бо́л [дб]

**Х**

Хры**с**ціяне [сьці]
Хрэ́**сь**біны [зьбі]

**Ц**

Ця́**ж**ка [шк]
Ця**с**ля́р [сьля]

**Ч**

Чалавекалю́**бс**тва [пств]
Чале́**с**нікі [сьні]
Ча**рсц**ве́ць [рсцьве]
Ча**ц**ве́р [цьве]

**Ш**

Шар**с**цяны́ [сьця]
Ша**с**цёра [сьцё]
Шма**т**гадо́вы [дг]
Шма**т**жа́нрава**с**ць [дж — *раздзельна* д + ж] [сьць]
Шма**тз**ме́нны [дзьме — *раздзельна* д + з]

**Э**

**Экз**а́мен [гз — г *выбухны*]
**Экз**а́рх [гз — г *выбухны*]

**Ю**

Юро́**дс**тва [цтв]
Ютла́**ндс**кі [нцк]

**Я**

Я**зм**і́н [зьмі]

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

# Адказы на тэставыя заданні

## ЧАСТКА I.

**А1.** 2
**А2.** 4
**А3.** 3
**А4.** 4
**А5.** 4
**А6.** 1, 4
**А7.** 2
**А8.** 1, 2, 3
**А9.** 1, 4
**А10.** 4
**А11.** 1, 3, 4
**А12.** 1, 2, 3
**А13.** 1, 2
**А14.** 1, 2
**А15.** 2, 3, 4
**А16.** 2
**А17.** 4
**А18.** 3
**А19.** 1
**А20.** 3
**А21.** 2, 3, 4
**А22.** 3
**А23.** 3
**А24.** 1, 3, 4
**А25.** 2
**А26.** 1
**А27.** 2, 3
**А28.** 4
**А29.** 4
**А30.** 1, 2
**А31.** 4
**А32.** 2
**А33.** 2, 3
**А34.** 2, 4
**А35.** 2
**А36.** 2
**А37.** 1, 2, 3
**А38.** 1, 2, 3
**А39.** 1, 2, 4
**А40.** I — 4; II — 3

## ЧАСТКА II.

**В1.** 1. *Даражэйшая за...* 3. *Самы зручны*
**В2.** *Гнецца*
**В3.** 1. *Пайнаводнае Антарыо.* 2. *Прыгожая вуаль*
**В4.** *Безасабовы*
**В5.** *Публіцыстычны*
**В6.** *Разважанне*

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

# ЗМЕСТ


§ 1. Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры 3

ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА Ў V—VIII КЛАСАХ

§ 2. Стылі мовы і маўлення . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
§ 3. Навуковы стыль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
§ 4. Публіцыстычны стыль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
§ 5. Мастацкі стыль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
§ 6. Афіцыйна-дзелавы стыль . . . . . . . . . . . . . . . . . 16
§ 7. Гутарковы стыль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18

СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ

§ 8. Публічнае выступленне . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
§ 9. Словазлучэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
§ 10. Граматычнае значэнне словазлучэнняў . . . . . . . . . 32
§ 11. Сінтаксічныя адносіны паміж словамі ў словазлучэнні . . 34
§ 12. Спосабы сувязі слоў у словазлучэнні . . . . . . . . . . 36

СКАЗ

§ 13. Агульнае паняцце аб простым сказе . . . . . . . . . . . 48
§ 14. Тыпы сказаў па мэце выказвання . . . . . . . . . . . . 50
§ 15. Лагічны націск. Парадак слоў у сказе . . . . . . . . . 54

ПРОСТЫ СКАЗ. ДВУХСАСТАЎНЫЯ НЕРАЗВІТЫЯ СКАЗЫ

§ 16. Будова і ўжыванне двухсастаўных неразвітых сказаў . . 61
§ 17. Галоўныя і даданыя члены сказа . . . . . . . . . . . . 62
§ 18. Дзейнік. Спосабы яго выражэння . . . . . . . . . . . . 62
§ 19. Тыпы выказнікаў і спосабы іх выражэння . . . . . . . . 65
§ 20. Некаторыя выпадкі дапасавання простага дзеяслоўнага выказніка да дзейніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
§ 21. Будова і сэнсава-стылістычныя магчымасці двухсастаўных развітых сказаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
§ 22. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам . . . . . . . . 75
§ 23. Даданыя члены сказа . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
§ 24. Дапаўненне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
§ 25. Азначэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
§ 26. Прыдатак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88
§ 27. Акалічнасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
§ 28. Акалічнасці месца і часу . . . . . . . . . . . . . . . . 92
§ 29. Акалічнасці прычыны, мэты і спосабу дзеяння . . . . . . 95
§ 30. Акалічнасці меры і ступені . . . . . . . . . . . . . . . 98
§ 31. Акалічнасці ўмовы і ўступкі . . . . . . . . . . . . . . 98

АДНАСАСТАЎНЫЯ СКАЗЫ

§ 32. Віды аднасастаўных сказаў . . . . . . . . . . . . . . . 106
§ 33. Пэўна-асабовыя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109




Скачено с Образовательного портала www.adu.by

§ 34. Няпэўна-асабовыя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
§ 35. Абагульнена-асабовыя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . 114
§ 36. Безасабовыя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 115
§ 37. Назыўныя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 120
§ 38. Паглыбленне паняцця пра публіцыстычны стыль . . . . 126
§ 39. Рэпартаж . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128

## НЯПОЎНЫ СКАЗ

§ 40. Няпоўны сказ і яго будова . . . . . . . . . . . . . . . . . 133
§ 41. Працяжнік у няпоўным сказе . . . . . . . . . . . . . . . . 138
§ 42. Роля і ўжыванне няпоўных сказаў . . . . . . . . . . . . . 140

## УСКЛАДНЕНЫ СКАЗ

§ 43. Сказы з аднароднымі членамі . . . . . . . . . . . . . . . . 151
§ 44. Аднародныя і неаднародныя азначэнні . . . . . . . . . . . 157
§ 45. Злучнікі пры аднародных членах сказа . . . . . . . . . . 164
§ 46. Спосабы аб'яднання аднародных членаў сказа . . . . . . . 167
§ 47. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа . . . . . . 169
§ 48. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа . 181
§ 49. Паглыбленне звестак пра апісанне як тып тэксту . . . . . 185

## СКАЗЫ СА ЗВАРОТКАМІ, ПАБОЧНЫМІ СЛОВАМІ І ВЫКЛІЧНІКАМІ. СЛОВЫ-СКАЗЫ

§ 50. Зваротак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 205
§ 51. Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы . . . . . . . . . . 222
§ 52. Словы-сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 237

## АДАСОБЛЕНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА

§ 53. Паняцце пра адасабленне . . . . . . . . . . . . . . . . . . 242
§ 54. Адасобленыя азначэнні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 243
§ 55. Адасобленыя прыдаткі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 253
§ 56. Адасобленыя дапаўненні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 260
§ 57. Адасобленыя акалічнасці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 263
§ 58. Адасобленыя ўдакладняльныя акалічнасці . . . . . . . . . 270
§ 59. Параўнальныя звароты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 285

**Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага ў IX класе** . . 301

## ДАДАТАК

**Узоры разбору** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 308
**Пунктуацыя** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 312

**Тлумачальны слоўнік** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 316
**Арфаэпічны слоўнік** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 320
**Адказы на тэставыя заданні** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 324



Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Вучэбнае выданне

**Антанюк** Любоў Адамаўна
**Бадзевіч** Зінаіда Іванаўна
**Кныш** Мікалай Валяр'янавіч
**Саматыя** Ірына Мікалаеўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**Вучэбны дапаможнік**
**для 9 класа**
**ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне**
**агульнай сярэдняй адукацыі,**
**з беларускай і рускай мовамі навучання**
**з 12-гадовым тэрмінам навучання**

**(базавы і павышаны ўзроўні)**

2-е выданне

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Л. Б. Сопат*
Дызайнер *І. А. Усенка*
Тэхнічны рэдактар *Д. А. Яшкін*
Камп'ютэрная вёрстка *А. М. Кульбіцкай, І. У. Шутко*
Карэктары *Т. Ф. Шайко, Ю. А. Якаўчэнка*

Падпісана ў друк з дыяпазітываў 14.12.2005. Фармат 60×90/16.
Папера афсетная № 1. Гарнітура Школьная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 20,5+0,25 форз.+0,95 укл. Ул.-выд. арк. 16,68.
Тыраж 147 500 экз. Заказ 3205

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. ЛВ № 02330/0133300 ад 30.04.2004.
220004, Мінск, Караля, 16

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». 220600, Мінск, Чырвоная, 23

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан падручніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне падручнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Скачено с Образовательного портала www.adu.by